ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВЫ І МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

Роднае слова

2013/2
(302)
ЛЮТЫ

Рэдакцыйная калегія

доктар філалагічных навук А. Бельскі (намеснік)
доктар філалагічных навук М. Прыгодзіч (намеснік)
доктар педагагічных навук М. Яленскі (намеснік)
доктар мастацтвазнаўства Т. Габрусь
доктар філалагічных навук У. Гніламёдаў
доктар мастацтвазнаўства В. Дадзіёмава
доктар філалагічных навук В. Іўчанкаў
доктар філалагічных навук І. Казакова
доктар гістарычных навук,
доктар архітэктуры А. Лакотка
доктар філалагічных навук А. Ліс
доктар філалагічных навук А. Лукашанец
доктар філалагічных навук В. Максімовіч
доктар мастацтвазнаўства У. Мартынаў
доктар філалагічных навук А. Ненадавец
доктар філалагічных навук В. Новак
доктар педагагічных навук І. Паўлоўскі
доктар мастацтвазнаўства В. Пракапцова
доктар філалагічных навук В. Рагойша
доктар філалагічных навук І. Роўда
доктар філалагічных навук І. Саверчанка
доктар філалагічных навук В. Старычонак
кандыдат філалагічных навук М. Трус
доктар філалагічных навук М. Тычына
доктар філалагічных навук І. Чарота
доктар філалагічных навук Т. Шамякіна

Навуковыя кансультанты

Г. Адамовіч, Р. Аладава, М. Аляхновіч,
Г. Арцямёнак, А. Багданава, З. Бадзевіч,
А. Белая, Д. Дзятко, Т. Казакова,
В. Карамазаў, У. Каяла, В. Лемцюгова,
І. Лепешаў, Е. Лявонава, В. Ляшук,
В. Ляшчынская, А. Макарэвіч, У. Мархель,
З. Мельнікава, П. Міхайлаў, М. Мушынскі,
М. Новік, В. Рагаўцоў, В. Русілка,
У. Сенькавец, А. Солахаў, А. Станкевіч, П. Сцяцко,
Т. Тамашэвіч, Н. Усава, Н. Шаранговіч, І. Штэйнер

Рэдакцыйная рада

Р. Бабашка, М. Бубешка, І. Булаўкіна,
В. Давідовіч, В. Душэўская, Р. Ільіна,
Г. Запартыка, З. Камароўская, В. Кажура,
Л. Лазарчык, А. Ляшковіч, Л. Макарэвіч,
А. Марціновіч, Г. Марчук, М. Пазнякоў, А. Панфіленка,
Т. Прадзед, Л. Собаль, І. Таяноўская, Т. Шэляговіч

Над нумарам працавалі

рэдактары:

Вольга Крукоўская (*Методыка і вопыт:* Міністэрства адукацыі прапануе, ВНУ – школе, Дыктант на ўроку, Прапануем план-канспект, Настаўнік прапануе; *Калі закончыўся ўрок:* Да Міжнароднага дня роднай мовы, Кола народных святаў),

Крысціна Пучынская (*Літаратура і час:* Да 120-годдзя з дня нараджэння, Скрыжаванні, Нацыянальны вобраз свету, З архіваў часу, Майстэрства творцы, Новыя выданні; *Нацыянальная і сусветная культура:* Водсветы; Каляндар памятных датаў і юбілейных дзён),

Ларыса Сагановіч (*Мовы рысы непаўторныя:* Мова мастацкіх твораў, Мовазнаўчы досвед, Чаму мы так гаворым, Назвы роднага краю, Малады даследчык прапануе, Чароўная маляўнічасць прасторы),

Наталля Шапран (*Нацыянальная і сусветная культура:* З архіваў часу, Вяртанне да вытокаў, Светлыя імёны Беларусі, Актуальная тэма, Постаці, Музычная гасцёўня),

намеснік галоўнага рэдактара **Марыя Кныш,**
адказны сакратар **Вольга Барздова,**
дзяжурны рэдактар **Наталля Шапран,**
літаратурны рэдактар **Ніна Ваніцкая,**
тэхнічны рэдактар **Канстанцін Лісецкі,**
галоўны бухгалтар **Валянціна Ракіцкая.**

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ГРАМАДСКАЕ АБ'ЯДНАННЕ "САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ"

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ЧАСОПІСА "РОДНАЕ СЛОВА"»

Часопіс выходзіць з 1988 года
(у 1988 – 1991, №№ 1 – 48, выдаваўся пад назвай **"Беларуская мова і літаратура ў школе"**)

Галоўны рэдактар

Зоя Іванаўна ПАДЛІПСКАЯ

WWW.RS.UNIBEL.BY

Змест

Падліпская Зоя. Шлях высокага служэння Радзіме: "Роднаму слову" – 25 3

ЛІТАРАТУРА І ЧАС

Іофе Эмануіл. Максім Гарэцкі – беларусазнаўца 6
Дасаева Таццяна. Якуб Колас і Максім Гарэцкі 13
Ярмоленка Алена. Мастацкі свет ранніх апавяданняў Максіма Гарэцкага 17
Жыбуль Віктар. "Буду слухаць песьні ветра…": Да 100-годдзя паэта і перакладчыка Алеся Розны ... 20
Тычына Міхась. "Як жывеш ты, мой народ…": Да 80-годдзя з дня нараджэння Юрася Свіркі 24

МОВЫ РЫСЫ НЕПАЎТОРНЫЯ

Рагаўцоў Васіль. Вербальныя сродкі камічнага ў драматычным абразку "Жартаўлівы Пісарэвіч" Максіма Гарэцкага 30
Каўрус Алесь. Не адно словам класікаў жыве мова: Трохі пра мову новых выданняў 33
Лепешаў Іван. Пра паходжанне прыказак. *Заканчэнне*..... 38
Багамольнікава Наталля. Я тут жыву: Лексіка-семантычная характарыстыка гелонімаў Гомельшчыны..... 41
Шахоўская Святлана. Беларуская тэарэтычная лексікаграфія: стан, праблемы, кірункі 43
Бабіч Юрый. "Чорныя косы, чорныя вочы…": Чорны колер і яго адценні ў творах беларускіх пісьменнікаў 47

МЕТОДЫКА І ВОПЫТ

Бут-Гусаім Святлана, Новік Марыя. Ад простага сказа да складанага: Метадычныя парады і рэкамендацыі (IX клас). *Працяг*..... 50
Саламевіч Алена. Мнемоніка пры вывучэнні беларускай мовы. *Працяг* 53
Мароз Святлана, Ржавуцкая Марына, Старасценка Таццяна. Дыктант як від практыкавання: Навучальны выбарачны дыктант. *Працяг*..... 57
Павалокіна Наталля. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай: Урок беларускай мовы (IX клас)..... 60
Зубко Аліна. Мікола Сурначоў. "У стоптаным жыце": Урок беларускай літаратуры (VI клас)..... 61

КАЛІ ЗАКОНЧЫЎСЯ ЎРОК

Мянькоў Юрый. Вечарына беларускай мовы і літаратуры: IX – XI класы 65
Маскевіч Алена. Ой, вясна вясёлая!: Тэатралізаванае прадстаўленне гукання вясны..... 68

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ І СУСВЕТНАЯ КУЛЬТУРА

Запартыка Ганна. Максім Гарэцкі ва ўспамінах сучаснікаў: Па матэрыялах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва 71
Статкевіч-Чабаганаў Анатоль. Арцішэўскія герба "Роля" 75
Кур'яновіч Юрась. Пятро Франко – вяртанне з забыцця..... 78
Налівайка Людміла. Ад Прыпяці да Нёмана: Да 100-годдзя з дня нараджэння народнага мастака Беларусі Віталя Цвіркі 84
Коўрык Аксана. Рэчы ў культуры і ў цывілізацыйным полі: Некаторыя меркаванні пра іх прыроду і прызначэнне. *Заканчэнне*..... 88
Горава Галіна. Грані вобраза пейзажнага жывапісу Івана Козела 91
Падліпская Зоя. Незабыўная мелодыя сэрца: Інтэрв'ю з кампазітарам Дзмітрыем Даўгалёвым..... 93

Паэтычная старонка. **Розна А.** Вось затым… "Дні мінулі…". Горад (23). **Свірка Ю.** Два штрыхі да вядомай ісціны (26). **Сурначоў М.** Раздум'е (62). Сон. Старонка мая (63). **Гарун А.** Гімн мове (67). **Пыліла А.** Родная мова (68).

Новыя выданні. **Нераток Ю.** Спектр белага колеру: Пра кнігу "Белая Жанчына" *Д. Пятровіча* (29).

Каляндар памятных датаў і юбілейных дзён на 2013 год: Красавік (52, 92).

Песню бярыце з сабою. Не кувай, зязюленька (словы *У. Пецюкевіча*, музыка *Д. Даўгалёва*) (96).

Часопіс уключаны ў Пералік навуковых выданняў ВАК Рэспублікі Беларусь
для друкавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па філалагічных навуках, мастацтвазнаўстве, культуралогіі, педагагічных навуках (тэорыя і методыка навучання беларускай мове і літаратуры).

У адпаведнасці з Законам аб друку аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных у артыкуле фактаў і звестак.
Рэдакцыя пакідае за сабой права друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.
Пры перадруку спасылка на "Роднае слова" абавязковая.
Патрабаванні да афармлення матэрыялаў і ўмовы для прыняцця матэрыялаў для аспірантаў гл. на сайце часопіса www.rs.unibel.by.

ШЛЯХ ВЫСОКАГА СЛУЖЭННЯ РАДЗІМЕ

“РОДНАМУ СЛОВУ” – 25

1 лютага 2013 года адбылася ўрачыстая нарада, прысвечаная 25-годдзю заснавання часопіса “Роднае слова”.

Свята, да якога рыхтаваліся роднасловаўцы з хваляваннем і вялікай адказнасцю, завяршылася, пакінуўшы ў душы кожнага з прысутных светлую радасць ад судакранання з найвялікшай каштоўнасцю – родным беларускім словам. Пляцоўкай для правядзення мерапрыемства была абрана гімназія з беларускай мовай навучання № 23 г. Мінска, дырэктар якой, Ніна Нікіціна, а таксама калектыў сардэчна расчынілі дзверы сваёй установы гасцям.

Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Маскевіч і галоўны рэдактар часопіса “Роднае слова” Зоя Падліпская ў час уручэння ўзнагароды.

З віншавальным словам да супрацоўнікаў рэдакцыі часопіса “Роднае слова”, усіх прысутных звярнуўся Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Маскевіч. Уручыўшы ганаровыя граматы, ён выказаў меркаванне, што за 25 гадоў працы часопіс стаў цэнтрам навуковай і метадычнай думкі педагогаў краіны, сапраўднай энцыклапедыяй для настаўнікаў роднай мовы і літаратуры, выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў. Адметнасць выдання – высокі навуковы ўзровень і ўзорная культура мовы. Часопіс адрозніваецца ад іншых профільных выданняў тэматычнай разнастайнасцю, бо забяспечвае інтэграцыю педагогікі і філалогіі з мастацтвам і культурай, прытым у самым шырокім кантэксце – як нацыянальным, так і сусветным.

Актуальнасць праблематыкі публікацый, клапатлівае, па-сапраўднаму шчырае стаўленне да беларускага слова, павага да духоўнай спадчыны беларускага народа робяць кожны нумар часопіса запатрабаваным сярод чытачоў, працуюць на карысць беларускай адукацыі і нацыянальнай культуры.

Сяргей Маскевіч адзначыў, што “Роднае слова” – гэта першы філалагічны, навуковы і метадычны часопіс, які мае сваю слаўную гісторыю, трывалыя традыцыі, прызнаныя дасягненні, займае значнае месца ў інфармацыйна-культурнай прасторы краіны. Па словах міністра адукацыі, часопіс спрыяў прафесійнаму станаўленню не аднаго педагагічнага пакалення, а клопат калектыву рэдакцыі пра захаванне і прапаганду роднага беларускага слова, нацыянальнай спадчыны, асвятленне пытанняў моўнай і літаратурнай адукацыі дапамагае моладзі правільна вызначаць жыццёвыя арыенціры, спрыяе выхаванню маладога пакалення ў павазе да роднай зямлі і культуры свайго народа.

Вітаючы юбіляраў, намеснік Міністра культуры Рэспублікі Беларусь Тадэвуш Стружэцкі адзначыў, што за гады плённай працы часопіс “Роднае слова” набыў папулярнасць і высокі аўтарытэт, стаў неад’емнай часткай адукацыйнага асяроддзя і культурнага жыцця нашай краіны. Высокі прафесіяналізм вызначаюць матэрыялы па сусветнай і нацыянальнай культуры, шматлікія мовазнаўчыя і літаратуразнаўчыя артыкулы, што друкуюцца на старонках часопіса. Менавіта таму на працягу доўгага часу “Роднае слова” адыгрывае прыкметную асветніцкую ролю, дынамічна развіваецца і застаецца запатрабаваным ва ўстановах адукацыі і культуры.

За значны ўклад у развіццё і папулярызацыю беларускай культуры і ў сувязі з 25-годдзем заснавання часопіса “Роднае слова” калектыў рэдакцыі быў узнагароджаны Граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Шчырыя віншаванні і падзяку за нястомную працу, якая садзейнічае духоўна-культурнаму ўзбагачэнню беларускага грамадства, умацоўвае яго прэстыж у свеце, забяспечвае важкі ўклад у фарміраванне светапогляду падрастаючага пакалення выказалі навукоўцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

На святочным мерапрыемстве, прысвечаным 25-годдзю заснавання часопіса "Роднае слова". Злева направа: **Міхась Пазнякоў, Анатоль Статкевіч-Чабаганаў, Тадэвуш Стружэцкі, Зоя Падліпская, Сяргей Маскевіч, Генадзь Пашкоў, Славамір Антановіч.**

Як адзначыў акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр Каваленя, акадэмічная гуманітарная навука непарыўна звязана з часопісам "Роднае слова". Вядучыя вучоныя-гуманітарыі НАН Беларусі з вялікай ахвотай працуюць у складзе рэдакцыйнай калегіі часопіса "Роднае слова", змяшчаюць публікацыі, якія дапамагаюць маладому пакаленню засвойваць літаратурную і моўную спадчыну ў арганічнай сувязі з нацыянальна-культурным здабыткам нашай Бацькаўшчыны.

Віншуючы роднасловаўцаў, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр Лукашанец прыгадаў доўгія гады супрацоўніцтва з часопісам "Роднае слова", назваўшы некалькі цікавых сумесных праектаў, сярод якіх падрыхтоўка педагогаў да працы па новай рэдакцыі правапісу ў сувязі з увядзеннем у дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі". Публікацыі ў часопісе "Роднае слова" садзейнічалі забеспячэнню захавання адзінага моўнага рэжыму ў школьным навучанні, стабілізацыі правапісных нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў друкаваных сродках масавай інфармацыі.

Першы сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі Генадзь Пашкоў і старшыня Мінскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Пазнякоў адзначылі, што самаадданая, сумленная праца калектыву рэдакцыі на ніве роднай літаратуры, мовы, адукацыі, важкі ўнёсак у справу захавання і развіцця сацыяльна значнага выдання – часопіса "Роднае слова" – заслугоўвае павагі і самай шчырай удзячнасці. З вялікай адказнасцю і хваляваннем я прымала найвышэйшую ўзнагароду Саюза пісьменнікаў Беларусі – нагрудны знак "За вялікі ўклад у літаратуру". Веру, што такая высокая ацэнка не толькі маёй уласнай працы, але і ўвогуле нашага калектыву, стане магутным стымулам для далейшых перамог на карысць роднай Беларусі.

Своеасаблівым сімвалам свята роднага беларускага слова стала крыштальная выява славутай асветніцы Еўфрасінні Полацкай, уручаная аўтару гэтых радкоў дырэктарам Беларускага рэспубліканскага літаратурнага фонду Славамірам Антановічам.

На ўрачыстым мерапрыемстве прысутнічалі выкладчыкі вядучых вышэйшых навучальных устаноў краіны, пісьменнікі, настаўнікі, метадысты, аўтары выдання, дзякуючы якім навуковы і метадычны часопіс "Роднае слова" мае высокі статус у навуковым свеце.

Выступленне ўзорнага калектыву "Жарт" Цэнтра дадатковай адукацыі "Светач" Савецкага раёна г. Мінска.

Шчырыя словы віншавання калектыву часопіса "Роднае слова" былі выказаны начальнікам упраўлення адукацыі Савецкага раёна г. Мінска Таццянай Янушкевіч і намеснікам начальніка Інэсай Сабаленка. Трэба сказаць, што Савецкі раён сталіцы на працягу доўгіх гадоў знаходзіцца ў ліку нашых актыўных чытачоў і падпісчыкаў.

Як адзначыў у вітальным слове намеснік старшыні камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Віталь Прыгодзіч, часопіс "Роднае слова" – сапраўдны сябра і дарадца ўсіх педагагічных калектываў устаноў адукацыі горада Мінска і краіны. Высокі прафесіяналізм калектыву рэдакцыі і кла-

патлівыя адносіны да зберажэння нацыянальных традыцый і роднага беларускага слова – узор высокага служэння Радзіме.

Загадчык аддзела арганізацыйна-інфармацыйнай работы Мінскага абласнога камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса Кузняцова, вітаючы юбіляраў, уручыла граматы старшыні прафсаюзнага камітэта Вользе Барздовай і членам прафсаюзнай арганізацыі часопіса "Роднае слова".

Віншавальныя словы ў адрас юбіляраў гучалі ад кіраўнікоў педагагічных сродкаў масавай інфармацыі Мікалая Супрановіча, Наталлі Ванінай, Алеся Бельскага, Алы Маслававай, яны засведчылі вялікую павагу да той справы, якой аддана і сумленна служыць "Роднае слова".

Музычнае віншаванне ўдзельнікаў свята ад народнай студыі традыцыйнай творчасці "Жыцень" гімназіі з беларускай мовай навучання № 23 г. Мінска.

За плённую дзейнасць па захаванні духоўнай спадчыны, далучэнні грамадскасці да скарбніц беларускай мовы, актыўнае партнёрскае супрацоўніцтва па падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў калектыў часопіса атрымаў грамату Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, якую са шчырымі словамі віншавання ўручыў сябра рэдакцыйнай калегіі часопіса, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Віктар Іўчанкаў.

"Роднае слова" вітаў Анатоль Статкевіч-Чабаганаў, пісьменнік, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, аўтар пастаяннай часопіснай рубрыкі "Вяртанне да вытокаў" і серыі кніг па гісторыі старажытных беларускіх родаў "Я – сын Ваш", якія ўбачылі свет дзякуючы выдавецтву "Беларуская Праваслаўная Царква" і ўстанове «Рэдакцыя часопіса "Роднае слова"».

Віншавальныя словы ў адрас супрацоўнікаў рэдакцыі былі выказаны кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам кафедры рэдакцыйных і выдавецкіх тэхналогій Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Уладзімірам Куліковічам.

Дарагія сябры! За дваццаць пяць гадоў на карысць часопіса шчыравалі многія адданыя рупліўцы роднага слова. У гэты юбілейны дзень гучалі шчырыя словы ўдзячнасці тым, чыя часцінка душы назаўсёды засталася ў "Родным слове".

Свята часопіса па праве можна лічыць святам кожнага настаўніка беларускай мовы і літаратуры. Дзякую вам, шаноўныя, што на працягу гэтых 25 гадоў на старонках выдання вы шчодра дзеліцеся сваімі напрацоўкамі з калегамі рэспублікі. І мы, роднасловаўцы, заўсёды рады супрацоўніцтву з кожным з нашых аўтараў.

За шматгадовую плённую дзейнасць на ніве беларускай адукацыі, значны ўклад у справу захавання нацыянальных традыцый і каштоўнасцей Ганаровай граматай установы "Роднае слова" быў узнагароджаны калектыў гімназіі з беларускай мовай навучання № 23 г. Мінска; члены рэдакцыйнай рады часопіса "Роднае слова": настаўнік беларускай мовы і літаратуры Нёманскай сярэдняй школы імя Ільі Гурскага Уздзенскага раёна Любоў Собаль і настаўнік беларускай мовы і літаратуры Вілейскай гімназіі № 2 Віктар Кажура.

Музычны падарунак роднасловаўцы атрымалі ад пісьменніка, музыканта, прыхільніка і аўтара часопіса "Роднае слова" Аляксандра Вашчанкі.

Народная студыя традыцыйнай творчасці "Жыцень" гімназіі № 23 г. Мінска (кіраўнік – Ірэна Іскрык), узорны калектыў "Жарт" Цэнтра дадатковай адукацыі "Светач" Савецкага раёна г. Мінска (кіраўнік – Ларыса Гайдук) парадавалі прысутных сваім майстэрствам.

Дарагія калегі! Свята, да якога ішлі роднасловаўцы чвэрць стагоддзя, годна завершана. Наперадзе ў калектыву рэдакцыі клапатлівая праца і доўгі творчы шлях. Так, ужо напрыканцы лютага 2013 года "Роднае слова" і яго прыхільнікаў чакае яшчэ адно значнае мерапрыемства. Сумесна з Саюзам пісьменнікаў Беларусі мы падвялі вынікі чарговага конкурсу навукова-даследчых і творчых прац вучняў, прымеркаванага да юбілеяў класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы, Якуба Коласа і Максіма Танка. Журы вызначыла пераможцаў, якія разам з настаўнікамі будуць запрошаны для ўручэння дыпломаў.

Шлях высокага служэння Радзіме працягваецца…

З павагай **Зоя ПАДЛІПСКАЯ.**

Да 120-годдзя з дня нараджэння

МАКСІМ ГАРЭЦКІ – БЕЛАРУСАЗНАЎЦА

Што такое беларусазнаўства? Многія адкажуць так: "Беларусазнаўства – гэта навука, што вывучае адметнасць і агульнасць беларусаў, іх нацыянальны рух, узаемаадносіны з суседзямі і ролю ў сістэме міжнароднай супольнасці народаў у мінулым. Яно вызначаецца комплексным, міждысцыплінарным падыходам да праблем даследавання".

У артыкуле "Беларусазнаўства" З. Шыбекі (Энцыклапедыя гісторыі Беларусі, т. 1, Мінск, 1993) адзначаецца, што ля вытокаў беларусазнаўства стаялі песняры Ф. Багушэвіч, К. Каганец, археолаг Г. Татур, беларускія народнікі, беларускія гурткі. Сярод беларусазнаўцаў даследчык вылучае А. Сапунова, братоў А. і І. Луцкевічаў, В. Ластоўскага, Я. Купалу, Я. Коласа, М. Багдановіча, Я. Карскага, Е. Раманава, А. Шахматава, Б. Эпімаха-Шыпілу. Вельмі шкада, што ў спісе адсутнічае арыгінальны беларусазнаўца Максім Гарэцкі.

Вядомы пісьменнік М. Лужанін трапна заўважыў: «Першыя празаічныя спробы Гарэцкага прыкмеціў і паставіўся да іх з надзеяй вялікі паэт, крытык бездакорнага густу, Максім Багдановіч… Я. Ф. Карскі знаходзіў у творах маладога Гарэцкага "ўсе дадзеныя, каб з аўтара з часам развіўся добры пісьменнік з самародным талентам"… Са здзіўленнем сталага мастака прыглядаўся Якуб Колас да майстэрства пісьменніка рабіць пры апісанні з'явы і рэчы як бы адчувальнымі навобмацак.

Тры такія сведчанні – важаць больш за прызнанне… <…>

Максім Гарэцкі выключны стыліст, тонкі знаўца народнай і адзін з творцаў нашай літаратурнай мовы…

Максім Гарэцкі для людзей майго пакалення – першаадкрывальнік творчых каштоўнасцей нацыі» [1, с. 79].

Біёграф М. Гарэцкага прафесар філалогіі Д. Бугаёў падкрэслівае: "Арыгінальны пісьменнік і таленавіты вучоны – даследчык літаратуры, фальклярыст, мовазнаўца – Максім Іванавіч Гарэцкі на працягу ўсяго свайго жыцця з выключнай самаадданасцю працаваў на ніве беларускай культуры, аддаючы ёй усяго сябе без астатку…

Асабліва значная роля належыць Максіму Гарэцкаму ў развіцці беларускай літаратуры, у першую чаргу мастацкай прозы, а таксама публіцыстыкі, крытыкі і, вядома ж, літаратуразнаўства. Нямала зрабіў Гарэцкі і як пісьменнік, і як вучоны-мовазнаўца для выпрацоўкі сталых норм і агульнага ўзбагачэння беларускай літаратурнай мовы, у асаблівасці мовы мастацкай прозы" [2, с. 5 – 6].

Вядомы беларускі літаратуразнаўца М. Мушынскі адзначае: "Гарэцкі належыць да ліку тых выдатных прадстаўнікоў беларускай культуры, якія ўнеслі велізарны ўклад у нацыянальнае прыгожае пісьменства і айчынную гуманітарную навуку, узнялі іх на новы, больш высокі ідэйна-мастацкі, эстэтычны і тэарэтыка-метадалагічны ўзровень. Сёння Гарэцкі – агульнапрызнаны класік беларускай літаратуры, адзін з самых таленавітых пачынальнікаў нацыянальнай мастацкай прозы… <…>

Асобнай гаворкі заслугоўвае дзейнасць Гарэцкага-публіцыста, арганізатара выдавецкай спра-

вы, лексікографа, перакладчыка, прапагандыста вуснай народнай творчасці" [3, с. 3, 5].

Дзіўна, што вучоныя да сённяшняга часу не адзначаюць, што Максім Іванавіч з пачатку творчага шляху быў таленавітым беларусазнаўцам, што ён зрабіў у беларусазнаўства велізарны ўклад, які і цяпер яшчэ не атрымаў належнай, сапраўды глыбокай і ўсебаковай ацэнкі.

…Увосень 1909 г. 16-гадовы Максім Гарэцкі паступіў у Горы-Горацкае каморніцка-аграномічнае вучылішча, хоць конкурс быў вельмі вялікі: толькі 25 месцаў пры 400 заявах. Стрыечны брат вядомага авіяканструктара Паўла Сухога аграном Андрэй Сухі, які вучыўся разам з Максімам, успамінаў: «Я неяк адразу вылучыў Максіма па яго сур'ёзнасці ў кожнай справе і адносінах да сяброў. У скорым часе злучыла і супольная цікавасць да беларускага друкаванага слова. <…> Максім Гарэцкі адзін з першых сярод нас пачаў пісаць па-беларуску карэспандэнцыі і малыя апавяданні з жыцця магілёўскіх сялян, адсылаючы іх у рэдакцыю "Нашай Нівы". <…> Варта паслухаць яго гутарку, нашу мову, якая гучала ў яго вуснах, як песня, каб запомніць яго на ўсё жыццё» [4, с. 63 – 65].

Невялікія нататкі, допісы, фельетоны М. Гарэцкага друкаваліся ў "Нашай Ніве" за подпісамі *М. Б.*, *Беларус*, *М. Беларус* і *Максім Беларус*. Першая такая нататка з'явілася ў "Нашай Ніве" 26 верасня 1912 г. Сапраўднае прозвішча аўтар паставіў толькі на кнізе "Рунь" (1914, Беларускае выдавецкае таварыства ў Вільні).

У ліпені 1914 г. у часопісе "Украинская жизнь" з'явіўся артыкул "Белорусское возрождение" М. Багдановіча, дзе ён прыгадваў кнігу "Рунь" М. Гарэцкага, а яе аўтара адносіў да людзей, якія ўжо тады займалі прыкметнае месца ў беларускай культуры, нямала зрабілі для развіцця беларускага нацыянальна-вызваленчага руху і былі віднымі дзеячамі нацыянальнага адраджэння: "Менавіта дзякуючы іх стойкасці і самаадданасці, беларускі рух, які знайшоў цяпер цвёрдую апору ў шырокіх кадрах беларускай інтэлігенцыі, вытрымаў увесь цяжар першых гадоў свайго існавання, набыў сваё цяперашняе ідэйнае аблічча і нябуйнымі, але глыбокімі, несціральнымі літарамі ўрэзаў сваё імя на скрыжалях сусветнага прагрэсу" [5, с. 34].

Ужо ў самым пачатку творчага шляху М. Гарэцкі паказаў сябе эрудыраваным пісьменнікам, які добра ведаў творчасць такіх волатаў рускай, украінскай і польскай літаратур, як А. Пушкін і М. Гогаль, Л. Талстой і Ф. Дастаеўскі, Т. Шаўчэнка і А. Міцкевіч, глыбока разумеў іх выключную ролю ў духоўным жыцці сваіх нацый, востра адчуваў патрэбы літаратурнага развіцця беларусаў. Пра гэта можна меркаваць

Максім і Гаўрыла Гарэцкія. 1926 г.

з двух праграмных артыкулаў, апублікаваных Максімам Іванавічам у 1913 – 1914 гг.: "Наш тэатр" і "Развагі і думкі". У іх ён упершыню выявіў сябе як тэарэтык-публіцыст, зацікаўлены праблемамі развіцця нацыянальнай культуры, тэатра, літаратуры, мовы.

Нельга не згадзіцца з меркаваннямі літаратуразнаўцы Д. Бугаёва: «…галоўны пафас гэтых артыкулаў зусім выразны і канкрэтны – абарона права народа на сваю нацыянальную культуру. У тыя часы… гэта была вельмі актуальная задача, бо якраз у праве на самастойнае нацыянальнае развіццё, на будаўніцтва ўласнай нацыянальнай культуры адмаўлялі беларусам, з аднаго боку, рускія чарнасоценцы на чале з царызмам, а з другога – польскія шавіністы. І тыя, і другія ўпарта не хацелі прызнаць беларусаў народам, самастойнай, самабытнай нацыяй, няхай сабе і вельмі блізкай, роднай такім братнім славянскім народам, як рускія, украінцы або палякі…

Артыкул "Наш тэатр" непасрэдна ставіць пытанне аб ролі тэатра ў нацыянальна-вызваленчым руху, у беларускім адраджэнні, у развіцці самасвядомасці беларускага народа. Але аўтар разам з тым закранае і многія іншыя пытанні. Ён імкнецца вызначыць асобныя рысы нацыянальнага характару беларусаў, абгрунтоўвае думкі пра добрую змястоўнасць, яркасць і каларытнасць народнай мовы, сцвярджаючы тым самым, што наш народ гэтак жа, як і кожная нацыя, мае свае вялікія вартасці… не бяднейшы за любы другі народ» [2, с. 29 – 31].

Нельга без хвалявання чытаць наступныя радкі: «*Каб прыдумаць і сказаць ладную беларускую прыказку, – трэба мець мастацкую і глыбокую душу. Трэба быць артыстам, відзячым чалавека і жыццё наскрозь з аднаго погляду…*

А трэба паказаць беларусу са сцэны, што так жыць, як ён жывець, няможна, гэткага жыцця няможна трываць…

І трэба яшчэ паказаць беларусу са сцэны, што ён – чалавек і што ён павінен мець чалавечы гонар. І павінен дзетак сваіх гадаваць з сумленнем…

І трэба паказаць беларусу са сцэны, што ён маіць слаўнае прошлае…

І трэба паказаць беларусу са сцэны, што за чалавек той, каторы спіць без канца краю, якой вартасці гэты чалавек і што жджэць яго ў будучыні…

Тэатр наш павінен стаць храмам Нашага Адраджэння… <…>

Трэба, каб са сцэны беларускага тэатра палілася беларуская песня, каб ад яе павеяла на людзей араматным пахам беларускай народнай паэзіі, каб пачулася ў ёй турлычлівая песня жаўраначка пад вясеннім небам над зялёнай рунню, каб у ёй пачуўся і далёкі спакойна-тужлівы гук бяроставаў трубы хлопчыка, што кароў пасе каля рэчкі, і шум бясконцых лясоў непраходных, і "шэпты спелых каласоў"…» [6, с. 17 – 18, 22 – 23].

Ацэньваючы раннюю творчасць М. Гарэцкага, Алесь Адамовіч адзначыў: «Аказалася, што ў маладога 20-гадовага студэнта-каморніка ёсць цэлая праграма грамадскай, культурнай дзейнасці. Ёсць свой, вельмі ж своеасаблівы погляд на беларускі нацыянальны характар, на тое, як пісаць і што пісаць, разуменне, што ёсць, а чаго няма ў маладой беларускай літаратуры…

Першыя ж артыкулы яго – "Наш тэатр", "Думкі і развагі" здзіўляюць нечакана сталым клопатам пра лёс нацыянальнай культуры, літаратуры, інтэлігенцыі, народа. Аказалася, што маладому каморніку з Малой Багацькаўкі ёсць што сказаць аб справах і клопатах зусім не мясцовых.

Ролю беларускага літаратара малады Максім Гарэцкі расцэньвае як нешта вельмі адказнае, высокае, што патрабуе ад чалавека вялікай грамадзянскай, нацыянальнай свядомасці, але ёй чужая правінцыяльная замкнёнасць.

У артыкуле "Наш тэатр", напісаным трохі "біблейскім", трохі "пароцкім" стылем, выказваецца яго высокае разуменне той ролі, да якой беларускім літаратарам, беларускай літаратуры трэба дарастаць – раўняючыся на Купалу, на Коласа раўняючыся…

Бачыце (гаворка ідзе пра выказванне М. Гарэцкага, што тэатр наш павінен стаць храмам Нашага Адраджэння. – ***Э. І.***) – гэта як бы купалаўскае "А хто там ідзе?", звернутае стылем, пафасам да самой літаратуры.

Чалавек з вясковай прагай бярэ тое, што дае яму адукацыя, кніга, і ўсё гэта не адгароджвае яго ад свайго, ад народнага, забыта-нацыянальнага, а наадварот толькі павышае нацыянальна-культурную ацэнку і самаацэнку…» [7, с. 18 – 19].

У 1918 г. у Вільні выйшла ў свет кніга палітычнага дзеяча і літаратурнага крытыка Антона Луцкевіча "Нашы песняры: Літаратурна-сацыяльныя нарысы". Яе артыкул "Ідэолаг народнае інтэлігенцыі" прысвечаны М. Гарэцкаму, якога А. Луцкевіч лічыць "найглыбейшым з ідэолагаў беларускае адраджэнскае народнае інтэлігенцыі". Крытык паважае яго як "натуру абдараную, чуткую і адзыўчывую на ўсё, што робіцца навокал". Менавіта гэтым аўтар тлумачыць няспынныя пошукі пісьменнікам свайго ідэалу: "Гарэцкі асабліва востра перажывае і шуканьне грамадзкага ідэалу, і захапленьне агульналюдскімі пытаньнямі і містычнымі настроямі, і ўрэшце даходзіць да яўнага нацыянальнага ідэалу".

Перад намі паўстае вобраз трохі нечаканага М. Гарэцкага – фанатыка беларускай справы: "Беларуская нацыянальная справа, справа нацыянальнага адраджэньня беларускага народу – гэта найвышэйшы дагмат грамадзкае рэлігіі Гарэцкага". А. Луцкевіч падтрымліваў М. Гарэцкага ў памкненні сінтэзаваць духоўнае і нацыянальнае, бачыў менавіта гэты шлях перспектыўным для адраджэння беларускага народа.

У лістападзе 1917 г. М. Гарэцкі прыехаў у Смаленск. Менавіта тут у 1918 г. быў выдадзены "Руска-беларускі слоўнік" братоў Гарэцкіх, пазней кніга выйшла ў Вільні (1921). У прадмове напісана: «*Знібеіць сэрца за розныя падзеі і да працы гукаіць, бо ўсякая наша бава а маруда надаюць сораму ад іншых народаў і нясуць кару – сканання мовы бацькоўскае ці, маўляў, душы беларускае, хаця ж уціскі незлічоныя мы вытрывалі, і ўжо здавалася, нібы то і сонца ў ваконца бліснула. "Каб не памёрлі" – загадаў наш пясняр-нябожчык*». Гэта першы беларускі слоўнік такога тыпу, надрукаваны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, і першы вопыт пісьменніка ў галіне лексікаграфіі, паспяхова прадоўжаны ў наступныя гады. Так, М. Гарэцкаму належыць яшчэ "Невялічкі беларуска-расійскі слоўнік" (Вільня, 1919), які меў тры выданні (апошняе называлася "Беларуска-расійскі слоўнічак", выйшла ў Савецкай Беларусі ў 1925 г.).

З жонкай і дзецьмі Леанідам і Галінай. 1923 г.

Складзены М. Гарэцкім разам з М. Байковым “Практычны расійска-беларускі слоўнік” на 20 тысяч слоў з’явіўся ў Мінску ў 1924 г. Праз два гады Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі выпусціла дапоўненае выданне гэтай грунтоўнай працы. Яе аўтары ставілі перад сабой задачу *“даць практычную дапамогу пры пераходзе на беларускую мову ў выкладанні навук у беларускіх школах і вядзенні спраў у беларускіх дзяржаўных, грамадскіх і кааперацыйных установах”* [8, с. 3]. Кідаючы агульны погляд на гісторыю нашага моўнага развіцця, складальнікі слушна падкрэслівалі, што старая беларуская літаратурная мова была высока культурная для свайго часу і з’яўлялася дзяржаўнай у Вялікім Княстве Літоўскім.

Двухмоўныя перакладныя слоўнікі М. Гарэцкага адпавядалі канкрэтным патрэбам дня і звычайна прыхільна ацэньваліся сучаснікамі, у тым ліку спецыялістамі-філолагамі. М. Гарэцкі працаваў як энтузіяст, кіруючыся пашанай і любоўю да мовы, клапоцячыся, каб жыло і развівалася, не траціла каларытнасці роднае беларускае слова. Слоўнікавыя працы М. Гарэцкага пакінулі прыкметны след у гісторыі беларускай лексікаграфіі, фактычна вызначыўшы цэлы этап яе станаўлення і развіцця.

З ліпеня 1919 г. Максім Іванавіч працаваў выкладчыкам беларускіх настаўніцкіх курсаў у Вільні і адначасова ў Віленскай беларускай гімназіі. Таксама ён выкладаў беларускую мову ў Праваслаўнай духоўнай семінарыі і рэдагаваў газеты прагрэсіўнага кірунку: “Беларускія ведамасці”, “Наша будучыня”, “Наша думка”.

У 1920 – 1926 гг. у Вільні, Маскве – Ленінградзе і Мінску выйшлі чатыры выданні “Гісторыі беларускае літаратуры” М. Гарэцкага. На працягу першага паслярэвалюцыйнага дзесяцігоддзя кніга служыла адзіным падручнікам для сярэдняй і вышэйшай школы. Выданне вылучаецца тонкасцю назіранняў, уменнем разглядаць літаратурныя з’явы на шырокім гістарычным фоне, вобразнасцю і даступнасцю выкладання. У “Гісторыі беларускае літаратуры” дадзены сістэматызаваны, глыбока навуковы і адначасна шырокадаступны аналіз тысячагадовага шляху беларускага прыгожага пісьменства – ад дахрысціянскай міфалогіі, старажытна-літаратурных помнікаў да творчых набыткаў пачатку 1920-х гг. Кніга насычана багатай фактурай, арыгінальнымі прыкладамі з літаратурных першакрыніц, характарызуецца цэласным спалучэннем літаратуразнаўчых і гісторыказнаўчых задач, прасякнута нацыянальна-патрыятычным пафасам і высокім мастацкім густам.

22 лістапада 1920 г. у “Нашай Ніве” змешчана рэцэнзія Антона Навіны (Антона Луцкевіча) на “Гісторыю беларускае літаратуры” М. Гарэцкага: «Мы горача вітаем працу М. Гарэцкага. Яна бясспорна мае вагу не толькі як учэбнік, але і як адзін з фактараў усведамлення “маладых” беларусаў, каторыя так мала ведаюць аб сваім народзе, аб яго гісторыі і літаратуры. Яна пакажа і нашым суседзям, якія культурныя скарбы меў і мае беларускі народ…

Яна павінна апынуцца ў руках кожнага свядомага беларуса, у кожнай бібліятэцы» [10, с. 79].

Праз 58 гадоў беларускі паэт і празаік М. Лужанін пісаў згодна з павевамі свайго часу: “І яшчэ адна акалічнасць вылучае згаданую работу: яна напісана вельмі проста – прачытаў старонку і адразу ж запомніў.

Гэта ўжо заслуга Гарэцкага-пісьменніка, ён умеў падаваць думку лаканічна і даходліва. Меў невычэрпны лексічны матэрыял і па-майстэрску валодаў народнай фразеалогіяй. Як ні шкада, але бесстаронні твар гісторыка засланіў ад многіх з нас жывое, своеасаблівае, багатае на адценні аблічча мастака” [1, с. 78 – 79].

Складзеная пісьменнікам грунтоўная і вельмі цікавая “Хрэстаматыя беларускай літаратуры. XI век – 1905 год” з’явілася ў 1922 г. Яна павінна была дапоўніць напісаны аўтарам гісторыка-літаратурны курс падборкай мастацкіх тэкстаў.

Тэксты для чытання і завучвання на памяць змяшчаліся М. Гарэцкім у 1921 г. і ў “Дэкламатары”. Акрамя таго, ён выпусціў некалькі зборнікаў “Беларускіх ведамасцей”, дзе перадрукаваў

найбольш істотныя мастацкія творы з аднайменнай газеты.

3 лютага 1922 г. Максім Іванавіч чатыры месяцы чытаў лекцыі на Беларускіх настаўніцкіх курсах у Дзвінску. 22 кастрычніка 1922 г. у Беларускай гімназіі ў Вільні М. Гарэцкі прачытаў лекцыю на тэму "Доктар Францыск Скарына", а ў пачатку лістапада – лекцыю пра В. Дуніна-Марцінкевіча.

На запрашэнне выдатнага расійскага і беларускага вучонага-славіста, рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта У. Пічэты М. Гарэцкі з сям'ёй у кастрычніку 1923 г. пераехаў у Мінск. Тут ён выкладаў беларусазнаўства навучэнцам рабочага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, а потым – выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры. Адначасова Максім Іванавіч стварыў гурток беларускай культуры на рабфаку БДУ. У студзені 1924 г. М. Гарэцкі наведаў Віцебск, дзе чытаў лекцыі па фальклоры. Ён выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Камуністычным універсітэце БССР у Мінску. З верасня 1925 г. праца ў гэтай установе стала асноўнай для М. Гарэцкага.

16 студзеня 1925 г. Народны камісарыят асветы БССР зацвердзіў новы склад правадзейных членаў Інстытута беларускай культуры, у які ўвайшоў і М. Гарэцкі.

Хоць пра лёс і творчасць пісьменніка-даследчыка напісана даволі шмат, перыяд працы Максіма Іванавіча ў Інбелкульце даследаваны недастаткова. Гэта кароткі, але вельмі плённы перыяд жыцця выдатнага беларусазнаўцы, які заслугоўвае асобнай кнігі.

Прывядзем толькі некаторыя фрагменты з фондаў Цэнтральнага навуковага архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і беларускага друку 1920-х гг.

4 лютага 1925 г. М. Гарэцкі і М. Байкоў узначалілі слоўнікавую камісію Інстытута беларускай культуры [11, воп. 1, адз. зах. 8].

8 лютага 1925 г. на агульным сходзе Інбелкульта абрана слоўнікавая камісія, старшынёй якой (часова) прызначаны М. Гарэцкі [11, воп. 2, адз. зах. 12].

9 лютага таго ж года адбылося пасяджэнне Прэзідыума Інстытута беларускай культуры, дзе слухалася пытанне пра фарміраванне яго секцый. У спісе, прыкладзеным да пратакола пасяджэння, пазначана, што М. Гарэцкі ўзначальвае мовазнаўчую і літаратуразнаўчую секцыі [11, воп. 2, адз. зах. 9].

Даследчык энергічна працягваў папярэднюю працу прапагандыста беларускай мовы і літаратуры. Пра гэта сведчыць беларускі друк сярэдзіны 1920-х гг. У лютым 1925 г. у Мінску Максім Іванавіч двойчы (у школе і народным доме) выступіў з лекцыяй "Беларуская мова і гісторыя беларускай літаратуры". У тым жа месяцы Народны камісарыят асветы Беларусі камандзіраваў яго ў Калінінскую акругу для чытання лекцый па беларусазнаўстве.

15 лютага 1925 г. адбылося пасяджэнне Правапісна-тэрміналагічнай камісіі Інбелкульта ў складзе Я. Лёсіка, М. Азбукіна і К. Міцкевіча (Я. Коласа). Для працы ў камісіі было вырашана запрасіць Я. Купалу, М. Гарэцкага і У. Чаржынскага [11, воп. 1, адз. зах. 9].

26 лютага таго ж года Максім Іванавіч прысутнічаў на сходзе камісіі па складанні слоўніка беларускай мовы.

30 сакавіка 1925 г. на агульным сходзе членаў Інстытута беларускай культуры быў зацверджаны склад літаратурнай камісіі, старшынёй якой абраны І. Замоцін, а сакратаром М. Гарэцкі. Акрамя таго, у склад Навуковай рады ад правадзейных членаў Інбелкульта дадаткова абралі К. Міцкевіча (Я. Коласа), М. Гарэцкага, В. Друшчыца і кандыдатам да іх – І. Луцэвіча (Я. Купалу) [11, воп. 1, адз. зах. 12].

У дакладзе прафесара І. Замоціна "Літаратурная камісія Інбелкульта ў працэсе працы над зборам твораў М. Багдановіча. Падрахункі і перспектывы", які датуецца не пазней за 12 лістапада 1925 г. занатавана: «…камісія пачала працу ў складзе старшыні праф. Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта І. І. Замоціна і сакратара – М. І. Гарэцкага ў палове сакавіка м[есяца] г. г. <…>

…Вехі працы былі вызначаны ў наступным відзе: 1) агульны агляд рукапісных і іншых матэрыялаў, 2) працы па чытанню і капіяванню рукапісаў, 3) працы па першапачатковаму адбору матэрыялаў для друку. Роўнаналежна з расчытваннем і перапіскай рукапісаў пачаліся розыскі друкаваных твораў паэта [Багдановіча], раскіданых па часопісам і газетам і іх перапіска для выдання; рабіліся гэтак сама спробы дадаткова адшукаць некаторыя новыя матэрыялы – творы Багдановіча, яго лісты, крытычныя і бібліяграфічныя матэрыялы аб ім і нарысы розных асоб, дзе прысутнасць іх можна было дапусціць. Напрыклад, была завязана перапіска з бацькам паэта, у выніку якой атрыманы не толькі некаторыя патрэбныя даведкі, але і некаторыя патрэбныя матэрыялы, напр. копіі артыкулаў і нататак паэта, надрукаваных ім у газеце: "Голас", зваротак да Антона Луцкевіча (Вільна) даў гэтак сама некаторыя даведкі адносна перакладаў з Верлена і інш.

Камісіяй складзен быў гэтак сама заклік да шырокіх колаў грамадзянства з просьбай дапамагаць у працы па збіранню твораў Багдановіча шляхам прысылкі матэрыялаў ці тых ці іншых

звестак аб паэце, зваротак быў надрукаваны ў газетах: "Звязда" і "Савецкая Беларусь".

3. Самы працэс працы камісіі адбываўся ў наступным парадку. Па-першае, была расчытана папка рукапісаў, абгарэўшых у час пажара ў Яраслаўлі. Расчытванне гэтых рукапісаў запатрабавала вялікай працы і напружанай увагі і нярэдка не толькі простым вокам, але і *праз павялічанае шкло* не ўдавалася ўстанавіць тэкст, *абгарэлыя краі* рукапіса пры гэтым рассыпаліся пры першым датырканні, а з попела аднаўляць тэкст было ўжо немагчыма. Дзякуючы *працы* М. І. Гарэцкага, часткова і Ул. Дубоўкі, камісія *расчытала* гэтую частку рукапісаў і не без вынікаў: была адрэдагавана да друку больш за дваццаць новых (яшчэ да цяперашняга часу нявыдрукаваных вершаў) Багдановіча, з якіх частка *зусім* закончаных, *а іншыя толькі* эскізы (нарысы), не пазбаўленыя аднак мастацкага значэння, пры гэтым перапісвалася з абгарэлае пачкі па магчымасці ўсё, што было магчыма разабраць для таго, каб не толькі выкарыстаць закончаныя творы паэта для друка, але і захаваць яго накіды і паасобныя радкі для будучага даследчыка яго стылю і паэтыкі ў шырокім сэнсе слова, застаўлялась без перапіскі тое, што цалкам не паддавалася расчытванню. *Апроч* абгарэлае пачкі, зазначаннай у сабранні рукапісаў паэта № 11, найвялікшую труднасць у сэнсе расчытвання прадстаўляла пачка № 1, якая змяшчае артыкулы ў прозе… Расчытванне пачкі № 1 было пачата М. І. Гарэцкім, но *ў хуткім часе* было пакінута з прычыны выхаду яго са складу камісіі [з 1 чэрвеня 1925 г.]» [12].

На ўрачыстым пасяджэнні літаратурнай камісіі Інстытута беларускай культуры, прысвечаным 20-годдзю літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы (май 1926 г.), М. Гарэцкі зрабіў даклад пра ролю песняра ў беларускім нацыянальна-культурным адраджэнні. Па яго прапанове сход ушанаваў маці і жонку паэта, якія прысутнічалі на мерапрыемстве.

Разам з кампазітарамі М. Аладавым і А. Ягоравым у пачатку 1925 г. Максім Іванавіч пачаў рыхтаваць зборнік "Народныя песьні з мэлёдыямі". У 1928 г. ён быў выдадзены Інбелкультам. Туды ўвайшло 318 песень, запісаных ад маці Максіма Ефрасінні Міхайлаўны Гарэцкай. Сярод іх малавядомая "Кума мая, кумачка". Яе мелодыю выкарыстаў М. Аладаў у оперы "Тарас на Парнасе", П. Падкавыраў – у Другім скрыпічным канцэрце, Р. Пукст – у Другой сімфоніі. Песню "Па гарохаўю, па ячанню" выкарыстаў Я. Цікоцкі ў оперы "Міхась Падгорны", М. Аладаў – у фінале "Квінтэта"; песню "Ты, чырвоная каліна" – кампазітар М. Крошнер у балеце "Салавей", Я. Цікоцкі – у Першай сімфоніі, Я. Глебаў – у Канцэрце для голасу з аркестрам [13, с. 86]. Кніга "Народныя песьні з мэлёдыямі" хутка стала бібліяграфічнай рэдкасцю.

З 1 лютага 1926 г. Максім Іванавіч працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. З 1 кастрычніка 1927 г. яго прызначылі дацэнтам кафедры беларусазнаўства ў гэтай акадэміі.

У лютым 1926 г. М. Гарэцкі выступіў на III Усебеларускім краязнаўчым з'ездзе з дакладам "Збіранне і апрацоўка фальклору".

Вялікі рэзананс меў яго даклад "Нашаніўскі перыяд у беларускай літаратуры", зроблены 18 лістапада 1926 г. на Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі.

Мала каму вядома, што ў чэрвені 1927 г. М. Гарэцкі быў прызначаны "старшынёй выпытальнай камісіі па беларускай мове" Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі [14, арк. 27].

Нельга не згадзіцца з думкай акадэміка Радзіма Гарэцкага, што М. Гарэцкі стварыў моцную кафедру, на якой працавалі Юрка Гаўрук, Паўліна Мядзёлка, Навум Сапранкоў. Усе – актыўныя сябры аршанскай філіі "Маладняка". Пісьменнік многа дапамагаў ім, не толькі парадамі, але і ўдзелам у літаратурных вечарах.

Член-карэспандэнт НАН Беларусі Міхась Ганчарык, блізкі з братамі Гарэцкімі, у размове з аўтарам гэтых радкоў адзначыў: "Максім Іванавіч аказаў значны ўплыў на фарміраванне светапогляду і станаўленне творчасці такіх маладнякоўцаў, як Тодар Кляшторны, Юлій Таўбін, Васіль Каваль, Алесь Вечар, Уладзіслаў Прыбыткоўскі, Герасімовіч, Аляксееў".

Праз шмат гадоў Ю. Гаўрук успамінаў: "Гарэцкі вельмі любіў выкладаць мову. <…> У той час выходзіла вельмі многа сельскагаспадарчых брашур па самых розных пытаннях земляробства, жывёлагадоўлі. Усе яны ў значнай колькасці траплялі ў сельскагаспадарчую акадэмію. Студэнты перакладалі гэтыя брашуры з рускай мовы і тым самым засвойвалі тэрміналогію і набывалі практыку перадачы думак па-беларуску. Мы кантралявалі гэты пераклад, памылкі перакладу аналізавалі ў аўдыторыі… <…> Яго падтрымлівала незвычайная вернасць, адданасць літаратуры, навуцы, народу свайму беларускаму…" [4, с. 75 – 79].

2 кастрычніка 1928 г. Максім Іванавіч быў прызначаны вучоным спецыялістам Інстытута навуковае мовы Інстытута беларускай культуры, пасля пераўтварэння Інбелкульта ў Беларускую акадэмію навук у студзені 1929 г. ён заставаўся на гэтай пасадзе. Адначасова пісьменнік з'яўляўся кіраўніком дыялекталагічнай

камісіі і, магчыма, быў у экспедыцыі на Гомельшчыне.

Мала каму вядома, што М. Гарэцкі не баяўся выступіць у абарону пісьменнікаў, арыштаваных органамі АДПУ. Так, 1 студзеня 1927 г. ДПУ БССР па абвінавачванні ў шпіянажы на карысць буржуазнай Польшчы быў арыштаваны беларускі драматург і тэатральны дзеяч, публіцыст і празаік Ф. Аляхновіч. Ён быў асуджаны на 10 гадоў высылкі на Салавецкія астравы.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь сярод матэрыялаў Прадстаўніцтва КПЗБ пры Камінтэрне захоўваецца ліст-хадайніцтва, скіраваны ў абарону Ф. Аляхновіча. Ён напісаны 10 лістапада 1927 г. М. Гарэцкім, які пасля пастановы бюро ЦК КП(б)Б аб немагчымасці ставіць пытанне пра перагляд прысуду па справе Ф. Аляхновіча зрабіў спробу ўзняць гэтае пытанне ў міжнародных арганізацыях. Ліст заканчваецца наступнымі словамі: *"Во имя революціонной справедливости, во имя чести человека, писателя, артиста. Во имя хоть коекаких заслуг в прошлом, во имя белорусской литературы и театра, из внимания советской власти к престарелой матери. К маленьким детям, – это дело нужно ещё раз тщательно пересмотреть"* [15].

10 снежня 1928 г. М. Гарэцкі разам з Я. Купалам, Я. Коласам, З. Бядулем, В. Ластоўскім, С. Некрашэвічам, Я. Дылам, У. Галубком, Ф. Ждановічам, М. Грамыкам падпісаў хадайніцтва старшыні СНК БССР М. Галадзеду ў абарону Ф. Аляхновіча.

Нягледзячы на некаторыя нападкі, творчасць М. Гарэцкага з 1928 г. атрымлівала высокую ацэнку. Так, у даследаванні "Максім Гарэцкі (спроба манаграфіі аб творчасці)", апублікаваным у часопісе "Узвышша", Антон Адамовіч адзначыў: "Мы ўжо не кажам тут аб значэньні М. Гарэцкага як першага пісьменніка выключна празаіка ў нашай літаратуры, як першага пісьменніка-псыхолінгвіста, як першага стварыцеля вялікіх рэчаў у гэтай літаратуры… Мы ня можам маўчаць пра значэньне М. Гарэцкага як выяўляльніка пануючага тыпу эпохі беларускага адраджэньня, якое адно дае права на пачэснае месца ў гісторыі літаратуры гэтай эпохі" [16, с. 32, 213].

Прайшло больш за 70 гадоў пасля гэтай ацэнкі. У другім томе фундаментальнага акадэмічнага выдання "Гісторыя беларускай літаратуры XX ст." адзін з самых аўтарытэтных беларускіх літаратуразнаўцаў М. Мушынскі так характарызаваў асобу Максіма Іванавіча: "Максім Гарэцкі належыць да ліку выдатных дзеячоў беларускай культуры. Яго творчасць уяўляе змястоўную і яскравую старонку ў гісторыі нацыянальнага прыгожага пісьменства. М. Гарэцкі – асоба надзвычай шырокага творчага дыяпазону – таленавіты мастак слова, адзін з пачынальнікаў беларускай прозы, буйны вучоны, гісторык і тэарэтык літаратуры, палымяны публіцыст, нястомны змагар за нацыянальнае адраджэнне, клапатлівы педагог, арганізатар літаратурнага руху, лексікограф, перакладчык, збіральнік і прапагандыст вуснай народнай творчасці. М. Гарэцкі – гэта гонар і сумленне беларускай нацыі, яе духоўны настаўнік, які ўнёс велізарны ўклад у фарміраванне нацыянальнай свядомасці беларусаў" [17, с. 381 – 426].

Трэба дадаць, што Максім Гарэцкі быў унікальным беларусазнаўцам і цяжка пераацаніць яго ўнёсак у беларускае і сусветнае беларусазнаўства.

Спіс літаратуры

1. **Лужанін, М.** З ранку да вечара / М. Лужанін. – Мінск, 1978.
2. **Бугаёў, Д.** Максім Гарэцкі / Д. Бугаёў. – 2-е выд., выпр. і дап. – Мінск, 2003.
3. **Мушынскі, М.** Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі : жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага / М. Мушынскі. – Мінск, 2008.
4. **Максім Гарэцкі** : Успаміны, артыкулы, дакументы. – Мінск, 1984.
5. **Багдановіч, М.** Творы / М. Багдановіч. – Менск, 1928. – Т. II.
6. **Гарэцкі, М.** Наш тэатр / М. Гарэцкі // Калядная пісанка. – Вільня, 1913.
7. **Адамовіч, А.** "Браму скарбаў сваіх адчыняю…" / Алесь Адамовіч. – Мінск, 1980.
8. **Байкоў, М.** Практычны расійска-беларускі слоўнік / М. Байкоў, М. Гарэцкі. – Мінск, 1924.
9. **Гарэцкія чытанні** : матэрыялы дакладаў і паведамленняў на Сёмых, Восьмых, Дзевятых, Дзесятых чытаннях. – Мінск, 2002.
10. **Луцкевіч, А.** Выбраныя творы : праблемы культуры, літаратуры і мастацтва / А. Луцкевіч. – Мінск, 2006.
11. **Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі**. – Ф. 67.
12. **Літаратурны музей Максіма Багдановіча.** – КП 8980. – Машынапіс з праўкамі В. Ф. Мачульскага фіялетавым чарнілам.
13. **Гарэцкі, Р.** Браты Гарэцкія / Р. Гарэцкі. – Мінск, 2008.
14. **Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці.** – Фонд 536. – Воп. 2. – Спр. 97.
15. **Скалабан, В.** "У імя беларускай літаратуры і тэатра" : Невядомы ліст Максіма Гарэцкага / В. Скалабан // Літаратура і мастацтва. – 1996. – 26 студз.
16. **Адамовіч, А.** Максім Гарэцкі (Спроба манаграфіі аб творчасьці) / Антон Адамовіч // Да гісторыі беларускай літаратуры. – Менск, 2005.
17. **Мушынскі, М.** Максім Гарэцкі / М. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. – Мінск, 1999. – Т. 1.

Эмануіл ІОФЕ,
прафесар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, доктар гістарычных навук.

Скрыжаванні

ЯКУБ КОЛАС І МАКСІМ ГАРЭЦКІ

Якуб Колас і Максім Гарэцкі – шматгранныя творчыя асобы. Яны ўвайшлі ў гісторыю нацыянальнай культуры і як літаратары (класікі прыгожага пісьменства), і як навукоўцы, грамадскія дзеячы. Асаблівай увагі заслугоўваюць іх педагагічныя і навуковыя набыткі, а таксама чалавечыя ўзаемаадносіны.

Пасля заканчэння ў 1902 г. Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі К. Міцкевіч працаваў школьным настаўнікам на Палессі. Малады педагог адчуваў патрэбу ў стварэнні беларускіх школ і забеспячэнні іх падручнікамі. За ўдзел у настаўніцкім з'ездзе і рэвалюцыйнай барацьбе К. Міцкевіча пазбавілі права працаваць настаўнікам. 1 верасня 1906 г. газета "Наша Доля" змясціла верш "Наш край" – першы друкаваны твор Я. Коласа. Зімой 1906 – 1907 гг. ён жыў у леснічоўцы Смольня, дзе нелегальна адкрыў прыватную школу. Тут ён рыхтаваў "Другое чытанне для дзяцей беларусаў" (выйшла ў 1907 г. у Пецярбургу).

З 1907 да 1908 г. Я. Колас працаваў у газеце "Наша Ніва" ў Вільні, загадваў літаратурным аддзелам, змяшчаў і ўласныя творы (вершы, публіцыстыку). У допісе "Беларуская мова ў казённай школе" Я. Колас ставіў пытанне: «*…як беларусам далі права гаварыць і пісаць на сваёй мове і як паявілася першае беларускае пісанае слова, багата знайшлося працаўнікаў беларускай мовы. …Адкуль жа гэтакія нападкі на беларускую мову? Што іх парадзіла? Чаму беларуская мова "мёртвая" мова? Чаму рэжа яна вушы нават таму ж самаму беларусу, каторы выйшаў з простага народа, інтэлігенту-беларусу?*» [7, т. 12, с. 303]. Я. Колас шукае адказ, выяўляе вытокі з'явы: *"Маленькі хлопчык-беларус вучыцца ў школе… Ці чуе ж ён там сваё роднае слова? Не, ён чуе адну толькі насмешку над сваёю моваю; а забудзецца часта, вырвецца ў яго сваё роднае слова, тое слова, каторым прывык ён ад пялёнак гаварыць з таткаю і з маткаю, – вучыцель, а за ім і ўсе вучні, падымаюць яго на смех"* [7, т. 12, с. 303].

Турэмнае зняволенне, Першая сусветная вайна, служба ў арміі, Аляксандраўскае вайсковае вучылішча, удзел у ваенных дзеяннях на Румынскім фронце надоўга адарвалі Я. Коласа ад творчай і педагагічнай дзейнасці, разлучылі з Беларуссю.

У 1921 г. Я. Колас вярнуўся на Радзіму, выкладаў у Беларускім педагагічным тэхнікуме і БДУ. У 1923 г. па даручэнні Наркамасветы БССР чытаў лекцыі па граматыцы і методыцы выкладання беларускай мовы на настаўніцкіх курсах у Слуцку. Неўзабаве падрыхтаваў і апублікаваў падручнік "Методыка роднай мовы" (1926) для настаўнікаў пачатковых і педагагічных тэхнікумаў. У прадмове чытаем: *"У той час, калі наша беларуская школа пераходзіць на выкладанне ў роднай мове і пробуе стаць на свае ўласныя ногі, паяўленне кожнага падручніка для школы, кожнай кнігі для школьнага ўжытку, – адным словам, кожная новая педагагічная літаратура як для вучняў, так і для настаўніка набывае асаблівае значэнне"* [7, т. 12, с. 315]. Я. Колас раскрывае велізарныя магчымасці, якія дае навучанне дзяцей на роднай мове: *"Гэтае навучанне робіцца крыніцай новых і глыбокіх выхавальных уплываў на ўвесь псіхічны стан вучняў: чытанне пашырае кругагляд дзіцяці, узбагачае ўспрымальную душу яго яркімі вобразамі і малюнкамі незнаёмага яму дагэтуль жыцця. Цераз кнігу дзіця набывае многа розных ведаў з розных навук. Скрозь адчыненыя дзверы роднай мовы льецца ў школу шырокая, магутная плынь, плынь асветы, людкуючы розум і пачуцці дзяцей"* [7, т. 12, с. 319].

10 лютага 1921 г. утварылася Навукова-тэрміналагічная камісія, дзе пачаў працаваць Я. Колас. 20 лютага 1922 г. на яе базе адчынілі Інстытут беларускай культуры. Я. Колас непасрэдна ўдзельнічаў у гэтым працэсе. У лісце да Я. Карскага ад 24/XI 1921 г. ён пісаў: *"У нас открывается Институт белорусской культуры, составляется штат, вырабатывается устав, подыскивается помещение…"* [7, т. 13, с. 30]. А 13 кастрычніка 1928 г. пастановаю Савета Народных Камісараў БССР Інбелкульт быў рэарганізаваны ў Беларускую акадэмію навук. З 1928 г. Я. Колас – акадэмік АН БССР, з 1929 г. – член Прэзідыума і віцэ-прэзідэнт АН БССР. У 1944 г. Я. Коласу прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі.

Максім Гарэцкі прыйшоў у літаратуру пазней за Я. Коласа. Друкавацца пачаў з 1912 г. Праз два гады ўжо меў зборнік апавяданняў "Рунь". Бурныя падзеі пачатку XX ст. уварваліся і ў яго жыццё. У 1914 г. пайшоў "вольнапісаным" у армію. У хуткім часе пачалася Першая сусветная вайна. У кастрычніку 1914 г. М. Гарэцкі атрымаў цяжкае раненне. Доўга лячыўся ў шпіталях. Пасля заканчэння Паўлаўскага вайсковага вучылішча ў Петраградзе адправіўся ў Іркуцк, потым у Гжацк. Зноў трапіў на фронт. Потым лячыўся ў Маскве і Жалезнаводску. Услед за рэдакцы-

яй газеты "Звезда" пераехаў на пачатку 1919 г. у Мінск, потым у Вільню.

У кастрычніку 1923 г. М. Гарэцкі вярнуўся з сям'ёй у Мінск. Паводле сведчання Галіны Гарэцкай, дачкі пісьменніка, «у лістападаўскі вечар 1923 г. прыйшоў да нас упершыню Якуб Колас, пазнаёміўся з мамай, запрасіў яе і бацьку ў тэатр на "Машэку" Я. Міровіча» [2, с. 23]. "Бацькі і Якуб Колас, – успамінала Г. Гарэцкая, – былі ў шчырых адносінах, хадзілі адзін да другога ў госці, чыталі свае творы, даравалі свае кніжкі" [2, с. 33]. У 1924 г. М. Гарэцкі пазнаёміў з Я. Коласам і брата Гаўрылу, які толькі што закончыў у Маскве Ціміразеўскую акадэмію.

Асветніцкія ідэі, цікавасць да фальклору, клопат пра лёс беларускай мовы Я. Коласа былі блізкімі М. Гарэцкаму, які захапляўся яго творчасцю з юнацтва. У ранніх артыкулах "Наш тэатр" (1913), "Развагі і думкі" (1914) пры абмеркаванні важных пытанняў, звязаных з нацыянальным адраджэннем, М. Гарэцкі ўздымаў і праблемы развіцця беларускай літаратурнай мовы. Ён пісаў: *"У нас жа так многа нарэчый, гутарак, асаблівасцей фанетыкі, што калі з часам з усяго гэтага паднімаецца нешта суцэльнастройнае, то што гэта будзе за харство, што гэта будзе за багацце, што гэта будзе за цікавасць, ой!"* [4, с. 196]. М. Гарэцкі выказваў меркаванне, што беларусы забылі сваю старажытную мову, яго хвалявала, што *"шмат дзе цяпер беларусы гавораць прыкрай мешанкай слоў беларуска-польска-рускіх"* [4, с. 175]. Ён заклікаў дзеячаў тэатраў, настаўнікаў, літаратараў *"дбаць аб гучнасці і чыстаце сваёй мовы"* [4, с. 175]. *"Сумна, калі ўсенародна калечыцца наша мова, сэрца весяліцца, калі чуем мову слаўную, правільную"* [4, с. 176], – пісаў М. Гарэцкі.

Гаўрыла Гарэцкі ў артыкуле "У вянок памяці Максіма Гарэцкага" напісаў: "Мой брат рупіўся аб пашырэнні беларускай мовы ў практычным ужыванні і выдаў некалькі кароткіх слоўнічкаў руска-беларускіх і беларуска-рускіх" [3, с. 233]. "Руска-беларускі слоўнік" (1918, Смаленск) Максім Гарэцкі падрыхтаваў разам з братам Гаўрылам.

З 1918 да 1926 г. М. Гарэцкі выдаў сем слоўнікаў. Ён шмат зрабіў для выпрацоўкі нормаў беларускай літаратурнай мовы, узбагачэння яе лексічнага складу, удасканалення стылістыкі, станаўлення і развіцця апавядальнай культуры нацыянальнай прозы, выпрацоўкі сістэмы вобразных сродкаў айчыннай публіцыстыкі.

Як і Я. Колас, М. Гарэцкі ўсведамляў пільную патрэбу беларускіх школ у стварэнні падручніка па гісторыі беларускай літаратуры. Ён склаў першы падручнік "Гісторыя беларускай літаратуры" (чатыры перавыданні, кожнае дапоўнена новым матэрыялам: 1920, 1921, 1924, 1926 гг.), падрыхтаваў і выдаў "Хрэстаматыю беларускай літаратуры. XI век – 1905 год" (1922).

Займаўся М. Гарэцкі і педагагічнай дзейнасцю. Працаваў выкладчыкам беларускіх настаўніцкіх курсаў у Вільні і адначасова ў 1-й Віленскай беларускай гімназіі. Выкладаў беларускую мову і літаратуру на рабфаку БДУ, у Камуністычным універсітэце БССР (1923 – 1926), Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках (1926 – 1928).

16 студзеня 1925 г. пастановай Наркамасветы БССР быў зацверджаны новы склад правадзейных членаў Інбелкульта, у які ўвайшлі Я. Купала, Я. Колас, Ц. Гартны, З. Бядуля, М. Чарот, М. Гарэцкі і інш.

Уваходзячы ў склад правапісна-тэрміналагічнай камісіі, дзе працавалі К. Міцкевіч (Я. Колас), Я. Лёсік, М. Азбукін, потым узначальваючы слоўнікавую (разам з М. Байковым), мовазнаўчую і літаратуразнаўчую камісіі, М. Гарэцкі часта перасякаўся па службовых справах з Я. Коласам. Пра гэта сведчаць пратаколы пасяджэнняў Прэзідыума Інбелкульта, Навуковай рады, агульных сходаў і секцый.

28 мая 1925 г. адбылося ўрачыстае пасяджэнне літаратурнай секцыі Інбелкульта, прысвечанае 20-годдзю літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы. З дакладам пра ролю Янкі Купалы ў беларускім нацыянальна-культурным адраджэнні выступіў М. Гарэцкі. Я. Колас прачытаў казку "Ноч, калі цвіце папараць". М. Гарэцкі, як і Я. Колас, сябраваў з Я. Купалам.

Навуковае супрацоўніцтва Я. Коласа і М. Гарэцкага дапаўнялася сумеснай педагагічнай дзейнасцю. Летам 1925 г. яны некаторы час у Мсціслаўскім педагагічным тэхнікуме чыталі лекцыі па граматыцы і методыцы выкладання беларускай мовы на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў.

Калі ў 1926 – 1928 гг. М. Гарэцкі два гады жыў у Горках, дзе ўзначальваў кафедру беларускай мовы і літаратуры Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі, ён перапісваўся з Я. Коласам, часам бачыўся. У лісце ад 14 верасня 1926 г. Марыя Міцкевіч (жонка Я. Коласа) паведамляла мужу, які адпачываў у Есентуках: «З тыдзень таму назад захадзіў Максім Гарэцкі і пакінуў табе на памяць "На імперыялістычнай вайне", толькі што выйшаўшую з друку» [6, с. 44].

У 1927 г. Я. Колас пабываў у Горках. Наконт прыезду ён паведаміў жонцы М. Гарэцкага Л. Чарняўскай у лісце ад 17.04.1927 г.: *"Глыбокапаважаная Ляонія Вусцінаўна! …Я думаю прыехаць у Горкі 24.04., бо іншага часу выбраць мне трудна. Выеду ў суботу 23.04. у 10 г. 50 м., а ў*

Горках буду 24 раніцаю. Прывітанне дзядзьку Максіму і мілым жанчынам-беларускам" [7, т. 12, с. 72].

Галіна Гарэцкая ўспамінала: «У красавіку 1927 г. наведаў Горкі Якуб Колас. У акадэмічным клубе была яму добрая сустрэча. На адной з вечарын спяяла мама Якубу Коласу дзве песні: "Не жаніўся я" і "Зара мая вячэрняя". Прыемна было ёй успомніць праз многа год аб гэтым» [2, с. 28 – 29]. З задавальненнем успамінаў пра сустрэчу і сам Я. Колас у лісце да Л. Чарняўскай ад 09.11.1927 г.

З верасня 1928 г. сям'я М. Гарэцкага зноў жыве ў Мінску. 2 кастрычніка М. Гарэцкі "прызначан вучоным спецыялістам Інстытута навуковае мовы Інстытута беларускае культуры. Пратакол пасяджэння Прэзідыума ІБК № 44 ад 2.10.1928. У студзені 1929 г. з рэарганізацыяй Інстытута беларускай культуры ў Беларускую акадэмію навук застаўлены на той жа самай пасадзе пры Беларускай акадэміі навук" [6, с. 55].

Цесныя творчыя і чалавечыя стасункі Якуб Колас да апошніх дзён жыцця меў з Гаўрылам Гарэцкім. Асабліва часта яны сустракаліся ў час працы ў Інбелкульце і ў Беларускай акадэміі навук. Г. Гарэцкі, як і яго брат Максім, у 1925 г. быў абраны правадзейным членам Інбелкульта (толькі па прыродазнаўчых навуках), з'яўляўся членам Управы і Навуковай рады гэтай установы (1927 – 1928). Паводле слоў яго сына Радзіма Гарэцкага, шмат асабістых намаганняў прыклаў Г. Гарэцкі і пры стварэнні Беларускай акадэміі навук. Дастаткова сказаць, што менавіта ім быў напісаны праект яе структуры… Ужо ў 28 гадоў Г. Гарэцкі – у ліку першых – зацверджаны акадэмікам Беларускай акадэміі навук. Ён стаў самым маладым акадэмікам за ўвесь час яе існавання [3, с. 15]!

У 1930 г. па сфабрыкаванай справе СВБ (Саюз вызвалення Беларусі) была арыштавана вялікая колькасць беларускіх інтэлігентаў. Не абмінула гэта і братоў Гарэцкіх, а таксама многіх з тых, з кім яны працавалі, сябравалі. М. Гарэцкага арыштавалі ў Мінску ў ноч з 18 на 19 ліпеня, Г. Гарэцкага – 24 ліпеня ў Хосце. Пры арышце М. Гарэцкага на яго кватэры быў праведзены вобшук, канфіскавана перапіска, шэраг кніг. Сярод іх падараныя М. Гарэцкаму Я. Коласам "Сымон-музыка" з надпісам *"Дарагому другу Максіму Гарэцкаму ад аўтара. Мінск. 12.09.1925 г."*, "Казкі жыцця" з надпісам *"Міламу Максіму Гарэцкаму ад Якуба Коласа. Мінск. 15.11.1928 г."* і інш.

Якуб Колас застаўся на волі, але і яму як віцэ-прэзідэнту Беларускай акадэміі навук, народнаму пісьменніку і проста грамадзяніну, чалавеку давялося перажыць нямала. Сярод арыштаваных былі яго калегі, адзінадумцы, сябры, сваякі.

Як віцэ-прэзідэнт Я. Колас прысутнічаў на пасяджэннях Прэзідыума Беларускай акадэміі навук, а яны ўсё больш нагадвалі разгляд судовых спраў. Так, напрыклад, 13 жніўня 1930 г. слухалася пытанне пра "заарыштаваных" навуковых спецыялістаў У. Бялькевіча і М. Грамыку (пратакол № 20) і пра зняцце з адказных пасад у БАН акадэмікаў С. Некрашэвіча, Я. Лёсіка, В. Ластоўскага (пратакол № 21) [1, воп. 2, адз. зах. 6].

А 19 кастрычніка 1930 г. адным з пытанняў чарговага пасяджэння Прэзідыума БАН было: "Аб пераводзе аспіранта т. Бэндэ ў навуковыя супрацоўнікі". Пастанавілі: "Прымаючы пад увагу, што т. Бэндэ да самастойнай навуковай працы падрыхтаваны, перавесці т. Бэндэ з 1 лістапада ў навуковыя працаўнікі па кафедры літаратуры без існуючага ў Акадэміі парадку пераводу" (пратакол № 28) [1, воп. 1, адз. зах. 6].

Як бачым, навукоўцы павінны былі прымаць рашэнні пра звальненне акадэмікаў і прыняцце на працу ў Беларускую акадэмію навук такіх, як Л. Бэндэ, чые артыкулы пра многіх беларускіх пісьменнікаў паслужылі падставай для іх арышту.

Самога Я. Коласа ў 1930-я гг. прадстаўнікі вульгарна-сацыялагічнай крытыкі (у тым ліку і Л. Бэндэ) беспадстаўна абвінавацілі ў нацдэмаўшчыне, ідэалагізацыі кулацтва, хутарской гаспадаркі, апяванні месіянскай ролі інтэлігенцыі. Сваякі Я. Коласа Я. Лёсік (дзядзька па мацярынскай лініі), А. Каменскі (родны брат жонкі Марыі Дзмітрыеўны) былі арыштаваны. Пагроза арышту вісела і над Я. Коласам.

Пасля арышту братоў Гарэцкіх Я. Колас падтрымліваў адносіны з іх сем'ямі, дапамагаў маральна і матэрыяльна, нягледзячы на тое, што гэта было небяспечна.

Дачка М. Гарэцкага з удзячнасцю ўспамінала: "Якуб Колас, даведаўшыся ад мамы ў 1931 годзе, што бацька наш паедзе на пяць гадоў у горад Вятку, стараўся суцяшаць, наведваў нас. Прыходзілі жонка яго Марыя Дзмітрыеўна і брат яе Аляксандр Дзмітрыевіч, Ванда Лёсік (Лявіцкая)" [2, с. 36].

Галіна Гарэцкая таксама засведчыла, што Леаніла Усцінаўна пісала ў Вятку мужу: "Кланяецца табе Жыта і ўсе краскі палявыя" (*Жыта* – Якуб Колас). Канстанцін Міхайлавіч прыносіў яблыкі з свайго саду, чытаў маме "Адшчапенца" [2, с. 36].

Калі Леаніла Усцінаўна прыняла рашэнне пераехаць разам з дзецьмі да мужа ў Вятку, сярод тых, хто праводзіў яе ў далёкі шлях, была і жонка Я. Коласа Марыя Дзмітрыеўна.

Вядома, што Л. Чарняўская перапісвалася з сям'ёй Я. Коласа. Пра гэта сведчыць ліст Марыі

Міцкевіч ад 24.11.1932 г.: "Дарагая Леаніла Юстынаўна! Вельмі прыемна было атрымаць ад вас ліст якраз 4-га лістапада, усё роўна як бы мы ў гэты дзень былі разам з вамі… Дзякуем за памяць і шчырыя пажаданні… Шкада, што Максім Іванавіч не надта здаровы, неяк гэтым часам усе падаліся здароўем. Колас улетку зусім было заняпаў… толькі цяпер пачынае прыходзіць да нормы…

Пакуль што пажадаю вам з найменшымі цяжкасцямі перажыць вяцкую зіму. Прывітанне і шчырае дзякуй ад Коласа, ад брата і дзяцей. Хочацца ўбачыць Максіма Іванавіча здаровым і бадзёрым" [6, с. 71, 72].

Відавочна, Леаніла Усцінаўна ад імя сям'і павіншавала Я. Коласа з днём нараджэння.

Надзвычай ярка адметныя чалавечыя якасці Я. Коласа і М. Гарэцкага раскрыліся ў асабістым жыцці: яны стварылі трывалыя сем'і, выхавалі цудоўных дзяцей.

Высокая культура пачуццяў, узвышанае стаўленне да жанчыны ўласцівы былі сапраўдным беларускім інтэлігентам. Іх дзеці раслі ў атмасферы любові. Бацькі развівалі іх творчыя здольнасці, закладвалі маральна-этычныя асновы. Пра гэта можна даведацца з лістоў Я. Коласа і М. Гарэцкага, адрасаваных сем'ям.

Знаходзячыся на настаўніцкіх курсах у Слуцку, Я. Колас у лісце ад 23.07.1923 г. пісаў: "*Мілая, слаўная Марусечка і сыны! Цяпер я больш-менш з дакладнаю пэўнасцю магу сказаць табе, калі я прыеду ў Мінск да вас, мілыя дзеткі і слаўная жонка…*

Юрачкін подпіс чытаў з прыемнасцю. Ах, Юрачка! Як ты хораша пішаш! Сёння твае літары пакажу ўсяму Слуцку – няхай ведаюць, як хораша піша наш Юрка. Вось што, брат Юрка: еш ты болей і меней балей. Я хачу, каб ты паправіўся за гэты час, бо калі не паправішся, то не будзе як узяць цябе ў лес грыбы збіраць. А Данілачка мой – гаспадар. Я чуў, што ты, Данілка, гатуеш козам корм на зіму. Вось малайчына!" [7, т. 12, с. 43, 46].

Лісты М. Гарэцкага да жонкі і дзяцей, дасланыя з Вяткі, месца высылкі, прасякнуты любоўю, пяшчотай і глыбокай трывогай, адчуваннем віны, што ён па волі жорсткага лёсу не разам з імі, а таму не можа дапамагчы ім пераадолець цяжкія абставіны. Жонку ён называў *Цярплівай Ласкай*, а дзяцей – *парасткамі малымі*.

У лісце ад 26 лютага 1932 г. М. Гарэцкі пісаў: "*Галінка, дачушка мая любая! Што ж гэта ў цябе плечыкі няроўныя? Можа, мы вінаваты, а можа, ты сядзіш у школе няправільна. Старайся сядзець, пішучы і чытаючы, роўна. Але нічога, не клапаці. У мяне правае плячо вышэйшае – жыву. Што ты зробіш… І ты, Лёня, галубок, старайся сядзець роўненька. Сумна мне, падумаўшы, што не магу памагчы вам нічым. Калі вам гаворыць хто што-небудзь брыдкае, благому навучае, – вы не слухайце і пра ўсё маме расказвайце. Не бойцеся і не саромцеся, мама заўсёды зразумее вас і зробіць тое, што трэба для вас, для вашага ўзгадавання*" [4, с. 440, 441].

Пасля адбыцця тэрміну высылкі 21 ліпеня 1935 г. М. Гарэцкі быў вызвалены. З верасня ён працаваў выкладчыкам мовы і літаратуры ў поўнай сярэдняй школе г. Пясочні (з 1936 г. Кіраў Смаленскай, цяпер Калужскай вобласці). У ноч з 3 на 4 лістапада 1937 г. М. Гарэцкага зноў арыштавалі і асудзілі, а 10 лютага 1938 г. расстралялі ў Вязьме.

Вялікае гора аб'яднала сем'і Я. Коласа і М. Гарэцкага. На пачатку вайны прапаў без вестак сын Я. Коласа Юрый. Апошні ліст з фронту прыйшоў ад яго 20 верасня 1941 г. Леанід Гарэцкі загінуў у 1944 г. Пра гэтую страшную страту Я. Коласу напісаў Гаўрыла Гарэцкі (ліст ад 11 чэрвеня 1944 г.): "Дарагі Кастусь Міхайлавіч! Злы лёс не пакідае сям'ю Максіма. Адзіны сын яго, Леанід, 17 лютага 1944 г. забіты на Ленінградскім фронце, каля в. Косткава Шымскага раёна. Лёня загінуў ад кулі снайпера. Пахавалі яго ў лесе, у брацкай магіле на высокім беразе ракі Шалоні. Меў ён толькі 21 год. Скончыў вайсковую школу, быў лейтэнантам. Увесь час імкнуўся Лёня на перадавыя пазіцыі, загінуў на 4-ты дзень побыту на фронце" [3, с. 371].

Якуб Колас да канца дзён падтрымліваў цесную сувязь з Гаўрылам Гарэцкім. Вёў перапіску, сустракаўся, дапамагаў яго сям'і, а таксама дачцэ і жонцы Максіма Гарэцкага.

Архіўныя матэрыялы, эпісталярная спадчына нашых класікаў і іх родных узбагачаюць наша ўяўленне пра Якуба Коласа і братоў Гарэцкіх, а таксама пра той няпросты час, у якім ім давялося жыць.

Спіс літаратуры

1. **Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук.** – Фонд 1.

2. **Гарэцкая, Г.** Наша сям'я / Г. Гарэцкая // Максім Гарэцкі : Успаміны, артыкулы, дакументы. – Мінск : Маст. літ., 1984.

3. **Гарэцкі, Г.** Выбранае / Г. Гарэцкі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2002.

4. **Гарэцкі, М.** Творы / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1990.

5. **Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.** : у 4 т. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – Т. 1.

6. **Дасаева, Т. М.** Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага / Т. М. Дасаева. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993.

7. **Колас, Я.** Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас. – Мінск : Маст. літ., 1976 – 1977. – Т. 12, 13.

Таццяна ДАСАЕВА,
доктар філалагічных навук, прафесар.

Нацыянальны вобраз свету

МАСТАЦКІ СВЕТ РАННІХ АПАВЯДАННЯЎ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

Асаблівай засяроджанасцю на псіхалогіі чалавека вызначаецца філасофскі цыкл "Што яно?" Максіма Гарэцкага, лірычныя экспрэсіі "Патаёмнае", "Цёмны лес", "Стогны душы". Адметнасцю гэтых апавяданняў з'яўляецца завостраная ўвага да духоўнага жыцця простага беларуса, рэальны свет якога цесна звязаны з ірэальным, міфалагічным светам.

Ключавыя словы: *псіхалогія*, *архетып*, *міфалогія*, *магія*, *чараўнік*, *маральныя каштоўнасці*, *нацыянальная адметнасць*, *адраджэнне*.

Philosophical cycle "What is it?", lyrical expressions "Mysterious", "Dark wood", "Moans of soul" written by M. Goretskiy are dedicated to the pcychology of the person. Typical feature of these tales is an interest to spiritual life of the simple Belarusian, whose real world is closely connected with irreal, mythological world.

Ёсць на свеце змагары і падзвіжнікі, якія ўвасабляюць усе надзеі і памкненні свайго пакалення, сведчаць пра вернасць роднай краіне, народу. Такім падзвіжнікам, якому заўсёды будуць удзячны нашчадкі, быў і Максім Гарэцкі. Пісьменнік жыў на зломе эпох, у час сутыкнення інтарэсаў вялікіх дзяржаў, што менш за ўсё клапаціліся пра захаванне этнагенетычнага адзінства беларускага народа. У цяжкі для краіны час ён знайшоў адзінае выйсце ў аднаўленні беларускай культуры, абуджэнні нацыянальнай годнасці, самасвядомасці і самапавагі.

Знакавыя падзеі эпохі адлюстраваліся ў лёсах яго аўтабіяграфічных герояў. Духоўныя перажыванні многіх з іх паказаны ў той час, калі асабістае і грамадскае жыццё імкліва змянялася, калі пераглядаліся духоўныя каштоўнасці, паскаралася змена пачуццяў, настрояў і думак. Аўтар звяртае асаблівую ўвагу на супярэчнасць, няўстойлівасць, хаатычнасць псіхалагічных працэсаў, так званую дыялектыку душы.

Філасофская засяроджанасць на псіхалогіі чалавека ўласціва ўсёй творчасці пісьменніка, але найбольшы псіхалагізм характэрны для ранніх апавяданняў М. Гарэцкага. Перш за ўсё яны расказваюць свету пра беларуса і яго асяроддзе, яго краіну. У апавяданнях гістарычная прастора і час цесна звязаны з міфалагічным хранатопам. Герой М. Гарэцкага існуе ў двух вымярэннях: рэальным і ірэальным, што не супрацьпастаўляюцца, а ўзаемазвязаны і актыўна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой. Мастацкае наватарства класіка ў тым, каб паказаць духоўнае жыццё дарэвалюцыйнай вёскі (якімі думкамі жыве і чаму верыць просты беларус), каб сцвердзіць, што ў змаганні з голадам і нястачай народ не адмаўляецца ад спрадвечных маральных законаў, хрысціянскіх запаветаў, выкладзеных у Бібліі. Але шлях да самавызначэння і духоўнага адраджэння надзвычай складаны, бо хрысціянская мараль, як і ў наш час, суседнічае з язычніцкімі забабонамі, чорнай магіяй і чараўніцтвам. Пра гэта – філасофскі цыкл з гаваркой назвай "Што яно?", а таксама лірычныя экспрэсіі "Патаёмнае", "Цёмны лес", "Стогны душы".

Розныя шляхі вядуць да спазнання таямніц жыцця і смерці, сакрэтаў светабудовы, замагільнага свету. Адзін з іх паслядоўна разглядаецца ў апавяданні ***"Што яно?"***, напісаным у 1913 г. і ўпершыню надрукаваным у кнізе "Рунь".

Захапляе і ўражвае створаная аўтарам атмасфера ночы, калі правяць баль розныя страхі і пачвары: *"Месячна навокал, так месячна, і лезе нешта месячнае, тое маўкліва-незразумелае, лезе ў кволую душу, зваяваную прыгоствам няцямлівасці ўсяго, што тут спала блізка, на зямлі, і што было, нявідзімае, у паветры, і што, можа, мае душу ці пачаткі яе там, далёка, на другіх планетах Усясвету…"* [1, с. 91].

Аўтар адухаўляе месяц, як і ў народных уяўленнях, асэнсоўвае яго ў негатыўным плане. Герой апавядання Янка шукае адказу на спрадвечныя пытанні, для чаго з дапамогай Чорнай кнігі выклікае нячыстую сілу: *"Чорна на дварэ, анідзе святла ўжо няма, апоўначы ўжо. Чорную кнігу чытае Янка, дабіваецца-шукае адгадкі на пытанні-дамаганні свае… <…> І чуецца-думаецца Янку, што не вецер бярозавым галлём аб сценку б'е, а скрабецца той страшны чараўнік, што пры жыцці ваўком бегаў і па начах кажаном лётаў ды чалавецкую кроў ссаў у сонных немаўленнікаў, што гэта ён скрабецца ў хату, бо не мае спакою на тым свеце"* [1, с. 95].

А разам з чараўніком, чуецца Янку, ляціць змей: *"Ляціць… Клубок агнявы… Далёка асвяцілася ўсё. Шум вялікі і сіп. Бліжэй… Гукаюць на зямлю каменні, шпякае смуродная гразь… Грошы нясе… Вочы аграмадныя вылезлі, чырвоныя, клыкі-кляцы даўгія, шыя тоненькая… ці то крылле, ці то ногі з капытамі і рукі кіпцятыя…"* [1, с. 94].

У спрадвечных пошуках ісціны герой апавядання Янка звяртаецца да нячыстай, антыхрыставай сілы, хоча стаць чараўніком: "Чараўнік, Вядзьмак, Чарадзей, Калдун, Кудар, Чараўніца, паводле народных уяўленняў – чалавек, надзелены звышнатуральнымі (магічнымі) здольнасцямі, дзякуючы якім можа ўплываць на прыродныя з'явы, здароўе людзей і жывёл, ураджайнасць, ператварацца і ператвараць людзей у прадстаўнікоў навакольнага свету…" [2, с. 549]. Але за веды і сі-

лу трэба плаціць. Вось і чараўніку Янку надышла пара аддаваць даўгі. Павінен ён, як і ў традыцыйных павер'ях, так і ў апавяданні перадаць сваю сілу сыну або памерці ў страшэнных пакутах.

Такім чынам, аснову апавядання "Што яно?" складае міфалагічны вобраз чараўніка, падрабязнае апісанне яго магічных дзеянняў на шляху да спасціжэння сакрэтаў светабудовы. Заганасць такога шляху паказана ў развязцы твора: стары чараўнік памірае, праклінаючы ўвесь свой род. Але ёсць штосьці, што адрознівае апавяданне пісьменніка ад звычайнага апісання магічнага абраду: Янка прагне не багацця, а ведаў і за іх гатовы аддаць душу нячыстай сіле.

Вобраз чараўніка – надзвычай прываблівы для М. Гарэцкага міфалагічны архетып. Нездарма ён даследуе яго ў "Гісторыі беларускае літаратуры": *"Ведзьмакоў жа народ не любіў і баяўся, верыў, што па смерці яны ходзяць і робяць людзям усякае ліха, як і пры жыцці сваім. Бывалі выпадкі, што іх выкапвалі з могілак, адціналі галаву, прабівалі асінавым калом, закідвалі іх могілкі травою багуном. Усё гэта нібы давала рады супроць ведзьмакоў-нябожчыкаў"* [3, с. 20 – 21].

Выкарыстоўвае пісьменнік гэты вобраз і ў апавяданні пад назвай ***"Патаёмнае"***, упершыню надрукаваным пад такой назвай у часопісе "Варта" (1918, № 1). Цяжкая смерць чакае старога чараўніка, прыйшоў час плаціць за людскія крыўды: *"Ляжыць стары на лаве, ад святых абразоў вернецца. Счарнеў, як смоўж. І зубамі скрыгоча ад цярпення перадсмяротнага. Людскія слёзы яму адрыгаюцца. Надойдзе часіна, і з'явяцца нячысцікі са сваімі відэльцамі па душу бязбожную"* [1, с. 55].

Вакол красуе жыццё, але штосьці смутна-тужлівае не дае радавацца маладой свашачцы, якая едзе з вяселля. Штосьці страшнае, смутнае дзеецца ў вёсцы, і ці то бачыцца, ці то мроіцца ёй, як памірае стары чараўнік. Калі звярнуць увагу на міфалагічныя архетыпы, выкарыстаныя аўтарам, то можна заўважыць апазіцыю *жыццё – смерць*. Вяселле сімвалізуе нараджэнне новай сям'і, новага жыцця, усяго светлага і радаснага, у той самы час смерць, асабліва смерць чараўніка, – жудасная і смяротна небяспечная падзея. Выкарыстаныя архетыпы сімвалізуюць пакутлівую смерць старога ладу і нараджэнне новага жыцця, якому пакуль перашкаджаюць прымхі і забабоны.

Новага прагне і герой лірычнай экспрэсіі ***"Стогны душы"***, апублікаванай упершыню ў 1913 г. у "Нашай Ніве", але ён ужо хоча змагацца з Люцыпарам, парваць ланцугі, якія скаваў той для людзей: «*Я жыць хачу вольным жыццём – жыццём радасці, добрага, вясёлага смеху і ўсяго таго, што побач з другім творыць гармонію жыцця… Бо нездаволен, вельмі нездаволен… Як толькі стаў я мець сваё сумленне, маю вялікую ахвоту, думку сэрца, як бы выпаўзці самому і другіх вызваліць з гэтага жыцця. Бо ў ім навакол адны аграмадныя, гідкія камы бруду, бруду дрэннага, гнойнага… Я не хачу трываць!.. Я скіну, сарву ланцугі свайго старога жыцця і зраблю жыццё новае… Парву ланцугі спрадвечнай гульні-лені, ланцугі глуму, шальмоўства і страшэннай, аграмаднай цемнаты векавечнай, тыя ланцугі, што робяць з чалавека скаціну, быдлё, што твораць "паноў" і "мужыкоў". Ланцугі гэтыя выдумаў хіба сам Люцыпар, скаваў іх у сваей кузні і скрыўдзіў імі ўсіх людзей усяго свету, што жылі і паўміралі, што мадзеюць і цяпер, хварэючы ад гэтых ланцугоў*» [1, с. 58].

Лірычная экспрэсія – сапраўдны крык душы новага героя, які ўсім сэрцам жадае вызваліцца ад спрадвечных ланцугоў невуцтва і прыгнёту. Ланцугі трымаюць простага чалавека, не даюць яму выйсці ў людзі, здабыць адукацыю, а разам з ёй надзею на новае, лепшае жыццё. У апавяданні выкладзена асноўная думка, характэрная для ранняй творчасці пісьменніка, заснаваная на супрацьпастаўленні адукацыі і невуцтва, цёмнага і светлага жыцця адпаведна. Увасабленне цёмных сіл – Люцыпар, ён скаваў ланцугі бруду і шальмоўства, ён уладарыць душамі людзей гэтай "патаёмнай" старонкі, і цяжкая доля чакае таго, хто паспрабуе змагацца з ім. Нялёгка несці асвету ў край, дзе вераць у чараўнікоў і ваўкалакаў.

Такі край паўстае і на старонках апавядання ***"Цёмны лес"***, напісанага ў 1913 г. (раней яно было часткай апавядання "Патаёмнае"). Яно расказвае пра вытокі нацыянальнага менталітэту беларусаў, сведчыць пра іх нацыянальную адметнасць, сфарміраваную на працягу жыцця сярод дрымучых пушчаў і балот, дзе дагэтуль жывёлы і дрэвы маюць душу і размаўляюць паміж сабой. Герой апавядання звяртаецца да ваўка: *"Шпарка бегаеш ты, шэры воўк! Дуж ты на ногі, ходак на бягню, цягуч у дарозе…*

Ды не аббегаць табе, скараход-жывадзёр, не аббегаць табе за ўвесь ваўчыны век твой усіх абшараў старонкі гэтае патаёмнае, не пратаптаці табе сцежачак на ўсіх гэтых пушчах драмушчых…" [1, с. 55].

Дужы і шпаркі воўк і ў народных уяўленнях: "…у нашых продкаў было дваістае стаўленне да воўка: яго нараджэнне выклікана творчасцю і Бога, і чорта. Жывучы доўгія стагоддзі побач з воўкам, у значнай меры канкуруючы з ім у паляванні, чалавек здзіўляўся розуму воўка, яго вынослівасці, арганізаванасці зграі, сямейнай салідарнасці…" [2, с. 90].

Не выхадзіць *"зямелькі гэтае"* і буслу: *"І ты баўцян – магутнакрылы бусел-чарнагуз!*

Бачыў ты піраміды фараонаў егіпецкіх, у шкляной, бліскучай, люстранай вадзе Ніла гістарычнага глядзеўся ты, прыгажун! Праз нашага прадзеда, Дуная мнагаводнага, ляцеў ты, даўганогі, і многа старонак з рознымі людзьмі, не наскае веры, і гаворкі, і аблічча, бачыў ты.

А ніколі не выхадзіць ні табе, ні буслянятам тваім балот зямелькі гэтае захаванае…" [1, с. 56].

"Бусел, бацян, буська, шырока прадстаўлены ў беларускай міфалогіі, паводле якой гэта чалавек ці анёл, пакараны богам за цікаўнасць…" [2, с. 51].

Неабсяжныя балоты і пушчы, якія не аббегаць ваўку і не абысці буслу, – вось калыска беларускай народнасці, крыніца фарміравання нацыянальнага характару. Таямнічы і загадкавы гэты край, як і душа беларуса, дзе спрадвеку разгортваецца барацьба цёмных і светлых сіл. Змаганне дабра і зла яскрава паказана пісьменнікам на прыкладзе супрацьстаяння двух міфалагічных архетыпаў – ветру і дуба: *"То-го-го-гэй! – зазлаваўся вецер, што не пушчаюць яго дружныя дрэвы ў сваю сям'ю.*

Кінуўся ён, як шалёны, на старога дзеда лесавога, на магутны, караністы дуб, што быў тут старэйшы ва ўсім лесе: думаў зняцейку бэхнуць яго на бясконцае, бяздоннае балота, што цягнецца ў непраходны лес, немаведама куды.

– Ня руш! Не чапай! – толькі і прамовіў магутны дуб. Кінуўся на адзін момант да багны і ўзноў выпрастаўся. Абправіў сваё каравае суччо – і ўзноў задумаўся аб старадаўніх часах, калі аквячалі яго людзі славай і хвалай, і шукалі пад ім адказу на свае загадкі, і клятвы пад ім давалі" [1, с. 56].

Магутны дуб увасабляе краіну, якую імкнуўся спасцігнуць герой твора і сам аўтар. Характарыстыкі дрэва адпавядаюць традыцыйным уяўленням пра Сусветнае дрэва, або Дрэва жыцця. Карані яго ў падземным свеце, камель на зямлі, а галіны цягнуцца да неба. Яно быццам мост злучае зямлю і нябёсы, сімвалізуе смерць і адраджэнне, мудрасць і спрадвечныя законы сусвету. У апавяданні дуб атаясамліваецца і з самім чалавекам, што рукамі-галінамі засцерагае родную старонку, вядзе барацьбу з нячыстай сілай, прадстаўніком якой выступае вецер.

Як вядома, вецер – "з'ява прыроды, у традыцыйных уяўленнях нярэдка амбівалентная: гэта і магутная стыхія, супрацьпастаўленая нячыстай сіле, і ўласна яе параджэнне, увасабленне, калі вецер персаніфікуецца і дэманалагізуецца" [2, с. 80].

Насельнікі цёмнага лесу – русалкі, зязюля і асіна, без іх немагчыма ўявіць неабсяжную таямнічую краіну, намаляваную М. Гарэцкім. Няшчасная і горкая асіна, ніколі не ведаюць супакою яе лісточкі. Усё таму, што заўсёды нагадваюць пра жахлівае здрадніцтва Юды: "Вонкавая рыса асіны – яе трапяткое лісце – спарадзіла этыялагічны міф на хрысціянскай аснове. Паводле яго, асіна спала, калі на ёй павесіўся Юда… Прачнуўшыся, асіна вельмі спужалася вісельніка, затрэслася ад страху, і з тае пары лісце на ёй трапечацца нават без ветру" [2, с. 28].

Гэтаксама традыцыйна малюе М. Гарэцкі і вобраз русалак: *"Тамуча там, калі вясна мінаецца, калі над возерам пад бярозамі стромкімі, з высокімі макухамі ды галінамі доўгімі, гібкімі, гутаюцца русалкі белацелыя, з косамі чорнымі, з вачыма маркотна-шалёнымі.*

– Гу-у-та! Гу-та-а-шы! Гута-рэ-элі! – крычаць яны і гукаюць да сябе хлопца прыгожага, мужчыну слабавольнага" [1, с. 57].

А вось каб зразумець вобраз зязюлі, трэба ведаць незвычайны міф пра паходжанне птушкі, які фальклярыст прыводзіць у "Гісторыі беларускае літаратуры": «*Казка аб тым, адкуль зязюлька, расказвае, што страшны змей Цмок украў у маці сына Якуба. Ад вялікае тугі маці скінулась зязюлькаю, паляцела ў шчырыя бары і гукае сына: "Я-куб! Я-куб!" А сын ёй дзесь адказвае: "Я тут! Я тут!"*» [3, с. 23]. Вось чаму сумуе зязюля ў апавяданні М. Гарэцкага.

Аснову апавядання "Цёмны лес" складаюць апазіцыі міфалагічных архетыпаў, якія сімвалізуюць спрадвечную барацьбу цёмных і светлых сіл (*вецер – дуб*, *зязюля – цмок*) і дапаўняюцца міфалагічнымі вобразамі *ваўка* і *бусла*, *русалак* і *асіны*. Сам цёмны лес сімвалічна ўвасабляе Беларусь, край пушчаў і балот, адгадаць усе таямніцы якога не пад сілу нікому.

Аналіз апавяданняў дазваляе вылучыць наступныя асаблівасці ранняй прозы Максіма Гарэцкага:

1) філасофскі цыкл "Што яно?", а таксама лірычныя экспрэсіі "Патаёмнае", "Цёмны лес", "Стогны душы", аб'яднаны адной аўтарскай задумай – паказаць духоўнае жыццё простага беларуса, яго трывогі і надзеі, вытокі яго характару і нацыянальнай адметнасці;

2) шлях герояў да самаспазнання і адраджэння – гэта барацьба з цёмнымі сіламі невуцтва і забабонаў, якія трэба скінуць як спрадвечныя ланцугі, што выкаваў Люцыпар;

3) дзейныя асобы апавяданняў – міфалагічныя істоты: чараўнікі і ваўкалакі, жывёлы, птушкі і дрэвы, іх характарыстыка адпавядае народным уяўленням;

4) рэальная прастора і час суседнічаюць у апавяданнях з міфалагічным хранатопам, дзеянне адбываецца ў двух вымярэннях: рэальным і ірэальным, якія не супрацьпастаўляюцца, а ўзаемазвязаны і актыўна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой.

Спіс літаратуры

1. **Гарэцкі, М.** Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1984 – 1986. – Т. 1.

2. **Беларуская міфалогія** : энцыклапедычны слоўнік / С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск, 2006.

3. **Гарэцкі, М.** Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1992.

Алена ЯРМОЛЕНКА,
аспірантка Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 22.12.2012 г.

Віктар ЖЫБУЛЬ

“БУДУ СЛУХАЦЬ ПЕСЬНІ ВЕТРА…”

ДА 100-ГОДДЗЯ ПАЭТА І ПЕРАКЛАДЧЫКА АЛЕСЯ РОЗНЫ

Пра вёску Вішнеў (Вішнева) Валожынскага раёна (былое мястэчка Віленскай губерні) можна прачытаць, што менавіта тут нарадзіліся Шымон Перэс (1923 – 2007), сусветна вядомы ізраільскі палітык, прэзідэнт Ізраіля (абіраўся двойчы) і лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру 1994 г., а таксама Нахум Гольдман (1895 – 1982), грамадскі дзеяч, заснавальнік і старшыня Сусветнага яўрэйскага кангрэсу. Як высвятляецца, Вішнеў – радзіма яшчэ адной адметнай асобы – паэта і перакладчыка Алеся Розны [4]. Паводле паходжання ён таксама быў яўрэем, але цалкам прысвяціў сябе беларускай літаратуры – як і Вульф Сосенскі, Змітрок Бядуля, Ізраіль Плаўнік, Зяма Півавараў, Юлі Таўбін.

Сапраўднае імя паэта – Абрам. Нарадзіўся ён у 1913 г. (дакладная дата невядомая) у сям’і рабочага. Пазней сям’я пераехала ў Мінск, які ў некаторых крыніцах памылкова пазначаецца як месца нараджэння паэта. Яго бацька Ісак Розна рана памёр, і маці адна выхоўвала пяцярых дзяцей. Паэзіяй Алесь захапіўся яшчэ ў школьныя гады, дэбютаваўшы ў снежні 1926 г. у газеце “Чырвоная змена”. А ўжо ў наступным годзе пачаў дасылаць вершы ў часопіс “Беларускі піянер”. Праз рэдакцыю ён пазнаёміўся яшчэ з адным юным паэтам – Сяргеем Грахоўскім з Глуска, і паміж хлопцамі наладзілася перапіска. Пазней, у 1928 г., яны пазнаёміліся асабіста і яшчэ больш пасябравалі. І цяпер дзякуючы пераважна ўспамінам С. Грахоўскага мы можам аднавіць вобраз напаўзабытага паэта і ўдакладніць факты яго біяграфіі.

Закончыўшы сярэднюю школу, А. Розна паступіў у Лепельскі педагагічны тэхнікум, пазней нейкі час працаваў наборшчыкам у друкарні [2, с. 125, 127]. У 1932 г. яны разам з С. Грахоўскім паступілі на газетна-выдавецкае аддзяленне літаратурнага факультэта Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута. Адначасова з навучаннем юнакі працавалі ў рэдакцыі “Чырвонай змены” і займаліся літаратурнай дзейнасцю. Алесь Розна друкаваў вершы ў часопісе “Чырвоная Беларусь”, альманаху “Ударнікі” (зб. 2, 1932), газеце “Піянер Беларусі”, перакладаў на беларускую мову з нямецкай творы Г. Гейнэ, Ё. Бехера і Э. Вайнэрта, з рускай – А. Пушкіна і М. Лермантава, з польскай – А. Міцкевіча. Сябры па інстытуце захапляліся талентам, працавітасцю і альтруізмам Алеся. С. Грахоўскі ўспамінаў: “У 19 гадоў яго скроні ўжо серабрылі сівізной. Ён ведаў больш за ўсіх нас, але ніколі не падкрэсліваў свае перавагі: кожнаму стараўся памагчы, растлумачыць, параіць. Мы і студэнты старэйшых курсаў часта прасілі Розну прачытаць семінарскія або курсавыя работы. Ён не толькі рабіў заўвагі, а часам перапісваў цэлыя абзацы і раздзелы, выпраўляў стыль, а бывала, і арфаграфію. Дабрата, ласкавы гумар, чуласць і ўвага да таварышаў прыцягвалі кожнага, хто хоць раз сустракаўся з ім” [2, с. 126]. Пакінулі згадкі пра Алеся Розну і іншыя яго аднакурснікі: “Алесь или Абрам Розно. Он внешне самый незаметный среди нас – мал ростом, обычное лицо, такие лица не запоминаются. Но он чертовски талантлив и работящ” [8, с. 21], – пісаў Ілья Карцель. Яўгеніі Каплуновай А. Розна запомніўся “вастравумным, добрым і таленавітым хлопцам”, які прыдумляў сябрам забаўныя мянушкі, а ў сваіх лістах любіў пакідаць іранічныя подпісы кшталту *“Остаюсь в пребывании глубочайшего почтения”* [5, арк. 8 адв.; 6, арк. 22, 29 адв.].

Тады, у 1920 – 1930-я гг., сям’я Рознаў жыла ў Мінску па адрасе: вул. Чырвонаармейская, д. 27, кв. 2, у двух маленькіх пакойчыках. Як згадваў С. Грахоўскі, гэта быў “доўгі драўляны дом з мноствам дзвярэй і ганкаў” [2, с. 125]. Алесеў старэйшы брат Леанід вучыўся ў Політэхнічным інстытуце, сястра Міра – у Інстытуце народнай гаспадаркі, брат Аркадзь (Арон) працаваў на заводзе

"Камунар" (з 1934 г. Мінскі станкабудаўнічы завод імя С. М. Кірава), а самы малодшы – Моня – вучыўся ў музычнай школе і падаваў вялікія надзеі [11, арк. 22 – 22 адв.]. Сам Алесь Розна, закончыўшы пединстытут у 1935 г., заставаўся літаратурным супрацоўнікам "Чырвонай змены".

У 1936 г., у разгар сталінскіх рэпрэсій, органы НКУС сфабрыкавалі справу, паводле якой у пединстытуце ў 1-й палове 1930-х быццам бы існавала "падпольная контррэвалюцыйная нацыянал-дэмакратычная арганізацыя" [1, с. 398 – 400; 3, с. 42 – 43; 8, с. 10 – 11, 22]. Па гэтай справе 28 кастрычніка 1936 г. у сябе дома быў арыштаваны А. Розна. У зняволенні апынуліся і іншыя выпускнікі Мінскага пединстытута: Янка Валасевіч, Яўхім Гаварушка, Сяргей Грахоўскі, Мітрафан Жукавец, Яўгенія Каплунова, Ілья Карцель, Леў Майзель, Міхась Плашчынскі і Усевалад Шыдлоўскі.

Паводле ўспамінаў С. Грахоўскага, А. Розна трымаўся ў турме вельмі аптымістычна: «Ён лагічна даводзіў абсурднасць усіх абвінавачванняў, верыў, што варта толькі цвярозым і разважлівым людзям пагартаць нашы "справы" і ўбачыць фантастычную бязглуздзіцу малапісьменных пратаколаў. Алесь на допытах "раскалоўся" і назваў завербаваных ім Памялоўскага, Ляскова, Паляжаева. Следчы ўзрадаваўся, далажыў начальству, а потым збіў Алеся па горкі яблык» [3, с. 32]. Наколькі дасціпна А. Розна дурыў малаадукаванага следчага, можна ацаніць, зазначыўшы, што згаданыя ім расійскія пісьменнікі Мікалай Памялоўскі, Мікалай Ляскоў і Аляксандр Паляжаеў жылі яшчэ ў XIX ст.

Адзін з парадоксаў сфальсіфікаванай справы быў і ў тым, што ўсе арыштаваныя былыя студэнты абвінавачваліся ў беларускім нацыяналізме, хоць сярод іх былі і два этнічныя яўрэі – Алесь Розна і Леў (Лейб) Майзель. І калі А. Розну прывязаць да справы было лёгка – ён сапраўды працаваў на ніве беларускай культуры, – то Л. Майзель на судзе 2 кастрычніка 1937 г. адкрыта сказаў: «Які з мяне беларускі нацыяналіст, калі я яўрэй і супрацоўнічаў у час вучобы ў рускай газеце "Рабочий"» [1, с. 400]. У выніку прысуд над Л. Майзелем адклалі, яго вярнулі ў турму, а 21 студзеня 1938 г. ужо як "члена контррэвалюцыйнай яўрэйскай нацыяналістычнай арганізацыі" асудзілі да пяці гадоў папраўча-працоўных работ і трох гадоў пазбаўлення правоў. А. Розна ж падзяліў лёс большасці астатніх падсудных: быў асуджаны пазасудовым органам НКУС як "член контррэвалюцыйнай нацыянал-фашысцкай арганізацыі" і за "антысавецкую дзейнасць" атрымаў 10 гадоў папраўча-працоўных канцлагераў.

Спачатку А. Розну разам з іншымі вязнямі (сярод іх былі пісьменнікі З. Астапенка, М. Багун, С. Баранавых, С. Грахоўскі, С. Знаёмы, Б. Мікуліч, С. Ракіта, Я. Скрыган, У. Хадыка, В. Шашалевіч і інш.) этапавалі ў магілёўскую турму, дзе ўтрымлівалі з кастрычніка да снежня 1937 г. У суседняй камеры, разам з жонкай пісьменніка Міхася Зарэцкага Марыяй, сядзела і аднакурсніца А. Розны Яўгенія Каплунова. Імкнучыся маральна падтрымаць сяброўку, паэт наладзіў з ёй сакрэтную перапіску. Аднойчы яе адказ на яго цыдулку трапіў у рукі наглядчыкаў, і Яўгенію пасадзілі ў карцэр – "гэтую страшную, чорную труну без святла" [5, арк. 14; 7, арк. 21].

Потым, ужо ў Унжлагу (Унжанскім папраўча-працоўным лагеры), разам з А. Рознам апынуліся пісьменнікі С. Грахоўскі, А. Пальчэўскі, У. Мяжэвіч, журналіст Ю. Такарчук. Каб пераадолець пакуты, сябры стараліся трымацца разам і дапамагаць адзін аднаму. "Каму б ні прыйшла вестка з дому, яна была нашай агульнай радасцю, пасылка дзялілася на ўсіх", – успамінаў С. Грахоўскі. Ён апісаў цяжкі лагерны побыт, а таксама смерць свайго сябра: "Разгублены, наіўны, несабраны, захоплены не бытавымі дробязямі, а нейкімі сваімі ўзвышанымі марамі. Ён мог забыць каля ўмывальніка адзіную кашулю, уціральнік, у сталоўцы – недаедзеную пайку. Я яго апекаваў, як малое дзіця. Мы з ім побач спалі, елі з аднаго кацялка, дзяліліся апошнім сухаром, падсоўваючы адзін аднаму большы кавалак. <…> Алесь Розна трагічна загінуў лютаю зімою 1942 года. Хворы на запаленне лёгкіх, ён упарта ішоў у лес, зняможаны лажыўся на сучча на снезе, пакуль не траціў прытомнасць. Яго смерць была наўмысным самагубствам" [3, с. 31]. Здарылася гэта недалёка ад станцыі Сухабязводная Горкаўскай вобласці.

Алесь Розна быў рэабілітаваны прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР 19 кастрычніка 1955 г. Яго асабовая справа Р. № 9934-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Лёс сваякоў А. Розны таксама склаўся трагічна. Маці, сястра Міра і брат Моня загінулі ў час Другой сусветнай вайны. Брат Арон прайшоў вайну, памёр у 1983 г. у Ялце. Другі брат Леанід жыў у Горкім (цяпер Ніжні Ноўгарад), перапісваўся з

Віктар Вячаслававіч Жыбуль *– даследчык літаратуры. Кандыдат філалагічных навук (2003). Закончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (2000), аспірантуру пры ім (2003). Працаваў у рэдакцыях часопісаў "Першацвет", "Роднае слова", "Arche". Цяпер вядучы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.*

С. Грахоўскім. Сын Леаніда стаў навукоўцам і таксама, як і дзядзька, пісаў вершы (“фізік-лірык”) [10, арк. 4 – 5]. Дом паэта ў вайну быў спалены гітлераўцамі (цяпер на яго месцы тэрыторыя станкабудаўнічага завода), не захаваўся і асабісты архіў. Уяўленне пра яго творчасць даюць публікацыі, раскіданыя па выданнях 1920 – 1930-х гг.

Большасць вершаў А. Розны, якія дайшлі да нас, напісаны ім ва ўзросце 14 – 16 гадоў. Не дзіўна, што іх лірычны герой – вясёлы і ўзнёслы юнак, ён смела і радасна ідзе насустрач будучыні, вітае новае жыццё, *“выходзіць на вуліцу сьцежкай”*, сустракае вясну *“на радасна-шумлівым полі”*. Адзін з найбольш яскравых у гэтым плане вершаў – “Вось затым” (1927), яго лірычны герой імкнецца падзяліцца радасцю з усім светам. Яго зухавата-разняволены настрой падкрэсліваецца элементамі гульні ў фармальнай будове верша з перастаноўкай і варыяцыямі слоў у ключавым радку *“Вось затым так хочацца мне…”*.

Вясна як увасабленне маладосці, радасці, новага жыцця – адзін з найбольш частых вобразаў-сімвалаў у паэзіі А. Розны. “Бурна-радасная” энергія маладосці выяўляецца таксама ў вобразах прыродных стыхій – моцнага ветру, дажджу, паводкі. Стварэнню адпаведнага эмацыйнага настрою спрыяюць і ўжываныя паэтам эпітэты. Так, дзень у яго – *вольны*, *новы*, *вясёлы*, жыццё – *новае*, *маладое*, час – *разгульны*, вясна – *шумлівая*, шляхі – *веснамайскія*, песня – *вольная*, *новая*, *вясёлая*, *залатая*, *звонкамаладая*, вясновы гул – *звонкі*, рака – *бурна-радасная*, *разгульная*, поле – *разгульнае*, *радасна-шумлівае*, сіла ветру – *дзікая*, далячынь – *залатая*, світанне – *залатое*, месяц – *залацісты* і г. д. *“Гімн дзён маладога жыцця”* – так можна назваць вершы А. Розны словамі самога ж паэта.

Калі ў “Чырвонай змене” паэт друкаваў вершы ўзнёсла-рамантычныя, насычаныя абстрактнай сімволікай, то ў часопісе для дзяцей “Беларускі піянер” часцей змяшчаў творы больш “прыземленыя”, напоўненыя канкрэтнымі жыццёвымі рэаліямі: “Я ў клуб іду”, “Каўказскі дэлегат”, “На варце”, “Люблю цябе, школа дарагая!” і г. д. Успамінаючы ўражанні ад яшчэ “піянерскіх” вершаў сябра, С. Грахоўскі зазначаў: «У тым шчаслівым дзіцячым узросце Алесь Розна ўжо імкнуўся да канкрэтнасці і прастаты, часам не пазбаўленай моднай у той час маладнякоўскай “прыгожасці”.

Стаіць у задуменні сквер,
Згубіўшы свой убор дашчэнту,
Сняжынкі ўслалі мой каўнер,
Як залатыя дыяменты.

Мне, хлапчуку з палескага мястэчка, які яшчэ ніколі не бачыў цягніка, цяжка было ўлавіць, што такое сквер, а тым больш залатыя дыяменты. Можа, таму і запомніўся верш, што ўпершыню адкрыў нешта новае, прынёс нячутае слова» [3, с. 124]. Сапраўды, рана далучыўшыся да гарадской культуры, А. Розна напаўняў некаторыя вершы апісаннем гарадскіх рэалій. У вершаваным дыпціху “Горад” (1928) ён падае два рамантызаваныя малюнкі – ранішні і вечаровы – тыповага горада 1920-х гг. з яго брукаванкамі, тратуарамі, заводскімі гудкамі, *“трубамі дымных фабрык”*, хоць галоўнае ў вершы, зноў жа, не вонкавае апісанне, а “псіхалагічны партрэт” горада ва ўспрыманні захопленага юнака.

У адпаведнасці з “канонамі эпохі” А. Розна адгукаўся і на падзеі ў грамадска-палітычным жыцці – згадаем вершы “Хай буяняцца пажарамі… (На расстрэл 7 камсамольцаў Польшчы)”, “Сустракаем Кастрычнік песьняю” (абодва 1927 г.), “Голас (На працэс Беларускай Грамады)” (1928), “Чырвоны маўзалей (Да пяцігоддзя смерці Леніна)”, “Зямля… Зямля… (Да 12-й гадавіны Кастрычніка)” (абодва 1929 г.). Пісаў і на “вытворчую”, фабрычна-заводскую тэматыку (вершы “Лірыка брыгадзіраў”, “Інтэрв’ю”, “Слова пра чорную дошку”, усе 1932 г.).

На жаль, сталінскія рэпрэсіі і ранняя смерць не далі разгарнуцца таленту Алеся Розны на поўную моц. Ягоныя летуценні, мары і памкненні засталіся ў вершах, якім так і не наканавана было выйсці асобнай кнігай.

Спіс літаратуры

1. **Гаварушка, Я.** У сталінскіх засценках / Я. Гаварушка // Правда истории : Память и боль / сост. Н. М. Жилинский. – Минск : Беларусь, 1991.

2. **Грахоўскі, С.** Жывуць у памяці маёй / С. Грахоўскі // Так і было : артыкулы, успаміны, эсэ / С. Грахоўскі. – Мінск : Маст. літ., 1986.

3. **Грахоўскі, С.** Зона маўчання / С. Грахоўскі // Выбраныя творы : у 2 т. / С. Грахоўскі. – Мінск : Маст. літ., 1994. – Т. 2 : Крыжавы шлях : Аповесці. Апавяданні.

4. **Жертвы политического террора в СССР** : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://lists.memo.ru/index17.htm. – Дата доступа : 19.12.2012.

5. **Каплунова, Я. П.** Лісты да С. І. Грахоўскага, 1971 – 2001 / Я. П. Каплунова // БДАМЛМ. – Фонд 201. – Воп. 4. – Адз. зах. 191.

6. **Каплунова, Я. П.** Лісты да С. І. Грахоўскага, 1987 – 1991 / Я. П. Каплунова // БДАМЛМ. – Фонд 201. – Воп. 3. – Адз. зах. 327.

7. **Каплунова, Я. П.** Лісты да С. І. Грахоўскага, 1991 – 1994 / Я. П. Каплунова // БДАМЛМ. – Фонд 201. – Воп. 3. – Адз. зах. 328.

8. **Картель, И. А.** Шесть кругов ада / И. А. Картель // Пока дышу – надеюсь / И. А. Картель [и др.]. – Кемерово : Кн. изд-во, 1991.

9. **Карцель, І.** Лісты да С. І. Грахоўскага, 20.10.1979 – 14.09.1988 / І. Карцель // БДАМЛМ. – Фонд 201. – Воп. 3. – Адз. зах. 262.

10. **Розна, Л. І.** Ліст да С. І. Грахоўскага, 22.12.1987 / Л. І. Розна // БДАМЛМ. – Фонд 201. – Воп. 4. – Адз. зах. 194. – Арк. 4 – 5.

11. **Шабека, Я. У.** Ліст да С. І. Грахоўскага, 10.04.1971 / Я. У. Шабека // БДАМЛМ. – Фонд 201. – Воп. 4. – Адз. зах. 194. – Арк. 22 – 23 адв.

Алесь РОЗНА

ВОСЬ ЗАТЫМ…

Я ў цьвеце жыцьця цяпер
Акунуўся ў вясновую песьню.
Вось затым так хочацца мне
У душы сваёй радасьць несьці…

Вось затым мне хочацца так
Падзяліцца з вясновым раньнем,
Свае думкі вясьне расказаць
І абняць залатое сьвітаньне.

І цяпер так хочацца мне
Праімчацца над возерам сінім,
Сваёй радасьцю доўга зьвінець
Над зялёна-застыўшай далінай.

І цяпер зажадалася мне
Гаманіць ды з зялёным борам.
Эх вы, сосны, сосны мае…
Абніму вашых ветак узоры…

Вось затым я цяпер хачу
Сваю радасьць далёка несьці,
І ў сінюю даль маю
Рассыпаць залатыя песьні.

[1927]

* * *

Дні мінулі…
На парозе
Паказаўся ты адзін…
Помніш…
Плакалі бярозы,
Лес лістамі гаманіў…
Ты зусім, зусім інакшы…
Сьвітка тая-ж на плячох.
З днямі новымі пазнаўся,
Верным шляхам выйсьці змог…
Помніш…
помніш…
поле… камень…
І адзін нямы курган…
Залатымі каласамі
Быў абвіт бярозкі стан…
Разьлівала песьню раньне
У нямую ціш душы…
Вецер плакаў на кургане…
Дудка пела ля ракі…
Быў маленькім ты хлапчугам,
Толькі ўсё прайшло, прайшло.
Вось сягоньня па-над лугам
Плешча новае жыцьцё…
Вырас.
Стаў ты чалавекам
Сярод шуму гарадоў,
З новай ласкай і прыветам
Ты сюды… сюды зайшоў…
Зашумела вербалозьзе,
Забруілася рака.
Помніш:
З вёскі ты выходзіў –
Маці сьлёзы праліла…
Помніш… Ціха каласамі
Поле плакала наўкол.
Веснамайскімі шляхамі
Ты ў жыцьцё пайшоў…
прыйшоў…

[1928]

ГОРАД

Досьвіткам

Задымілі трубы, зазьвінелі песьні,
Абудзілі горад песьняю гудкі.
Заіграла сонца залацістым блескам,
Запляло вянкі…

Заіграла сонца вогненным узорам,
Бегае па даху, серабро ліе.
Ой, сягоньня горад, мой юнацкі горад
Усьміхнуўся мне…

Дні ужо другія… – тысячамі песень
Зацьвілі па бруку, ой другія дні…
Сёньня, як ніколі, радасьць сэрца цешыць
І пяюць гудкі…

Вуліца шумуе гоманам вясёлым,
Трубы дымных фабрык глянулі кругом.
Зацьвілі сягоньня песьні, як ніколі,
Песьні новых дзён…

Увечары

…І машыны сьціхлі, і заводы змоўклі,
І па бруку вечар ўжо раняе змрок,
Засьцілае далі цьмяна-сінім шоўкам,
Сьцелецца здалёк…

Залатыя зоры зьвесілі галовы,
Ў безгранічнай высі ўсё ліе свой сьмех.
Чую я сягоньня веснавыя словы
І вясновы бег…

Ўсё цьвіце па бруку сёньня васількамі,
Пахіліўся вечар, толькі гоман сьціх.
Загарэлась неба тысячай агнямі.
Ой, люблю я іх…

Пакаціўся месяц ціха у абшарах
І за сіняй рэчкай зьвесіў галаву,
Ды іду сягоньня я па тротуары
Спатыкаць вясну!

[1928]

Друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала.

З юбілеем!

70

Міхась Тычына (нар. 10 лютага 1943 г., п. Верхне-Сталінскі Алданскага раёна Якуцкай АССР) – літаратуразнаўца, пісьменнік. Доктар філалагічных навук. Нарадзіўся ў сям'і ссыльнага селяніна. Дзед Мітрафан Фаміч Тычына з сям'ёй (жонка Ефрасіння Іосіфаўна, сын Аляксандр, дзве малалетнія дачкі Зіна і Люба) у 1930 г. быў высланы як кулак у Алданскі раён ЯАССР; маці Кацярына Сцяпанаўна Алашкіна як кулачка была выслана тады ж. У 1947 г. разам з бацькамі пераехаў на іх радзіму, у вёску Завалочыцы Глускага раёна. Скончыў філалагічны факультэт Брэсцкага педагагічнага інстытута (1964). Тры гады, з перапынкам на службу ў войску, працаваў настаўнікам на Піншчыне. Скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1970). Цяпер працуе загадчыкам аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Спецыяліст у галіне літаратуразнаўчай экспертызы. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1976 г.

Друкавацца пачаў у 1963 г. з вершаў (брэсцкая абласная газета "Заря"); як крытык і літаратуразнаўца выступае з 1969 г. (часопіс "Маладосць"). Аўтар шматлікіх уласных і калектыўных манаграфій, эсэ, нарысаў, аповесцей, апавяданняў. Пераклаў на беларускую мову шэраг твораў Алеся Адамовіча. Адзін з аўтараў школьных падручнікаў і навучальных дапаможнікаў для базавай і сярэдняй школы.

Аўтар кніг "Дажынкі: Аповесць і апавяданні" (1979), "Магчымасці рэалізму: Прычыннасць і гістарызм" (з В. Жураўлёвым; 1982), "Змена квадры: Зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў" (1983), "Вяртанне: Аповесць пра Кузьму Чорнага" (1984), "Час прозы: Зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў" (1988), "Аляксандр Пушкін і Якуб Колас" (1999), "Карані і крона: Фальклор і літаратура" (1991), "Беларуская літаратура і свет: Папулярныя нарысы" (з Л. Баршчэўскім і П. Васючэнкам; 2006), "Чалавечае вымярэнне ў сучаснай беларускай літаратуры (у суаўтарстве; навуковае рэдагаванне ўсяго тэксту; 2010), "Вялікія і Малыя Тычыны: легенды і рэальнасць (зборнік літаратурна-дакументальных матэрыялаў пра беларускі і ўкраінскі род Тычынаў)" (2011), "Янка Купала і Якуб Колас: учора і сёння" (2012) і інш.

Майстэрства творцы

Міхась ТЫЧЫНА

"ЯК ЖЫВЕШ ТЫ, МОЙ НАРОД…"

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЮРАСЯ СВІРКІ

У шумнай і вясёлай кагорце літаратурнага пакалення шасцідзясятнікаў імя Юрася Свіркі (1933 – 2010) стала займае месца недзе паміж першай і другой дзясяткай найбольш яркіх і прыкметных імёнаў. Прынамсі, літаратуразнаўча-крытычны разгляд жыцця і творчасці прадстаўнікоў названага пакалення звычайна абмяжоўваецца першай "залатой дзясяткай", а імя Юрася Свіркі або падвёрстваецца пад пералік "шчасліўчыкаў", або трапляе ў безаблічна-агульнае вызначэнне "і інш.". Яго можна аднесці да разраду "непрачытаных паэтаў".

Вядома, кнігі вершаў, выбраных твораў Ю. Свіркі заўсёды своечасова рэцэнзаваліся, і, акрамя фармальна-апісальных, лёгка адшукаць водгукі, аўтары і назвы якіх гавораць самі за сябе. Сярод іх рэцэнзіі на першы зборнік вершаў маладога паэта "Шэпчуцца ліўні" (1959): "Паэзія – у жыцці!" Рыгора Бярозкіна, "Сваім голасам" Міхася Стральцова, "Нязведаныя шляхі і збітыя сцежкі" Валянціна Тараса; на зборнік вершаў "Вечнасць" (1963): "Пра кнігу таварыша" Рыгора Барадуліна, "Агонь жывы і бенгальскі" Сямёна Блатуна, "Памяць сэрца" Сцяпана Гаўрусёва, "Вечнае, чалавечнае" Вячаслава Рагойшы, "Сто кіламетраў паэзіі" Янкі Сіпакова. Творчы рост паэта навідавоку. Сучаснае асэнсаванне жыцця і творчасці Юрася Свіркі дае падставу залічваць яго ў шэраг вартых "уважлівага прачытання" (Ралан Барт) паэтаў.

Юрась Мікалаевіч Свірка (псеўданімы Банадысь Кастрыца, Гарчыца), паэт, журналіст, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова (1993, за зборнік паэзіі "Узаемнасць"), нарадзіўся 6 мая 1933 г. у вёсцы Маргавіца Бя-

гомльскага раёна Мінскай вобласці (цяпер Докшыцкі раён Віцебскай вобласці). У аўтабіяграфічных нататках "Вяртаючыся ў пражытае" (1973) паэт згадвае гады дзяцінства і падлеткавага ўзросту, звязаныя з цёплымі ўспамінамі пра родную вёску і бацькоў. *"…Самая жаданая для мяне дарога тая, што вядзе ў бок Бягомля… Там упершыню, ад роднай маці, пачуў пявучае беларускае слова… Там выток маёй любві да бацькаўшчыны"* [1, с. 251]. Бацька паэта, Мікалай Іванавіч, удзельнік грамадзянскай вайны, селянін-земляроб, жыў з працы сваіх рук. Маці, Акуліна Пятроўна, ведала шмат казак, баек, любіла спяваць беларускія народныя песні. У сям'і было васьмёра дзяцей, пяць сясцёр і тры браты, Юрась – малодшы.

У 1953 г. Ю. Свірка скончыў Бягомльскую сярэднюю школу, тады ж паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ, якое скончыў у 1959 г. У час вучобы пазнаёміўся з многімі паэтамі. Удзельнічаў у працы добра тады вядомага паэтам-пачаткоўцам літаратурнага аб'яднання пры "Чырвонай змене". Пасля заканчэння вучобы некалькі месяцаў працаваў стыль-рэдактарам у часопісе "Камуніст Беларусі". У 1959 – 1961 гг. – на пасадзе літсупрацоўніка рэдакцыі газеты "Чырвоная змена", з 1961 г. – старшы рэдактар літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё, з 1975 г. – загадчык аддзела прозы і паэзіі газеты "Літаратура і мастацтва". Свой першы верш "Новы крок" Ю. Свірка надрукаваў у газеце "Піянер Беларусі" (1952).

Малады паэт, студэнт 3-га курса, пісаў у вершы "Слядамі бацькоў" (1957): *"Праходжу я не першы па зямлі, / Ісці мне лёгка светлымі шляхамі: / Тут да мяне мае бацькі прайшлі, / І я трапляю крочыць іх слядамі… / Бацькам маім нялёгкі выпаў лёс: / Яны ў баях нам здабывалі волю, / Каб толькі мы хадзілі на ўвесь рост, / Каб не згіналі плеч сваіх ніколі"* [2, с. 6]. У творы, напісаным лёгкім, празрыстым 5-стопным ямбам, ужо выявілася імкненне паэта бачыць уласны жыццёвы шлях як звяно вялікага гістарычнага ланцуга. Маці, бацьку паэт прысвяціў шмат вершаў.

Праявы навакольнага жыцця і зрухі душы асэнсоўваюцца ўжо не толькі Свіркам-паэтам, але і Свіркам – глыбокім філосафам, які рана зведаў цану чалавечага жыцця, духоўную і культурную каштоўнасць набытага драматычнага вопыту.

Васьмігадоваму Юрасю назаўсёды запомніўся пачатак вайны: запыленыя, стомленыя, няголеныя, галодныя савецкія пехацінцы, якія забеглі ў вёску Маргавіцу ў першыя дні вайны, і амаль адразу пасля іх запылілі нямецкія танкеткі (*"Чужынцы саскаквалі з машын і з кінжаламі ганяліся за курамі, рагочучы, выносілі з істопкі падвяленыя кумпякі і сцёгны. Яны рэзалі і глыталі мяса, як ненажэрныя*

пачвары"). І выснова, уласцівая пяру ўжо сталага, багатага на жыццёвы вопыт, філасафічна настроенага паэта: *"Неяк адразу змяніўся наш Бягомль… Людзі нашай вёскі былі дружныя, трымаліся разам… Існаваў нават, калі так можна яго назваць, савет старэйшын. Аўтарытэт паважаных аднавяскоўцаў меў вялікую сілу"* [1, с. 251 – 252]. …Калі вяскоўцы хаваліся ў час блакады ў лесе за ракой Бярозай, немцы спалілі вёску.

Настойлівае акцэнтаванне ў вершах увагі на прыналежнасці да пакалення "дзяцей вайны", якому ўласціва абвостраная дзіцячая памяць пра перажытае блізкімі людзьмі, жыхарамі спаленай карнікамі вёскі Маргавіца, у Ю. Свіркі не здаецца данінай часу і перапевам чужых інтанацый, а чымсьці надзвычай шчырым і натуральным, неадольнай патрэбай выказацца пра набалелае. У вершы "Вечар над Паліком" (1958) знаходзім завяршэнне намаляванай геаічна-гістарычнай панарамы: *"Я гляджу на той бераг / І лаўлю усе гукі начныя, / Я стаю сярод ночы – / Не магу я дадому пайсці: / Можа, ў поўнач, / А можа, на золку / Прыплывуць і сюды сувязныя, / Яны змогуць заўжды тут сабе / Папаўненне знайсці"* [3, с. 14]. Пакаленне Ю. Свіркі шкадуе, што не паспела ў час падрасці, каб прыняць чынны ўдзел у падзеях сусветна-гістарычнага маштабу.

У вершы "Маё мястэчка" (1956) ключавыя словы паэта таксама пра вайну: *"Я не забыў, / Што бомбаю варожай / Маленства пакалечана маё"*. Забыць такое немагчыма, бо абавязкова нагадаюць *"чараты і лозы, / І ў багне адгукнецца / Гільзаў медзь"* [3, с. 7 – 8]. У многіх "ваенных" і "партызанскіх" вершах тут і там пра перажытае сведчаць "сляды вайны": *"у чалавека раны зарастуць, / Але рубцы навечна застаюцца"* [3, с. 9], *"мох зялёны парос. / Ператлела вуголле, /*

Але попел зусім / Не астыў яшчэ знізу" [3, с. 11], *"а пчолы цяжка з красак выпаўзаюць / І кулямі рашэцяць далячынь"*, *"кладу пад падушку / Любоў і надзею, / Як клалі вайной партызаны наган"* [3, с. 31 – 33], *"здаецца мне, падбітым самалётам / Планіруе над сасняком каршун"* [3, с. 34].

Заўважаныя ў беларускім наваколлі і пазначаныя ў глыбіні памяці падрабязнасці нічога не кажуць пасляваеннаму пакаленню, але надзвычай шмат нагадваюць "дзецям вайны". У вершы "На партызанскім аэрадроме" (1964) выказана найбольшае жаданне паэта Ю. Свіркі, які ўвесь час разважае пра таямніцы і праблемы пісьменніцкай прафесіі: *"І я нібыта ўзлёту тут чакаю, / Гляджу у даль, / Што мроівам дыміць. / Аэрадром! / Цябе я бласлаўляю. / Мяне над дробналессем паднімі, / Мяне над дробнатэм'ем паднімі!"* [3, с. 34 – 35]. Менавіта такое ўменне зазірнуць у глыбіню жыццёвай з'явы, адчуць яе сакральны сэнс, узняцца *"над дробнатэм'ем"* характэрна для паэта.

Урокі майстэрства засвойваліся Ю. Свіркам на працягу ўсяго яго творчага жыцця. Ва ўжо згаданай аўтабіяграфіі, напрыклад, чытаем такое вызначэнне: *"Калі б патрабавалася адказваць, якія вершы любіш, зазначыў бы: выпакутаваныя, сціслыя, спакойныя. Мне здаецца, калі паэт свядома піша гучныя радкі, то ён думае, што ўсе глухаватыя і яму трэба крычаць"* [1, с. 255]. Нелюбоў да *"вершаў-галаваломак з прэтэнзіяй на глыбакадумнасць"* неабавязкова азначае і нелюбоў да творчага эксперымента. У вершах Ю. Свіркі, акрамя моцнай апоры на традыцыйнасць народна-песеннай лірыкі класікаў, адчуваецца таксама засяроджаная і падтэкстава багатая іронія і гратэскная вобразнасць, заўважаныя яшчэ Варленам Бечыкам, літаратурным крытыкам і літаратуразнаўцам [5, с. 296].

Беларускі паэт у супрацьстаянні тагачаснай "трыбуннай лірыцы" абапіраўся на вопыт Я. Купалы і вершы, дзе ёсць "жыццёвая аснова і лёс" (верш "Купалле": *"А песня павольна / Расла і ўзлятала. / Здаецца, што полем / Спяшае Купала"* [4, с. 12]). Да постаці нашага класіка Ю. Свірка звяртаецца неаднойчы, каб адчуць яго веліч і каб паспавядацца: *"Я не люблю высокіх слоў, авацый, / Не ўскалыхнулі мне яны душу. / Не кожнаму хачу я прызнавацца / У тым, пра што пішу, чаму пішу… / У вас вучуся вобразу і слову… / Ваш верш вучыў…"* [4, с. 227 – 228].

Паэт не баяўся прызнацца ў паходжанні з традыцыйнай "аграрнай цывілізацыі" з яе спрадвечнай народнай этыкай і эстэтыкай, прастатой і чысцінёй людскіх дачыненняў: *"Ішоў я ў паэзію з вёскі, / Яна мне трывожыла сны – / Ваеннай пары адгалоскам / І мірным напевам сасны. / Я славіў Бярозу, і поле, / І лес, і пушчанскую раць, / Як людзі пяюць у застоллі, / Як моўчкі над горам стаяць… / Не ведаю я, ці пачулі, / Але я і сёння пяю / Пра вернасць зямлі і матулі, / Пра вечную мову сваю. / Не ведаю я, ці ўдалося, / Але я хацеў перадаць, / Як шастае поле калоссем, / Як звоніць касой сенажаць. / Як сэрца трапеча ў чаканні, / Як свецяцца зоркі начэй, / Як ласкава грэе каханне, / Як здрада балюча пячэ. / Не тузаў я рыфмаю жылы – / Высвечваў душы глыбіню…"* [3, с. 5 – 6].

А ў выніку працэсу самаспазнання нараджаюцца такія паэтычныя шэдэўры, як верш "Два штрыхі да вядомай ісціны" (1964), які стаў хрэстаматыйным:

Даказана і войнамі, і голадам,
Што падаюць раней
Мужчыны-волаты.
Жанчыны ж
Застаюцца жыць удовамі,
Засмучаныя думкамі бядовымі.

Таму
Спачатку падалі мужчыны,
Бо аддавалі свой паёк нішчымны
Матулям,
Любым жонкам
І каханым,
А самі паміралі нечакана.

Яны хацелі,
Каб хоць дзень-другі
Жыццё прадоўжыць родным, дарагім.
А там –
Не стане голаду, вайны.
А там, глядзіш,
Народзяцца сыны…

З такою думкай падалі яны [3, с. 36].

Родны край, *"нічым не славуты лясісты куток"*, насамрэч *"славуты каменнямі…"*, *"густымі барамі"*, *"чабаровымі і верасовымі пералескамі, лугавінамі і крыніцамі"*, апеты Ю. Свіркам у многіх яго вершах. У вершы "Родны край" (1958) незнаёмы хлопец на Замкавай гары натхнёна апавядае сябрам пра Гародню і пра Нёман, а лірычны герой перапыняе яго і пачынае распавядаць пра *"партызанскі наш Бягомль і пра раку Бярозу"*, пра прыгажуні сосны, з якіх выраблюць скрыпкі і цымбалы, і пра раку Бярозу, дзе бабры майструюць дружна хаткі, дзе ласіныя сцежкі да ракі вядуць. Аўтар сканчае высновай: *"І хлопца я не пазнаю, / Крычыць зусім цвяроза: / – Кідай ты практыку сваю, / Паедзем на Бярозу"* [2, с. 8]. Магчыма, узятыя дзеля рыфмы словы *цвяроза – Бярозу*, *бягом – Бягомль*, *бяроз – бароў*, *медзь – грымцець* выглядаюць штучнымі, але вобраз лірычнага героя праўдападобны.

Пейзажная лірыка Ю. Свіркі перадае настрой чыста дзіцячага, наіўнага ўспрымання свету ва ўсёй яго прыроднай паўнаце і першароднай некранутасці. Верш "Ласіха" (1958) поўны чуласці

да навакольнага асяроддзя, уласцівай не чалавеку, а ласіце, якой *"надакучыла адной, / І ў смутку друга яна кліча: / Лася тут восенню глухой / Забіў бяздушны паляўнічы"*. Чалавек жа, разумная істота, на жаль, страціў жыццёвы інстынкт і ўвогуле пачуццё "глыбокай пашаны да жыцця" (А. Швейцар).

Асобныя пейзажныя творы Ю. Свіркі можна смела ўключаць у школьныя хрэстаматыі, настолькі адкрыта і пранікнёна гучаць у іх дзіцячыя інтанацыі. Як, напрыклад, у вершах "Хмаркі", "Пасля навальніцы", "Лось", "Ноч", "Грыбы", "Ветразь", "Ягады".

У лірыцы Ю. Свіркі, і ранняй, і сталай, выяўлена імкненне вярнуцца ў часы маленства. Пра яго ў сваю пару Леў Талстой сказаў, што ідэал, да якога мы імкнёмся, не ў будучыні, а ў мінулым, у дзяцінстве, поўным суладдзя са светам. Адсюль жаданне паэта перагледзець многія стандартныя параўнанні і трывалыя выразы: "І варта жыць…" (*"Гаротны Месяц! / Рыфмай выпадковаю / Цябе сцягнулі з неба, цягнуць зноў. / І шабляю, / І бубнам, / І падковаю / Здаваўся ты для многіх песняроў"*), "Так было б…" (*"Уяўляецца тая палянка, / Дзе Алёнка сядзіць ля крыніцы. / Адышоўся далёка Іванка, / І сумуе па ім сястрыца"*), "У блакіце жаўрук" (*"Прылятае ён першым / З далёкага выраю. / Але людзі гавораць, / Што гэта не так…"*). Спіс вершаў, дзе на першым плане перагляд звыклага, вялікі.

Амаль кожны верш Ю. Свіркі завяршаецца філасофскай сентэнцыяй, бо ў кожнай праяве жыцця паэт шукае глыбінны сэнс, незаўважны павярхоўнаму погляду. Такая асаблівасць нагадвае пра сябе ў назвах кніг Ю. Свіркі: на фоне жыццёвай канкрэтыкі ("Шэпчуцца ліўні", "Баравіна", "Аўтограф", "Памятная вярста", "Кружка з пясчаным дном") выразна вылучаецца філасафізм як праява самабытнасці вобразнага мыслення ("Вечнасць", "Крэўнасць", "Люблю і веру", "Біяграфія памяці", "Ядранасць", "Паўшар'е блакіту", "Узаемнасць"). У вершы з адпаведным загалоўкам "Вечнасць" (1960), прысвечаным Рыгору Барадуліну, сябру па паэтычным цэху і жыццёвым лёсе, думка аўтара выказана па-мужчынску адкрыта і жорстка: *"Жыццё з людзьмі гаворыць груба: / Адных – дае, другіх – бярэ. / А людзі ж – гэта не падрубы, / Ім так не хочацца старэць. / Падрубу лёгка замяняюць / (У лесе знойдзецца бярно), / А людзі знаюць і не знаюць, / Калі для воч настане ноч"*. У паэта адметнае прызванне – у любым выпадку думаць пра вечнае, чалавечнае: *"А я ўсё думаю пра вечнасць, / Пяро не выпускаю з рук"* [6, с. 16].

Жыццёвая выснова, да якой прыйшоў яшчэ Свірка-студэнт: "І варта жыць…" (1959), невыпадковая. На 3-м курсе вучобы ва ўніверсітэце ён моцна захварэў: *"Мяне вайна / І сёння не пакінула: / Знайшла у лёгкіх шчылінку адну… / Тады скажу я, / Што вайна загінула, / Калі грудзьмі здаровымі ўздыхну"* [6, с. 37 – 38]. Лячыўся ў Грузіі. Напісаў пра гэта цыкл вершаў. У творы "Я з палаты пачынаў дарогу" (1959) узнаўляюцца ў падрабязнасцях пакуты асуджанага да смерці юнака: «*Цэлы месяц мне сціскалі косці / Мулкія бальнічныя бінты… / Не забуду, як мяне сшывалі. / Сіні шрам застаўся на плячы… / "Нібы мёртвы, болю ён не чуе", – / Чуў ад урачоў я і сясцёр… / А было, што ступіш крок і… цёмна, / Вочы забінтоўвала імгла…*» Паэт на ўсё жыццё застаўся ўдзячны грузінскім урачам, якія яго *"ў смерці вырывалі"*, сястры-грузінцы, што, *"як малога, навучыла зноў мяне хадзіць"*: *"Беларусь мая дала жыццё мне, / Грузія ад смерці зберагла"* [6, с. 11 – 12]. Пазней, калі паэт бываў у частых камандзіроўках у розных кутках неабсяжнага Савецкага Саюза, ён адусюль прывозіў стосы вершаў, прысвечаных дружбе народаў.

Нечакана, бы парыў ветру, уварвалася ў лірыку Ю. Свіркі інтымная тэма: "Многа ты мне крыўднага сказала…", "Я не веру…" (1963). У вершы "Непажаданае спатканне" (1963) пакуты юнага героя выбухаюць у маналогу, які раптам пачынаецца і раптам абрываецца: *"Тыя вочы маўчаць, / Што без слоў / гаварылі начамі; / Тыя губы маўчаць, / Што дружылі з маімі губамі; / Тыя рукі маўчаць, / Што мяне абвівалі вянкамі. / Як раней, / Не паверу мядовым вачам; / Як раней, / Не паверу вішнёвым губам; / Як раней, / Не паверу гарачым рукам, – / Ты мне здрадаю сэрца / Навек апякла. / І з табой, / Як з агнём, / Мне балюча сустрэцца…"* [4, с. 48]. Але ўжо ў вершы "Заклінанне" (1963), дзе паўтараюцца знаёмыя па іншых вершах падрабязнасці любоўнага захаплення, быццам гутарка ідзе пра адну і тую ж асобу, знаходзім клятву ў вечным каханні да той, што, *"нібы жыццё, адна / Была і будзеш. / Ты – мая аснова… / І я цяпер навек такі шчаслівы – / Не страшна чарната даўгіх начэй… / А страшна, / Што магу цябе згубіць…"* [4, с. 67 – 68]. Толькі сам закаханы можа зразумець такіх жа закаханых, адноўчы ўбачаных выпадкова:

Двое ў лодцы.
Мусіць, муж і жонка.
Адплывае бераг – жоўты вал.
Рассякае лодка-пласкадонка
Паясы тугіх азёрных хваль.

След дарожкай на азёрнай сіні.
Два вяслы у чатырох руках
Адпіхаюць лодку на глыбіні,
Дзе вада страшнейшая за страх.

. . . . . .

Адплывайце далей, адплывайце.
Вёслы – на ўсе пёры у ваду!
Адпіхайце далей, адпіхайце
Смутак, і нявернасць, і бяду [4, с. 82].

У кнізе вершаў "Узаемнасць" (1993), у раздзеле, невыпадкова названым "З жыццём размова не канчаецца", Ю. Свірка пацвярджае заяўленую яшчэ ў пачатку творчага шляху прыналежнасць да літаратурнай плыні "ціхай лірыкі". Прызнанне ў любові да роднага кутка, з часоў коласаўскай "Новай зямлі", і не магло быць гучнагалосым і звонкапафасным, тым больш што гэта адпавядае беларускай душы ўвогуле і прыроднай сціпласці паэта ў прыватнасці. У пару, калі многія яго равеснікі ў адначассе ператварыліся ў паэтаў-трыбунаў і з нядаўніх абывацеляў сталі раптоўна палітычнымі дзеячамі, Ю. Свірка застаўся верным сваёй ціхмянай і цярплівай натуры беларуса, які адкрыта радуецца чаканым пераменам у грамадскай атмасферы і адначасова сумняваецца ў шчырасці многіх "перабудоўшчыкаў на час", чуючы фальш пафасных заклікаў і палітызаваных лозунгаў.

Грамадзянская пазіцыя паэта выказваецца дастаткова пэўна ў радках верша "Мяне заўсёды вабіла сюды" (1993), які адкрывае згаданую кнігу і натуральна ўспрымаецца як праграмны: *"Мяне заўсёды вабіла сюды, / У гэты край лясны і камяністы, / Дзе доўга нараджаліся сады, / Дзе сосны скрозь / І менш бяроз махрыстых. / Мяне заўсёды клікалі лясы, / Рака Бяроза чысцінёй вытоку. / Такой нідзе не ўбачыў я красы, / Хоць і ад дому ад'язджаў далёка. / Мяне заўсёды суцяшаў спакой / Вясковага ляснога адвячорка / І той туман-дымок па-над ракой, / Што не бывае на радзіме горкім"* [7, с. 5]. У падтэксце гэтых радкоў выразна чуецца іронія да векавечнага пакланення "русским березам", "русскому полю", словам "и дым отечества нам сладок и приятен".

А ў заключэнне пішуцца радкі, пад якімі мог бы падпісацца і Максім Багдановіч, і Максім Гарэцкі, і Максім Танк:

Мой край, навекі ў сэрцы ты маім
Часцінкай нескаронай Беларусі.
І, як прызнаўся малады Максім,
Зямлёй зрабіцца тут – я не баюся [7, с. 5].

Юрась Свірка, у адрозненне ад шумнага натоўпу сучаснікаў, пра тое, *"што ўчора балела, / Што сёння баліць"*, пра што *"народ мой адкрыта гаворыць"*, *"пра чалавечнасць і чалавека, / Пра годнасць яго, / Пра знявагу і лёс. / Пра годы застою, знішчэння і здзеку"*, выказваецца простымі, без гучных эпітэтаў і выклічнікаў, словамі, найперш таму, што *"народ мой, ты вымаўчаў гэту галоснасць. / Галоснасць гаворыць сумленнем людзей"* [7, с. 9], *"нарэшце хочацца паверыць – / Народ паверыў у сябе"* [7, с. 11]. Паэт глыбока адчувае супярэчлівасць "пераходнага перыяду" і выдатна разумее неабходнасць усебакова-аб'ектыўнага погляду на падзеі: з аднаго боку, *"ёсць чаму, ёсць чаму / І ў народа майго павучыца"*, а з другога – *"ёсць чаму, ёсць чаму / І народу майму павучыцца, / Каб пакутліва крыўду за лёс свой / У вечнасць не нёс"*. І ў той жа час ён ні на хвіліну не забываецца пра галоўнае ў жыцці і гісторыі краіны: *"Я – пясчынка яго. Не магу без яго ні хвіліны"*. І адкідвае ўсякія папрокі ў яго, народа, бок: *"Ён жа – волат, ён – сіла, і той ён адзіны, / Чыё слова не можа ніхто / Паланіць, папраўляць, адмяняць"* [7, с. 14 – 15].

Тым не менш, нягледзячы на пакутлівы роздум і на рацыянальныя высновы, паэт не здольны пазбавіцца ад пачуцця роспачы. Напрыклад, у цыкле "Надпісы пад палітычнымі малюнкамі": *"Дзе ваш розум, скажыце, урады і троны? / Да чаго дажылася планета Зямля: / Сума шара зямнога і бомбы нейтроннай / Вызначаюць знішчальную сілу нуля"* [7, с. 40].

У пачатку творчасці Юрась Свірка напісаў верш "Хачу прачнуцца…" (1963), дзе выказана яго паэтычнае пажаданне *"прачнуцца праз сотні год"*, каб *"паслухаць, / Як жывеш ты, мой народ"*. І яго цвяроза прадуманае асабістае рашэнне: *"Калі пачую: / Ты жывеш, народ / (Па голасе пазнаю беларусаў), / Тады спакойна на пагост вярнуся / І зноў засну – / На сотні тысяч год"* [3, с. 29]. 31 жніўня 2010 г., калі паэт браў удзел у штогадовым свяце Дня ведаў у Камянцы, яго не стала: збалелае за век сэрца абарвала жыццё і творчы бег. Суцяшэннем нашчадкам застаюцца нашы веды пра тое, што тузін кніг паэзіі Юрася Свіркі нясе ў сабе вялікі творчы вопыт перажытага на працягу XX ст., што паэт сказаў непаўторнае слова пра новую эпоху ў гісторыі беларусаў першага дзесяцігоддзя XXI ст., што яго вершы перакладзены на рускую, украінскую, літоўскую, грузінскую, армянскую, узбекскую, таджыкскую, чувашскую, малдаўскую, асецінскую, польскую, англійскую мовы, а многія яго тэксты сталі песнямі (музыку да якіх напісалі М. Аладаў, Э. Зарыцкі, В. Кандрасюк, Ю. Семяняка і інш.).

Спіс літаратуры

1. **Вытокі песні** : аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мінск : Маст. літ., 1973.

2. **Свірка, Ю.** Шэпчуць ліўні : вершы / Ю. Свірка. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1959.

3. **Свірка, Ю.** Кружка з пясчаным дном : лірыка / Ю. Свірка. – Мінск : Маст. літ., 1990.

4. **Свірка, Ю.** Ядранасць : вершы / Ю. Свірка. – Мінск : Маст. літ., 1983.

5. **Ярош, М. Р.** Беларуская савецкая лірыка / М. Р. Ярош, В. Л. Бечык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979.

6. **Свірка, Ю.** Вечнасць : вершы / Ю. Свірка. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1963.

7. **Свірка, Ю.** Узаемнасць : кніга вершаў / Ю. Свірка. – Мінск : Маст. літ., 1993.

Аўтар ахвяруе ганарар на развіццё часопіса.

СПЕКТР БЕЛАГА КОЛЕРУ

ШТРЫХ-АНАЛІЗ ДЭБЮТНАЙ КНІГІ ДЗМІТРЫЯ ПЯТРОВІЧА

Кніга Дзмітрыя Пятровіча "Белая Жанчына" выйшла на пачатку 2012 г. у выдавецтве "Четыре четверти" ў серыі "Бібліятэка Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі".

У прафесійнае пісьменства Дзмітрый Леанідавіч падаўся адносна нядаўна – ва ўзросце пад трыццаць пяць гадоў. Позні дэбют змушае экзамен на прафесійную сталасць здаваць экстэрнам. Складнікамі поспеху сталі несумненныя творчыя задаткі і багаты жыццёвы досвед, камунікабельнасць, схільнасць да аналізу і патрабавальнасць да ўласнага слова. Гэта пацвярджае ў прадмове "Новае імя" вядомы пісьменнік і адмысловы рэдактар Андрэй Федарэнка.

Містычна-прыгодніцкая аповесць "Белая Жанчына" – ключавы твор празаічнага зборніка. За сюжэтны дэкор узята тэма, якой дагэтуль не краналася пяро беларускага літаратара, – спелеалогія. Яна асветлена пераканальна, вельмі натуральна адаптавана да нашых мясцін.

Містычны кампанент аповесці – Белая Жанчына – прыём не новы. Дзмітрый Пятровіч усведамляе гэта і распавядае вуснамі герояў вядомыя і малавядомыя легенды, а Белую Жанчыну робіць спараджэннем сумлення галоўнага героя. Таямнічы флёр аповесці надаюць маляўнічыя філасофскія аўтарскія адступленні: *"Мітусліва-дзіўная кветка вогнішча была бачна здалёк у цемры. Яна шапацела-трашчала пра штосьці сваё, спрадвечнае. І людзям, якія сядзелі вакол агню, ніколі не было дадзена зразумець гэта, як і ўсім тым, хто не ведаў, якой была Зямля ў часы, калі на ёй маглі жыць і веліканы, і атланты, і іх прашчуры, пра якіх мы маглі толькі здагадвацца, знаёмячыся з легендамі і казкамі"*; *"Святаслаў на нейкі час сцішыўся, услухаўся ў цішыню і, здалося, на імгненне адчуў тонкі, няўлоўны рух часу. Ён, час, прайшоў праз яго цела, не спыняючыся, без аніякага гуку, і рух гэты можна адчуць толькі сэрцам і памяццю сваёю і чалавецтва"*.

Наступны буйны твор кнігі – аповесць "Джэк" – адметны аб'ёмнымі сюжэтнымі разгалінаваннямі. Твор ажыўляюць дбайна выпісаныя вобразы герояў. Аповесць кампазіцыйна ўяўляецца не дрэвам, а кустоўем, дзе кожны стволік над зямлёй (для чытацкага ўспрымання) – паасобку. Несумненна, што гісторыі і жыццёвыя сітуацыі пераказаны пісьменніку рэальнымі людзьмі, а характары і антураж спісаны з натуры.

Майстэрскія апісанні і ў аповесцях, і ў апавяданнях даюць пэўную настройку на варункі сюжэта: *"Жнівеньскі дзень быў насычаны пахамі лугавых кветак, скошанай сям-там травы, птушынымі спевамі. Таполі паабапал шашы стаялі як ганаровая варта, вітаючы ўсіх, хто праязджаў тут. Справа, на ўзгорку, паўсталі калгасныя будынкі на чале з сіласнай вежай, купал якой срэбрам зіхацеў на сонцы"*; *"За акном барвовае неба здавалася нібы аблітым крывёю. Аблокі, што ўвесь дзень хадзілі па небе, падсвечаныя сонцам, раздзьмуўшы свае ветразі, зараз здаваліся суцэльнай цёмнай хмарай, якая пералівалася, зіхацела ўсімі колерамі ўжо заходзячага сонца. Яно, развітваючыся з Зямлёю, адыходзіла… у цемру Сусвету"*.

Настальгічная замалёўка "Вартоўня" – цёплы ўспамін пра родных людзей, якія па няўмольных законах жыцця сышлі ў іншасвет: *"Дзякуй Богу, нашы ўспаміны і нашы пачуцці не згасаюць, а толькі з часам напаўняюцца нейкім новым зместам, пра які калісьці скажуць за нас нашы дзеці і ўнукі"*.

Лірычным настроем і трапяткімі адносінамі да праяў жыцця і прыроды вызначаецца і апавяданне "Мара". Тэматычна з "Марай" пераклікаецца "Ласкавы падман". Уменне цаніць прыгожыя імгненні жыцця і радавацца ім – неад'емная частка творчага эга пісьменніка. Эсэ "Горад майго сэрца" – кранальны асабісты гімн сучаснаму і гістарычнаму Заслаўю, радзіме Дзмітрыя Пятровіча.

Белы колер, сімвалічны для пісьменніка (невыпадкова і папярэдні зборнік паэзіі называецца "Белая квецень кахання"), раскладаецца на ўсе колеры. І кніга прозы Дзмітрыя Пятровіча ўтрымлівае ўсе адценні, неабходныя, каб спраўдзіцца аўтару як пісьменніку.

Юрась НЕРАТОК.

МОВЫ РЫСЫ НЕПАЎТОРНЫЯ

Мова мастацкіх твораў

ВЕРБАЛЬНЫЯ СРОДКІ КАМІЧНАГА Ў ДРАМАТЫЧНЫМ АБРАЗКУ “ЖАРТАЎЛІВЫ ПІСАРЭВІЧ” МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

Даволі значнае месца ў літаратурнай спадчыне Максіма Гарэцкага займаюць драматургічныя творы. Ужо на пачатку літаратурнай дзейнасці пісьменнік “не абмяжоўваўся якой-небудзь адной жанравай формай, а ахвотна спрабаваў свае сілы ў розных жанрах, у тым ліку – у драматычных” [1, с. 363]. М. Гарэцкі – аўтар п’ес “Антон” (1914), “Атрута” (1913), “Гапон і Любачка” (1914), “Салдат і яго жонка”, “Свецкі чалавек”, “Не адной веры”, “Каменацёс”, “Чырвоныя ружы”, “Жалобная камедыя” (1922). Называючы свае п’есы “драматычнымі абразкамі, пісьменнік тым самым засведчыў іх жанравую спецыфіку, іх прыналежнасць да драматычнага і эпічнага родаў літаратуры” [2, с. 504].

Паводле М. Мушынскага, “сцэнкі” і “абразкі” М. Гарэцкага “ўспрымаюцца як пэўны цыкл, аб’яднаны аўтарскім пафасам выкрыцця маральных хібаў і заганаў, уласцівых чалавеку ці пэўнай сацыяльнай групе” [3, с. 402].

З вяртаннем спадчыны і імя Максіма Гарэцкага ў літаратуру адрадзілася цікавасць і да яго драматургічнай творчасці. Баранавіцкім народным тэатрам пастаўлена “Атрута” (1981), Краснапольскім народным тэатрам – спектакль “Стогны душы” (1992) паводле аднаактовых п’ес “Салдат і яго жонка”, “Свецкі чалавек” і “Атрута” (паказаны ў 1993 г. у Горках і ў Мінску на вечарыне з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння пісьменніка). На беларускім тэлебачанні ставіўся спектакль паводле п’есы “Салдат і яго жонка” (1980) [4, с. 255].

Драматургічны абразок “Жартаўлівы Пісарэвіч” напісаны ў 1922 г., упершыню апублікаваны ў часопісе “Полымя” (1925, № 8). “Шматок драмы” пад назвай “Жарты пана Пісарэвіча” быў змешчаны ў газеце “Наша будучыня” (8 снежня 1922 г.) пад псеўданімам А. Мсціслаўскі. Абразок надрукаваны ў кнізе: Гарэцкі М. Жартаўлівы Пісарэвіч: сцэнкі і размовы. Мінск, 1928. Датуецца 1922, 1927 гг. на падставе [“Храналогіі твораў”*].

На долю Пісарэвіча выпалі неймаверныя жыццёвыя выпрабаванні бежанца-пакутніка, які ўдалечыні ад бацькаўшчыны марнее ў холадзе і голадзе, што дашчэнту падарвала яго здароўе. На адной са станцый беларускага прыгранічча, калі выпала мажлівасць вярнуцца дадому, Пісарэвіч, знясілены, памірае.

Адна з адметных асаблівасцей гэтага персанажа – вялікая сіла волі: нават будучы хворым, ён увесь час жартуе – не толькі з сябе, але і навакольнага свету. У п’есе багата жартаў, смешных эпізодаў, тым не менш яна ўспрымаецца як “камедыя-плач” – “па тых таленавітых, пісьменных, шчырых беларусах, якіх параскідаў лёс па розных канцах свету” [6, с. 144 – 145].

Драматычны абразок шмат у чым аўтабіяграфічны: як і Пісарэвічу, М. Гарэцкаму давялося зведаць горкую долю бежанца-выгнанніка.

Найважнейшыя вербальныя сродкі камічнага наступныя.

Іранізмы. На эфекце “падманутага чакання” пабудаваны наступны дыялог: спачатку Пісарэвіч нібы згаджаецца з Пані (*Выбачайце: тут мяшкаюць панства Пісарэвічы?*): *Тут, тут…* Аднак далейшы працяг яго рэплікі сведчыць пра адваротнае: *хоць якое там панства!* ***Быў конь, ды з’ездзіўся.*** Без скаргі, не адкрыта, а неяк прыхавана, у вобразнай форме, з дапамогай вылучанай прыказкі (гаворыцца пра таго, хто састарыўся ці страціў былое значэнне, уплыў і пад.) Пісарэвіч даў зразумець Пані, хто ён ёсць насамрэч (нямоглы, пазбаўлены свайго жылля, гаспадаркі…). Горкая самаіронія ўкладзена “панам” Пісарэвічам у сэнс ужытай ім прыказкі.

Іранічную афарбоўку могуць набываць словы персанажа, якія ўжываюцца як адмысловая (“разавая”) яго назва: [Жонка (збітая з раўнавагі):] *Дык гэта ж і ёсць сам пан Пшэпюркоўскі, лекар бяжэнскага камітэту.* [Пісарэвіч:] *А-а?! А чаму ж ты з ім не пазнаёмілася? Знаёмы і сам уцякач, гэта ж:* ***“Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся”.*** [Жонка:] *Не жартуй, Алесь! Якое ж цяпер у нас можа быць знаёмства з парадачнымі людзьмі? Сорам прызнацца, хто мы ёсць…* Вылучаны выраз Пісарэвіч выкарыстоўвае ў дачыненні да лекара *бяжэнскага камітэту*, які, мабыць, нярэдка карыстаўся гэтым адным з першых самых вя-

* Аўтограф без загалоўка, у якім занатаваны назвы твораў паводле прынцыпу “Храналогіі маіх твораў” [5, с. 628].

домых камуністычных лозунгаў (ням. *Proletarier aller Länder, vereinigt euch!*; упершыню быў выказаны Карлам Марксам і Фрыдрыхам Энгельсам у "Маніфесце Камуністычнай партыі").

Як іранізмы ўспрымаюцца радкі, якія неаднойчы спяваў Пісарэвіч дзеля суцяшэння сваёй і людской нядолі, – заключныя словы 1-й страфы міжнароднага пралетарскага гімна "Інтэрнацыянал" (1871) французскага паэта-песенніка Эжэна Пацье:

1) [Пісарэвіч:] *Быў конь, ды з'ездзіўся. Ну, нічога! Добра, усё добра!* (Пяе, махаючы ад сцюжы рукамі – ботам і шылам.)

Хто быў нічым,
Той будзе ўсім!

Хоць Пісарэвіч і суцяшае сябе (*Ну, нічога! Добра, усё добра!*), але ягоныя словы ўспрымаюцца як прыхаваная іронія, пра што сведчыць ужытая ім прыказка *Быў конь, ды з'ездзіўся*, а таксама радкі гімна.

2) [Пісарэвіч:] *Ну, нічога, добра!* (Пяе.)

Хто быў нічым,
Той будзе ўсім!

3) [Пісарэвіч:] *Гэ, а чаго мне журыцца? Я шыю боты, жонка мяшкі выпыльвае, дзеткі ў школе…* [Пані:] *А ў якой школе?* [Пісарэвіч:] *У школе жыцця!* [Пані:] *Бальшавіцкай, значыцца? Многа яны там наўчацца!* [Пісарэвіч:] *Дазвольце вытлумачыць, грамадзянка! На станцыі стаіць эшалон з чырвонаармейцамі, што едуць на белых, на фронт.* (Бярэцца за працу і адварочваецца.) *Дык яны там цэльны дзень пільнуюць з місачкамі. Астаткі крупнічку, камочак кашы, скарыначка хлеба, селядцовы хвосцік – усё на патрэбу чалавеку… <…> Нічога, усё добра будзе!* (Пяе.)

Хто быў нічым,
Той стане ўсім!

4) [Пісарэвіч (прыходзіць, пеючы **"Хто быў нічым…"**):] *А што, пайшла ўжо гэтая лялька* [маладая, досыць прыгожая пані Ядвіга]*? Няўжо і да сябе запрасіла?* [Жонка (халяруе):] *Змоўкні, змоўкні, змоўкні з гэтаю песняй! Ты ненармальны!*

Пра дасціпнасць Пісарэвіча, здольнасць яго пра жыццёвыя нягоды сказаць не адкрыта, а іншасказальна сведчыць наступны дыялог: [Пісарэвіч:] *Промысел – чым мы будзем жыць і што мы будзем есці. Але, грамадзянка, не стойце ў дзвярах, праходзьце далей у нашы* ***палацы!*** [Пані (нясмела заходзіць):] *А хто вы такі? Ці сапраўды тут жывуць панства Пісарэвічы?* З папярэдняй разгорнутай рэмаркі вынікае, што *нашы палацы* – гэта сцюдзёная няпаленая марознай зімою кватэра.

У функцыі іранізмаў могуць ужывацца выразы-эўфемізмы. Такія выразы выконваюць важную мастацкую нагрузку: не парушаючы прынцыпаў этыкі ў найменні рэалій, яны, аднак, сваім кампанентным складам камічна намякаюць на прамую назву: [Баба (прыбягае раз'юшаная):] *Зладзеі вы! З-пад чужой курыцы яйкі выбіраеце ды яешні сабе смажыце! Падумаеш, паны дужа вялікія!* [Жонка:] *Алесь, галубок, даражэнькі! Яна брэша, няпраўда, я не брала, я на рынку купіла…* (Тупіць вочы, уцягвае галаву.) [Баба:] ***Купіла пад чужой курыцай!*** Тут выраз *Купіла пад чужой курыцай!* ужываецца са значэннем 'забрала з-пад чужой курыцы'.

З іранічным адценнем успрымаецца ацэнка-пахвальба Пісарэвічам сваіх хлопчыкаў: [Пісарэвіч:] *Мае хлопчыкі? А нічога, нічога, дзякую! Аддалі былі іх у прытулак, – хоць Стася і дужа не хацела, але крута нам прыйшлося. Дык нічога! Красці троху няліся там, наўчыліся ад сяброў, а цяпер во з намі жывуць, бо прытулак зачыніўся, – нічога, добрыя хлопчыкі…* Актуалізатарам іранічнага ўжывання словазлучэння (*нічога*), *добрыя хлопчыкі* з'яўляецца прэпазіцыйны вербальны кантэкст – *красці троху няліся там, наўчыліся ад сяброў.*

Алагізмы. Асновай камічнага можа быць алагізм – вербальна апісаны факт, які не адпавядае рэчаіснасці і разлічаны на тое, каб пацешыць суразмоўніка: [Пісарэвіч:] *Го-го! Мы сабе* ***з Масквы снег выпісваем, а з Варшавы саначкі.*** *Так і пакатаемся і паваляемся… го-го!* [Мяшчанка:] *Які вы жартаўнік, пан Пісарэвіч!*

Алагізмы (як элементы першаснага маўлення – Пісарэвіча) могуць ужывацца ў рэпліцы іншага персанажа: [Мяшчанка:] *Вы ж мяне павесяліце, пан Пісарэвіч. Як гэта вы казалі, што ў вас не так, як у нас, –* ***не на дрэве, а на зямлі ігрушкі растуць****… Хі-хі!*

На скаргу Мяшчанкі (*Насланнё мне з гэтымі ўцекачамі… Сцягнулі-ткі чурбанок!*) Пісарэвіч "усур'ёз" супакоіў яе: *Яны бачылі, дурныя, і думалі, што гэта кавалак мяса. Дык вось яны схапілі ўночы, а цяпер вараць…* Зразумела, Мяшчанка не паверыла Пісарэвічу: *Не сорам вам бажыцца, пан Пісарэвіч? Ці ж гэта можа быць тое, што вы кажаце?* Каб пераканаць суразмоўніцу ў "ісціннай праўдзе", Пісарэвіч працягвае свой жарт, які імкнецца па-ранейшаму выдаць за праўду, і дае Мяшчанцы "слушную" параду: *Можа, не зусім так, але каля таго; калі не імеце веры, дык вось, Мар'я Іванаўна…* (Цягне з-за спіны чурбанок.) *Трымайце! Я на ім боты рапараваў, а думаў сабе: пасля звару яго ды з'ем. Далібог, так думаў! Але неяксь пашкадаваў. Бярыце, Мар'я Іванаўна: мо калі голад будзе ў вашай губерні, – не вам, дык добрым людзём спатрэбіцца замест кавалка мяса…* Нарэшце ўсё-такі дайшло да Мяшчанкі, што гэта жарты-выдумкі: *Дык гэта ўсё вашы жарцікі, пан Пісарэвіч? А я спалохалася – дзе, думаю сабе, мой чурбанок? Ну і жартаўнік!*

Як алагізм успрымаецца зварот, утвораны аб'яднаннем сэнсава несумяшчальных кампанентаў формулы маўленчага этыкету: [Пісарэвіч (тыцкаючы сябе пальцам у грудзі):] *Вы, грамадзянка, бачыце перад сабою грамадзяніна ці, як вы кажаце*

дзеля старой сваёй прызвычаёнасці, пана, ***грамадзяніна-пана*** *Пі-са-рэ-віча!* Тут *грамадзянін* – тыповая форма афіцыйнага звароту да дарослага чалавека, *пан* – форма ветлівага звароту да асобы, якая належыць да прывілеяваных класаў.

Выслоўі. Дасціпныя, гумарыстычна афарбаваныя выразы даволі часта сустракаюцца ў маўленні Пісарэвіча. На папрок Жонкі (*Апамятайся і людзей пастыдайся. Ледзьве ногі цягаеш, а скачаш, як малое дзіцянё*) хворы Пісарэвіч сапраўды, як тое малое дзіця, прыпявае: ***Гуляй, хата, гуляй, печ!*** Гэтая пацешка-прыгаворка яскрава сведчыць, што і ў неймаверна цяжкім фізічным стане (блуканне па пакутах падарвала здароўе Пісарэвіча) ён працягвае жыць жартамі, якія сілкуюць яго волю, не даюць скарыцца перад нядоляй, заняпасці духам.

Некаторыя выразы (выдумлянкі) успрымаюцца як смех праз слёзы: [Пісарэвіч:] *Я – хворы? Глядзі, які я здаровы!* (Махае кулакамі.) *Го-го!* ***На мяне яшчэ маладзіцы заглядаюцца!*** *Го-го! Ну, смейся ж, Стасенька! Чаго там плакаць? Го-го! Мы яшчэ… о-го-го!* Адчуваючы, што яе муж жартуе праз сілу, Жонка са спачуваннем звяртаецца да яго: *Не жартуецца табе, Алесь! Кінь…*

Фразеалагізмы. Пачуўшы ад Дзяўчынкі: *Я не брадзяга, – майго бацьку на вайне забілі за вас, праклятых*, Пісарэвічава жонка адпрэчыла яе са злосцю: *Ідзі, ідзі!* (Бярэ яе [Дзяўчынку] за плечы і выводзіць.) *Бач,* ***распусціла язык****, як карова.* Вылучаны выраз у рэпліцы Жонкі ўжываецца з фразеалагічным значэннем (разм. няўхвальн. ‘дазволіла сабе нагаварыць многа лішняга’). Пад уплывам падкрэсленага параўнання гэты выраз набывае больш зніжаную экспрэсію, паколькі Дзяўчынка ўскосна параўноўваецца з жывёлай.

Прыгаворкі-рыфмаванкі. Камічны эфект дасягаецца паўтарэннем аднолькавых слоў, якія не з’яўляюцца паўнацэннымі лексічнымі адзінкамі і ўжываюцца ў функцыі выклічнікаў: [Пісарэвіч (схаваўшы чурбанок з ботам за спіну):] *Выбачайце, Мар’я Іванаўна, што вы не пастукалі: я ў хатнім выглядзе і боты сабе рапараваў.* (Скача на адной назе.) ***Дылі-дылі, го-ца-ца! Дылі-дылі, го-ца-ца!*** [Мяшчанка:] *Кіньце свае жарты, пан Пісарэвіч! Чурбанка няма. Ці не бачылі вы часам?* Параўн.: выклічнік *го-ца-ца* і дзеяслоў *гоцацца* – разм. ‘з шумам скакаць, падскокваць’.

Кантамінаваныя іншамоўныя ўкрапіны. Камізм выклікае нямецка-беларуская ўкрапіна *цуруком*, утвораная ад частковай нямецкамоўнай украпіны *цурук* (ням. *zurück* ‘назад’) з уласцівым беларускай мове канчаткам творнага склону *-ом*: [Немец:] *Цурук!* (Варочае яго назад.) [2-гі ўцякач:] *Вярніся, хай ён падавіцца сваім* ***цуруком****.*

Комплекснае ўжыванне вербальных сродкаў камічнага. У рэпліках персанажаў-суразмоўнікаў могуць ужывацца вербальныя сродкі камічнага розных тыпаў, што садзейнічае стварэнню насычанага камізму: [Пані:] *Не, я-то ўжо бальшавікоў хваліць не магу. Галайстру гэтую, хвэ! І муж мой, доктар, цярпець іх не можа…* [Пісарэвіч (устае):] *Охо-хо… Выбачайце, грамадзянкі, але мне трэба выйсці* ***за фізіялагічнай патрэбаю****: гнілая бульба* ***робіць часцейшы кругазварот.*** (Насвіствае і выходзіць.)

Хто быў нічым,
Той стане ўсім!

У функцыі камічнага ўжываюцца эўфемізм *за фізіялагічнай патрэбаю*, выраз, пабудаваны на канцылярскі лад (*гнілая бульба*) *робіць часцейшы кругазварот*, словы “Інтэрнацыянала”: *Хто быў нічым, / Той стане ўсім!*

Вось якая размова адбываецца паміж Мяшчанкай і бежанцам Пісарэвічам, які шукае пакойчык, каб было хоць дзе прытуліцца: [Мяшчанка:] *Маеце шмат чаго-о? Дык вы мне пакой згноіце, заставіўшы сваім дабром.* [Пісарэвіч:] *У нас яго зусім мала, панічка…* [Мяшчанка (перабіваючы):] *А вы ж казалі – многа.* [Пісарэвіч:] *Ды так…* ***ні многа ні мала: ні кошыкам перанесці, ні пакой згнаіць.*** [Мяшчанка:] *Гм!* ***Вас таўкачом у ступе не зловіш…*** Вербальныя сродкі камічнага: дасціп-гумарызм *ні многа ні мала: ні кошыкам перанесці, ні пакой згнаіць*, выраз *вас таўкачом у ступе не зловіш* (мае адценне жартаўлівасці і звычайна ўжываецца, калі гаворка ідзе пра каго-н. надта ўвішнага, спрытнага).

Такім чынам, камічны эфект у драматычным абразку дасягаецца ўжываннем як спецыялізаваных вербальных сродкаў (іранізмы), так і неспецыялізаваных (алагізмы, выслоўі, фразеалагізмы, прыгаворкі-рыфмаванкі, кантамінаваныя іншамоўныя ўкрапіны). Стварэнню насычанай камічнай экспрэсіі садзейнічае комплекснае ўжыванне вербальных сродкаў.

Спіс літаратуры

1. **Мушынскі, М. І.** Каментарыі / М. І. Мушынскі // Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1985. – Т. 2.

2. **Мішчанчук, М. І.** Максім Гарэцкі / М. І. Мішчанчук // Гісторыя беларускай літаратуры, XIX – пачатак XX ст.; пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – 2-е выд., дапрац. – Мінск : Выш. шк., 1998.

3. **Мушынскі, М. І.** Максім Гарэцкі / М. І. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. : у 4 т. / НАНБ, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 1.

4. **Гаробчанка, Т. Я.** Гарэцкі Максім Іванавіч / Т. Я. Гаробчанка // Тэатральная Беларусь : энцыкл. : у 2 т. – Мінск : БелЭн, 2002. – Т. 1.

5. **Гарэцкі, М.** Выбраныя творы / М. Гарэцкі; уклад. Р. Гарэцкага і Т. Голуб, прадм. і камент. Т. Голуб. – Мінск : Кнігазбор, 2009.

6. **Лаўшук, С. С.** Гарызонты беларускай драматургіі / С. С. Лаўшук. – Мінск : Беларус. навука, 2010.

Васіль РАГАЎЦОЎ,
доктар філалагічных навук.

Аўтар ахвяруе ганарар на развіццё часопіса.

Алесь КАЎРУС

НЕ АДНО СЛОВАМ КЛАСІКАЎ ЖЫВЕ МОВА

ТРОХІ ПРА МОВУ НОВЫХ ВЫДАННЯЎ

Летась адзначаліся юбілеі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка. Можна сказаць, усёй грамадой беларусы аддалі даніну пашаны бясспрэчным аўтарытэтам, многія з нас нібыта пабылі яшчэ раз на ўроках майстроў роднага слова. Пашчасціла і мне прычыніцца да творчай спадчыны класікаў беларускай літаратуры: у сваіх публікацыях звярнуў увагу чытачоў часопіса "Роднае слова" на асобныя словы і звароты, актывізацыя ўжытку якіх можа паслужыць павышэнню культуры мовы на сучасным этапе, закрануў некаторыя аспекты выкарыстання лексікі ў мастацкім творы, у агульнанароднай мове.

А далей што? Здаволіцца гэтым і чакаць наступных юбілеяў? Насамрэч святкаванне ўгодкаў славутых песняроў прывяло, можа, крыху па інерцыі, але заканамерна, да ўсведамлення актуальнасці тэмы: сённяшняе жыццё, функцыянаванне роднай мовы. Кажучы прасцей і больш канкрэтна, захацелася звярнуцца да новых тэкстаў. Перадусім зазначу, што для мяне вартасць тэксту вызначаецца не ў апошнюю чаргу тым, ці ўзбагачае ён мову (літаратурную і маю індывідуальную) на пэўныя словы, формы, сінтаксічныя канструкцыі.

Неяк пры канцы мінулага года на маім стале апынуліся часопіс "Дзеяслоў" і зборнік аповесцяў і апавяданняў Валера Санько [5]. А яшчэ – свежыя нумары беларускіх газет. Паралельна яны гарталіся, чыталіся. Узнікла сітуацыя навукавання, патрэба назіраць, аналізаваць заўважаныя моўныя факты – праз іх супастаўленне ў розных выданнях.

Як новыя (яшчэ не сустраканыя мною) успрыняліся тры словы ў тэкстах часопіса "Дзеяслоў" (2012. № 5). Пачнем іх разгляд з, мабыць, самага запатрабаванага. У беларускай мове ёсць словы *аднойчы*, *двойчы*, *тройчы*. У прыватнасці, можна прачытаць, пачуць: *Чапля* ***двойчы*** *ўздымалася над ракой*; ***Тройчы*** *спрабаваў вырвацца на волю*. Але аднаслоўнага адпаведніка рускага *четырежды* (*четырежды Герой Советского Союза*) у беларускай літаратурнай мове не было. Пісалі: *чатыры разы Герой Савецкага Саюза*. І вось чытаем: *"Слова пра паход Ігаравы" на сучасную беларускую мову перакладалася, здаецца,* ***чацвёрачы****: Янкам Купалам, Рыгорам Барадуліным, Яўгенам Крупенькам, Іванам Чыгрынавым* (с. 317).

Не маючы больш звестак пра слова *чацвёрачы* (з якіх крыніц: дыялектнае, аўтарскі нават твор ці інш.), на падставе нават адзінага ўжывання адважымся канстатаваць: ягоны выступ на друкаваных старонках чаканы і, на першы погляд, удалы.

Чытаем у артыкуле маладога даследніка: *Нават у верш,* ***прынагоджаны*** *да пятай гадавіны часопіса "Полымя" (1926), паэт укладае свае перажыванні і жаданні адносна "загонаў, што засталіся за кардонам"* (с. 288).

Значэнне вылучанага слова, дзеепрыметніка, блізкае да 'прымеркаваны', толькі ў ім падкрэсліваецца сэнс "выкліканы, абумоўлены **нагодай**". Слова сінанімічнае спалучэнню *з нагоды*, але, як свежае, яно выразнейшае.

Падчас напісання артыкула выявілася, што ў беларускай мове ўжываецца прыметнік *прынагодны*, які значэннем адпавядае дзеепрыметніку *прынагоджаны*: *У Рыме гэта* [дзень 1 студзеня, пачатак адміністрацыйнага года] *адзначалася вельмі ўрачыста. Наведвалі адно аднаго, адорвалі падарункамі. Пры гэтым гучалі* ***прынагодныя*** *спевы* (Звязда. 22.12.2012).

Трапіла ў поле зроку чытача-навукоўцы і слова *квятнярка*: ***Квятнярка*** *стаяла на парожку сваёй крамы, зрабіла крок уніз, аступілася і, каб не ўпасці, ухапілася за безліч руж, выхапіўшы з іх адну* (с. 240).

Мажліва, гэты назоўнік ад польскага *kwiaciarka* 'кветачніца' [1]. Пад уплывам беларускай гаворкі паланізм адаптаваўся, відазмяніў сваю форму, стаў яе лексічнай адзінкаю. З дыялектнай мовы, напэўна, слова *квятнярка* пайшло ў літаратурны тэкст.

На наша меркаванне, слова *квятнярка* неаднолькавай запатрабаванасці з лексемай выяўна небеларускага гучання, якая амаль жыўцом бярэцца некаторымі аўтарамі з мовы палякаў, – *капэрта* [1]: *Корпалася ў кнігах, старой карэспандэнцыі і наткнулася на даўнюю* ***капэрту*** *Алеся Пушкіна, у якой ён даслаў мне кнігу вершаў…* (Наша слова. 5.12.2012).

Робячы ацэнку гэтага паланізма, трэба ўлічваць, што беларуская мова мае таксама запазычаны, але здаўна ўлітаратураны назоўнік *канверт* (рус. *конверт* < фр. *couvert*). Згадваецца мясцовы варыянт гэтага слова – *карвэнт* (в. Брусы Мядзельскага раёна). Пры засваенні

Алесь Аляксандравіч Каўрус *– мовазнаўца. Кандыдат філалагічных навук (1965). Закончыў Мінскі педінстытут імя А. М. Горкага (1959). Працаваў настаўнікам на Мядзельшчыне (1959 – 1962), старшым выкладчыкам Мазырскага педінстытута (1965 – 1968), старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН Беларусі (1968 – 1974), рэдактарам выдавецтва "Народная асвета" (1974 – 1981), дацэнтам кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка (1982 – 2006). Даследуе мову мастацкай літаратуры і сродкаў масавай інфармацыі, беларускую тэрміналогію, культуру мовы, стылістыку і інш. Аўтар больш як 250 навуковых публікацый, у тым ліку кніг "З крыніц народнай мовы" (1968), "Стылістыка беларускай мовы" (1980, 2-е выд. 1987, 3-е выд. 1992), "Культура слова" (1983), "Слова наша роднае" (1986), "Мова народа, мова пісьменніка" (1989), "Дакумент па-беларуску" (1994), "Да свайго слова. Пытанні культуры мовы" (2011), суаўтар (з М. Круталевічам) навучальнага дапаможніка для студэнтаў ВНУ "Старославянская мова" (2005).*

слова *канверт* у ім на беларускай глебе (у гаворках) адбыліся фанетычныя змены: перастаноўка гукаў (метатэза), зацвярдзенне зычнага *в*.

Прыемна, калі напаткаю цікавае слова ў тэксце або лексікаграфічным даведніку. Але ўжо сапраўдную радасць перажываю ад сустрэчы з тым словам, з'яўлення якога чакаў і, можа, у нейкай меры гэтаму спрыяў. Як прыклад згадаю аддзеяслоўныя назоўнік і прыметнік *атакоўца*, *атакоўчы*, прапанаваныя мною на ролю адпаведнікаў рускіх назоўніка і прыметніка *атакующий* (Полымя. 1996. № 6). Сустрэць гэтыя словы ў "чужым" тэксце мне не давялося. Але тое, што яны існуюць, сведчыць "Вялікі слоўнік беларускай мовы" Ф. Піскунова (ВСБМ-12), дзе змешчаны аднакаранёвікі *атаковец*, *атакоўца*, *атакоўчы* [4].

Правамернасць вытвораў *атаковец*, *атакоўца* пацвярджаецца наяўнасцю ў беларускай мове іх варыянта з суфіксам *-нік*. У апавяданні В. Санько "Наперад! Ур-а-а-а!!!" ён ужываецца паслядоўна, шэсць разоў. Напрыклад: *Сумленне, шкадаванне за няўдала зробленае і зусім нязробленае не заміналі* ***атакоўнікам***.

Да гэтага тыпу належыць і назоўнік *наступоўнік*, сустрэты ў згаданым творы В. Санько: *Стралялі прыцэльна, з чаго маглі, стралялі ўсе. Гранаты ляцелі ў* ***наступоўнікаў***.

"Вялікі слоўнік беларускай мовы" падае шэраг назоўнікаў-сінонімаў: *наступальнік*, *наступленец*, *наступоўца*.

Як бачым, беларуская мова можа лёгка абыходзіцца без нехарактэрных для яе, скалькаваных з рускай мовы аддзеепрыметнікавых назоўнікаў *атакуючы*, *наступаючы* і пад.

Пакарыстаюся выпадкам, каб звярнуць увагу чытачоў "Роднага слова" на навуковую і практычную вартасць згаданага слоўніка Ф. Піскунова – у прыватнасці, на паўнату падачы беларускай лексікі.

У ім, напрыклад, знаходжу яшчэ некаторыя словы, пра якія ў розны час мне даводзілася пісаць: *дзяяч*, *валжанскі*, *надсожаўскі* ды інш. Прыметнік *надсожаўскі* – адна з важкіх падстаў да абгрунтавання заканамернасці патэнцыйнай формы *сожаўскі* (нарматыўнае *сожскі*, паводле натуральнага беларускага вымаўлення [соскі]). Цікава, што пасля з'яўлення артыкула, прысвечанага і гэтаму слову, удалося пачуць прыметнік *сожаўскі*: *У Гомелі сёння пачынаецца міжнародны харэаграфічны фестываль "****Сожаўскі*** *карагод"* (радыё "Свабода". 15.09.2011).

ВСБМ-12 досыць ашчадна фіксуе словы (варыянты, сінонімы), не суправаджаючы іх, як правіла, абавязаўчымі і забарончымі пазнакамі. Пакідаецца права карыстальніку мовы выбіраць самае прыдатнае ў адпаведнасці з камунікацыйным заданнем і кантэкстам, паводле моўнага, эстэтычнага густу.

Нават вельмі актыўнаму, дасведчанаму чытачу-навукоўцу бывае не пад сілу выявіць патрэбныя для працы (тэмы) словы, якія ёсць у мове. Дапамагчы ў гэтым цяпер можа ВСБМ-12 – сапраўдны моўны клад. І ад нас залежыць, як яго выкарыстоўваць, якія залацінкі-словы падхапіць і падтрымаць.

Шырыня і глыбіня ахопу лексікі – бясспрэчная перавага ВСБМ-12 перад (таксама вялікім) "Слоўнікам беларускай мовы" (Мінск, 2012). Апошні не вельмі спяшаецца ўлучаць многіх слоў, што ўжываюцца ў беларускай літаратурнай мове. Як адзначае прафесар І. Лепешаў у рэцэнзіі на гэты слоўнік, у яго не ўвайшлі некаторыя словы, што былі выяўлены ім, а таксама мною з абсягу так званай пазаслоўнікавай лексікі, ці слоў без прапіскі [3]. Уключэнне ж адметных, у тым ліку рэдкіх, слоў у ВСБМ-12 – важная ўмова для працы з такімі словамі, для іх даследавання і, мажліва, пашырэння ў літаратурным ужытку.

Але вернемся да назіранняў над моваю падаваных выданняў.

Параўнальна з тэкстамі ў часопісе "Дзеяслоў", пабудаванымі на выкарыстанні галоўным чынам агульнаўжывальнай лексікі, аповесці і апавяданні В. Санько выдаюцца вялікай шчыльнасцю аўтарскіх наватвораў. Верагодна, сярод прыводжаных у нашым артыкуле адметных слоў, словаформаў трапяцца такія, крыніца

якіх – родныя пісьменніку слуцкія гаворкі. Гэта вынікае і з анатацыі да кнігі: “Аповесці, апавяданні… кожнага зацікавяць багаццем жывой беларускай мовы”.

Пазаслоўнікавая лексіка, выяўленая ў тэкстах В. Санько, сведчыць пра невычэрпныя магчымасці беларускага словаўтварэння, дэманструе аўтарскую спробу іх рэалізацыі ў абсягу розных часцін мовы, ці не найболей назоўніка і дзеяслова. Падаём прыклады.

Абрабляльнік, аб’яўніца, адведнік, аддзяленцы, вывучэнец, выратавалька, выручэнец, выспавяднкі, выстарванні, выўчанік, габлёўцы, галасавальнік, гарэлька ‘гаротніца’, *дапытнік, жартуцька, заезджалка, засядалец, здабытнік, злітасціўленне, крыўдзельнік, лакіроўцы, наведвалька, недамыслік, няверыца, нявытрымнік, падвучальнік, папраўляльнік, правяральнік, прыбіралька, прышляк, прышлячка, прышэлька, прыязджалка, распытнікі (мужчыны), рашальнікі-паслухмянцы, улагоджвальнік, шкадобнік, шляхаводцы, усебачанцы.*

Словы збольшага зразумелыя без кантэксту. Гэта назоўнікі, што абазначаюць пераважна асоб паводле дзеяння. Таму ў сказе яны часта выступаюць на месцы назоўнікаў з неўласцівымі беларускай мове або малахарактэрнымі для яе суфіксамі, у тым ліку субстантываваных дзеепрыметнікаў тыпу *галасуючы*, *правяраючы*.

Увогуле В. Санько выявіў прыхільнасць да ўжывання назоўнікаў, часта ўтварае іх ад прыметнікаў.

Абмежаванец, адважненцы, адважнік, безгаловік, безуважнік, блакітніцы, ветліўцы, дужэц, зелянва, лагоднік, мужненец, мужнік, наравісцік, настойнік, невінаватавец, нежанацік, нясмельнік, павольнік, памярковец, памяркоўніца, паслухмяннік, пачуццёвік, плячысцік, раслячок, спаважнік, справядлівец, стараннік, упарцік, упэўненцы, утрапёнец, ціхмянец, чарняўчык, шустрык.

Адпрыметнікавыя назоўнікі ў творах В. Санько існуюць пераважна як аказіяналізмы, толькі некаторыя ўжываюцца паслядоўна ці, прынамсі, неаднаразова. Іх можна разглядаць як асаблівасць стылю аўтара. Выкарыстанне такіх назоўнікаў вызваляе пісьмоўцу ад неабходнасці называць носьбіта пэўных прыкмет: хлопец, жанчына і пад. Параўнаем: *памярковец – памяркоўны рэдактар*, *блакітніцы – блакітныя* (*сінія*) *вочы*. З іншага боку, перабудова прыметнікаў у назоўнікі вядзе да паслаблення атрыбутыўнасці (азначальнасці) у сказе, увага акцэнтуецца не на паказе, абмалёўцы, а на канстатацыі, называнні.

У тэкстах В. Санько шмат пазаслоўнікавых дзеясловаў: *выніковіць, падвыніковіць, доказніца, задобразычлівіць, запамагацца, запрынцыповіцца, застрымголіць, захуткасніцца, зкатэгарычнічаць, змізэрніваць, імклівіць, інерцыйнічаць, камандзірыць, клубкавацца, паволіць, падпарадчыцца, радасніць, рэплікавацца, спадзеіць, спакойніць, спалахлівіць, справядлівіць, урачысціць, ускаленіцца, шчаслівіцца.*

Звяртацца да словатворчасці – гэта, бадай, прафесійнае права пісьменніка. Бывае, яму спатрэбіцца слова, каб выказаць больш дакладна пэўнае сэнсавае ці стылістычнае адценне, як, напрыклад, у наступным выпадку: *У яслях світаў нараджэнец зямны, / Над сынам* ***вачэла*** *Марыя* (Р. Барадулін).

Трэба зазначыць, што асобныя з паказаных вышэй слоў можна напаткаць і ў іншых аўтараў, выданнях. Напрыклад: ***Падвынікоўваючы****, сфармулюем кароткае правіла ўтварэння назваў…* (Роднае слова. 2012. № 11). *Пакуль ёсць* ***адважнікі****, будуць і баязліўцы* (Н. Мацяш).

Часткова мы закраналі дзеепрыметнік. Пра месца і ролю гэтай іменнай формы дзеяслова ў творах В. Санько варта сказаць паўней. Тут карціна такая: пісьменнік не ўжывае вытвораў з суфіксамі *-юч-*, *-ўш-*, *-ем-*, а знаходзіць больш адпаведныя беларускай мове лексіка-граматычныя сродкі.

Шырока выкарыстоўваюцца дзеепрыметнікі з суфіксам *-л-*.

Марчук з лёгкаю лянотаю ***адпачылага****, у добрым настроі чалавека прыжмурыўся, сузгодна хітаў галавою*; [Бычок] *у натапыраным здзіўленні стаяў пасярод вуліцы, пазіраў на* ***ляцелыя*** *на яго сані*; *Вераб’і радаваліся ціхаму надвор’ю, іскрыстаму снегу, далёкім хмаркам і* ***ажывелым*** *гаманкім людзям.*

У падобных выпадках дзеепрыметнікі з суфіксам *-л-*, хоць яшчэ і не ўсе звыклыя, успрымаюцца чытачом адэкватна.

Аднак пры гэтым мусім адзначыць. Нягледзячы на тое, што аўтар у цэлым стаіць за нацыянальную своеасаблівасць сваёй мовы, на практыцы ён часам будуе сказ, ідучы ад узораў рускай мовы.

Недарэзаны бык, ***зазналы*** *дотык смерці, як правіла, уцякацьме…* У гэтым разе, мабыць, лепш падышло б дзеепрыслоўе: *Недарэзаны бык,* ***зазнаўшы*** *дотык смерці… уцякацьме.*

Яшчэ не доўга – і выйдуць ёй насустрач Змітрок і Параска Панцырэвічы, яна перадасць ім, ***прыехалым*** *нашмат зараней, дарагі пакунак* [дзіця]. Тут варта замяніць дзеепрыметнікавы зварот даданым азначальным сказам *што прыехалі нашмат зараней.*

…тым мацней адчынялася мінулае, ***былое*** *не з ім – з бацькам.* Дзеля граматычнай і сэнсавай пэўнасці, адназначнасці дзеепрыметнік *былое* патрабуе замены: *…тым мацней адчынялася мінулае, тое, што было не з ім…*

Не мае права кропля не выканаць волю ракі, завяшчання сябра, які перад смерцю, як і ўсе ***паміралыя****, думаў пра самае галоўнае ў жыцці.* Слова *паміралыя* падлягае замене: *хто памірае* ці *паміраючы* (дзеепрыслоўе).

У плане ўсвядомленага пошуку адпаведнікаў нехарактэрных для беларускай мовы дзеепрыметнікаў заслугоўваюць падтрымання вытворы з суфіксамі *-н-*, *-оў-н-*: *– Лес густы, снег угары, меней на зямлі. Лягчэй баразнаваць каню, – Марчук паказвае на сняжынкі,* ***сыходныя*** *з воблачных гор.* Параўнаем аналагічнае словаўжыванне: *Шчыра віншую ўсіх нашых пакупнікоў, а таксама работнікаў універмага з* ***надыходнымі*** *Калядамі і Новым годам!* (Звязда. 22.12.2012).

…Карыды вогненныя іскры ўвайшлі ў сэрца Аляксея Бялько. Іскры гэтыя, як і бывае сярод ***шугоўных****, былі розныя, прамяніліся своеасабліва…*; ***Іскроўны*** *ручаёк, адчуў Буганера, перастаў шугаць уверх, пацёк убок і ўніз*; *Рух мулетаю,* ***танцоўнае*** *перасоўванне ног матадора былі непаўторнымі.*

Відаць, да апошніх слоў можна далучыць даўнейшае ўтварэнне *працоўны* (цяпер назоўнік і прыметнік). У кнізе "Да свайго слова" прыведзена больш як дзесяць такіх прыметнікаў: *атакоўны*, *існоўны*, *пульсоўны*, *рэфлексоўны* ды інш. [2]. Гэта абгрунтоўвае правамернасць адзначаных індывідуальных словаўжыванняў В. Санько. Праўда, у выпадку з адным падобным прыметнікам яго напаткала няўдача: [Рэдактар часопіса] *не абавязаны быць добранькім, усім* ***спачоўным***. Гэтае слова (сустрэлася не раз) марфемна ўсечанае і семантычна недавыражанае. Як відаць з кантэксту, яно значэннем адпавядае нарматыўным прыметнікам *спагадны*, *спагадлівы*, *спачувальны*. Выходзіць, тут можна абысціся без наватвора.

Пільна прыгледзімся да дзеепрыметнікавых формаў з суфіксам *-н-* (*-ан-*), якім у рускай мове (і калькаванай беларускай) адпавядаюць утварэнні з суфіксамі *-ем-*, *-им-*.

"Буду есці бульбу, а казацьму м'яса", – яго любімая думка, часта ***выказваная*** *ў сям'і, на працы*; *Трахім Славашэвіч адчуў, ляпнулася лішняе пра нікому* ***невыказваную*** *інтымніцу*; *Людзі мяняюцца, словы, матывацыя, сэнс* ***навязваных*** *парадаў – нізашта*; ***Стрымваная*** *гадамі нянавісць… прарвалася ў нечаканым месцы нечаканым чынам*; *Стадыён… раптам замёр. Ад здзіву, захаплення, ад убачанага* ***твораннага*** [так! – ***А. К.***] *на вачах цуда.*

Вылучаныя формы – яскравая праява спецыфікі марфалогіі беларускага дзеяслова. Пра іх жыццёвасць сведчыць сённяшняя моўная практыка.

Чаго толькі не шле на чалавека / Бязлітасны і непахісны лёс: / І рак, / І вечных стрэсаў небяспеку, / І ***забываны*** *ўжо туберкулёз* (Г. Бураўкін). ***Адчуваная*** *ўсім жывым ісціна ў іх* [маці і дачкі] *не была так цвёрда выфармуляванай* (Наша слова. 12.12.2012). *Персанал "Іскамедтэха" – амаль 70 чалавек. Гэта… аптымальная колькасць для любога сярэдняга прадпрыемства. Тады яно* ***кіраванае****, можа гібка рэагаваць на знешнія выклікі…* (Звязда. 22.12.2012). *З часам ён прызвычаіўся да сваіх жахлівых сноў і прывучыўся нават да пэўнай* ***кантраляванай*** *стрыманасьці ў сьвеце мрояў* (В. Воранаў).

У прадмове да сваёй кнігі В. Санько згадвае, як у рэдакцыях выпраўлялі яго рукапісы, і прыводзіць ілюстрацыі:

…ад ста грамаў, ***выдаваных*** *→ …ад ста грамаў,* ***якія выдаваліся***; *…напярэдадні хвіліны літасці → …напярэдадні* ***рашаючай*** *хвіліны літасці.*

Прыклады красамоўныя. З аднаго боку, рэдагавальнікі не прымаюць натуральных беларускіх формаў дзеяслова (*выдаваны*), з другога – нават устаўляюць за аўтара ў яго тэкст запазычаныя, заштампаваныя словы (*рашаючы*), ігнаруючы дзейныя нормы (*вырашальны*).

На фоне пошукаў (і знаходак) у абсягу лексікі і граматыкі, якія вядуцца адным з шараговых літаратараў, здаюцца неапраўданымі "рэверансы" некаторых аўтараў часопіса "Дзеяслоў" у бок мовы, запанавалай на Беларусі. Падаём ілюстрацыі.

Вобраз ***акупаваўшых*** *дубы варон рэмінісцыруе ранейшых Купалавых груганоў* (с. 283). Напэўна, больш натуральным быў бы сказ (у тым ліку парадак слоў): *Вобраз варон, што* (*якія*) *акупавалі дуб, рэмінісцыруе ранейшых Купалавых груганоў*. У такой рэдакцыі акцэнтавалася б слова *акупаваць*, больш празрыстаю стала б выказаная думка.

Для шукальнікаў скарбаў… успамін ёсць на сённяшні дзень найбольш ***інтрыгуючым*** *у таемным лёсе скарбаў Напалеона* (с. 306). У беларускай літаратурнай мове існуюць варыянты вылучанага слова – *інтрыгавальны*, *інтрыгоўны*. Апошні можна ўжываць (з папраўкай на гучанне) у форме *інтрыгоўчы* – на ўзор ужо вядомых беларускай мове прыметнікаў з суфіксамі *-оў-ч-*: *абслугоўчы*, *арганізоўчы*, *атакоўчы*, *мабілізоўчы*. Мэтазгодна і правамерна гэты шэраг вытвораў папоўніць: *кантралёўчы* (рус. *контролирующий*), *падсумоўчы* (рус. *суммирующий*), *рэгулёўчы* (рус. *регулирующий*).

Жакасу неверагодна пашанцавала, ён застаўся жывым [ці не лепей *жывы*? – ***А. К.***], *бо яго,* ***паміраючага****, падабрала беларуская маладзіца* (с. 311). Дзеепрыметнік *паміраючага* варта замяніць на сінтаксічныя канструкцыі *што паміраў* / *што быў пры смерці*.

Але ***мяркуемай*** *размовы назаўтра не адбылося* (с. 313). У беларускай мове нарматыўнай

лічыцца дзеяслоўная форма *меркаваны*. Параўнаем: *Прэм'ер-міністр Расіі Дзмітрый Мядзведзеў адзначыў, што беларуска-расійскі тавараабарот па выніках года дасягне $ 40 млрд. На думку кіраўніка расійскага ўрада,* ***меркаваны*** *рост па выніках года беларуска-расійскага тавараабароту ў значнай меры з'яўляецца вынікам стварэння Мытнага саюза* (Звязда. 13.12.2012).

Хочацца асобна звярнуць увагу на адзін выпадак. Рускі выраз *самый читаемый автор* перакладаюць: *самы чытаны аўтар*, *самы чытальны аўтар*, а дзе-хто пакідае яго амаль без перакладу. У часопісе "Дзеяслоў" (с. 331), як гэта сустракаецца ў іншых выданнях, бачым слова *чытэльны*: *Сярод беларускіх пісьменнікаў савецкай эпохі менавіта Іван Шамякін з'яўляўся адным з самых* ***чытэльных*** *аўтараў*. Новае значэнне ў слове *чытэльны* можа замацавацца побач з традыцыйным 'які лёгка чытаецца; які можна прачытаць' (ТБСМ, т. 5, кн. 2).

А вось самае апошняе натрапленае ўжыванне слова *чытэльны*: *Л. Рублеўская, разгарнуўшы падзеі на фоне вірлівага XVIII ст., нібыта асцерагаецца, што яе зграбны і* ***чытэльны*** *тэкст будзе ўспрыняты літаральна, як проста займальная гісторыя пра шкаляра і алхіміка, – і яна піша прадмову да кнігі* (Звязда. 20.12.2012). Як вынікае з гэтага сказа і шырэйшага кантэксту, прыметнік *чытэльны* мае значэнне 'які лёгка, цікава чытаецца паводле выкладу зместу (а не праз выяўнасць, разборлівасць напісання літар і слоў)'.

Такім чынам, даўняе слова *чытэльны* пашырае свой семантычны дыяпазон, пра што сведчыць і кампазіт, састаўной часткай якога стаў гэты прыметнік: ***Цяжкачытэльныя*** *кнігі становяцца разнавіднасцю выпрабавання: паспрабуй прачытаць тое, што не паддаецца чытанню* (ЛіМ. 21.12.2012).

Мы спыніліся толькі на некаторых складніках мовы часопіса "Дзеяслоў" і зборніка В. Санько. У абодвух выданнях ёсць здабыткі і страты. Заўважнае імкненне аўтараў скарыстаць лексіку і фразеалогію, сродкі беларускай граматыкі і стылістыкі ў рэальнай паўнаце, з улікам іх мастацкай мэтазгоднасці.

Але, на жаль, адначасова трапляюцца элементарныя адхіленні ад кадыфікаваных моўных нормаў. Так, пераможца конкурсу маладых літаратараў "Экслібрыс" піша: *Яе прыцягвала гэтая нястрымная энергія, што* ***біла*** *з дзяўчынкі* ***ключом*** (с. 209). Фразеалагізм *біць ключом* у беларускім тэксце сёння – грубая памылка. Ёсць агульнаўжывальны эквівалент *біць крыніцай* і яшчэ малапашыраны дзеяслоў *крынічыць*. Апрача таго, з боку граматыкі, мабыць, лепш: *энергія біла крыніцай* (*крынічыла*) *у дзяўчынкі* (а не *з дзяўчынкі*). Варта дадаць, што ў артыкуле Якуба Коласа ўжыты сінанімічны зварот: *Творчае жыццё народа* ***б'е*** *буйным* ***струменем*** (т. 12, 1976, с. 12).

Нельга не сказаць, хоць у самых агульных рысах, пра моўныя (а значыць, і мастацкія) недахопы ў тэкстах В. Санько.

Аўтар дапушчае адхіленні ад лексічных нормаў (*дажыдацца*, *зачастую*, *людзішкі*, *стая*, *шаг*), ад правілаў граматыкі і арфаграфіі (*па майму настаянню, фінальнага старта*, *кацяць бочкі*, *радзіска*, *разсякаць*) і тым самым "дражніць гусей", настройвае супраць сябе рэцэнзентаў і рэдактараў. У гэтых адносінах ён не проста "ўпарцік", як паблажліва-мякка сказана ў пасляслоўі да кнігі за подпісам доктара філалагічных навук Арсеня Ліса, а найсапраўдны беларускі *вýпар* (маё роднадыялектнае слова, ёсць у ВСБМ-12).

Парушэнне арфаграфічных нормаў не выклікаецца патрэбамі своеасаблівасці выказвання думкі, нават самай арыгінальнай, хіба што зрэдку абумоўлена аб'ектыўнай цяжкасцю вызначыць правільны варыянт. Усе недаборы і лішноты мовы і стылю засцяць тое добрае, што чэрпаецца аўтарам з крыніц роднай мовы, "выстарваецца" (творыцца) ім самім.

Чытача, асабліва пісьменніка, журналіста, філолага, могуць зацікавіць рэгіянальныя словы, звароты, пераважна слуцкізмы: *магчыся* 'намагацца' (*Трахім* ***могся*** *аўтарытэтнічаць хоць у чым*), *заслед* 'услед', *трэбла* 'трэба было', *кмеціць* 'цаляць', *кметкі* 'трапны, меткі', *санькі*, *скрынька*, *убесплаць* 'бясплатна', *цюцля ў цюцлю* ды іншыя. Сустракаецца даўнейшая форма дзеясловаў будучага часу: *Сідаравічанцы* [жыхары в. Сідаравічы] ***гаварыцьмуць***.

Нашы заўвагі – гэта ў нейкай меры і адказ на просьбу В. Санько (у "Прадмове") да "люду беларускага" выказацца наконт ягонай творчасці: "Дык абзавіцеся, людцы, прашу, малю, укленчваю. Не прашу дапамогі – аб'ектыўнасці, праўды, толькі праўды".

Шкада (а можа, і добра), што з такою просьбаю да чытачоў звяртаюцца толькі лічаныя аўтары.

Спіс літаратуры

1. **Волкава, Я. В.** Польска-беларускі слоўнік / Я. В. Волкава, В. Л. Авілава. – Мінск : БелЭн, 2004.

2. **Каўрус, А. А.** Да свайго слова. Пытанні культуры мовы / А. А. Каўрус. – Мінск : РІВШ, 2011.

3. **Лепешаў, І.** Слоўнік добры, але не надта… / І. Лепешаў // Наша слова. – 2012. – 6 чэрв.

4. **Піскуноў, Ф. А.** Вялікі слоўнік беларускай мовы / Ф. А. Піскуноў. – Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2012.

5. **Санько, В. А.** Ненадрукаванае. У белдзяржструктурах. Аповесці, апавяданні / В. А. Санько. – Мінск : Смэлтак, 2009.

6. **Слоўнік беларускай мовы.** – Мінск : Беларус. навука, 2012.

Чаму мы так гаворым

ПРА ПАХОДЖАННЕ ПРЫКАЗАК

Заканчэнне. Пачатак у № 12 за 2012 г.

Пададзім прыказкі, разнастайныя паводле свайго паходжання.

Адклад не ідзе на лад. *Уласна беларуская.* Не варта адкладваць на пазнейшы час тое, што можна ці трэба зрабіць неадкладна. – *Дык жа можна схадзіць па венікі і заўтра. – Адклад не ідзе на лад. Рабі, што я табе сказала, – строгім голасам загадала Вера* (М. Паслядовіч).

Магчыма, прыказка напачатку найчасцей ужывалася ў дачыненні да сватання, якое пры яго адкладванні "часта разладжвалася" [1, с. 121].

Дай божа, каб усё было гожа, а што нягожа – не дай божа. *Уласна беларуская.* Ужываецца як застольны тост або як найлепшае пажаданне каму-небудзь. – *З потам прыйшла хвароба, з потам хай пойдзе, – шаптала маці, – пральецца на зялёную траву, на чыстую расу… Дай божа, каб усё было гожа, а што нягожа – не дай божа…* (В. Шырко).

Прыказка пабудавана на прыёме сінтаксічнага паралелізму, супрацьпастаўленні аднакаранёвых, але антанімічных слоў (*гожа*, *нягожа*) і двух сэнсава супрацьлеглых выклічнікавых выразаў: *дай божа* – выказванне пажадання чаго-небудзь і *не дай божа* – выказванне засцярогі ад чаго-небудзь нежаданага, недапушчальнага.

Дзед бабцы купіў лапці, былі малыя – абсек пальцы. *Уласна беларуская.* Гаворыцца як іранічная ці асуджальная ацэнка чыіх-небудзь безразважных дзеянняў або намераў. *І да такога ў нас даходзіла зусім нядаўна* ["пры Кебічу"]*: так аб'яднацца з багацейшай, мацнейшай суседкай, што і бюджэт ёй падпарадкаваць, і нацыянальны банк. Згадалася даўно пачутае ад старое маці: "Дзед бабцы купіў лапці, былі малыя – абсек пальцы". Няўжо і такая мудрая палітыка народам нашым даўно прадугледжана?* (Я. Брыль).

Прыказка з сюжэтным патэнцыялам і нерэальным вобразам у яе аснове.

Дзе фэст, там і я ест. *Уласна беларуская.* Гаворыцца, часцей іранічна, пра тых, хто любіць пастаянна наведваць гулянкі, сходы і пад. *У Мядзведзічах было сёння трохі чужога народу з суседніх вёсак. Гэта найбольш былі браты, сваты, швагры, зяці і іншыя катэгорыі сваяцтва. Шмат якія з іх былі такія аматары, што смела пра сябе маглі сказаць: дзе фэст, там і я ест* (К. Крапіва).

Утворана з выкарыстаннем для рыфмы польскага слова *jest* замест беларускага *ёсць*. Назоўнік *фэст* у складзе прыказкі абазначае не царкоўнае, а любое іншае свята ці пэўнае мерапрыемства з гулянкамі.

Забаронены плод салодкі. *Паўкалька з рускай мовы: Запретный плод сладок.* Штосьці прывабнае, спакуслівае, але недазволенае заўсёды прыцягвае, вабіць. *Рыхцік маніў, а яму верылі, і малыя верылі, і дарослыя. Гарвась спрабаваў зразумець, чым ён адурманьваў людзей, чаму яны цягнуліся да яго, як галодныя да хлеба, верылі паганаму слову, а не боскаму. "Забаронены плод салодкі!" – вучыў ён братоў і сясцёр* (А. Кажадуб).

У рускай мове прыказка склалася на аснове біблейскага міфа пра першых людзей на зямлі. Паводле Бібліі, Бог дазволіў Адаму і Еве есці плады з усіх дрэў, акрамя Дрэва пазнання дабра і зла: "І не датыкайцеся да іх, каб вам не памерці" (Быццё, 3, 3; 2, 16 – 17). Аднак занадта цікаўная Ева не ўтрымалася, каб не сарваць забаронены плод, і спакусіла таксама Адама. За гэта абое былі пакараны і выгнаны з Раю. На базе прыказкі ўтварыўся фразеалагізм *забаронены плод*, які ўжываецца са значэннем 'штосьці прывабнае, спакуслівае, але недазволенае': "Грамадзянін Міхалёў пакаштаваў *забаронены плод*, які аказаўся для яго атрутным" (А. Масарэнка).

За пастой грошы не плацяць. *Уласна беларуская.* Кажуць пры запрашэнні сесці. *Ваўчок, прыткнуўшыся да большага, абслізганага ўлетку* [каменя], *махнуў рукою, запрашаючы сесці Міцю: – Садзіся, чаго там, за пастой, як кажуць, грошы не плацяць* (В. Адамчык).

Утворана з эфектыўным выкарыстаннем слова *пастой*: з аднаго боку, яно як бы ў форме загаднага ладу ад дзеяслова *пастаяць*; з другога – гэта як бы назоўнік *пастой* у сэнсе 'часовае знаходжанне ці пражыванне ў нанятым памяшканні' (у ТСБМ гэты назоўнік апісаны як трохзначны). У "Новай зямлі" Якуба Коласа двухсэнсавасць гэтага слова пазначана двукоссем: «– Сядай, мой мілы, мой харошы, бо за "пастой" не плацяць грошы, – сказаў сярмяжнік дабрадушны».

Зранку і коні не п'юць. *Уласна беларуская*. Кажуць суразмоўніку, адмаўляючыся ад яго запрашэння нашча, зранку выпіць спіртнога. – *Сядай, вып'ем разам… – Зранку не спажываю і табе не раю. Зранку і коні не п'юць. Пакінь на вечар* (К. Мохар).

У чатырохзначным дзеяслове *піць* два першыя значэнні такія: 'глытаць якую-небудзь вадкасць' і 'ўжываць спіртныя напіткі'. Абодва гэтыя значэнні рэалізуюцца ў прыказцы-каламбуры *Зранку і коні не п'юць*.

І козы сытыя і сена цэлае. *Уласна беларуская*. І для адных, і для другіх выгадна. Гаворыцца, калі імкнуцца знайсці выйсце з цяжкага становішча. Часцей ужываецца ў складаным сказе пасля злучніка *каб* ці *калі*. *Казік падышоў да прадаўшчыцы, стаў раіцца з ёю, што б гэта купіць свайму зяцю, каб, як кажуць, і козы былі сытыя і сена цэлае* (В. Дайліда).

Прыказка ўтварылася па аналогіі і на ўзор структурна аднатыпнай і семантычна тоеснай парэміі *І воўк сыты і козы цэлыя*, а магчыма, і не без уплыву вядомых у заходнееўрапейскіх мовах прыказак, у якіх супастаўляюцца *каза* і *капуста*. Напрыклад, у французскай мове: *Menager la chèvre et la chou*; у нямецкай мове: *Die Ziege ist satt und der Kohl unberührt*.

Каму па каму, а каму (нам, мне) <дык> два камы. *Уласна беларуская*. Гаворыцца няўхвальна, калі неаднолькава адносяцца да каго-небудзь, несправядліва дзеляць што-небудзь і пад. [Гарошка:] *Польскія лаюць рускіх, рускія лаюць польскіх, а як прыйдзе што да чаго, каб нашага простага чалавека пакрыўдзіць, дык і польскія, і рускія ў адну дудку граюць*. [Гануля:] *Ды яно ж гэтак, мой сваток. Каму па каму, а нам, казаў той, дык два камы* (Я. Купала).

У часы І. Насовіча прыказка мела абмежаваную сферу прымянення, гаварылася "ў насмешку таму, каму пры бойцы ці пакаранні пападала болей, чым другім" [1, с. 67]. З мастацкага ж боку гэтая прыказка – паэтычная мініяцюра: яна вобразная, алегарычная, каламбурнага характару (абыгрываюцца амаформы *каму* – ад займенніка *хто* і *каму* – ад назоўніка *ком*), у ёй ёсць рыфма ў першай частцы, рытм (амфібрахій у 1-й частцы і анапест у 2-й), антытэза, гукапіс, эфектыўная таўталагічнасць аднолькавага, аднакаранёвага і сугучнага слоў.

На вяку ўсяго нажывеш – і Кузьму татам назавеш. *Уласна беларуская*. У жыцці здараецца так, што абставіны прымушаюць выказваць пашану каму-небудзь. [Пацяруха:] *Ды ён не зайздросціць, ён… ад хвалявання так сказаў. Нервуецца вельмі – лекцыя пад пагрозай зрыву*. [Ганна Піліпаўна:] *Ад хвалявання ўсё можа быць. Нездарма ж людзі кажуць, жывучы, усяго нажывеш – і Кузьму татам назавеш* (Н. Гілевіч).

Гэтая прыказка, паводле І. Насовіча, «бярэ пачатак ад наступнага аповеду. Адзін пасынак, прывыкшы з маленства называць айчыма па імю Кузьмой, і, падросшы, не пакідаў сваёй прывычкі. Але аднойчы, везучы з айчымам па возе пшаніцы снаповай, неяк уз'ехаў на ўзгорак і трапіў пад воз, які перакуліўся на яго. Пасынак з крыкам клікаў на дапамогу свайго Кузьму, які ехаў наперадзе, але Кузьма, не адклікаючыся, працягваў ехаць. Пасынак, бачачы няўвагу айчыма, пачаў крычаць: "Тата, тата! Памажы мне вылезці". Айчым зараз жа спыніўся і вызваліў пасынка, але той, прыехаўшы дамоў, пры апавяданні пра такі выпадак сказаў: на вяку ўсяго нажывеш – і Кузьму татам назавеш» [1, с. 83].

Не адзін Гаўрыла <што> у Полацку. *Уласна беларуская*. Хто-небудзь ці што-небудзь не з'яўляецца адзіным прадметам размовы. – *А граф Тышкевіч, выпадкова, не далёкі ваш родзіч? – Не адзін Гаўрыла ў Полацку, – усміхаецца Аляксандр Леанідавіч, – хоць, хто яго ведае, карані ў нас лагойскія…* (В. Шырко).

Паводле І. Насовіча [1, с. 207], Гаўрыла (Гаўрыіл) Полацкі "быў славуты прапаведнік і выкрывальнік заганаў, недахопаў" (даты жыцця не называюцца).

Пан з пана – пан, пан з хама – хам. *Уласна беларуская*. Кажуць з пагардай пра таго, хто, стаўшы кіраўніком, прывілеяванай асобай, панам, не пазбавіўся сваіх ранейшых, прыродных адмоўных звычак, якасцей. *Рабская, хамская пыхлівасць цешыць самалюбства героя-антыгероя* [у вершы Я. Купалы "…О, так! Я – пралетар!"], *кіруе інтанацыяй, з якой ён прамаўляе. Ён – воляй гістарычнага лёсу – цар. А па сутнасці: быў рабом, рабом і застаўся. Ці, як цвердзіць народная мудрасць: пан з пана – пан, пан з хама – хам* (А. Петрушкевіч).

Прыказка, узніклая ў народнай мове, пабудавана на абыгрыванні слоў *пан* і *хам*, на іх адначасовым двухсэнсавым выкарыстанні. *Пан* (гл. ТСБМ) мае 5 значэнняў і адно адценне, *хам* – 2 значэнні.

Свая рука ўладыка. *Відаць, запазычанне з рускай мовы: Своя рука владыка; параўн. і ва ўкраінскай мове: Своя рука владика.* Кажуць няўхвальна пра таго, хто дзейнічае толькі па сваім жаданні, бярэ, прысвойвае тое, што хоча. *Крыху пазней арыштавалі і Лагуна. Ад яго прывезлі ў раён дзве грузавыя машыны дыхтоўнай мяккай мэблі і іншага дабра, нарабаванага ў панскіх маёнтках. Не дзіва – свая рука ўладыка,*

кажуць людзі. Быў першым старшынёй у гміне пасля вызвалення і выкарыстаў гэта ў сваю карысць (М. Машара).

Супастаўленне рукі з уладыкам азначала, што яна мае такую ж уладу, як уладыка, г. зн. мітрапаліт. У старажытнасці мітрапаліт удзельнічаў ва ўсіх дзяржаўных справах, а імя ўладыкі ва ўсіх дагаворных граматах і іншых дакументах стаяла перад імем вялікага князя.

Так нічога не бывае <усё за грошы>. *Уласна беларуская*. Ужываецца іранічна як рэакцыя на слова *так*. [Ядзя:] *Каб ты быў добры, дык і жонка была б добрая, а так…* [Іван:] *Так нічога не бывае, усё за грошы!* (З. Дудзюк).

Слова *так* ужываецца як прыслоўе, часціца і злучнік і мае, паводле ТСБМ, 13 значэнняў і 6 адценняў. Прыказка пабудавана на іранічным пераасэнсаванні слова *так*, выступае як рэакцыя на гэтае слова, ужытае ў папярэднім незакончаным ці няпэўным выказванні суразмоўніка.

Усякі (кожны) чорт на сваё кола ваду цягне. *Уласна беларуская*. Кожны чалавек усё робіць на сваю карысць. – *Кожны чорт на сваё кола ваду цягне, – сказаў баярын Белакур, землі і сядзіба ў якога былі над ракой Шчарай. – Трэба нам, князь Войшалк, узнімаць дружыну, узнімаць апалчэнне мужоў, новаграджан, слаць ганцоў да кунігаса Міндоўга і разам з ім бараніць дзяржаву* (Л. Дайнека).

"У беларусаў, – пісаў І. Насовіч, – ёсць павер'е, што ўсякі млын і нават кожнае млынавое кола мае свайго апекуна-чорта" [1, с. 18]. Дарэчы, на аснове гэтай прыказкі склаўся дзеяслоўны фразеалагізм *цягнуць ваду на сваё кола*, што значыць 'рабіць усё на сваю карысць, служыць выключна асабістым інтарэсам, не клапоцячыся пра іншых'; напрыклад: "Яму, Валеру, увесь час здавалася, што не мізэр, як лічыў Пятро, а шмат людзей імкнецца прыстасавацца ў жыцці як найлепей і цягнуць ваду адно на сваё кола" (У. Рубанаў).

Хапіў з дзежкі, аж (што) не бачыць сцежкі. *Уласна беларуская*. Кажуць насмешліва пра п'янага. [Грушэўскі:] *Учора ў аднаго майго друга быў дзень нараджэння… Адзначылі як мае быць. Я заначаваў у яго на дачы… Дык і сёння яшчэ шал з галавы не выйшаў.* [Ракітны:] *Гэта называецца – хапіў з дзежкі, аж не бачыць сцежкі* (К. Крапіва).

У спалучэнні *хапіў з дзежкі* – прыхаваны намёк на пяршак – 'першую самагонку з сумесі, прызначанай для браджэння пры вырабе гарэлкі'. *Дзежка* – драўляная пасудзіна з прамых клёпак (для заквашвання цеста, прыгатавання брагі і інш.).

Хто не працуе, той не есць. *Прыказка (як калька) ужываецца ў многіх еўрапейскіх мовах.* Пра недапушчальнасць дармаедства, паразітавання. [Каваль:] *А жыць з чаго будзеш?* [Фрося:] *На бабчыны грошы.* [Каваль:] *Ты што, жартуеш, каб я, рабочы, ды на гэткі спосаб. О не!.. Так няможна, ты ведаеш – ёсць такі закон: хто не працуе – той не есць* (У. Галубок).

Паходзіць з Біблії: "Калі хто не хоча працаваць, той не есць" (Другое пасланне да Фесалонікійцаў, 3, 10).

Чуў, кум, сонца, бачыў гром? *Уласна беларуская*. Ужываецца як выказванне здзіўлення ад чагосьці нечаканага, незвычайнага, пачутага ад суразмоўніка. [Аўлас:] *Ці ж так просяць? Мая гармонь ласку любіць… Ласку з паперачкамі.* [Юрка:] *Чуў, кум, сонца, бачыў гром?* (А. Макаёнак).

Прыказка іранічнай накіраванасці, пабудаваная на знарочыстым парушэнні лагічнасці маўлення (*чуць… сонца, бачыць… гром*).

Язык без касцей. *Агульная для ўсходнеславянскіх і польскай (Język bez kości) моў.* Нагаварыць можна ўсяго, што хочаш. Кажуць, калі не надаюць значэння якім-небудзь чуткам, чыёй-небудзь балбатні. *Уздыхае Віцька Зайцаў… Трэба было ідэю ратаваць… Бо начальству што?.. Любое шэфства можа ўзяць. Язык без касцей. Яшчэ і ў раённай газеце напішуць пра гэтае шэфства* (П. Місько).

Відаць, прыказка ў яе сучаснай форме склалася ў выніку скарачэння, адпадзення яе другой часткі, удакладняльнай, паясняльнай. У парэміялагічных зборніках XIX ст. яна фіксавалася так: *Язык без касці – усё хвашчы*; *Язык без косці – што хоча, то хлосціць*; *Язык без касці – што хоч, то й хвашчы.*

Я не арганісты (не музыкант), не перабіраю. *Уласна беларуская*. Я не пераборлівы. – *Во, харошую знайшоў! Гэта ж некалі да яе ўсе хлопцы сваталіся… – Я ж не музыкант – не перабіраю. Якую ўжо бог даў, – Імполь чуў, што не можа схаваць сваю злосць, раздражняла гэта распытванне…* (В. Адамчык).

Гэтая прыказка каламбурнага характару: у ёй дзеяслоўны кампанент мае дваякі сэнс: 'рытмічна кратаць пальцамі (інструмент)' і 'быць пераборлівым'.

Спіс літаратуры

1. **Сборник белорусских пословиц**, составленный И. И. Носовичем. – СПб. : Отд. русск. яз. и словесности Импер. АН, 1874.

Іван ЛЕПЕШАЎ,
доктар філалагічных навук.

Назвы роднага краю

Я ТУТ ЖЫВУ

ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ГЕЛОНІМАЎ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

Малая радзіма… Дзе б чалавек ні жыў, у яго памяці назаўжды застаюцца краявіды родных мясцін, іх найменні, якія не заўсёды яму нават зразумелыя. Уласныя назвы геаграфічных аб'ектаў вывучае адзін з раздзелаў анамастыкі – тапаніміка. Тапонімы не толькі вылучаюць аб'ект з ліку іншых, але і захоўваюць у сваіх утваральных асновах цікавыя звесткі пра мінулае: знаёмяць з гісторыяй рассялення плямён, народнасцей, характарызуюць прыродныя ўмовы мясцовасці, тагачасны жывёльны і раслінны свет, занятак насельніцтва.

З уласнымі назвамі, ці онімамі, вучні ў школе сустракаюцца на ўроках гісторыі, геаграфіі, мовы і літаратуры, але не атрымліваюць дастаткова поўнай інфармацыі пра іх. Праца з онімамі зводзіцца ў асноўным да вывучэння іх правапісу або да знаёмства з энцыклапедычнымі звесткамі. Аднак у апошнія гады сярод студэнтаў і навучэнцаў ліцэяў, гімназій, сярэдніх агульнаадукацыйных школ сталі праводзіцца разнастайныя лінгвістычныя конкурсы, у тым ліку і па тапанімічнай тэматыцы. Агляд конкурсных работ вучняў дазволіў заўважыць, што ў іх адсутнічае аналіз онімаў, падаецца, на жаль, толькі пералік даволі цікавага, змястоўнага мясцовага матэрыялу. А гэта, у сваю чаргу, сведчыць пра няведанне методыкі працы з фактычным матэрыялам. Таму мэта нашага артыкула – дапамагчы настаўнікам і вучням у лінгвістычнай апрацоўцы онімаў, у авалодванні неабходнымі тэарэтычнымі звесткамі і практычнымі навыкамі ў галіне анамастыкі.

Першыя крокі ў адзначаным кірунку былі зроблены В. Емельяновіч, якая прапанавала праграмы "Тапанімічнага гуртка" і факультатыву "Беларуская анамастыка" [10, 11]*. Мы ж не абмяжоўваем рамкамі працы настаўніка-філолага, а даём магчымасць яму самому, зыходзячы з умоў навучальнай установы, праявіць ініцыятыву, творчыя магчымасці падчас вывучэння ўласных найменняў. Калі настаўнік правільна падбярэ формы арганізацыі работы, то праца будзе карыснай, цікавай, вучні змогуць самастойна рашаць пастаўленыя перад імі задачы. Нашы рэкамендацыі ў гэтым кірунку наступныя.

Пачатковы этап – знаёмства з класамі онімаў. Так, у анамастыцы (з грэч. 'майстэрства даваць імёны') вылучаны антрапонімы – імёны, імёны па бацьку, прозвішчы, мянушкі, псеўданімы (ад грэч. *anthropos* 'чалавек' і *onyma* 'імя'), сярод тапонімаў – айконімы (назвы населеных пунктаў, грэч. *oikos* 'жыллё'), гідронімы (назвы водных аб'ектаў, грэч. *hydor* 'вада'), урбанонімы (назвы ўнутрыгарадскіх аб'ектаў, грэч. *urbanus* 'гарадскі') і мікратапонімы (назвы дарог, шляхоў, участкаў палёў, лесу, сенажацей і г. д.). Асобна вылучаны анемонімы – уласныя імёны ўраганаў, цыклонаў, тайфунаў, вятроў (грэч. *anemos* 'вецер'), заонімы – мянушкі жывёл (грэч. *zoon* 'жывёліна'), ідэонімы – назвы твораў выяўленчага мастацтва, органаў перыядычнага друку: газет, часопісаў, інфармацыйных бюлетэняў, свят, памятных дат, фестываляў, святкаванняў (грэч. *idea* 'ідэя'), касмонімы – уласныя імёны зон касмічнай прасторы, галактык, зорнай сістэмы, частак сузор'я, планет, астэроідаў, камет (грэч. *kosmos* 'свет, сусвет, небасхіл'), этнонімы – імёны этнічных груп, плямёнаў, народаў, нацыянальнасцей (грэч. *ethnos* 'племя, народ') і інш.

Вучням прапануецца працаваць па інтарэсах у групах, г. зн. яны могуць выбраць клас онімаў, якія іх найбольш зацікавілі, скласці картатэку. Мясцовыя ж назвы запісваюцца ў мясцовым вымаўленні з пастаноўкай націску, пры гэтым збіраюцца ад старажылаў-інфарматараў ці ў краязнаўчых музеях легенды пра іх паходжанне.

На асобных прыкладах онімаў настаўнік знаёміць вучняў з такімі відамі аналізу, як лексіка-семантычны і структурна-граматычны (этымалагічны, напрыклад, узроставым асаблівасцям вучняў не адпавядае).

Лексіка-семантычная характарыстыка прадугледжвае апісанне семантыкі словаўтваральных асноў онімаў, пры гэтым роля семантычных характарыстык матывавальных асноў разглядаецца як сукупнасць граматычных і лексічных значэнняў. Для ўзору гэты від аналізу мы прывядзём на прыкладзе гідронімаў Гомельшчыны, у прыватнасці назваў балот – **гелонімаў**.

Значная колькасць назваў балот у рэгіёне паходзіць ад агульных слоў, або апелятываў. У іх складзе ўтваральныя асновы характарызуюць тагачасную флору, фаўну, асаблівасці тапаграфіі краю. У якасці лексічных асноў гэтых груп онімаў выкарыстоўваюцца, як правіла, народныя найменні, архаічныя і вузкарэгіянальныя тэрміны, значэнне якіх вызначаецца па лексікаграфічных крыніцах.

*Спіс літаратуры будзе змешчаны ў другой частцы артыкула. – *Заўвага рэд.*

Ва ўтварэнні фларыстычных гелонімаў шырока прадстаўлены разнастайныя назвы як драўнінных пород, кустоўя, так і травяністых раслін: *аер* (мясц. *явар*): ***Яварнік***; *арэх* (мясц. *ляшчына*): ***Арэхава***, ***Ляшчынскае***; *асака* і яе віды *камыш*, *сітнік*, *смучай*, *чарот*: ***Камышы***, ***Сітнікі***, ***Смучай***, ***Чараценка***; *асіна* і яе ўстарэлая назва *оса*: ***Асіннік***, ***Осов***; *бяроза*: ***Бярэзіца***; *верас*: ***Верасіха***; *вольха*: ***Падольха***; *вяз*: ***Вязаўка***; *вярба* і яе пароды *лаза*, *ракіта*: ***Вярбінскае***, ***Лаза***, ***Ракіта***; *граб*: ***Грабнік***; *дуб*: ***Дубавое***; *елка*: ***Ёлка***; *каліна*: ***Калінавіца***; *клён*: ***Кленове***; *ліпа*: ***Ліпка***; *мох*: ***Мохач***; *рабіна*: ***Рабінкі***; *плеценка* ‘мясцовая назва хвашча’: ***Плецень***, ***Хвашчавата***; *хвоя*: ***Хвайнічкі***; *явар* (мясц. *осакар*): ***Осакар***; *ясень*: ***Ясенец***.

Для называння балот прадуктыўна ўжываюцца агульныя найменні лесу і яго частак, лясных масіваў: *корч*, *пень*, *сук*, *карэнне*: ***Карэнне***, ***Корч***, ***Лясок***, ***Пнішчы***, ***Сучкі***, ***Кнея***, ***Окнеяцкое*** (арх. *кнея* ‘лясны гушчар’).

Назвы садовых і агароднінных раслін у якасці ўтваральных асноў сустракаюцца радзей: *абрыкос*: ***Абрыкосы***; *вішня*: ***Вішанькі***; *гарох*: ***Гарошкі***; *груша*: ***Грушыцкае***; *каноплі*: ***Канопліічэ***; *лён*: ***Ляніха***; *мак*: ***Макавае***; *рэпа*: ***Рэпішча***; *соя*: ***Соі***; *яблыня*: ***Яблanскае***.

Зафіксаваны “ягадныя” і “грыбныя” гелонімы: *ажыны*: ***Ажынёўка***; *журавіны*: ***Журавіннае***, ***Клюкаўка***; *маліны*: ***Маляное***; *чарніцы*: ***Чарнічнае***; *сыраежкі*: ***Сыраежка***.

Шырокае ўжыванне такіх лексем тлумачыцца тым, што ў славян, на тэрыторыі якіх было шмат лясоў, назвы раслiннага свету – адзін з аблюбаваных спосабаў называння геаграфічных аб’ектаў.

Ва ўтварэнні гелонімаў задзейнічаны таксама назвы дзікіх і свойскіх жывёл з перавагай першых: *барсук*: ***Борсукі***; *воўк*: ***Воўчыца***, ***Ваўкаўня***; *вуж*: ***Завужжа***; *зубр*: ***Зубранка***; *каза*: ***Казінае***; *конь*, *кабыла*: ***Конскае***, ***Кабылячае***; *ліса*: ***Ліскі***; *лось*: ***Ласінае тапіла***; *мядзведзь*: ***Мядзведаўка***; *свіння*: ***Свінячая града***; *тур*: ***Туро***.

Назвы арніталагічнага паходжання ўказваюць на распаўсюджанасць на тэрыторыі дзікіх птушак: *арол*: ***Арлаваха***; *бусел*, мясц. *лелька*: ***Буслоўка***, ***Лялецкія балоты***; *драч*: ***Драч***; *журавель*: ***Жураўліныя пелі***; *сава*: ***Совіца***; *чапля*: ***Цапля***.

Асобныя гелонімы паходзяць ад назваў рыб: *карась*: ***Карасіна балота***; *лін*: ***Ліновіца*** – або звязаныя з назвамі насякомых: *камар*: ***Камарыцкае***; *муравей*: ***Муравейная пеля***; *муха*: ***Мухавой***; *слепень*: ***Слепецье***; *чмель*: ***Чмяліны рог***.

Сярод утваральных асноў назваў мясцовасці дамінуюць і тыя, у якіх шырока прадстаўлена ландшафтная і тапаграфічная наменклатура, што ўвогуле тыпова для тапанімii.

Так, для характарыстыкі навакольнага грунту паслужылі апелятывы *гліна*: ***Глінянкі***; *каменне*: ***Камена***; *крэйда*: ***Крэйды***; *крэмень*: ***Крамяніцкае***; *пясок*: ***Пясчанка***, ***Шчырэц*** (*шчырэц* ‘буйны пясок’); *торф*: ***Тарфяная глеба***. Падобныя найменні змяшчаюць інфармацыю аб глебе ў дадзенай мясцовасці.

Гелонімы, матываваныя апелятывамі, што абазначаюць прыродна-геаграфічныя паняцці, найчасцей звязаны з назвамі рэльефу: узвышаных месцаў (*востраў*, *гара*, *града*, *груд*, *грэбень*, *курган*), нізін (*алёс*, *даліна*, *лог*, *луг*, *поплаў*), адкрытага навакольля (*гала*, *паляна*, *поле*): ***Астроўцы***, ***Горнае***, ***Груд***, ***Курганы***; ***Даліна***, ***Папплавы***; ***Вінішча*** (*вынья* ‘вялікая паляна сярод лесу’), ***Галістае***, ***Вялікае поле***.

Гелонімы з коранем *-гар-* (*-жар-*) сведчаць пра пажар на балоце або падсечна-агнявы спосаб распрацоўкі лясных участкаў: ***Гарэлы Мох***, ***Жары***, ***Выжар***, ***Апаленае***, ***Пажарышча***, ***Смаленае***.

Назвы-арыенціры ўказваюць на месцазнаходжанне гідрааб’ектаў або іх арыентацыю на мясцовасці адносна якіх-небудзь іншых аб’ектаў: ***Забалоцце***, ***Зарэчча*** (за *балотам*, *ракой*), ***Падазер’е***, ***Падгалле*** (перад *возерам*, *галам*), ***Ля вадаёма***, ***Міжрэчча*** (каля *вадаёма*, сярод *рэчак*). На размяшчэнне ў прасторы з улікам адлегласці могуць указваць і апелятывы-назоўнікі *бок*, *верх* ‘высокае месца’, *вугал*, *вусце*, *галава*, *горла*, *карма*, *край*, *ніз*, *рог*, *рубеж*, *старана*, *сярэдзіна*, *хвост* (у канцы), *нега* і *прыслон* у значэнні ‘паўднёвы’ або адпаведныя прыметнікі: ***Вяршына***, ***Галоўкі***, ***Ляўша*** (з левага боку), ***Ніз***, ***Прыслон***, ***Пярэдняе***, ***Рубежнае***, ***Сквазное***, ***Сярэдняе*** і інш.

Назвы апелятыўнага паходжання характарызуюць гідрааб’екты і па форме, памерах, стане паверхні, ступені забалочанасці і абваднення, часе ўзнікнення, тыпе вадаёма, квалітатыўных прыметах.

Для ўказання на форму даволі часта выкарыстоўваецца характарыстыка канфігурацыі аб’екта лексемамі *клін*, *круг*, *рог* (у выглядзе кліна, круга, рога), радзей *крывуля*, *вілы*, *вус*, *горб*, *горла*, *калоша*, *каромысел*, *карыта*, *мяшок*, *рубец*, *шабелькі*, *штаны* і інш. Гелонімы, матываваныя названымі і іншымі лексемамі, па сваёй форме нагадваюць адпаведныя прадметы: ***Апендзіцыт***, ***Крывуля***, ***Калоша***, ***Сапажок***, ***Фігура***, ***Штаны***, ***Шыя*** і г. д.

Гелонімы па памерах характарызуюцца пераважна апелятывамі *вузкі*, *вялікі*, *глыбокі*, *доўгі*, *малы*, рэг. *бахмат* у значэнні ‘шырокі’: ***Бальшое***, ***Бахмат***, ***Вузкае***, ***Вялікае***, ***Малое***, ***Шырокае*** і інш.

Для адлюстравання стану паверхні выкарыстаны наступныя апелятывы і вытворныя ад

іх: *бель*, *куп'ё*, *плёс* (*плёса*), *язвіны*, каляронімы *зялёны*, *жоўты*, *рыжы*, *цёмны*, *чорны* і іншыя: ***Белае***, ***Белка*** (*бель* на Палессі абазначае 'балота, дзе пераважна расце бярэзнік' або 'балота, парослае белым мохам'), ***Купністае*** (месца, багатае купінамі), ***Плёсо*** (у літаратуры зафіксавана шмат значэнняў тэрміна, але ў мясцовых гаворках ён ужываецца са значэннем 'забалочанае месца'), ***Язвінец*** (*язвіны* 'багністая гнілая жыліна', 'вокнішча на балоце, якое не замярзае'); ***Жоўтэ таплла***, ***Зялёны мох***, ***Зялёнік***, ***Краснае балота***, ***Рудзец***, ***Рыжае***, ***Чэрнішча***, ***Ярчышча*** (шмат журавін – яркіх ягад).

У адзінкавых выпадках у гэтай групе гелонімаў у якасці ўтваральных асноў задзейнічаны такія назвы, як *балбучыха*, *варкоч* 'балота, з якога выходзяць бурбалкі газу', *бубен* 'высокае, беднае травастоем месца', *выталаж* 'вытаптанае', *голымень*, *лысіца* 'чыстае месца, дзе нічога не расце', *шапкі* 'куп'істае месца', рэг. *небец* 'балота з вокнамі' і інш.

Шмат назваў, што адлюстроўваюць ступень забалочанасці: ***Вязкае***, ***Гнілое***, ***Грузкае***, ***Пель***, ***Рэдкае***, ***Таплла***, ***Топкае***, ***Трасіна***. Сярод іх часцей сустракаюцца архаічныя і рэгіянальныя тэрміны, такія як *верацея* 'нізкае, балоцістае месца', *віш* (*выш*) 'топкае балота, на якім траву косяць па лёдзе', *крокаць* 'рэдкае, вязкае балота', *мерва* 'вязкае, зыбучае балота', *муцвіца* 'нізкае балоцістае месца': ***Верацея***, ***Віш***, ***Краколь***, ***Мерва***, ***Муцвіца***. Дрыгвяністыя, топкія балоты ў гаспадарчых мэтах выкарыстоўваліся рэдка, таму іх назвы захоўваюць, хутчэй за ўсё, рэальную характарыстыку аб'ектаў.

Такім чынам, найменні ўказваюць на розныя віды балот: голае, бязлесае, парослае расліннасцю, бруднае, ржавае, гнілое, застойнае, вязкае, дрыгвяністае, гарэлае.

Заканчэнне будзе.

Наталля БАГАМОЛЬНІКАВА,
кандыдат філалагічных навук.

Малады даследчык прапануе

БЕЛАРУСКАЯ ТЭАРЭТЫЧНАЯ ЛЕКСІКАГРАФІЯ: СТАН, ПРАБЛЕМЫ, КІРУНКІ

У артыкуле апісаны прыярытэтныя кірункі лексікаграфічных даследаванняў, характэрныя для сучаснага этапу развіцця беларускай лінгвістыкі: вывучэнне гісторыі айчыннай навукі аб слоўніках, вырашэнне праблем тыпалогіі слоўнікаў у кантэксце агульнай метатэорыі лексікаграфіі, распрацоўка і супастаўленне лексікаграфічных праграм і праектаў, даследаванне структурна-зместавых асаблівасцей слоўнікаў, тэарэтычнае асэнсаванне і ўкараненне інфармацыйных тэхналогій у лексікаграфіі.

Ключавыя словы: *тэорыя лексікаграфіі, гісторыя лексікаграфіі, тыпалогія слоўнікаў, праектная лексікаграфія, лексікаграфічная крытыка, корпусная лексікаграфія.*

The prior tendencies of lexicographic researches which are typical for the modern period of the development of Belarusian linguistics are described in the article. They are devoted to the history of national science of dictionaries study, the dictionaries typology problem-solving in the context of general metatheory of lexicography, the lexicographical programs and projects development and identification, the dictionaries structure and content features research and also theoretical understanding and information technology rooting in lexicography.

Сучасная навука аб мове – вынік складанага развіцця лінгвістычных ведаў, на працягу ўсяго перыяду існавання яна характарызуецца пастаянным павелічэннем разгалінаванасці сваёй сістэмы. Адным з ключавых кампанентаў структуры мовазнаўства выступае лексікаграфія, якая абагульняе і сістэматызуе ў межах вызначанай навуковай парадыгмы звесткі, атрыманыя ў іншых раздзелах лінгвістыкі.

Сам факт фарміравання лексікаграфіі як самастойнай галіны мовазнаўства звязаны з рэзкім павелічэннем колькасці прыкладных лексікаграфічных работ у другой палове XX ст. да межаў т. зв. крытычнага аб'ёму, пры якім далейшае развіццё стала немагчымым без тэарэтычнага асэнсавання і аптымізацыі наяўных мадэлей слоўнікавай структуры.

У беларускім мовазнаўстве склалася алагічная сітуацыя, адметнасць якой у тым, што пры амаль поўнай адсутнасці канцэптуальных работ абагульняльнага характару колькасць разнастайных аспектных публікацый па праблемах гісторыі і тэорыі лексікаграфіі вымяраецца сотнямі.

На сучасным этапе існавання беларускай лінгвістыкі ўжо можна гаварыць пра фарміраванне пэўных прыярытэтных кірункаў лексікаграфічных даследаванняў, якія характарызуюцца адноснай устойлівасцю і шматаспектнасцю. Асноўныя вектары развіцця тэорыі беларускай лексікаграфіі: а) вывучэнне гісторыі айчыннай навукі пра слоўнікі; б) вырашэнне праблемы тыпалогіі слоўнікаў у кантэксце агульнай метатэорыі лексікаграфіі; в) распрацоўка і супастаўленне раз-

настайных лексікаграфічных праграм і праектаў; г) даследаванне структурна-зместавых асаблівасцей слоўнікаў; д) лексікаграфічная крытыка; е) тэарэтычнае асэнсаванне і ўкараненне інфармацыйных тэхналогій у лексікаграфіі.

Вывучэнне гісторыі лексікаграфіі ў айчынным мовазнаўстве пачалося ў 1920-я гг. са з'яўленнем у перыядычным друку артыкулаў Я. Карскага і М. Байкова, у якіх быў праведзены крытычны агляд наяўных лексікаграфічных выданняў, апісваліся прынцыпы ўкладання розных слоўнікаў, а таксама аналізаваліся вынікі арганізацыі слоўнікавай працы ў Беларусі на працягу 1925 – 1928 гг.

Даследаванні, прысвечаныя гісторыі станаўлення тэарэтычнай і прыкладной лексікаграфіі ў Беларусі, закранаюць: 1) фарміраванне лексікаграфічнай традыцыі ў цэлым; 2) гісторыю стварэння канкрэтных слоўнікаў; 3) ролю асобных вучоных у развіцці лексікаграфіі.

Комплексна гісторыю беларускай лексікаграфіі вывучалі М. Гуліцкі [3], М. Суднік [6], В. Шчэрбін [8]. Даследчыкі звярнуліся да разгляду дзейнасці ў галіне лексікаграфіі Ф. Скарыны, П. Бярынды, Ф. Шымкевіча, П. Шпілеўскага, Я. Чачота, І. Грыгаровіча, С. Мікуцкага, І. Насовіча і іншых, а таксама вызначылі ўплыў ранніх лексікаграфічных прац на сучасныя традыцыі складання слоўнікаў. Аспектныя публікацыі па гісторыі лексікаграфіі прысвечаны апісанню старажытных лексіконаў ("Лексисъ съ толкованіемъ словенскіхъ мов просто", 1586; "Лексисъ" Л. Зізанія, 1596; "Лексіконъ славенорусскій" П. Бярынды, 1627), вывучэнню беларускай слоўнікавай справы савецкага перыяду, працэсу станаўлення і развіцця беларускай дыялектнай, анамастычнай лексікаграфіі і інш.

Асноўная маса работ па гісторыі беларускай лексікаграфіі абмяжоўваецца вывучэннем публікацый, падрыхтаваных на этнічнай тэрыторыі Беларусі. Фактычна адзіная крыніца, прысвечаная сістэматызацыі слоўнікаў беларускай мовы, укладзеных па-за межамі краіны, – аглядавая работа Л. Юрэвіча, у якой характарызуюцца 42 лексікаграфічныя замежныя выданні другой паловы XX ст., што апісваюць сістэму беларускай мовы [11].

Адзін з прыярытэтных напрамкаў даследавання гісторыі беларускай лексікаграфіі – вывучэнне асобных слоўнікавых праектаў, умоў іх стварэння, структурных асаблівасцей і інш. Шэраг прац беларускіх навукоўцаў прысвечаны аналізу "Словаря белорусского наречия" І. Насовіча, гісторыі стварэння слоўніка, яго макра- і мікраструктуры, лексічных і граматычных асаблівасцей. У адзінкавых артыкулах даследуюцца прынцыпы ўкладання слоўнікаў І. Капіеўскага, В. Ластоўскага, Я. Ціхінскага, І. Бялькевіча і інш.

Важны аспект у распрацоўцы гісторыі лексікаграфіі – вывучэнне дзейнасці асобных лінгвістаў. У адпаведнасці з канцэпцыяй М. Палані, навука не існуе ў дэперсаніфікаваным і адарваным ад пэўных сацыяльна-гістарычных умоў выглядзе [5], таму натуральна, што ўвагу лінгвістаў прыцягваюць праблемы сістэматызацыі і асэнсавання навуковай спадчыны асобных даследчыкаў, у тым ліку тых, што працавалі ў галіне тэарэтычнай і прыкладной лексікаграфіі. У беларусістыцы першым і найбольш удалым вопытам стварэння даведніка, прысвечанага дзейнасці асобных вучоных, стала фундаментальная праца М. Булахава, у якой падаюцца біяграфічныя звесткі, пералік асноўных лінгвістычных публікацый, сціслы крытычны аналіз найбольш важных работ беларускіх, рускіх і ўкраінскіх філолагаў XVI – XX стст. [1]. Апісанне жыццёвага шляху і навуковых дасягненняў некаторых айчынных лексікографаў зроблена ў кнізе "Беларускія мовазнаўцы" І. Германовіча [3].

Вялікая колькасць публікацый прысвечана вывучэнню дзейнасці асобных спецыялістаў у галіне лексікаграфіі: У. Анічэнкі, Г. Арашонкавай, М. Байкова, М. Бірылы, А. Жураўскага, В. Лемцюговай, А. Крывіцкага, Ю. Мацкевіч, І. Насовіча, С. Некрашэвіча, М. Судніка, П. Сцяцко і інш.

Вынікам навукова-тэхнічнай рэвалюцыі стала імклівае павелічэнне колькасці філалагічных слоўнікаў, а таксама разнастайных даведнікаў спецыяльнага характару: "тэрміналагічных слоўнікаў, спецыяльных энцыклапедый, класіфікатараў і рубрыкатараў, эксперыментальных даведнікаў, вузкадысцыплінарных канцэптуарыяў і т. п." [10, с. 330]. Натуральна, што ў новых умовах адна з найважнейшых задач сучаснай тэарэтычнай лексікаграфіі – стварэнне ўніверсальнай тыпалогіі слоўнікаў беларускай мовы, якая, з аднаго боку, дазваляе інвентарызаваць наяўныя рознаструктурныя працы, а з другога – дапамагае вызначыць лексікаграфічныя лакуны ў апісанні мовы.

У айчынным мовазнаўстве праблемай класіфікацыі беларускіх слоўнікаў займаўся В. Шчэрбін. Ён крытычна асэнсаваў разнастайныя падыходы да групавання слоўнікаў, пашыраныя ў расійскай навуковай традыцыі, тэарэтычна абгрунтаваў думку, што стварэнне "тыпалогіі слоўнікаў дало б лексікографу магчымасць з самага пачатку працы над укладаннем слоўніка адбіраць сярод вылучаных лексікаграфічных параметраў найбольш аптымальныя, якія ў максімальнай ступені адпавядаюць прад'яўляемым для слоўнікаў гэтага тыпу патрабаванням" [9, с. 50]. У пазнейшых публікацыях В. Шчэрбін прапанаваў вылучаць два асноўныя кампаненты слоўнікавай сістэмы – тлумачальную і аспектную лексікаграфію (гістарычная, дыялектная, перакладная, анамастычная, этымалагічная, аўтарская, арталагічная,

семанімічная, статыстычная, вучэбная, неалагічная, фразеалагічная, парэміялагічная, граматычная, субстандартная, стылістычная, лінгвакраіназнаўчая, тэкставая і гіпертэкставая, электронная, ілюстрацыйная, а таксама ідэаграфія, дэрыватаграфія і агульная канцэптаграфія) [7].

Сістэмную тыпалогію слоўнікаў беларускай мовы прапанаваў Д. Дзятко, які на аснове спецыфікі моўных адзінак, зафіксаваных у слоўніках, асаблівасцей іх лексікаграфічнай інтэрпрэтацыі і тыпу інфармацыі, што падаецца ў выданні, вылучыў дзве групы лінгвістычных слоўнікаў – лексемныя і ідыёмныя. ***Лексемныя слоўнікі*** апісваюць словы ў чатырох аспектах: 1) *семантычным*: а) тлумачальныя: агульных імёнаў літаратурнай мовы – зводныя і аспектныя (напр., амонімаў, паронімаў, антонімаў, новых слоў, іншамоўных слоў, мовы аўтара, тэрміналагічныя і інш.); агульных імёнаў дыялектнай мовы – зводныя і аспектныя, а таксама слоўнікі ўласных імёнаў (анамастычныя); б) перакладныя: агульных імёнаў (зводныя і аспектныя) і ўласных імёнаў (зводныя і аспектныя); 2) *функцыянальным*: арталагічныя (арфаграфічныя, арфаэпічныя, цяжкасцей, тыповых формаў і інш.), статыстычныя (частотныя, лексічныя мінімумы), ідэаграфічныя (асацыятыўныя, тэматычныя), стылістычныя (устарэлай лексікі, сінонімаў, эпітэтаў, дыялектызмаў), парадыгматычныя; 3) *структурным*: словаўтваральныя і марфемныя; 4) *намінацыйным*: анамастычныя (тапанімічныя, антрапанімічныя – зводныя і аспектныя – і інш.), канкардансы, спісы, рэестры. У ***ідыёмных слоўніках*** характарызуюцца моўныя канструкцыі: 1) у *семантычным* аспекце: тлумачальныя (фразеалагізмаў, парэмій), перакладныя (фразеалагізмаў, парэмій); 2) у *функцыянальным* плане: стылістычныя (перыфраз, параўнанняў і інш.); 3) у *намінацыйным* плане: афарызмаў і пад. [4].

Асобныя артыкулы беларускіх вучоных прысвечаны пытанням тыпалагізацыі аспектных лексікаграфічных выданняў: гэта класіфікацыі дыялектных фразеалагічных слоўнікаў І. Лепешава, сінтаксічных слоўнікаў славянскіх моў С. Важніка, электронных перакладных слоўнікаў Г. Канцавой і Т. Пратасевіч і інш.

Праектная лексікаграфія як спосаб планавання і каардынацыі лінгвістычнай дзейнасці фарміруецца даследаваннямі двух тыпаў, якія адрозніваюцца паміж сабой узроўнем распрацоўкі праблем, звязаных з тэорыяй і методыкай уласна лексікаграфічнай дзейнасці: а) праекты і інструкцыі па збіранні лексікі; б) праекты лексікаграфічных выданняў.

Планамернай распрацоўкай метадалагічных асноў лексікаграфіі беларускія вучоныя ўпершыню заняліся ў 1920 – 1930-я гг., калі ў выніку дзейнасці Навукова-тэрміналагічнай камісіі, Камісіі па ўкладанні слоўніка жывой беларускай мовы пры Інбелкульце істотна актывізавалася падрыхтоўка і выданне слоўнікаў у Беларусі.

У гэты час у сувязі з неабходнасцю складання слоўніка беларускай мовы быў надрукаваны шэраг праграм і інструкцый, у якіх падрабязна апісвалася методыка збірання лексікі і спосабы яе першаснай апрацоўкі. У рэспубліканскім друку былі апублікаваны інструкцыі, праграмы, праекты па збіранні беларускай дыялектнай, тэрміналагічнай і анамастычнай лексікі, а таксама артыкулы С. Некрашэвіча, М. Байкова, у якіх вырашаліся многія метадалагічныя пытанні.

Другая хваля ў развіцці праектнай лексікаграфіі прыпадае на 1960 – 1970-я гг. і звязана з актывізацыяй дыялекталагічных даследаванняў у Беларусі. У гэты перыяд Інстытутам мовазнаўства АН БССР на аснове аналізу слоўнікаў М. Каспяровіча, М. Шатэрніка, зборнікаў П. Бяссонава, Д. Булгакоўскага, Е. Раманава, І. Сербава, П. Шэйна, а таксама ўкраінскіх праграм для збірання матэрыялаў па тапаніміцы, лексікі роднасці і свайцтва (К. Цылуйка, А. Бурачок), апытальніка па вывучэнні народнай лексікі В. Дарашэўскага была распрацавана "Інструкцыя па збіранню матэрыялаў для складання абласных слоўнікаў беларускай мовы".

Надрукаваны шэраг індывідуальных артыкулаў-праектаў М. Абабуркі, У. Анічэнкі, М. Бірылы, С. Грыгор'ева, І. Капылова, І. Козырава, К. Любецкай, Т. Сцяшковіч, В. Шчэрбіна, Ф. Янкоўскага, І. Яшкіна і іншых, прысвечаных апісанню метадаў і прынцыпаў стварэння розных тыпаў лексікаграфічных выданняў.

Агульнае металексікаграфічнае вучэнне пра інфармацыйную напаўняльнасць корпуса слоўніка складаецца з двух узаемазвязаных кірункаў, прысвечаных: а) даследаванню найбольш агульных асаблівасцей мікраструктуры слоўнікавых выданняў, б) вывучэнню прыватных праблем фарміравання рэестра слоўнікаў пэўных тыпаў.

Праблемай аптымізацыі інфарматыўнай насычанасці слоўнікавага артыкула займаліся У. Марцінеўскі, Л. Рубцова, А. Бардовіч і інш. Вывучаліся таксама шматлікія прыватныя праблемы рэестра: асаблівасці лексікаграфічных дэфініцый і спосабы іх фарміравання, пытанні граматычнай характарыстыкі ў тлумачальных слоўніках, спосабы разгортвання граматычнай інфармацыі ў розных лексікаграфічных выданнях, спосабы прэзентацыі і тлумачэння ў слоўніках архаізмаў і гістарызмаў, з'явы аманіміі, мнагазначнасці і варыянтнасці моўных адзінак у сучасных слоўніках розных тыпаў і інш.

Характэрнай рысай сучаснага мовазнаўства з'яўляецца не толькі так званае гарызантальнае асэнсаванне (выяўленне тыповых тэндэнцый у развіцці моўнай сістэмы і планаванне агуль-

налінгвістычнай перспектывы), але і інтэнсіўнае развіццё ўнутрыгаліновай, "вертыкальнай" рэфлексіі, сутнасць якой заключаецца ў сістэматызацыі і карэкцыі структур і метадаў навуковага пазнання.

Адна з формаў такой рэфлексіі – лексікаграфічная крытыка, у межах якой развіваюцца два ўзаемазвязаныя напрамкі: а) вывучэнне асаблівасцей канкрэтных слоўнікаў, б) даследаванне формаў і спосабаў лексікаграфічнай інтэрпрэтацыі моўнага матэрыялу.

Першы кірунак рэалізуецца ў выглядзе манарэцэнзій, калі аб'ектам навуковага аналізу выступае адно асобнае выданне, другі – у форме полірэцэнзій, калі лексікаграфічныя выданні разглядаюцца ў іх параўнанні.

Лексікаграфічная крытыка як навуковы кірунак сфарміравалася ў Беларусі ў 1920-я гг. і была дэтэрмінавана не толькі неабходнасцю ацаніць адпаведнасць канкрэтных метадаў і прынцыпаў стварэння слоўнікаў тым задачам, якія стаялі перад тагачаснай лексікаграфіяй, але і патрэбай праанансаваць з'яўленне новых выданняў.

Шэраг крытычных публікацый у перыядычным друку 1920-х гг. прысвечаны падрабязнаму аналізу выданняў, надрукаваных у серыі БНТ, у шматлікіх рэцэнзіях аналізуюцца перакладныя руска-беларускія і беларуска-рускія слоўнікі.

Найбольш істотная асаблівасць крытычных работ, апублікаваных у 1920-я гг., – суб'ектыўнасць інтэрпрэтацыі і асобасны падыход пры ацэньванні выдадзеных прац. Разам з тым наяўнасць дыскусійнага кампанента ў агульным працэсе станаўлення лінгвістычнай навукі спрыяла стабілізацыі прынцыпаў і прыёмаў лексікаграфічнай дзейнасці і спрыяла павышэнню якасці слоўнікаў.

У пасляваенны перыяд назіраецца інтэнсіфікацыя лексікаграфічнай крытыкі. Гэта звязана не толькі з павелічэннем колькасці слоўнікаў, але і з развіццём інфармацыйна-выдавецкіх тэхналогій. Па нашых падліках, за апошнія 60 гадоў у айчынных і замежных выданнях з'явілася больш за 200 артыкулаў, прысвечаных пытанням навуковай крытыкі слоўнікаў. На сучасным этапе выхад абсалютнай большасці лексікаграфічных твораў суправаджаецца анатацыйна-рэцэнзійнымі водгукамі ў перыядычным друку.

Ва ўмовах сучаснай тэхналагізацыі лексікаграфія не можа развівацца без шырокага выкарыстання камп'ютарных тэхналогій. Важным аспектам вывучэння становяцца электронныя слоўнікі, лінгвістычныя базы і банкі дадзеных, што даследуюцца ў межах корпуснай лексікаграфіі, якая паступова набывае ўсё большае пашырэнне і тэарэтычнае абгрунтаванне. Пытанні тэорыі корпуснай лексікаграфіі і тэрмінаграфіі разглядаюцца ў працах Л. Рычковай і В. Шчэрбіна, якія даследавалі ўзаемаўплыў корпуснай лінгвістыкі і лексікаграфіі і корпусную тэрмінаграфію.

Вынікам тэарэтычнага асэнсавання розных праблем корпуснай лінгвістыкі стала стварэнне "Корпуса мовы Янкі Купалы" (ГрДУ) і "Корпуса беларускай мовы" (МДЛУ).

Увагу даследчыкаў прыцягваюць пытанні распрацоўкі камп'ютарнага фонду беларускай мовы як складанай інфармацыйнай сістэмы комплекснай аўтаматызацыі лінгвістычных даследаванняў і распрацовак, забяспечанай лінгвістычнай базай дадзеных і адпаведнымі праграмамі. У публікацыях вызначаюцца перспектывы фарміравання беларускага лінгвістычнага партала, апісваюцца структурныя элементы інфармацыйнай сістэмы "Машынны фонд беларускай мовы", канцэпцыя, асноўны змест і функцыянальныя магчымасці "Электроннага слоўніка беларускай мовы" і інш.

Такім чынам, у беларускім мовазнаўстве акрэсліўся шэраг лексікаграфічных праблем метадалагічнага характару, вырашэнне якіх магчымае толькі пры ўмове далейшага развіцця самастойнага кірунку ў лінгвістычнай навуцы – тэорыі лексікаграфіі.

Спіс літаратуры

1. **Булахов, М. Г.** Восточнославянские языковеды : биобиблиографический словарь : в 3 т. / М. Г. Булахов. – Минск : БГУ, 1976 – 1978.

2. **Германовіч, І. К.** Беларускія мовазнаўцы : Нарысы жыцця і навуковай дзейнасці / І. К. Германовіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1985.

3. **Гуліцкі, М. Ф.** Гісторыя беларускай лексікаграфіі XIX – пач. XX ст. : дыс. … канд. філал. навук : 10.02.02 / Ф. М. Гуліцкі. – Мінск, 1972.

4. **Дзятко, Д. В.** Да праблемы тыпалагізацыі лінгвістычных слоўнікаў / Д. В. Дзятко // Сёмыя Танкаўскія чытанні : зб. навук. артыкулаў. – Мінск : БДПУ, 2010. – С. 185 – 187.

5. **Полани, М.** Личностное знание. На пути к посткритической философии / М. Полани. – Благовещенск, 1998.

6. **Суднік, М. Р.** Гісторыя ўзнікнення і этапы развіцця беларускай лексікаграфіі старажытнай пары / М. Р. Суднік // Працы Інстытута мовазнаўства АН БССР. – 1957. – Вып. 4. – С. 62 – 122.

7. **Шчэрбін, В.** Асноўныя складнікі беларускай лексікаграфіі / В. Шчэрбін // Роднае слова. – 2009. – № 2. – С. 38 – 45.

8. **Шчэрбін, В. К.** Гісторыя беларускай лексікаграфіі / В. К. Шчэрбін. – Мінск : МДЛУ, 1994.

9. **Шчэрбін, В. К.** Праблема класіфікацыі беларускіх слоўнікаў / В. К. Шчэрбін // Беларуская лінгвістыка. – 1987. – Вып. 31. – С. 43 – 50.

10. **Щербин, В. К.** От специальной лексикографии – к справочной науке / В. К. Щербин // Лексикографические ракурсы : традиции и вызовы XXI века : матер. IX междунар. школы-семинара (Иваново, 8 – 10 сентября 2011 г.). – Иваново, 2011. – С. 330 – 333.

11. **Юрэвіч, Л.** Даследаванні беларускай лексікаграфіі за мяжой / Л. Юрэвіч // Роднае слова. – 1998. – № 4. – С. 75 – 89.

Святлана ШАХОЎСКАЯ,
выкладчык кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 26.12.2012 г.

“ЧОРНЫЯ КОСЫ, ЧОРНЫЯ ВОЧЫ…”

ЧОРНЫ КОЛЕР І ЯГО АДЦЕННІ Ў ТВОРАХ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Чорны колер разам з белым і шэрым належыць да ахраматычнай гамы, якая характарызуецца адсутнасцю колеравага тону.

З пункту гледжання псіхалогіі *чорны* ўспрымаецца як сімвал няшчасця, зла, хваробы, разбурэння, змроку і г. д. Мяркуецца нават, што калі чалавек аддае перавагу цёмным тонам перад светлымі, то ён схільны да дэпрэсіі, няўпэўнены ў сабе, хоць выразна гэта можа і не выяўляцца. Але, як, па сутнасці, і кожны іншы колер, *чорны* ў розных культурах трактуецца неаднолькава. Сапраўды, у хрысціян, за рэдкімі выключэннямі, гэта ўвасабленне ўсяго адмоўнага. Але, напрыклад, у арабскім свеце сінтагмы кшталту *чарната вачэй* або *чарната сэрца* абазначаюць адпаведна ‘прыгажосць жанчыны’ і ‘палкае каханне’. А ў афрыканскіх народаў, асабліва цэнтральнай часткі кантынента, *чорны* – традыцыйна станоўчы колер. Гэта тлумачыцца тым, што названы рэгіён – найбольш засушлівы, адсутнасць дажджу выклікае вялікія гаспадарчыя і эканамічныя праблемы. Таму *чорная хмара* – сімвал надзеі, па вялікім рахунку сімвал жыцця. І чым чарнейшая гэтая хмара, тым мацнейшы будзе дождж, тым больш станоўчых асацыяцый нараджаецца. У творах жа айчынных пісьменнікаў словазлучэнне *чорная хмара* мае абсалютна супрацьлеглую канатацыю: *За акном увесь далягляд, аж да паловы неба, зацягнула* ***грыфельна-чорная*** *хмара* (У. Караткевіч. Нельга забыць); *Насунецца* ***чорная*** *хмара. / Маланкі скрамсаюць лясы. / Знямеюць жаночыя твары. / Заціхнуць наўкол галасы* (Л. Галубовіч. Насунецца чорная хмара…); *Бачаннем не насыціцца вока, / Слуханнем не напоўніцца вуха. / Весялосць спее белааблока, /* ***Чарнахмара*** *збіраецца скруха* (Р. Барадулін. Бачаннем не насыціцца вока); *Доля з* ***чорнымі*** *хмарамі* (Я. Купала. Згінула сонца); ***Чарнела*** *неба ад хмар, шумеў голым веццем узлесак, стыла шэрая далячынь* (В. Быкаў. Незагойная рана). Пераасэнсаванне семантыкі *чорнага*, своеасаблівая інфільтрацыя каляроніма і апелятыва ў мастацкім радку таксама мае трывалы пеяратыўны характар. І гэта бачыцца вельмі істотным момантам, паколькі метафарызацыя “не проста лінгвістычная з’ява, якая адбываецца на паверхневым узроўні мовы; яна бярэ пачатак у больш глыбінным кагнітыўным працэсе творчага характару, які адкрывае новыя магчымасці развіцця значэння” [1, с. 376 – 377]. Таму праз каляронім не толькі ствараецца агульны эмацыйны фон мікракантэксту, але і адлюстроўваецца ўвесь спектр негатыўных аўтарскіх асацыяцый, што гэты фон дапаўняюць і адпаведным чынам узбагачаюць: *Робім да стомы. Цягнемся. Марым. / Век здаганяем. Героямі ходзім. / Ззяем, як сонца.* ***Чарнеем****, як хмары. / Нешта губляем. Амаль не знаходзім* (П. Панчанка. Робім да стомы); *Я буду маліцца і сэрцам, і думамі, / Распетаю буду маліцца душой, / Каб* ***чорныя*** *долі з мяцеліцаў шумамі / Ўжо больш не шалелі над роднай зямлёй* (Я. Купала. Мая малітва); *Мне сібірскія сняцца завеі, / Сніцца мне* ***чорных*** *дзён Калыма, – / Край, дзе людзі губляюць надзеі, / Край, дзе людзям ратунку няма…* (У. Клішэвіч. Ой, чаму ў вас, тужлівыя ліпы…); *Сярод* ***чорнага*** *запусценя ззялі нечакана яркімі, жывымі фарбамі роспісы на сценах* (В. Іпатава. За морам Хвалынскім); *Усё ж у яе баярская кроў, а ты дзеўчыну да такой* ***чорнай*** *справы прыставіў* (В. Іпатава. Альгердава дзіда); *Колькі рабіў ён спробы / Гора ўкінуць у лёх. /* ***Чорнай*** *хусцінкай жалобы / Цень на пагоркі лёг* (Д. Бічэль. Мацей Бурачок); *Ночка* ***чорным*** *пакрывалам / Мне акно завесіла. / У хаце холад (дроў замала). / На душы нявесела* (С. Крывец. Сыплюць думкі); *Ночка* ***чорнай*** *птушкай кладзецца на мае думкі* (Я. Купала. Раскіданае гняздо).

Як бачым, у творах беларускіх пісьменнікаў *чорны* досыць часта асацыюецца з ноччу. Гэта, можна сказаць, найбольш тыповае, найбольш выразнае ўвасабленне сімвалічнай сутнасці колеракода. Але ў кожнага мастака ёсць адметныя семантычныя і сімвалічныя нюансы. І менавіта ў паэтычных радках найлепшым чынам адлюстравана індывідуальна-аўтарская трактоўка каляроніма: *Патухаў наш касцёр, / Разбягалася варта, / Сэрца сціснула ноч / Сваёй* ***чорнаю*** *мукай… / Я сягоння другі, / Я бязлітасны, горды, / Не прыбіты, не здушаны /* ***Чорнай*** *тугой…* (В. Маракоў. Пры дагараючым кастры); *Прайсці праз сытасць, душой застацца / Без* ***чорных*** *плям, з сумленнем не лаўчыць – / Вось гэтаму вялікаму мастацтву / Сям’ёй народнай трэба ўсіх вучыць* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

Матэрыял паказвае, што каляронім *чорны* – самы прадуктыўны і ў мастацкім сэнсе галоўны ў творах Кузьмы Чорнага. Гэта якраз той выпа-

Размова пра колерава-светлавую эстэтыку ў творах беларускіх пісьменнікаў вядзецца з 2007 г. ***Юрый Бабіч*** *разгледзеў колеры: белы (2011, № 2; у творчасці Якуба Коласа – 2007, №№ 3, 4), чырвоны (2007, № 9), аранжавы (2007, № 10), жоўты (2008, № 3), зялёны (2008, № 6), залаты (2008, №11), сіні (2009, № 1), блакітны (2009, № 7), фіялетавы (2010, № 1), шэры (2010, № 11).*

дак, калі сутнасць псеўданіма пісьменніка адпавядае яго светаўспрыманню, выразна раскрываецца праз аналіз асобных аспектаў яго творчасці. Аўтар уводзіць колераабазначэнне ў кантэкст розных сюжэтных ліній, з рознымі мастацкімі задачамі: *Сонца ўжо стаяла зусім нізка. У чырванаватых яго колерах* ***чорныя*** *руіны здаваліся страшнымі*; *Толькі далей ад гэтага месца, якое кранула* ***чорная*** *рука смерці, скрозь зелянелі дрэвы* (Вялікі дзень); *І ў гэты момант усё ўздрыгнулася, і* ***чорны*** *дым з рухавым агнём напоўніў сабою свет*; *І* ***чорнае*** *пракляцце таму, хто паліць і разбурае* (Млечны шлях); *Безнадзейнасць і* ***чорны*** *смутак душылі…*; *Чужыя людзі і зямля наганялі на Густава* ***чорны*** *сум* (Пошукі будучыні). У прыведзеных фрагментах каляронім ужываецца пераважна з абстрактнымі паняццямі, утвараючы адпаведныя тропы і адлюстроўваючы ў пэўным сэнсе адцягнены характар мыслення творцы. Адначасова адзначым, што спалучэнні каляроніма з абстрактнымі назоўнікамі дастаткова прадуктыўныя і ў творах іншых пісьменнікаў: *Мне лёс мой сцвердзіў: працай* ***чорнай*** */ За стромай год, даўным-даўно / Два словы цвёрда заручоны – / Жыццё і жыта – як адно* (В. Зуёнак. На сэрцы – неспакою камень…); *З чаго пачаў калісь над Гайнай – / І скончу тым… Спакойны я / Павек не стане* ***чорнай*** *ганьбай / Любоў прасветлая мая* (Н. Гілевіч. О, Беларусь!..); *Але цяпер бачу: з самага пачатку не рабілі ў Гародні больш* ***чорнай*** *справы* (У. Караткевіч. Хрыстос прызямліўся ў Гародні); *Не скруціць ніякай* ***чорнай*** *скрусе / Маладосць крылатую маю. / Я іду з усімі і смяюся, / Я іду з усімі і пяю* (Г. Бураўкін. Калі часам трохі засумуецца…); *Уваскрасаюць: постацяў абрысы / Расхліствае спалохана туман. / Рагнеда, Еўфрасіння і Ларыса, / Ад Краю адвядзеце* ***чорны*** *зман!* (А. Хатэнка. Уваскрасаюць: постацяў абрысы…). Можна меркаваць, што *чорны* – самы абстрактны каляронім, і абстрактнасць гэтая адмоўная.

У творах беларускіх пісьменнікаў колеракод *чорны* рэпрэзентаваны рознымі ў граматычным плане лексемамі. Але практычна заўсёды колеравыя словы розных часцін мовы выступаюць важнай мастацкай дэталлю, якая рыхтуе чытача да нечага істотнага, можа, нават ключавога. Прыгадаем эпізод з аповесці "Сотнікаў" Васіля Быкава, калі Рыбак заходзіць да Партнова. Першае, што кідаецца ў вочы, – гэта вялікая чорная печ (тут – недвухсэнсоўны сімвал): *Яе* ***чорны*** *колер і крутыя асадзістыя бакі прыгняталі, нагадваючы недарэчны помнік па чыімсьці жыцці.* Каляронім выразна падкрэслівае важнасць моманту і адпаведна ўсяго фрагмента, усёй сюжэтнай лініі.

Асобна адзначым прадуктыўнае выкарыстанне пісьменнікамі каляроніма-дзеепрыметніка. Прычым гэтая дзеяслоўная форма, як правіла, не проста адлюстроўвае прымету ў дзеянні, але і дапаўняе фрагмент дадатковымі сэнсавымі нюансамі. Напрыклад, стварае кантраст: *Пад поўнач <u>бялію</u> зямлю іней, у ледзяныя звонкія раніцы і трава каля платоў і на выганах, і палі з загонамі яшчэ не скопанай бульбы, і панурыя,* ***учарнелыя*** *стрэхі – усё было па-зімоваму <u>белае</u>* (І. Мележ. Подых навальніцы); *У гародчыку на двары з яблыні апала* ***пачарнелае*** *лісце, паказаўся на свет адзін <u>жоўты</u> яблык з чырвоным бокам…* (І. Пташнікаў. Алімпіяда) – або ўзмацняе негатыўны фон кантэксту: *Там, дзе восень ідзе, лес шумлівы радзее, / Вецер гоніць хмарыны з-за <u>цёмных</u> ялін. / Грозны чуючы сівер, лісты, як надзеі, / Аблятаюць на дол з* ***пачарнелых*** *галін* (А. Куляшоў. Пра восень). Можна меркаваць, што дзеепрыметнікі-каляронімы са значэннем *чорнага* адыгрываюць важную ролю ў мастацкім тэксце, дадаючы дынамікі ў цёмныя адценні.

Мэтазгодным бачыцца разгляд спецыфікі функцыянавання колераабазначэння ў тэкстах, дзе так ці інакш закранаюцца экалагічныя праблемы. Даволі шмат падобных мастацкіх твораў з'явілася ў беларускай літаратуры напрыканцы 80-х гг. XX ст. – пасля аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі. Высокая прадуктыўнасць элементаў кода *чорны* тлумачыцца, з аднаго боку, яго семантычнай і вобразна-сімвалічнай сутнасцю, а з іншага – наяўнасцю ва ўласнай назве кораня *чарн-*. Гэта і паслужыла асновай для мастацкага ўвасаблення аўтарскіх ідэй і задум: *Стала* ***чорнай*** *зялёная роба. / Не былінкаю стала быль. / З векавым падтэкстам* ***Чарнобыль*** */ Прамату, нарэшце, набыў… / Дзеля праўды – не дзеля адвагі – / Мы запішам у* ***чорную*** *быль / Нараўляны, Хойнікі, Брагін…* (Р. Тармола. Стала чорнай зялёная роба…). Тут выразна відаць, што змяненне колеру выклікае змену канатацыі. ***Чарнобыля счарнелыя*** *радкі / Ў пасведчанні нявіннага дзіцяці. / І я, што найшчаслівейшая маці, / Сціраю слёзы страху са шчакі* (Н. Гальпяровіч. Адначасова шчасце і бяда…); *Дым Айчыны –* ***чарнобыльскі*** *дым. / Не салодкі ён, а гаркавы. / О, як часта яго мы снім – /* ***Чорны*** *дым, нібы* ***чорны*** *саван* (В. Гардзей. Дым Айчыны – чарнобыльскі дым…). У дадзеным кантэксце аб'ект і суб'ект параўнання рэпрэзентаваныя каляронімам, што істотна ўзмацняе эмацыйны эфект. *Беларусь, мая хворая маці, / Са слязою Сажа на шчацэ / Ў парваным* ***чарнобыльскім*** *плацці /* ***Пачарнелым*** *Усветам брыдзе…* (В. Зуёнак. Краіна Начы); *Смех і кветкі, / Вы куды падзеліся? / Навакол / Стагі, стагі, стагі. / Чым жа ты цяпер са мной падзелішся, / Прыпяць,* ***пачарнелая*** *з тугі?* (П. Панчанка. На Палессі восень); ***Чорныя*** *птушкі фарбуюць нябёсы / У жудасны колер. / Голае поле. Дарога. Калёсы. / Вецер у коле… /* ***Чорныя*** *птуш-*

кі ўсадзілі ў нябёсы / Крылы. / Даволі!.. (А. Аркуш. Чорныя птушкі). У апошнім фрагменце ключавая сінтагма – *чорныя птушкі*. Аналізаваны колеракод можна лічыць прадуктыўным пры стварэнні мастацкага вобраза са згаданым родавым ці відавым назоўнікам. Найчасцей у беларускіх пісьменнікаў фіксуюцца словы *воран* (*вароны*) або *крумкач*. У спалучэнні з каляронімам яны перадаюць агульны настрой тэкставага фрагмента, выражаюць адмоўную экспрэсіўную афарбоўку і актуалізуюць сімвалічны складнік: ***Чорны*** *воран, белы лебедзь – / Гляну ўвысь і на жарству. / Мяне воран не зачэпіць, / Пакуль з лебедзем жыву* (С. Гаўрусёў. Чорны воран, белы лебедзь…); *Мычыць у небе зорная цяліца. / Цямнее крыж, як воран-****чарнакрыл****. / І крылаў дачакаецца капліца, / Каб паляцець і ёй за небасхіл* (Р. Барадулін. Капліца); *Захінуся шалёнаю сцюжай, / Завяжу вузялочкам кутас. / ****Чорны*** *воран над белаю ружай: / О, які фантастычны кантраст!* (Я. Янішчыц. Кантрасты); *У дрыгву закапалі чорта, / Воран* ***чорны*** *сваё адкружыў. / Кружаць сёння над рэчкаю* ***чорнай*** */ Экскаватарныя каўшы* (Н. Гальпяровіч. Я шкадую цябе, зямля); *Толькі злосна* ***чорны*** *птах крумкаў* (Я. Купала. Блізкім і далёкім); *Узняўся з зарасцяў вялізны, сыты,* ***вугальна-чорны*** *крумкач* (У. Караткевіч. Лісце каштанаў). Тут у аснове пераратыўнасці ляжаць фальклорныя традыцыі, шматвяковы культурны досвед нашага народа, што не дазваляе названых птушак успрымаць станоўча. Так, існуе меркаванне, што воран (крумкач) "мог быць нейкім божышчам з заантрапаморфнымі рысамі адначасова… Гэтае божышча мела шчыльную сувязь з сакральнымі (першапачатковымі) водамі і светам памерлых…" [2, с. 89].

Калі ў разгледжаных выпадках *чорны* мае выразную адмоўную канатацыю, то, напрыклад, пры партрэтнай характарыстыцы персанажа дамінуе, наадварот, станоўчая эмацыянальна-экспрэсіўная афарбоўка, нярэдка з выражэннем інтымных пачуццяў: *Мне доўгае расстанне з Вамі /* ***Чарней*** *ад Вашых* ***чорных*** *кос…* (М. Багдановіч. Трыялет); *Цёмныя ночы, асеннія ночы, / Хлопец астацца дома не мог: /* ***Чорныя*** *косы,* ***чорныя*** *вочы / Хлопца свайго правялі за парог* (А. Астрэйка. Чорныя косы, чорныя вочы); *Вочы* ***чорныя*** *палкім гарэлі агнём, / Вусны, дрогнуўшы, штось зашапталі…* (К. Буйло. Рута); *Запляла дзяўчына ў косы / Стужкі каляровыя, / Яе бровы –* ***смоль****, а вочы – / Васількі жытнёвыя* (А. Дзеружынскі. Чараўніца); *Незнаёмая дзяўчына, як бы спалохаўшыся, зноў борздзенька апусціла свае* ***чорныя****, як смоль, вочы* (Я. Колас. На ростанях); *Маёй вясны далёкай адгалоскі… / І я ўжо сачу праз ціхі боль, / Як ападаюць пышныя прычоскі – / Русявыя і* ***чорныя****, як смоль* (Я. Янішчыц. Верш, напісаны ў цырульні). *Смоль* у пераносным значэнні – нешта вельмі чорнае і бліскучае, але найчасцей гэта менавіта валасы. А ў мастацкім радку – дадатковая вобразная характарыстыка, пяшчотная і кранальная, дзе выразна выяўляецца аўтарскае стаўленне да апісанага.

Увогуле колеракод *чорны* ў мове твораў беларускіх пісьменнікаў надзвычай прадуктыўны пры партрэтнай характарыстыцы: *У яго быў прыгожы сыты твар,* ***чорныя*** *бровы* (В. Іпатава. Ластаўка); ***Чорныя*** *вочы Косці загарэліся, як вугалькі* (І. Шамякін. Сэрца на далоні); *Джулія зіхатліва ўсміхаецца Івану* ***чорнымі****, нібы спелыя слівы, вачыма…* (В. Быкаў. Альпійская балада); *"Я не пайду", – сказала* ***чарнявая, з вугальнымі*** *вачыма маладзіца* (У. Караткевіч. Крыж Аняліна). У айчынных аўтараў *чорныя вочы* – калі не эталон прыгажосці, то адлюстраванне вельмі сімпатычных рысаў як мінімум. Але ж існуюць і іншыя меркаванні адносна названай сінтагмы. Тут цікавай будзе думка вядомай расійскай даследчыцы каларыстыкі В. Кульпіной, якая сцвярджае, што "чорныя вочы… могуць быць катэгарычна нядобрымі, зайздрослівымі (якія могуць сурочыць) і быць вачыма ворага" [3, с. 113]. Так, напэўна, могуць. Але ў творах беларускіх пісьменнікаў гэта, хутчэй, рэдкае выключэнне. Як, напрыклад, у адным з эпізодаў з "Жураўлінага крыку" В. Быкава: *Аўсееў непрыязна бліснуў на старшыну* ***чорнымі*** *сцюдзёнымі вачыма.* Лічыцца, што ў значнай ступені менавіта вочы – люстэрка чалавечага характару, адлюстраванне псіхічнага стану ў пэўны момант і эмацыйнасці ўвогуле.

Колеракод *чорны* можа адлюстроўваць станоўчую канатацыю і па-за партрэтнай характарыстыкай персанажа, калі гаворка ідзе не пра колер вачэй ці валасоў: *Валодзька, стомлены,* ***чорны*** *ад твані, аж ззяў ад шчасця* (І. Мележ. Людзі на балоце); *Спелі ягады. За суніцамі – чарніцы, ад якіх аж* ***чорна*** *было між рослага папаратніку* (тамсама); *Лясок над рэчкай. Пераправа / Дыхнула блізкасцю вады. / Чарэшні навісаюць млява, / Даспелі ўжо да* ***чарнаты*** (А. Пысін. Белы камень); *Аснова асноў, без яе чалавек / Да зорак дайшоў бы хіба? / Таму і спяваю я песню табе, /* ***Чорная*** *скіба!* (К. Цвірка. Чорная скіба).

Заканчэнне будзе.

Спіс літаратуры

1. **МакКормак, Э.** Когнитивная теория метафоры / Э. МакКормак // Теория метафоры. Сборник. – М., 1990.

2. **Міфалогія беларусаў** : энцыклапедычны слоўнік. – Мінск, 2011.

3. **Кульпина, В.** Лингвистика цвета : Термины цвета в польском и русском языках / В. Кульпина. – М., 2001.

Юрый БАБІЧ,
кандыдат філалагічных навук.

Аўтар ахвяруе ганарар на развіццё часопіса.

МЕТОДЫКА І ВОПЫТ

Міністэрства адукацыі прапануе

АД ПРОСТАГА СКАЗА ДА СКЛАДАНАГА

МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ І РЭКАМЕНДАЦЫІ (IX КЛАС)*

Працяг. Пачатак у №№ 7 – 9, 11, 12 за 2012 г., № 1 за 2013 г.

ВЫКАРЫСТАННЕ СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫХ СКАЗАЎ У ТЭКСТАХ РОЗНЫХ ТЫПАЎ, СТЫЛЯЎ І ЖАНРАЎ

Мэта заняткаў – паўтарыць і сістэматызаваць веды вучняў пра ўжыванне складаназалежных сказаў у тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў; удасканальваць уменне выкарыстоўваць розныя тыпы складаназалежных сказаў адпаведна сэнсавым і стылістычным асаблівасцям кантэксту.

Пры выкананні *практыкавання 91* трэба звярнуць увагу вучняў на тое, што роднаснымі да слова *анатацыя* з'яўляюцца словы *занатаваць* 'запісаць што-небудзь для памяці або адзначыць у памяці', *нататка* 'кароткі запіс або інфармацыя ў друку пра што-небудзь'. У якасці дадатковага задання можна прапанаваць замяніць канструкцыю з пабочным словазлучэннем, якое паказвае на крыніцу паведамлення, складаназалежным сказам: ***Паводле падлікаў спецыялістаў****, чытач, выбіраючы кнігу па бібліятэчных картках без анатацый, у 30 – 50% памыляецца ў сваім выбары.* – ***Спецыялісты высветлілі****, што чытач, выбіраючы кнігу па бібліятэчных картках без анатацый, у 30 – 50% памыляецца ў сваім выбары.* Трэба звярнуць увагу вучняў на тып сінтаксічнай сувязі паміж колькаснымі лічэбнікамі і назоўнікам: у *трыццаці – пяцідзесяці працэнтах* – дапасаванне. У назоўным склоне гэтыя лічэбнікі кіруюць назоўнікамі: *трыццаць працэнтаў.*

Практыкаванні 92 і *93* могуць быць прапанаваны для самастойнага выканання. Настаўнік можа даць заданне знайсці ў тэкстах словы, што маюць наступныя лексічныя значэнні: 'сутыкненне якіх-небудзь процілеглых сіл, інтарэсаў, імкненняў' (калізія); 'чуццё, тонкае разуменне, пранікненне ў самую сутнасць чаго-небудзь' (інтуіцыя); 'свяшчэнны, які адносіцца да рэлігійнага культу і рытуалу' (сакральны); 'які мае адносіны да пропаведзі хрысціянскага веравызнання сярод нехрысціянскага насельніцтва' (місіянерскі). Можна прапанаваць вучням уключыць гэтыя словы ў выказванне. Старшакласнікі звернуць увагу на напісанне з вялікай літары слоў *Нябесная Апякунка*, *Вера*, звязаных з найважнейшымі персаналіямі і паняццямі хрысціянскага веравызнання.

Аналізуючы тэкст *практыкавання 93*, вучні павінны прыйсці да высновы, што твор належыць да навуковага стылю. Прыметамі навуковага стылю з'яўляюцца інфармацыйная насычанасць (артыкул дае дастаткова поўныя звесткі пра рэцэнзію), аб'ектыўнасць (непрадузятасць выкладу), дакладнасць і скрупулёзнасць у падачы матэрыялу. У гэтым стылі ўжываюцца складаназалежныя сказы, якія выражаюць узаемаадносіны паміж фактамі і з'явамі, што важна для навуковага выкладу. У тэксце выкарыстоўваюцца тэрміны: *рэцэнзія*, *аўтарэцэнзія*, *эсэ*, *палеміка*, *жанр*, *публікацыя*, *крытыка*. Што да дзеясловаў, то ў навуковай рабоце выкарыстоўваюцца формы *даецца*, *вылучаюць*, *вядзецца* і іншыя ў значэнні цяперашняга абстрактнага часу. Гэтыя формы абазначаюць пастаяннае, пазачасавае дзеянне.

Старшакласнікам трэба будзе знайсці ў прыведзеным тэксце слова са значэннем 'празаічны нарыс невялікага аб'ёму і вольнай кампазіцыі на прыватную тэму, якая трактуецца суб'ектыўна і няпоўна' (эсэ). Неабходна звярнуць увагу на правапіс гэтага слова.

Пры выкананні *практыкавання 94* трэба адзначыць, што рэцэнзія А. Марціновіча на кнігу "Мы: аповесць пра нашы прозвішчы" У. Ліпскага – тэкст навукова-папулярнага стылю. Чытачы такога твора не маюць спецыяльных ведаў у галіне антрапанімікі. Ужыванне тэрмінаў мінімальнае, прычым кожны з іх падрабязна паясняецца

* Заданні і практыкаванні змешчаны ў дапаможніку: Бут-Гусаім, С. Ф. Складаны сказ без складанасці / С. Ф. Бут-Гусаім, В. М. Касцючык, М. І. Новік. – Мінск : Аверсэв, 2012. – 140 с.

Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў па беларускай мове для IX класа "Складаны сказ без складанасці" змешчана ў № 10 за 2011 г.

(*антрапаніміка*, *прозвішча*). Асаблівасцю стылю з'яўляюцца лёгкасць чытання, выкарыстанне параўнання са звыклымі з'явамі і прадметамі: прозвішчы параўноўваюцца з люстэркам, у якім адбіваецца гісторыя і культура краю. Што да аналізу складаназалежных сказаў, то ўвагу вучняў неабходна звярнуць на сказ *Узнікла яна з разумення, што на зямлі ёсць МЫ – беларусы, народ, нацыя.* У сказе даданая дапаўняльная частка адносіцца да назоўніка са значэннем мысленчай дзейнасці. Даказаць, што гэта дапаўняльная, а не азначальная частка, можна, падставіўшы ў галоўную частку дапаўненне *разумення* ***таго***… І яшчэ адзін крытэрый размежавання: злучнік *што* нельга замяніць словам *які*, *каторы*, што бывае магчыма пры азначальных адносінах паміж часткамі складанага сказа.

Старшакласнікам неабходна будзе растлумачыць значэнне слова *радавод* 'паходжанне ад агульнага продка, сістэма крэўных сувязей, заснаваных на сваяцтве'. Настаўнік раскажа, што *Радавод* – гэта міфалагічны бог адзінства роду, племені. Ён лічыўся адным з галоўных багоў, асацыяваўся з *парадзіхамі* – жаночымі персанажамі – прадаўжальніцамі роду. Радаводу і парадзіхам пакланяліся, прыносілі дары (ежу, мёд), пры гэтым згадвалі продкаў – вялі *радавод*. Вучні знаходзяць у рэцэнзіі словы з наступнымі лексічнымі значэннямі: 'шэраг правячых манархаў, якія паходзяць з аднаго роду' (дынастыя), 'вусная народная творчасць, сукупнасць народных абрадавых дзеянняў' (фальклор), 'матэрыяльны носьбіт спадчыннага матэрыялу, які вызначае фарміраванне структуры жывога арганізма' (ген).

Твор "Фёдор=Иван" (*практыкаванне 96*) належыць да навукова-папулярнага стылю і адрасаваны тым, хто цікавіцца гісторыяй айчыннага іменаслову. Пераклад тэксту на беларускую мову дазволіць удасканаліць навык падбору да рускіх адзінак беларускіх адпаведнікаў: рус. *два различных произношения* (спосаб сінтаксічнай сувязі – кіраванне) – бел. *два розныя вымаўленні* (спосаб сінтаксічнай сувязі – дапасаванне), рус. *имена, содержащие в себе слоги "Тео" или "Фео"* – бел. *імёны са складамі "Тэа" або "Феа"*, рус. *Божья благодать* – бел. *Божая раскоша*.

Пры разглядзе *практыкавання 97* навучэнцы вызначаюць стыль тэксту. Рэпартаж "Святыя зярняты народнай Куцці" Ірыны Тулупавай – узор твора публіцыстычнага стылю, для якога характэрны вобразнасць і яркасць выкладу. Гэта абумоўлена прызначэннем публіцыстыкі: паведамляючы пра факты, фарміраваць грамадскую думку, актыўна ўздзейнічаць на розум і пачуцці чалавека. Твор насычаны тэрміналагічнай лексікай – найменнямі паняццяў са сферы культуры (*фальклорныя традыцыі*, *каляндарныя святы*, *калядныя песні*, *гуканні вясны*, *куцця*) і грамадскіх адносін (*сацыякультурная дзейнасць*, *ідэнтычнасць нацыі*). Побач са словамі з прамым значэннем, выкарыстаны і лексічныя адзінкі, якія маюць пераносны, алегарычны сэнс. Так, найменнем ключавога паняцця твора з'яўляецца *Куцця*. Значнасць паняцця падкрэсліваецца напісаннем слова з вялікай літары. Настаўнік раскажа вучням, што *куцця* – гэта абрадавая каша з ячных, пшанічных ці грэцкіх круп. *Куццёй* называюць і ўрачыстую вячэру, на якой гэтая каша фігуруе як абавязковая абрадавая страва. Куццю гатавалі да Каляд, на Дзяды, у час жніва, на радзіны, яна была цесна звязана з культам продкаў. Яна сімвалізуе вечнасць жыцця, урадлівасць нівы і выконвае магічныя і выхаваўчыя функцыі. Для гераіні рэпартажу, навукоўца-фальклярыста Ларысы Мятлеўскай, *Куцця* – гэта адроджаныя фальклорныя традыцыі каляндарных свят і абрадаў беларусаў, якія прыходзяць з глыбіні стагоддзяў і звязваюць мінулае, сучаснасць і будучыню. Пры выкананні практыкавання вучням неабходна знайсці ў тэксце словы, што маюць наступныя лексічныя значэнні: 'які адпавядае арыгіналу, правільны, сапраўдны' (аўтэнтычны), 'комплекс адзення, характэрны для якога-небудзь рэгіёна; уборы, убранне (разм.)' (строй). Настаўнік расказвае вучням пра *гуканне вясны* – веснавое свята, якое пачынала Дабравешчанне. Удзельнікі свята выходзілі на высокае месца, раскладалі вогнішча, палілі смецце, ачышчаючы зямлю, запаленае кола на плыце пускалі па рацэ, што было водгукам культу сонца.

Вучні падзяляюцца на варыянты: І варыянт аналізуе структуру, сродкі сувязі, значэнне складаназалежных сказаў з адной даданай, ІІ варыянт – з некалькімі даданымі часткамі. Замацаванню ўмення характарызаваць структуру і значэнне сказаў будзе садзейнічаць складанне лінейных і структурных схем сказаў.

Практыкаванне 98 задаецца вучням на дом.

СА ЗЛУЧНІКАМ ЦІ БЕЗ ЯГО: АДРОЗНЕННЕ БЯЗЗЛУЧНІКАВЫХ СКАЗАЎ АД ІНШЫХ СКЛАДАНЫХ СКАЗАЎ

Мэта заняткаў – узнавіць і замацаваць веды пра складаныя злучнікавыя і бяззлучнікавыя сказы; развіваць уменне школьнікаў вызначаць сэнсавыя адносіны паміж часткамі складаных сказаў і сродкі сувязі частак; удасканальваць пунктуацыйныя навыкі.

Заняткі варта пачаць з узнаўлення ведаў школьнікаў пра віды складаных сказаў паводле спосабу сувязі частак. Гэта можна зрабіць, выканаўшы практыкаванні з рубрыкі "Паўтараем".

Раскрыццё тэрмінаў *злучнікавыя* і *бяззлучнікавыя сказы* (*практыкаванне 99*) вымагае

ад вучняў успомніць асаблівасці відаў сувязі ў складаназлучаным (злучальная) і складаназалежным (падпарадкавальная) сказах, а таксама віды злучнікаў – злучальныя, падпарадкавальныя – і злучальныя словы. Сярод прапанаваных сказаў школьнікі павінны ўбачыць: 1-ы сказ – складаназалежны з даданай параўнальнай; 2-і – складаназалежны з даданай азначальнай; 3-і – з рознымі відамі сувязі частак (бяззлучнікавай і падпарадкавальнай); 4-ы – бяззлучнікавы; 5-ы – складаназлучаны.

Уменне вызначаць сэнсавыя адносіны паміж часткамі складаных сказаў, а таксама ўменне вызначаць віды сувязі частак удасканальваецца пры выкананні *практыкавання 100*. Да таго ж вучні практыкуюцца ў абгрунтаванні свайго меркавання пра тып сказа паводле будовы: сярод прапанаваных прыкладаў – складаназалежныя сказы – 1, 2, 4; просты сказ з аднароднымі членамі сказа – 3.

Рубрыка "Пунктуацыйны трэнінг" скіравана на развіццё ўмення правільна вызначаць сэнсавыя адносіны паміж часткамі складанага сказа і пунктуацыйна правільна афармляць складаныя бяззлучнікавыя сказы. *Практыкаванне 101* дапаможа вучням паўтарыць правілы пастаноўкі знакаў прыпынку шляхам выбару адпаведнага прыкладу – сказа да прапанаванага ў табліцы матэрыялу: I – сказ 2; II – сказы 1, 3, 6, 7; III – сказы 4, 5.

Выкананне *практыкавання 102* дазволіць школьнікам развіваць навык вызначаць сэнсавыя адносіны паміж часткамі складанага сказа, абгрунтоўваць адпаведны знак прыпынку, бачыць структуру сказаў. Сярод прапанаваных сказаў – 1-ы – складаназлучаны, сказы 2 і 3 – складаныя бяззлучнікавыя.

Удасканаленню уменняў школьнікаў пунктуацыйна правільна афармляць тэксты садзейнічаюць заданні з рубрыкі "Працуем карэктарамі". У *практыкаванні 103* вучням трэба будзе ўбачыць не толькі складаныя сказы, але і знакі прыпынку ў простым сказе ці частках складанага сказа, ускладненых аднароднымі членамі, звароткамі.

Рубрыка "Рыхтуемся да дыктоўкі" (*практыкаванне 106*) акцэнтуе ўвагу школьнікаў на правілах пастаноўкі знакаў прыпынку, вывучаных раней.

Заданні з рубрыкі "Працуем перакладчыкамі" (*практыкаванні 104* і *105*) дазваляюць паўтарыць і замацаваць веды школьнікаў пра разнастайныя віды складаных сказаў, выпрацаваць уменне не толькі вылучаць сярод іх складаныя бяззлучнікавыя сказы, але і перадаць прапанаваную ў тэкстах інфармацыю сродкамі беларускай мовы. У *практыкаванні 106* складаным для вучняў можа быць падбор адпаведнікаў да некаторых слоў і словазлучэнняў. Напрыклад: *язык, отличный от разговорного – мова, якая адрозніваецца ад гутарковай*; *утонченный язык – далікатная, узвышаная мова*; *заклинания – замовы.* Менавіта пераклад вымагае ад школьнікаў ведання арфаграфічных (пры пісьмовым перакладзе), арфаэпічных (пры вусным перакладзе), а таксама лексічных, граматычных нормаў беларускай літаратурнай мовы.

Працяг будзе.

Святлана БУТ-ГУСАІМ,
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства
Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта,
Марыя НОВІК,
кандыдат філалагічных навук,
загадчык кафедры беларускага мовазнаўства
Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтары ахвяруюць ганарар на развіццё часопіса.

КАЛЯНДАР ПАМЯТНЫХ ДАТАЎ І ЮБІЛЕЙНЫХ ДЗЁН на 2013 год

КРАСАВІК

1 красавіка – 90 гадоў з дня нараджэння Віктара Папова (1923 – 1981), скульптара

80 гадоў з дня нараджэння Віктара Сташчанюка (1933 – 2007), графіка, мастака дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва

2 красавіка – 80 гадоў з дня нараджэння Віктара (Вікенція) Шымука (1933 – 1998), паэта, празаіка, перакладчыка

3 красавіка – 75 гадоў з дня нараджэння Людмілы Барташэвіч, актрысы

70 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Рагаўцова, акцёра, заслужанага артыста Беларусі

4 красавіка – 120 гадоў з дня нараджэння Мікалая Шчаглова-Куліковіча (1893, паводле іншых крыніц, 1896 ці 1897 – 1969), кампазітара, музычнага і тэатральнага дзеяча. Жыў у ЗША

105 гадоў з дня нараджэння Ганны Базыленкі (1908 – 1980), мовазнаўцы

75 гадоў з дня нараджэння Вячаслава Кавалеўскага (1938 – 1997), мастака-плакатыста, афармляльніка

5 красавіка – 70 гадоў з дня нараджэння Мар'яна Дуксы, паэта

6 красавіка – 70 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Заневіча, спевака, педагога, заслужанага артыста Беларусі

7 красавіка – 100 гадоў з дня нараджэння Максіміліяна Гугеля (1913 – 1985), графіка

8 красавіка – 110 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Скібнеўскага (1903 – 1978), рэжысёра і педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў Удмурціі, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі

10 красавіка – 115 гадоў з дня нараджэння Боруха Янпольскага (1898 – 1975), акцёра, заслужанага артыста Беларусі

75 гадоў таму выйшаў у свет першы нумар маладзёжнай газеты "Знамя юности"

Заканчэнне на с. 92.

Алена САЛАМЕВІЧ

МНЕМОНІКА ПРЫ ВЫВУЧЭННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Працяг. Пачатак у №№ 2, 4, 9 за 2011 г., № 1 за 2013 г.

Да II спражэння адносяцца дзеясловы, якія ў форме 3-й ас. мн. л. маюць канчаткі *-аць*, *-яць*.

Калі гэтыя канчаткі *ненаціскныя*, то абавязкова ненаціскнымі яны будуць таксама ў формах 2-й і 3-й ас. адз. л., 1-й і 2-й ас. мн. л.: *яны гаво́р**аць**, но́с**яць** – ты гаво́р**ыш**, но́с**іш**, ён гаво́р**ыць**, но́с**іць**, мы гаво́р**ым**, но́с**ім**, вы гаво́р**ыце**, но́с**іце*** (аднак: *я гавар**у́**, наш**у́***). З дзеясловамі II спражэння менш праблем, іх канчаткі запамінаюцца лягчэй, бо літары *ы*, *і* заўсёды ёсць у канчатках формаў 2-й і 3-й ас. адз. л., 1-й і 2-й ас. мн. л.

II спражэнне. Ненаціскныя канчаткі.

Асоба	Адз. лік	Мн. лік
1	-у́, -ю́	-ым, -ім
2	-ыш, -іш	-ыце, -іце
3	-ыць, -іць	-аць, -яць

Аднак калі канчаткі *націскныя*, то ў форме 2-й ас. мн. л. націск таксама падае на склад ***-це*** (як і ў дзеясловаў I спражэння з націскнымі канчаткамі): *яны сп**я́ць** – вы сп**іце́**, яны дрыж**а́ць** – вы дрыж**ыце́**, яны маўч**а́ць** – вы маўч**ыце́***.

II спражэнне. Націскныя канчаткі.

Асоба	Адз. лік	Мн. лік
1	-у́, -ю́	-ы́м, -і́м
2	-ы́ш, -і́ш	-ыце́, -іце́
3	-ы́ць, -і́ць	-а́ць, -я́ць

Калі ж націск будзе пастаўлены не на апошні, а на папярэдні склад, мы будзем мець формы не абвеснага ладу, а загаднага: *дрыжы́це*, *спі́це*, *маўчы́це*.

Эфектыўным для запамінання націскных канчаткаў II спражэння будзе заданне на складанне тэксту з дзеясловамі ў форме 2-й ас. мн. л., напрыклад:

*Летам вы, журавы, маўч**ыце́**,*
*Ціха ў гнёздах сваіх седз**іце́***
*І начамі ў балотах сп**іце́**.*
*А куды ж вы цяпер лец**іце́**?*
*Гэтак жаласна вы крыч**ыце́**,*
*Што ў чужыя краі імч**ыце́**?*

Калі канчаткі ненаціскныя, вучні могуць няправільна вызначаць спражэнне па 3-й ас. мн. л. Напрыклад: дзеяслоў *палоць – яны пол**юць*** ці *яны пол**яць***? У такіх выпадках (а можна і заўсёды) спражэнне вызначаюць па знешнім выглядзе інфінітыва. Інфінітыў на канцы мае суфіксы *-ць*, *-ці*, *-чы* (калі зваротны, пасля іх постфіксы *-ца*, *-ся*: *адмові**ць** – адмові**цца**, нес**ці** – нес**ці**ся, бераг**чы** – бераг**чы**ся*). Суфіксы (і постфіксы) трэба апусціць і прыгледзецца да апошняй літары, калі гэта *і* або *ы*, падумаць, яны суфіксы (тады дзеяслоў II спражэння) ці частка кораня (тады I спражэння): *гавары**ць** – гавар**ы**-* (*ы* – суфікс), *жы**ць** – ж**ы**-* (*ы* – частка кораня *жы-*). Калі дзеяслоў і I, і II спражэння заканчваецца на *-эць*, *-ець*, *э*, *е* – суфіксы. Аднак калі суфіксы *-э-* ці *-е-* захоўваюцца пры спражэнні – гэта I спражэнне, не захоўваюцца – II спражэнне: *стал**е**ць – я стал**е**ю, ты стал**е**еш, ён стал**е**е, мы стал**е**ем, вы стал**е**еце, яны стал**е**юць* (I спражэнне); *глядз**е**ць – я гляджу, ты глядзіш, ён глядзіць, мы глядзім, вы гледзіце́, яны глядзяць* (II спражэнне). Праўда, дастаткова паставіць дзеяслоў у форме 1-й ас. адз. л. (у гэтай асобе канчаткі для I і II спражэнняў аднолькавыя: *-у*, *-ю*, у астатніх жа формах можна памыліцца менавіта з канчаткам, бо працэс вызначэння спражэння яшчэ не закончаны). Абітурыенты ўсё роўна могуць памыліцца, калі слова мала ўжываюць ці сустракалі яго няправільныя формы, як гэта бывае з дзеясловам *саром**е**цца*: *саром**е**-ц-ца – я саром**е**юся*, але памылкова могуць сказаць ці напісаць: *саромлюся*. Тым больш што ў мове мастацкай літаратуры сустракаем: *Пад небам блакітным саромімся мы галізны. Пад небам адкрытым саромся хлусні і грызні* (А. Вярцінскі) [6, с. 208].

Ёсць дзеяслоў, які не падпарадкоўваецца правілу, адносіцца да I спражэння, хоць у ім *-е-* выпадае: ***хацець** – я хачу, ты хочаш, ён хоча, мы хочам, вы хочаце, яны хочуць*. Канчаткі ў ім ненаціскныя, таму яго часта няправільна спрагаюць, ужываючы канчаткі II спражэння.

Дзеясловы II спражэння, у якіх перад інфінітыўным суфіксам галосныя *-а-*, *-я-*, трэба проста запомніць: *стаяць, гнаць, спаць, крычаць, ламаць, баяцца, імчаць, маўчаць, ляжаць (належаць, залежаць)**. Усе астатнія адносяць да I спражэння.

Лепш за ўсё гэтае правіла размясціць у табліцы (гл. табліцу “Вызначэнне спражэння па інфінітыве” с. 54).

Выпускнікі школы не заўсёды правільна вызначаюць марфемную будову дзеяслова, а тут вельмі

* Гэтую групу можна павялічыць дзеясловамі з шыпячым перад суфіксам *-а-*: *верашчаць*, *вішчаць*, *пішчаць*, *трашчаць*, *тарчаць*. Некаторыя з іх паралельна ўжываюцца з суфіксам *-э-*: *блішчаць* і *блішчэць*, *дрыжаць* і *дрыжэць*, *бурчаць* і *бурчэць*. Таму для дзеясловаў з шыпячымі перад *-а-* / *-э-* можна прымяняць правіла: у 1-й ас. адз. л. *-а-* / *-э-* не захоўваюцца (*я дрыжу*, *бурчу*), значыць, гэта дзеясловы II спражэння.

Вызначэнне спражэння па інфінітыве.

Знешні выгляд інфінітыва	I спражэнне	II спражэнне
-ыць / -ыцца *-іць / -іцца*	*-ы-, -і-* – частка кораня: аднаскладовыя дзеясловы і вытворныя ад іх (*мыць, жыць, піць, ліць, мыцца, выжыць, напіцца, выліць* і інш.)	*-ы-, -і-* – суфіксы: шматскладовыя дзеясловы і вытворныя ад іх (*варыць, ляпіць, хваліць, крышыць, пераварыць, узважыць, вучыцца, хваліцца* і інш.)
-эць / -эцца *-ець / -ецца* *-э-, -е-* – суфіксы	У форме 1-й ас. адз. л. суфіксы *-э-, -е-* захоўваюцца (*стар**э**ць – стар**э**ю, маладз**е**ць – маладз**е**ю* і інш.) !!! *хацець*	У форме 1-й ас. адз. л. суфіксы *-э-, -е-* не захоўваюцца (*гар**э**ць – гару, ненавідз**е**ць – ненавіджу, вярц**е**ць – вярчу* і інш.)
	Усе астатнія	*Стаяць, крычаць, ламаць, гнаць, спаць, баяцца, імчаць, маўчаць, ляжаць*, і вытворныя ад іх: *настаяцца, раскрычацца, зламаць, пагнаць, пагнацца, пабаяцца, намаўчацца, памчаць, памчацца, належаць, залежаць* і інш.

важна бачыць марфемны склад інфінітыва. Выкладчык павінен зноў акцэнтаваць увагу на разборы дзеясловаў паводле складу, навучыць абітурыентаў бачыць дзеясловы аднаскладовыя і асабліва вытворныя ад іх, а таксама дзеясловы з суфіксамі *-ы-*, *-і-*. Для трэніроўкі прапануецца той жа метад: даецца група дзеясловаў на *-ыць / -ыцца*, *-іць / -іцца*, сярод якіх патрэбна выбраць тыя, у якіх *-ы-*, *-і-* – суфіксы (г. зн. толькі дзеясловы II спражэння). Потым дзеясловы групуюцца ў сэнсавыя рады (напрыклад: а) *хадзіць, вучыцца, лічыць, гаварыць, тварыць, хваліцца, закончыць, паступіць, здзейсніць, ажыццявіць*; б) *нарадзіць, няньчыць, карміць, паіць, вучыць, вадзіць, дружыць, любіць*; в) *лячыць, сачыць, загаіць, даражыць*; г) *грашыць, спаліць, вастрыць, дрэйфіць, маліць, маліцца*), складаюцца звязныя тэксты ці вершаванні.

Каб запомніць дзеясловы II спражэння *стаяць, крычаць, ламаць, гнаць, спаць, баяцца, маўчаць, імчаць, ляжаць* і не аднесці да I спражэння ("усе астатнія"), трэба таксама пабудаваць пэўны лагічны рад, пастарацца стварыць карціну (карціны), што спрасціла б запамінанне. Напрыклад, такая жыццёвая сітуацыя: дзіця доўга, да поўначы, сядзіць за камп'ютарам. Бацьку ці маці трэба над гэтым дзіцем *стаяць*, *ламаць* рэжым сына ці дачкі, *крычаць* і *гнаць спаць*. Дзіцё *баіцца*, *імчыць* (не пераблытаць з *бегчы* – гэта рознаспрагальны дзеяслоў) і *ляжыць*, *маўчыць*. У жыцці, праўда, другі і трэці сюжэты запамінанкі не заўсёды збываюцца. Аднак уяўныя карцінкі дапамогуць замацаваць у памяці патрэбную групу дзеясловаў.

Можна стварыць зрыфмаваны тэкст:

Дзіця да поўначы не спіць,
А за камп'ютарам сядзіць.
Бацькам над ім трэба стаяць,
Рэжым ламаць, крычаць, гнаць спаць.
Дзіця бацькоў сваіх баіцца –
У ложачак ляжаць імчыцца.
Баіцца? Так! Яно ж імчыць,
Ляжыць і ў ложачку маўчыць.

Тут прадстаўлены ўсе дзеясловы II спражэння той групы, якую трэба запомніць абітурыентам. Апрача таго, у форме 3-й ас. адз. л. пададзены дзеяслоў *сядзець*, ён таксама II спражэння (*сядз**е**ць – я сяджу*, *-е-* выпадае).

Рознаспрагальныя дзеясловы *бегчы*, *есці*, *даць* літаральна просяцца ў лагічную групу: *Каму трэба **бегчы даць есці**? Хто галодны?* Калі на занятках пачынае весціся гутарка пра гэтыя дзеясловы, заўсёды бачу ўсмешкі на тварах навучэнцаў. Напэўна, кожны з іх будуе нейкі лагічны ланцужок. Аднак трэба памятаць, што не толькі гэтыя дзеясловы трэба лічыць рознаспрагальнымі. Да іх адносяцца ўсе вытворныя ад ***бегчы*** (*пабегчы, прыбегчы, адбегчы, выбегчы, забегчы, разбегчыся* і інш.), ***есці*** (*паесці, з'есці, наесціся, выесці, недаесці* і інш.), ***даць*** (*здаць, выдаць, перадаць, аддаць, здацца, падаць* і інш.), калі каркас дзеяслова застаецца нязменным, а дадаецца толькі прыстаўка ці постфікс або адначасова прыстаўка і постфікс. Нельга блытаць рознаспрагальныя дзеясловы з дзеясловамі I спражэння ***бегаць*** (*я бегаю, ты бегаеш, ён бегае, мы бегаем, вы бегаеце, яны бегаюць*) і вытворнымі *выбягаць, забягаць, разбегацца*; ***даваць*** (*я даю, ты даеш, ён дае, мы даём, вы даяце, яны даюць*) і вытворнымі *перадаваць, здаваць, выдаваць, здавацца, выдавацца*; ***з'ядаць*** (*я з'ядаю, ты з'ядаеш, ён з'ядае, мы з'ядаем, вы з'ядаеце, яны з'ядаюць*) і вытворнымі *пад'ядаць, недаядаць, выядаць* і інш.

Дык як жа змяняюцца па асобах і ліках рознаспрагальныя дзеясловы?

БЕГЧЫ	
Адз. л.	**Мн. л.**
я бягу́	мы бяжы́м
ты бяжы́ш	вы бежыце́
ён бяжы́ць	яны бягу́ць

Дзеяслоў *бегчы* толькі ў форме 3-й ас. мн. л. мае канчатак I спражэння, у астатніх – II (канчаткі формы 1-й ас. адз. л. для I і II спражэнняў аднолькавыя).

ЕСЦІ	
Адз. л.	**Мн. л.**
я е́м	мы ядзі́м
ты я́сі	вы ясце́
ён е́сць	яны ядзя́ць

ДАЦЬ	
Адз. л.	**Мн. л.**
я да́**м**	мы дадзі**м**
ты да**сі́**	вы да**сце́**
ён да́**сць**	яны дад**у́ць**

У дзеясловаў *есці*, *даць* толькі ў форме 1-й ас. мн. л. канчаткі II спражэння, а ў форме 3-й ас. мн. л. – I спражэння. У астатніх формах захаваліся рэшткі старажытных канчаткаў. У форме 2-й ас. мн. л. (пад націскам) у гэтых дзеясловаў могуць быць варыянтныя канчаткі *-сцё*. Пад уплывам канчаткаў такіх дзеясловаў у рускай мове (*ты ешь, вы едите*; *ты дашь, вы дадите*) часта дапускаюць памылкі, калі пішуць і гавораць па-беларуску. Зваротныя рознаспрагальныя дзеясловы *наесціся*, *здацца* ў форме 3-й ас. адз. л. маюць адну літару *ц*: *ён наесца, ён здасца*.

Прапануем вершаванне, з якога дастаткова завучыць першыя два радкі, каб зафіксаваць у памяці рознаспрагальныя дзеясловы.

Патрэбна ***бегчы есці даць***
Прагаладалым дзеткам,
Суседцы грошы перадаць –
Такія планы ў Светкі.
Прыбегла, ежу падала
І выдала раптоўна:
– Усё вось гэта са стала
Вы з'есці ці гатовы?
Вадзім:
– Не з'ем, пюрэ аддам,
Яго з'есць Тася ці Адам.
– Ну з'еш!.. Чаму ж ты не з'ясі,
Адаму й Тасі аддасі?
– Не, дзякуй, мамачка, мерсі…
Сама ж чаму ты не ясі?
– Ды мне ж ужо няма калі…
(Назад хіба што на таксі?!)
Суседцы, калі ўсё з'ясце,
Вы дзвесце тысяч аддасце?
– З'ядзім, матуля, аддадзім! –
Зноў галасок падаў Вадзім.
Адам:
– З'ямо і аддамо!
Нашто ў абед табе дамоў?
Мы ўжо дарослыя даўно!
Другія мамы не бягуць,
Парады дзецям раздадуць –
І дзеці самі пад'ядуць.

* * *

Не трэба *бегаць, падаваць,*
Мы можам самі згатаваць
І згатаванае з'ядаць!

Карысна папрацаваць з усім тэкстам, які складаўся з захаваннем пэўнай умовы: тут павінны быць толькі рознаспрагальныя дзеясловы. Аднак мы адышлі ад гэтай умовы. Пасля зорачак (***) у тэксце ўсе дзеясловы I спражэння, якія вельмі падобны (акрамя *магчы*, *згатаваць)* да рознаспрагальных, таму словы пасля зорачак утрымліваюць і такі змест: "***не трэба*** словы *бегаць*, *падаваць*, *з'ядаць* блытаць з рознаспрагальнымі!" Рознаспрагальныя ж дзеясловы (а менавіта *есці* і *даць* і вытворныя ад іх, пры спражэнні якіх у навучэнцаў больш за ўсё памылак) прадстаўлены ва ўсіх формах: 1-й ас. адз. л. (*з'ем, аддам*), 2-й ас. адз. л. (*не ясі, не з'ясі, аддасі*), 3-й ас. адз. л. (*з'есць*), 1-й ас. мн. л. (*з'ядзім, аддадзім*; *з'ямо, аддамо*), 2-й ас. мн. л. (*з'ясце, аддасце*), 3-й ас. мн. л. (*не бягуць, раздадуць, пад'ядуць)*; у форме інфінітыва (*бегчы, есці, даць, перадаць, з'есці*), прошлага часу (*прыбегла, падала, выдала, падаў*), загаднага ладу (*з'еш*). Апошняя форма вельмі часта называецца абітурыентамі як форма 2-й ас. адз. л. абв. л. – гэта тлумачыцца ўплывам роднаснай рускай мовы (*ты ешь, ты дашь* – абвесны лад). Спецыяльна выкарыстаны некалькі разоў і акустычны код: *ад**дам** – А**дам***; *адда**сі**, з'я**сі**, *не я**сі** – Та**сі**, так**сі**, мер**сі**; з'я**дзім**, ад**дадзім** – В**адзім**; з'я**мо**, ад**дамо** – да**мо**ў*; *з'я**сце**, ад**дасце** – дзве**сце*** – у некаторых мнеманічных прыёмах выкарыстоўваюцца візуальныя і акустычныя коды [4, с. 376].

Формы *з'ямо*, *аддамо* і пад. (1-й ас. мн. л.) таксама старажытныя, іх апошнім часам выцеснілі новыя формы *з'ядзім*, *аддадзім.*

ЭЛЕАНОРА

Многія дзеясловы I спражэння ў пачатковай форме перад *-ць* (*-цца*) маюць суфіксы *-ва-*, *-іва-*, *-ыва-*, *-ава-*, *-ява-*. Усе яны незакончанага трывання, калі не маюць прыставак (параўн.: *сябраваць – пасябраваць*).

Калі ў форме 1-й ас. адз. л. дзеяслоў заканчваецца на *-ую*, *-юю*, то ў інфінітыве пішуцца суфіксы *-ава-*, *-ява-*: *даследую – даследаваць, працую – працаваць, сяброю – сябраваць, гастралюю – гастраляваць, кантралюю – кантраляваць.* Гэты ж суфікс будзе і ў формах дзеяслова, якія ўтвараюцца ад асновы інфінітыва: *сябр**ава**ць – сябр**ава**ў, сябр**ава**ла, сябр**ава**лі, сябр**ава**ў бы.*

Прыгожае жаночае імя *Элеанора* дапамагае запомніць правіла напісання суфіксаў *-іва-*, *-ыва-* ў дзеясловах незакончанага трывання I спражэння, якія ў форме 1-й ас. адз. л. заканчваюцца на *-ваю*.

Суфіксы *-іва-*, *-ыва-* пішуцца толькі тады, калі ў дзеясловах ёсць збег зычных, аднак не любы збег зычных, а такі, у якім апошнімі аказваюцца літары *л*, *н* або *р* – якраз тыя, што ёсць у слове *Э**л**еа**н**о**р**а*: *стры**мл**іваць, стры**мл**іваю, стры**мл**іваў*; *злу**пл**іваць, злу**пл**іваю, злу**пл**іваў*; *зачэ**рн**іваць, зачэ**рн**іваю, зачэ**рн**іваў*; *праве**тр**ываць, праве**тр**ываю, праве**тр**ываў.*

Пры параўнанні гэтых дзеясловаў незакончанага трывання з дзеясловамі закончанага тры-

вання назіраем гістарычныя чаргаванні зычных, у якіх апошні зычны – гук [л’]:

[п] – [пл’]: *злупіць – злупліваць*, *зляпіць – злепліваць*;

[б] – [бл’]: *зарубіць – зарубліваць*;

[в] – [ўл’]: *абумовіць – абумоўліваць*;

[м]– [мл’]: *стрымаць – стрымліваць*.

Калі збег зычных заканчваецца іншым гукам (і адпаведна літарай), пішацца суфікс *-ва-*: *расто**пт**ваць, распро**ст**ваць, расхі**ст**ваць, разго**рт**ваць, распы**рск**ваць, зачэ**рч**ваць, расплю**шч**ваць.*

Гэты ж суфікс выбіраецца таксама тады, калі збегу зычных перад ім няма: *расця**г**ваць, раскі**д**ваць, расказ**в**аць, праско**к**ваць, распы**т**ваць, скру**ч**ваць, ублы**т**ваць, раско**л**ваць, перако**н**ваць, распо**р**ваць.*

Калі дзеяслоў закончанага трывання меў ненаціскную літару *і* пасля галоснай (II спр.), то ў дзеяслове незакончанага трывання (I спр.) на месцы *і* перад суфіксам *-ва-* пішацца *й*: *прасе**і**ць – прасе**й**ваць, скле**і**ць – скле**й**ваць, засво**і**ць – засво**й**ваць*.

Калі ў дзеяслове закончанага трывання націскная літара *і* (II спр.) была пасля зычнай літары (абазначала мяккасць папярэдняга гука), то ў дзеяслове незакончанага трывання (I спр.) мяккасць зычнага будзе абазначана мяккім знакам: *сазван**і**цца – сазво́ньвацца*; *расцан**і**ць – расцэ́ньваць*, націск пры гэтым перамяшчаецца на папярэдні склад.

Як бачым, аднакаранёвыя дзеясловы рознага трывання адносяцца да розных спражэнняў. Таму вельмі важна на гэтай асаблівасці сканцэнтраваць увагу навучэнцаў.

Пры выкананні заданняў на цэнтралізаваным тэсціраванні абітурыенты павінны памятаць: калі дзеяслоў у форме інфінітыва адказвае на пытанне *што **з**рабіць?*, то і ў форме 3-й ас. мн. л. павінен адказваць на пытанне *што **з**робяць?* (а не *што робяць?*). Напрыклад, на ЦТ у 2011 г. было заданне: “Адзначце дзеясловы, якія ў форме 3-й асобы множнага ліку цяперашняга або будучага простага часу маюць канчатак *-аць* / *-яць*: 1) зацвісці; 2) стварыць; 3) праяўляць; 4) дзяліць; 5) распаліць” [7, с. 4].

Гэтае заданне фактычна скіравана на вызначэнне спражэння. Калі абітурыент пачне ставіць дзеясловы ў форме 3-й ас. мн. л., то пераканаецца, што канчаткі ненаціскныя ў дзеясловах пад лічбамі 2, 3, 4 і 5. Лепш за ўсё вызначаць спражэнне па інфінітыве, і калі абітурыент памятае правіла, то адразу адзначыць нумары 2, 4, 5, бо ўсе гэтыя дзеясловы перад суфіксам *-ць* маюць суфіксы *-ы-*, *-і-*. Дзеясловы *зацвісці* і *праяўляць* адносяцца да I спражэння (паводле вызначэння па інфінітыве – “усе астатнія”). Аднак многія абітурыенты ўсё роўна робяць памылкі, бо правіла не памятаюць, а калі ставяць дзеясловы ў патрэбнай форме, “губляюць” трыванне. Трыванне мяняць нельга: *зацвісці – яны зацвітуць* (а не *зацвітаюць*), *стварыць – яны створаць* (а не *ствараюць*), *праяўляць – яны праяўляюць* (а не *праявяць*), *распаліць – яны распаляць* (а не *распальваюць*), *дзяліць – яны дзеляць* (а не *падзяляюць*). Калі дзеясловы закончанага трывання, то ад іх будуць утварацца асабовыя формы будучага простага часу, калі незакончанага – асабовыя формы цяперашняга часу.

Як вядома, на цэнтралізаваным тэсціраванні ўмовы заданняў па тэмах “Правапіс канчаткаў дзеясловаў”, “Правапіс суфіксаў дзеясловаў” бываюць розныя: абітурыенту прапаноўваюць вызначыць канчаткі дзеясловаў у формах 2-й і 3-й ас. адз. і мн. л., у форме 1-й ас. мн. л., знайсці рознаспрагальныя дзеясловы, вызначыць правільна напісаныя дзеясловы ў розных формах, знайсці дзеясловы, у якіх трэба ўставіць літары *ы*, *і* перад *-ва-* і інш. Таму вельмі важна выпускніку школы цвёрда засвоіць гэтыя тэмы, і добра, калі веды, набытыя з дапамогай мнеманічных спосабаў запамінання, ён з поспехам выкарыстае ў патрэбны час.

ЗАДАННІ ДЛЯ ЗАМАЦАВАННЯ МНЕМОНІКАЎ

1. Выпішыце дзеясловы I спражэння:

а) думаць; б) саромецца; в) гнаць; г) належаць; д) даваць.

2. Выпішыце словы, у якіх трэба ўставіць літару *е:*

а) прысядз…ш; б) вер…ш; в) адраза…ш; г) топч…ш; д) ходз…ш.

3. Канчаткі якіх дзеясловаў няправільныя?

а) Ён хочыць спаць; б) Хутка вы здадзіце экзамены; в) Міхась распішыцца; г) Ружа коле рукі; д) Чаму ты не еш яблыкаў?

4. Адзначце дзеясловы цяперашняга часу абвеснага ладу з правільнымі асабовымі канчаткамі:

а) мы смяёмся; б) вы ідзеце; в) мы сцеражэм; г) вы шыеце; д) ён жывець.

5. Адзначце рознаспрагальныя дзеясловы:

а) хацець; б) есці; в) марыць; г) спяваць; д) адбегчы.

6. Адзначце правільна напісаныя дзеясловы:

а) выбеліваць; б) перапытываць; в) пакутваць; г) даследаваць; д) супакойваць.

7. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й ас. адз. л. цяперашняга або будучага простага часу маюць канчаткі *-аш*:

а) пісаць; б) думаць; в) адрэзаць; г) выбраць; д) выбіраць.

8. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы адз. л. цяперашняга або будучага простага часу маюць канчаткі *-еш*:

а) гаварыць; б) расказваць; в) расказаць; г) перайсці; д) пад’есці.

9. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й ас. адз. л. цяперашняга часу маюць канчаткі *-ыш / -іш*:

а) малоць; б) калоць, в) маўчаць; г) сядзець; д) залежаць.

10. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й ас. мн. л. цяперашняга часу маюць канчатак *-яце*:

а) плесці; б) заплятаць; в) несці; г) выносіць; д) насіць.

11. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 3-й ас. мн. л. цяперашняга або будучага простага часу маюць канчаткі *-уць / -юць*:

а) пераліць; б) схапіць; в) змацаваць; г) віць; д) злавіць.

12. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 3-й ас. мн. л. цяперашняга або будучага простага часу маюць канчаткі *-аць / -яць*:

а) настаяцца; б) выбягаць; в) гарэць; г) разгарэцца; д) ненавідзець.

13. Адзначце дзеясловы II спражэння:

а) маладзець; б) гудзець; в) гусці; г) слаць; д) надрыжацца.

14. Выпішыце запісаныя правільна рознаспрагальныя дзеясловы:

а) яны наядуцца; б) яны з'ядаюць; в) ты выбягаеш; г) ты выбежаш; д) ён наесцца.

15. Адзначце правільна напісаныя дзеясловы:

а) ты растоптываеш; б) я раскідываю; в) вы склеіваеце; г) вы склейваеце; д) вы склейваяце.

Адказы: 1 – а, б, д; **2** – а, в; **3** – а, б, в, д; **4** – а, г; **5** – б, д; **6** – г, д; **7** – а, в, г; **8** – б, г; **9** – в, г, д; **10** – а, в; **11** – а, в, г; **12** – а, в, г, д; **13** – б, д; **14** – а; **15** – г.

Працяг будзе.

Спіс літаратуры

1. **Портуондо, П. Р.** Мнемоника как фактор активизации процесса обучения : на примере курса "Технология конструктивных материалов" : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.01 / П. Р. Портуондо; Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Минск, 1983.

2. **Красней, В. П.** Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / В. П. Красней, Я. М. Лаўрэль, С. Р. Рачэўскі. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2009.

3. **Ратанова, Т. А.** Психология общая : учебник / Т. А. Ратанова, И. А. Домашенко. – 2-е изд., доп. и перераб. – М., 2004.

4. **Майерс, Д.** Психология / Д. Майерс; пер. с англ. И. А. Карпиков, В. А. Старовойтова. – 2-е изд. – Минск : Попурри, 2006.

5. **Вярцінскі, А.** Рэквіем па кожным чацвёртым / А. Вярцінскі // Сталасць думкі, маладосць душы : зб. паэзіі. – Мінск : Маст. літ., 2000.

6. **Вярцінскі, А.** Пад небам адкрытым / А. Вярцінскі // Сталасць думкі, маладосць душы : зб. паэзіі. – Мінск : Маст. літ., 2000.

7. **Цэнтралізаванае тэсціраванне.** Беларуская мова : зборнік тэстаў / Рэсп. ін-т кантролю ведаў М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. – Мінск : Аверсэв, 2011.

Дыктант на ўроку

ДЫКТАНТ ЯК ВІД ПРАКТЫКАВАННЯ

НАВУЧАЛЬНЫ ВЫБАРАЧНЫ ДЫКТАНТ

Заканчэнне. Пачатак у № 12 за 2012 г., № 1 за 2013 г.

11. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце. Выпішыце з тэксту сказы з адасобленымі азначэннямі.

Вясна ўпарта стукалася ў …вёрды снежны покрыў сонечнымі промнямі як у шкарлупіну яйка. За дзень снег прыкметна раставаў на…драваты і ашэрхлы шаргацеў пад нагамі нават вецер дз…муў па/вясновaму цёплы. І гэта была не проста а…ліга бо набліжаўся сакавік першы в…сновы месяц калі гаспадар мусіў агледз…ць усё начы…е плуг воз барану …упраж каб быць гатовым да с…ўбы. Праўда па нача… яшчэ прыпякаў мароз і неба на захадзе было чырвонае і чыстае…

За два сонечны… сакавіцкі… тыдн… расталі высокія гурбы снегу расцякліся зіхоткімі ручаінамі ў сажалкі нізінкі паплавы і бало…цы. Снег чапляўся за зямлю ў цян…ку за хатаю ці пад варотамі …чарнелы і на…драваты хворы не падобны да сябе а свет радаваўся д…ўгачаканаму ц…плу. І лю…скія душы прыхавана хвалявaліся ў пра…чуванні росквіт… і шчасця.

З. Дудзюк. Слодыч і атрута.

Знайдзіце ў тэксце словы, ужытыя ў пераносным значэнні. Вызначце, на аснове чаго (падабенства або сумежнасці) адбыўся перанос назвы.

12. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Выпішыце з тэксту ўласныя назоўнікі, растлумачце іх правапіс.

Той хто бываў у (П, п)олацк… ведае (В, в)ал (І, і)вана (Г, г)рознага. Узвышаецца ён у гістарычным цэнтры горада парослы хмызняком з аднаго бок… абмываецца хуткаплы…ай а…мялелай (П, п)алатой з (Ч, ч)ырвоным мостам праз яе а з другога па…ступае да муроў былога (К, к)адэ…кага корпус… . Велічны і н…калі не/прыступны ён адзін з сімвалаў бацькі гарадоў беларускіх і кожны палачанін хоць раз у жыцці падымаўся на

яго вышыню блукаў сярод в…чыстых дрэў па ву…кіх сц…жынках з якіх а…крываецца від на ціхія за…улкі з прыватнымі драўля(н, нн)ымі дамамі сярод якіх у апошні час сталі з…яўляцца ш…коўныя асабнякі "новых беларусаў".

Тысячы разоў я бываў у гэтых мясцінах дыхаў не/параўнальным водарам (П, п)олацкай даўніны любаваўся не/звычайнай прыгажосцю гэтага кутка любага мне горада. І калі не так даўно сівы мой з…мляк (А, а)лесь (А, а)нуфр…евіч (С, с)авіцкі з якім мы чарговы раз прыехалі ў наш (П, п)олацк прапанаваў мне падняцца на (В, в)ал з радасцю згадзіўся.

Н. Гальпяровіч. Самы высокі паверх.

Падбярыце сінонімы і антонімы да слоў *велічны*, *ціхі*, *ш…коўны*.

13. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце. Выпішыце з тэксту адносныя прыметнікі.

Свет "(П, п)але…кай хронікі" гэта (М, м)ележаўскі свет ім створа(н, нн)ы ім узноўле(н, нн)ы аналаг р…альнага нацы…нальнага беларускага свет… – у прыродз… побыц… прац… лю…скіх характарах у чалавечых паводзінах у эмацы…нальна/духоўным ладзе. І гэта напэўна галоўная вартасць твора яна гарантуе яму жыццё сучаснае і будучае. Д…ўгавечнасць "Хронікі" яе пастаянная актуальнасць не толькі вынік мастацкай р…алізацыі высокага талент… бо выключнае значэнне ў яго канкрэтным увасабленні мелі вось якія моманты жыццёвая аснова твора і час напісання. Праблематыкай ідэйна/мастацкай скірава…асцю раманы Мележа народжа(н, нн)ы грама…скімі ўмовамі духоўнай атмасферай другой паловы шасцідз…сятых гадоў…

У перыяды пераломныя ў жыцці народа такія як р…валюцыя грамадзянская вайна кал…ктывізацыя (А, а)йчынная вайна пытанні ўзаема/адносін чалавечай свабоды і сацы…льнай неабходнасці ўзнікаюць у асабліва …острай і бескампраміс…ай форме і патрабуюць адназначнага адказ… . Менавіта гэтыя пытанні ў літаратуры тых гадоў а найперш у жыцці набываюць моцнае гучанне і маюць т…ндэнцыю ярка выяўле(н, нн)ую да гуманістычнага іх вырашэння.

С. Андраюк. Зямля Івана Мележа.

Падбярыце спрадвечна беларускія сінанімічныя адпаведнікі да запазычаных слоў *аналаг*, *р…альны*, *актуальнасць*, *р…алізацыя*, *т…ндэнцыя*.

14. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Выпішыце сказы камбінаванай будовы (з рознымі відамі сувязі). Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Пабудуйце схемы.

Піс…меннік не павінен забываць пра сваіх с…айчы…ікаў і многія не абмяжо…ваюцца толькі кантактамі з чытачамі праз саму кнігу імкнуцца сустракацца з імі на пр…зентацыях сваіх твораў выступаць па радыё на тэл…бачанні перапіс(ва, ыва)цца. Дзякуючы такім сустрэчам у піс…менніка не толькі становіцца больш чытачоў якія будуць выб…раць менавіта яго-ныя кнігі але і сам ён можа лепей зразумець іх запатрабаванні.

Успамінаюцца два выпадк… . Па…час сустрэчы дзяцей з Янка… Маўрам адзін дапытлівы школьнік пацікавіўся дзе ўзялі Мірон і Віктар на не/населе(н, нн)ым …остраве вяроўку. І ў наступным выданні "(П, п)але…кіх рабінзонаў" гэта недарэчнасць была аўтарам папраўле(н, нн)а. Пры сустрэчы з Міхасём Лыньков…м дзеці прасілі напісаць пра Міколку/паравоза ў гады (В, в)ялікай (А, а)йчыннай вайны і Міхась Ціханавіч адказаў што не можа гэтага зрабіць бо ў часы вайны Міколка ўжо не быў хлопчыкам але напісаць пра дзяцей на вайне пааб…цаў.

Сув…зь піс…меннік – чытач па…трымліваецца вядома праз тое што напіса(н, нн)ае шырока распаўсюдж(ва, ыва)ецца дзякуючы публікацыям.

М. Кенька. Літаратурныя сувязі.

Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце адказ. Растлумачце сваё разуменне сувязі *піс…меннік – чытач*. Якім чынам яна ажыццяўляецца ў вас?

15. Спачатку выпішыце словы, якія пішуцца разам, а потым – словы, якія пішуцца праз злучок.

Водна/маторны, кіна/механік, водна/энергетычны, чалавека/год, астрашыцка/гарадоцкі, ваенна/палявы, контр/агент, мяса/кансервавы, ваенна/палонны, горна/заводскі, мэта/накіраваны, камер/юнкер, кілават/гадзіна, сацыяльна/бытавы, норд/ост, літаратура/знаўчы, ледзь/улоўны, грамадска/палітычны, грамадска/вытворчы, паравоза/зборачны, рабочы/спецыяліст, Масква/Таварная, хлорыста/вадародны, горна/рабочы, грамадска/карысны, бела/палякі, грос/майстар, Масква/рака, паў/Беларусі, светла/зялёны, вытворча/неабходны, вытворча/фінансавы, відэа/тэхніка, Буда/Кашалёва, конна/спартыўны, лічыльна/аналітычны, конна/ручны, гама/пластыка, капіравальна/фрэзерны, азотна/свінцовы, народа/ўладдзе, экс/прэзідэнт, жаўта/ліс-це, суцэльна/металічны, паўднёва/амерыканскі, глыбока/паважаны, малата/боец, музыкальна/сцэнічны, музыка/знаўства, знешне/падобны.

ДАВЕДКІ

11. Вясна ўпарта стукалася ў цвёрды снежны покрыў сонечнымі промнямі, як у шкарлупіну яйка. За дзень снег прыкметна раставаў, наздраваты і ашэрхлы, шаргацеў пад нагамі, нават вечар дзьмуў па-вясновому цёплы. І гэта была не проста адліга, бо набліжаўся сакавік – першы вясновы месяц, калі гаспадар мусіў агледзець

усё начынне: плуг, воз, барану, вупраж, каб быць гатовым да сяўбы. Праўда, па начах яшчэ прыпякаў мароз і неба на захадзе было чырвонае і чыстае…

За два сонечныя сакавіцкія тыдні расталі высокія гурбы снегу, расцякліся зіхоткімі ручаінамі ў сажалкі, нізінкі, паплавы і балотцы. Снег чапляўся за зямлю ў цяньку за хатаю ці пад варотамі, счарнелы і наздраваты, хворы, не падобны да сябе, а свет радаваўся доўгачаканаму цяплу. І людскія душы прыхавана хваляваліся ў прадчуванні росквіту і шчасця.

З. Дудзюк. Слодыч і атрута.

12. Той, хто бываў у Полацку, ведае вал Івана Грознага. Узвышаецца ён у гістарычным цэнтры горада, парослы хмызняком, з аднаго боку абмываецца хуткаплыннай абмялелай Палатой з Чырвоным мостам праз яе, а з другога – падступае да муроў былога Кадэцкага корпуса. Велічны і некалі непрыступны, ён адзін з сімвалаў бацькі гарадоў беларускіх, і кожны палачанін хоць раз у жыцці падымаўся на яго вышыню, блукаў сярод вячыстых дрэў па вузкіх сцяжынках, з якіх адкрываецца від на ціхія завулкі з прыватнымі драўлянымі дамамі, сярод якіх у апошні час сталі з'яўляцца шыкоўныя асабнякі "новых беларусаў".

Тысячы разоў я бываў у гэтых мясцінах, дыхаў непараўнальным водарам полацкай даўніны, любаваўся незвычайнай прыгажосцю гэтага кутка любага мне горада. І калі не так даўно сівы мой зямляк Алесь Ануфрыевіч Савіцкі, з якім мы чарговы раз прыехалі ў наш Полацк, прапанаваў мне падняцца на вал, з радасцю згадзіўся.

Н. Гальпяровіч. Самы высокі паверх.

13. Свет "Палескай хронікі" – гэта мележаўскі свет, ім створаны, ім узноўлены аналаг рэальнага нацыянальнага беларускага свету – у прыродзе, побыце, працы, людскіх характарах, у чалавечых паводзінах, у эмацыянальна-духоўным ладзе. І гэта, напэўна, галоўная вартасць твора: яна гарантуе яму жыццё, сучаснае і будучае. Даўгавечнасць "Хронікі", яе пастаянная актуальнасць не толькі вынік мастацкай рэалізацыі высокага таленту, бо выключнае значэнне ў яго канкрэтным увасабленні мелі вось якія моманты: жыццёвая аснова твора і час напісання. Праблематыкай, ідэйна-мастацкай скіраванасцю раманы Мележа народжаны грамадскімі ўмовамі, духоўнай атмасферай другой паловы шасцідзясятых гадоў…

У перыяды, пераломныя ў жыцці народа, такія, як рэвалюцыя, грамадзянская вайна, калектывізацыя, Айчынная вайна, пытанні ўзаемаадносін чалавечай свабоды і сацыяльнай неабходнасці ўзнікаюць у асабліва вострай і бескампраміснай форме і патрабуюць адназначнага адказу. Менавіта гэтыя пытанні ў літаратуры тых гадоў, а найперш у жыцці, набываюць моцнае гучанне і маюць тэндэнцыю, ярка выяўленую, да гуманістычнага іх вырашэння.

С. Андраюк. Зямля Івана Мележа.

14. Пісьменнік не павінен забываць пра сваіх суайчыннікаў, і многія не абмяжоўваюцца толькі кантактамі з чытачамі праз саму кнігу, імкнуцца сустракацца з імі на прэзентацыях сваіх твораў, выступаць па радыё, на тэлебачанні, перапісвацца. Дзякуючы такім сустрэчам у пісьменніка не толькі становіцца больш чытачоў, якія будуць выбіраць менавіта ягоныя кнігі, але і сам ён можа лепей зразумець іх запатрабаванні.

Успамінаюцца два выпадкі. Падчас сустрэчы дзяцей з Янкам Маўрам адзін дапытлівы школьнік пацікавіўся, дзе ўзялі Мірон і Віктар на ненаселеным востраве вяроўку. І ў наступным выданні "Палескіх рабінзонаў" гэта недарэчнасць была аўтарам папраўлена. Пры сустрэчы з Міхасём Лыньковым дзеці прасілі напісаць пра Міколку-паравоза ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і Міхась Ціханавіч адказаў, што не можа гэтага зрабіць, бо ў часы вайны Міколка ўжо не быў хлопчыкам, але напісаць пра дзяцей на вайне паабяцаў.

Сувязь пісьменнік – чытач падтрымліваецца, вядома, праз тое, што напісанае шырока распаўсюджваецца дзякуючы публікацыям.

М. Кенька. Літаратурныя сувязі.

16. Водна-маторны, кінамеханік, воднаэнергетычны, чалавека-год, астрашыцкагарадоцкі, ваенна-палявы, контрагент, мясакансервавы, ваеннапалонны, горназаводскі, мэтанакіраваны, камер-юнкер, кілават-гадзіна, сацыяльна-бытавы, норд-ост, літаратуразнаўчы, ледзь улоўны, грамадска-палітычны, грамадска-вытворчы, паравозазборачны, рабочы-спецыяліст, Масква-Таварная, хлорыставадародны, горнарабочы, грамадска карысны, белапалякі, гросмайстар, Масква-рака, паў-Беларусі, светла-зялёны, вытворча неабходны, вытворча-фінансавы, відэатэхніка, Буда-Кашалёва, коннаспартыўны, лічыльна-аналітычны, коннаручны, гамапластыка, капіравальна-фрэзерны, азотнасвінцовы, народаўладдзе, экс-прэзідэнт, жаўталісце, суцэльнаметалічны, паўднёваамерыканскі, глыбока паважаны, малатабоец, музыкальна-сцэнічны, музыказнаўства, знешне падобны.

Святлана МАРОЗ,
Марына РЖАВУЦКАЯ,
Таццяна СТАРАСЦЕНКА.

Прапануем план-канспект

ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ Ў СКАЗАХ З ПРОСТАЙ МОВАЙ

УРОК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ (IX КЛАС)

Мэты: дапамагчы вучням асэнсаваць спосабы перадачы чужой мовы, асаблівасці будовы сінтаксічных канструкцый з простай і ўскоснай мовай; выпрацоўваць уменне знаходзіць адпаведныя сінтаксічныя канструкцыі ў тэкстах, інтанаваць іх у вусным маўленні, адпрацоўваць уменне перакладаць тэкст з рускай мовы на беларускую, удасканальваць пунктуацыйныя навыкі вучняў; спрыяць абуджэнню цікавасці да кнігі.

Эпіграф: Людзі перастаюць мысліць, калі перастаюць чытаць.

Д. Дзідро.

ХОД УРОКА

I. Арганізацыйны момант.

• ***Паведамленне тэмы і мэты ўрока. Абмеркаванне эпіграфа.***

Настаўнік. Ці згодны вы з думкай Д. Дзідро, французскага пісьменніка і філосафа? Як чытанне падштурхоўвае да працэсу мыслення? Наколькі каштоўнымі могуць быць думкі іншых людзей? (*Адказы вучняў.*) Ці заўсёды мы згаджаемся са словамі, думкамі іншых людзей? (*Спрэчка нараджае ісціну.*)

II. Актуалізацыя апорных ведаў, уменняў, навыкаў.

Заданне 1. Выкарыстоўваючы словы Д. Дзідро, пабудуйце сказы з простай мовай (1-ы варыянт), з ускоснай мовай (2-і варыянт).

Дапаможныя словы: *дапамагаў*, *лічыў*, *гаварыў*, *прытрымліваўся думкі*, *быў упэўнены*.

Апорныя схемы:

1-ы варыянт **2-і варыянт**

А: “П”. “П”, – а. [ ], (што…).

Заданне 2. Запоўніце наступную табліцу, расстаўце неабходныя знакі прыпынку, карыстайцеся ў якасці прыкладаў прапанаванымі сказамі. (*Адзін вучань выконвае заданне з адваротнага боку дошкі.*)

Простая мова	
пасля слоў аўтара	**перад словамі аўтара**
А П.	П а.
А П!	П! а.
А П?	П? а.

1. “Няма такіх кніг, у якіх нельга было б чамунебудзь навучыцца”, – пісаў С. Будны.

2. Настаўнік сказаў Сцёпку: “Не пакідай навукі!”

3. Іван Навуменка казаў: “Ці ёсць сябар, лепшы за кнігу?”

4. Віктор Гюго зазначаў: “Творца кнігі – аўтар, творца яе лёсу – грамадства”.

5. “А ці не задача пісьменніка – фарміраванне, адбор лепшага, ці не сам народ – творца мовы?” – задаваўся пытаннем Якуб Колас.

6. “Узвышайце чытаннем душу!” – заклікаў Вальтэр.

• ***Праверка выкананага задання.***

Заданне. Дапоўніце сказы.

1. Калі простая мова стаіць пасля слоў аўтара, перад ёю ставіцца …, а ў канцы … .

2. Калі простая мова стаіць перад словамі аўтара і мае апавядальную інтанацыю, то пасля яе ставіцца … .

3. Калі простая мова з’яўляецца пытальным ці клічным сказам, то пасля яе ставіцца …, а перад словамі аўтара … .

4. Словы аўтара пасля простай мовы прынята пісаць з … літары.

III. Вывучэнне новага матэрыялу (пры дапамозе схем).

Простая мова разрываецца словамі аўтара	
на месцы коскі	**на месцы кропкі, клічніка або пытальніка**
“П, – а, – п”.	“П, – а. – П”. “П! – а. – П”. “П? – а. – П”. “П, – а: – П”.

Настаўнік. Чым абумоўлена розніца ў пастаноўцы знакаў прыпынку ў наступных сказах?

“П, – а. – П”. “П? – а. – П”. “П! – а. – П”.	“І тое праўда, – згадзіўся камандзір. – Прабірацца будзем разам”.
“П, – а, – п”.	“Братачка, – чужым голасам загаварыла Вольга, – што там робіцца! Маці схапілі… Нават апрануцца не далі”.
“П, – а: – П”.	“Да плошчы Перамогі? – перапытала жанчына і ўпэўнена сказала: – Вы хутчэй на метро даедзеце”.

IV. Замацаванне ведаў, фарміраванне першасных уменняў і навыкаў.

Заданне. Графічна абазначце знакі прыпынку ў сказах, аргументуйце іх расстаноўку. Як вы разумееце словы пісьменнікаў?

1) Паэт не можа быць ценем гаварыў Расул Гамзатаў ён заўсёды агонь, крыніца святла, незалежна ад таго слабенькі гэты агеньчык ці вялікае сонца.

2) Мы часта самі адчувалі, што адной кнігі мы не можам дачытаць, а другая чытаецца лёгка, ад яе нельга адарвацца пісаў Ян Скрыган і тут жа адзначаў Усё ў ёй хораша, натуральна… І сакрэт гэтага майстэрства просты…

V. Прымяненне ведаў у незнаёмай сітуацыі.

Заданне 1. Перакладзіце тэкст. Запішыце, расстаўляючы неабходныя знакі прыпынку.

Хорошая книга это просто праздник. Один мудрый человек сказал Не тот умён кто всё знает – всё знать невозможно, – а тот кто знает где и о чём можно прочитать. В словах этих большая правда. Ведь книги рассказывают буквально обо всём на свете. Нет такого вопроса такой темы по которым не было бы написано книг. Всем хорошим во мне я обязан именно книгам говорил М. Горький.

• ***Праверка і тлумачэнне пастаноўкі знакаў прыпынку.***

Заданне 2. Якая кніга добрая для вас? Выкажыце свае думкі пісьмова, абапіраючыся на адну са схем.

1. "Добрая кніга, – *адзначыў(ла) для сябе я*, – гэта…"

2. "Толькі такая кніга добрая, у якой…, – *падумаў(ла) я і вырашыў(ла) для сябе канчаткова:* – Кніга…"

Заданне 3. Знайдзіце сказы, у якіх дапушчаны пунктуацыйныя памылкі, адрэдагуйце і запішыце правільны варыянт.

1. Чытаю радкі В. К. Бялыніцкага-Бірулі: "Нідзе на поўдні няма такой шматфарбнай, урачыстай вясны, як у нашых краях".

2. "Скажы ты, якое дзіва! – прамовіў дзядзька расчулена, – такое, мне здаецца, не можа намаляваць найлепшы мастак".

3. "Дабро – адзіная сіла, здольная зрабіць чалавека высакародным" – гаварыла мне некалі маці.

4. "Хворым дрэвам, – гаварыў мне бацька, – як і хворым людзям, трэба дапамагаць".

5. "А я хачу быць доктарам, – кажа малодшы сын і дадае – Хачу людзей лячыць, дарыць ім надзею".

6. Ігар Васільевіч выслухаў нас уважліва, пасля ўсё ж запытаўся: – "Вы нічога не пераблыталі?"

7. "Без навукі і лапця не спляцеш, – часта гаворыць дзед і дадае: – А вучоны з пяску вяроўку саўе".

8. "Лепш з разумным згубіць, чым з дурнем знайсці", – справядліва сцвярджае старадаўняя прыказка.

VI. Падвядзенне вынікаў урока. Выстаўленне адзнак.

VII. Рэфлексія.

VIII. Дамашняе заданне. Падрыхтаваць вуснае паведамленне па тэме "Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай", праілюстраваўшы адказ уласнымі прыкладамі.

Наталля ПАВАЛОКІНА,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Мінскай дзяржаўнай гімназіі-каледжа мастацтваў.

Настаўнік прапануе

МІКОЛА СУРНАЧОЎ. "У СТОПТАНЫМ ЖЫЦЕ"

УРОК БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (VI КЛАС)

Мэта: пазнаёміць з біяграфіяй М. Сурначова; на прыкладах героя верша і землякоў – удзельнікаў вайны – фарміраваць паняцце гераізму; абудзіць пачуццё нянавісці да вайны, пачуццё болю за страты, панесеныя беларускім народам у гады Вялікай Айчыннай вайны; развіваць навыкі выразнага чытання, вуснага маўлення, творчага мыслення; выхоўваць у вучняў павагу да ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, гонар за мужнасць і гераізм беларускага народа.

Тып урока: урок вывучэння новага матэрыялу.

Міжпрадметныя сувязі: краязнаўства, жывапіс, музыка.

Абсталяванне: партрэт М. Сурначова, вершы беларускіх паэтаў пра Вялікую Айчынную вайну, музычны запіс "Рэквіема" В. А. Моцарта, рэпрадукцыя карціны "Летні тэатр" М. Савіцкага, карткі для працы ў групах.

Эпіграф: Творы паэтаў, якія аддалі жыццё за Радзіму ў час Вялікай Айчыннай вайны, – гэта адна з самых дарагіх старонак нашай паэзіі. І самых балючых.

Варлен Бечык.

Я вас прашу, не зведаў хто вайны,
Прашу вас, мае дочкі і сыны,
Узяць хоць долю памяці маёй,
Каб потым ёй не зарасці травой.

Анатоль Вярцінскі.

Вайна любая – гэта згустак жаху.
І ў гэтай тое самае было.
Праз столькі год з таго былога страху
Зусім нямнога сэрцаў дажыло.

Надзея Салодкая.

ХОД УРОКА

І. Арганізацыйны момант.

• ***Падрыхтоўка да ўспрымання новага матэрыялу.***

Больш за 65 гадоў мы жывём пад мірным небам. Салдаты Перамогі, нашы дзяды і прадзеды, зрабілі ўсё, што ў сілах чалавека. Вы не раз чулі, чыталі пра тую страшэнную вайну, але ці часта вы задумваліся пра тое, што за словам *вайна* стаіць смерць. І ўсё ж мацнейшай за страх аказалася любоў – любоў да Айчыны, роднай зямлі, да блізкіх, знаёмых і незнаёмых людзей, да тых, каго неабход-

на было выратаваць і абараніць. Гэта найвышэйшая праява патрыятызму. Гады Вялікай Айчыннай вайны не забудуцца ніколі. Подзвіг савецкіх салдат быў аплачаны высокай цаной, і мы павінны памятаць пра гэтыя ахвяры. Мы не хочам, каб паўтарыліся жахі вайны, каб маці плакалі па загінулых дзецях. Значыць, мы павінны берагчы Радзіму як самае дарагое для кожнага з нас. Памятайце, што ў нашых руках наша будучыня, будучыня нашай планеты. Якія асацыяцыі ўзнікаюць у вас, калі чуеце слова *перамога*? (*Радасць, шчасце, мір, салют, здароўе, кветкі, абдымкі, вера, спакой, жыццё.*)

ІІ. Вывучэнне новага матэрыялу.

• ***Слова настаўніка.***

Настаўнік. Ваенны час змусіў творчую інтэлігенцыю спазнаць суровыя выпрабаванні: 250 пісьменнікаў Беларусі – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Літаратары апраналі шынялі, ішлі на фронт, ваявалі са зброяй у руках ці працавалі ў армейскіх газетах; многія змагаліся ў партызанах і антыфашысцкім падполлі; іншым давялося выжываць ва ўмовах акупацыі.

Дзякуючы пісьменнікам наша літаратура ішла дарогамі вайны, набліжала Перамогу. Палымянае мастацкае слова заклікала да барацьбы з фашызмам. Беларуская літаратура зрабілася адным з магутных сродкаў змагання з гітлераўскімі заваёўнікамі. Творы беларускіх пісьменнікаў – гэта набатныя сведкі самога жыцця, гэта сляды крыві на каменні, подых жыцця; гэта словы, працягнутыя з мінулага ў будучыню. Гэта галасы, якім ніколі не змоўкнуць, як бы далёка ні адышоў час, гэта невычэрпная крыніца мужнасці і веры ў будучыню. Успаміны пра мінулае можна параўнаць з вогнішчам, раздзіманым ветрам часу. Даўно адгрымелі баі Вялікай Айчыннай вайны, але ў памяці застаюцца тыя, з кім елі з аднаго кацялка, разам ішлі ў атаку, над чыёй магілай пралілася салдацкая сляза. Раздзел, з якім мы пачнём знаёмства на сённяшнім уроку, так і называецца "Вайна – боль і памяць народа".

Агучваецца тэма і мэты ўрока. Звяртаецца ўвага на эпіграфы.

Настаўнік. Прачытайце першы эпіграф. Ці згодны вы з Варленам Бечыкам? (*Адказы вучняў.*) Каб памяць не зарасла травой, мы з вамі прысвячаем урок тым, хто так і застаўся ў 1941 – 1945 гг. маладым і прыгожым, хто не напісаў і палову таго, што мог. А яшчэ тым, хто змагаўся з ненавісным ворагам, дорачы нам шчаслівае жыццё.

• ***Паведамленне падрыхтаванага вучня пра біяграфію М. Сурначова.***

Ужо адно толькі прозвішча Міколы Сурначова шмат у каго асацыіруецца з вайной. І прычынай тут можна назваць своеасаблівы феномен паэта: большасць яго вершаў (тых, што дайшлі да нас) адносяцца менавіта да 1941 – 1944 гг. – часу Другой сусветнай вайны, у якой М. Сурначоў браў непасрэдны ўдзел.

Мікола Сурначоў прайшоў усе дарогі вайны і загінуў 20 красавіка 1945 г. на подступах да Берліна. Двое братоў Міколы таксама загінулі: старэйшы пад Масквой, а малодшы – ва Усходняй Прусіі. Такі цяжкі лёс выпаў бацькам, Радзіме, ім самім. У кожнага з братоў свой лёс, свая біяграфія. Нічым незвычайным не вызначалася біяграфія Міколы Сурначова. Нарадзіўся ў 1917 г. у вёсцы Слабада Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці. Вучыўся на літаратурным факультэце Гомельскага, а затым і Мінскага педінстытутаў. Працаваў у газетах "Звязда" і "Чырвоная змена". Друкаваўся з 1933 г., з 1941 г. – у арміі. Удзельнічаў у абароне Каўказа, вызваленні Беларусі і Польшчы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі. Юнак, самы звычайны юнак. Звычайны, ды не зусім. Вось што ўспамінае пра свайго сябра Кастусь Кірэенка: «Шукальнік, чулы і таварыскі, але заўсёды бескампрамісны да фальшу слова, няпэўнасці поглядаў, браку пачуцця. Такім Мікола запомніўся мне і ўсім сябрам у гады вучобы ў Гомельскім педінстытуце, такім ён быў і ў час сваёй нядоўгай працы ў газетах "Чырвоная змена" і "Звязда", і такім ён паказаў сябе ў строі змагароў за Айчыну». Другі сябар Міколы Сурначова Паўлюк Прануза адзначае: "Яму было б 70, але ў памяці майго сэрца ён жыве як крыху сарамлівы юнак, два гады я жыў з ім у адным пакоі, будучы студэнтам. Мікола з хваляваннем расказваў аб прыгажосці родных мясцін, працавітасці бацькоў, дзяцінстве. Ён праявіў вялікую дасведчанасць у літаратуры, шмат вершаў рускіх і беларускіх паэтаў ведаў на памяць, сваімі ведамі шчодра дзяліўся з намі, было відаць, што Мікола сур'ёзна ставіўся да жыцця…" Літаратурная спадчына Міколы Сурначова прадстаўлена зборнікамі вершаў "На сурмах баравых" (1946), "Барвовая зара" (1959), а таксама кнігай "Акопны спеў" (1986), куды акрамя вершаў увайшлі яго лісты, успаміны сяброў і сучаснікаў, артыкулы журналістаў і літаратараў.

• ***Выразнае чытанне вершаў М. Сурначова.***

1-ы чытальнік.

Раздум'е

І цішыня, і стогн глухі,
І сэрца ачарсцвела быццам,
І хочацца на грунт сухі,
Нібы на ложак апусціцца.
Мацнее бой, і ты з штыком
Ідзеш наўпрост да перамогі,
І, можа быць, сустрэне дом
Пасля вайны зусім нямногіх.
І, можа, я, як ветэран,
Паду на жоўтыя пакосы
І да маіх гаручых ран
Нахіляцца спагадна розы.
Не гэта нас турбуе! Што ж?

Без перамогі свет не мілы.
Калі не я, жыць будзе ўсё ж
Зямля, што нас з табой расціла.

2-і чытальнік.

Сон

Мне сёння сніліся суніцы,
Сцяжынка праз густы хмызняк
І дзераза, што хутка віцца
Пачне ў імхах і так і сяк.

І луг мурожны, і прысады
Вакол Варшаўскае шашы
Шапталі мне: "Цябе мы рады
Сустрэць ад шчырае душы".

І так заўжды перад вачыма:
Густы хмызняк, разбег дарог…
Такою я цябе, Радзіма,
У дні суровыя збярог.

3-і чытальнік.

Старонка мая

Старонка мая, з дакорам
Ты сына свайго не кляні,
Мы пройдзем любімым борам,
Здабудзем твае кляны,
Хваёвыя пералескі,
Пасек мядзвяны пах,
Узняўшыя снег пралескі
Усцелюць прад намі шлях.
"Узняўшыя снег пралескі
Усцелюць прад намі шлях…"
Падобна гэта да песні,
А каска, відаць, у палях
Тады ў нямецкіх упала,
Дзе куля салдата дагнала.

Настаўнік. Менавіта гэтыя творы, пры жыцці не апублікаваныя, прынеслі паэту вядомасць – ужо пасмяротную – не толькі на Радзіме, але і за яе межамі (перакладзены на 8 моў свету). Што і казаць, калі нават самы першы напісаны на вайне верш "У стоптаным жыце" стаў хрэстаматыйным.

• ***Настаўнік чытае на памяць верш "У стоптаным жыце" М. Сурначова.***

• ***Аналіз верша.***

Пытанні і заданні:

1. Ваша ўспрыманне праслуханага твора. Што ў ім на першым плане – падзея ці аўтарскае пачуццё?

2. Які момант з жыцця "хлапца маладога" згадваецца ў вершы М. Сурначова?

3. Пракаменціруйце назву твора "У стоптаным жыце". Памятайце, што жыта – сімвал жыцця. Значыць, калі жыта – жыццё, то сімвалам чаго з'яўляецца стоптанае жыта?

4. Якая мастацкая дэталь праходзіць праз увесь верш і вынесеная нават у яго назву?

5. Што з'яўляецца сведкам трагедыі – гібелі маладога салдата? Выпішыце з тэксту словы і словазлучэнні, якія яшчэ больш адцяняюць трагізм падзеі.

6. Ці адлюстроўваюць мастацкія дэталі верша аўтарскі настрой? Чаму прырода сумуе разам з аўтарам, чаму яна агорнута скрухай?

7. Дзе і калі адбываецца дзеянне?

8. Які агульны настрой верша? (*Стрыманы, спакойны; сумны, маркотны; радасны, бадзёры; узрушаны і ўрачысты; тужлівы і самотны.*) Абгрунтуйце свой выбар.

9. Чаго патрабавала трагічная гісторыя, пра якую паведамляе аўтар?

10. Якое адчуванне ўзнікла ў вас, калі вы ўявілі гэтую сцэну? Ці не сталі вы на нейкі час сведкамі ўсяго таго, што ўбачыў аўтар?

• ***Работа ў групах.***

Заданні 1-й групе.

1. Пра што гаворыцца ў першай страфе верша "У стоптаным жыце" М. Сурначова? З якім пачуццём яе неабходна прачытаць? (*Са смуткам і шкадаваннем аб тым, што "хлапцу маладому" не проста "не ехаць дадому", а "ніколі не ехаць"; са спачуваннем, бо загінуў "хлапец малады", воін-салдат.*) Абгрунтуйце свае меркаванні.

2. Якім настроем прасякнута другая страфа верша? Якая мэта яе чытання? [*Дапамагчы слухачам уявіць абставіны, у якіх адбываецца дзеянне; перадаць розныя адценні аўтарскага настрою (жальбу, адчуванне непапраўнай страты, роспач, бо і прырода знаходзіцца ў трывожнай скрусе)*].

3. Абгрунтуйце думку, што паняцці *кветкі-краскі* і *абсмалены колас*, *жыццё* і *смерць*, *краскі* і *вайна* несумяшчальныя. Нават прырода абвяшчае сваё непрыманне звярыных законаў фашызму.

4. Як выяўляецца аўтарскі настрой у заключнай страфе верша М. Сурначова? Якім паўстае перад вамі аўтар? (*Засмучаным і журботным; узрушаным і заклапочаным; стрыманым і засяроджаным.*) Адказ абгрунтуйце.

Заданні 2-й групе.

1. Чаму паэт такі "скупы" на мастацкія вобразна-выяўленчыя сродкі (*эпітэты*, *метафары*, *увасабленні*), на адкрытае выяўленне сваіх пачуццяў? (*Адказы вучняў.*) Абгрунтуйце думку, што сціплыя вобразна-выяўленчыя сродкі верша падпарадкаваны раскрыццю яго зместу, галоўнай ідэі: асудзіць фашызм, якому нельга дараваць усе яго злачынствы над народам і прыродай.

2. Да каго звяртаецца пісьменнік у апошніх двух радках верша? Чаму просіць сведак трагічнай падзеі не казаць пра гэта маці?

3. Што дамінуе ў сюжэце твора: рэальныя падзеі вайны ці казачнасць, якая ідзе ад народнай творчасці?

• ***Агучванне вынікаў працы ў групах.***

• ***Творчасць.***

Заданне. Падрыхтуйце некалькі славесных малюнкаў да прачытанага верша:

I пара. "Жытнёвае поле" (*пачарнелае, пахіленае, стаптанае фашысцкімі ботамі*);

II пара. "Сумуе прырода" (*слуцкія завялыя кветкі, абсмалены счарнелы колас, побач – салдацкая каска*);

III пара. "Ляжыць ён, як віцязь…" (*у стоптаным жыце ляжыць высокі, статны баец, падобны да старажытнага волата-асілка, нерухомы позірк яго скіраваны ў блакітнае неба, твар воіна застылы*).

Апішыце ў форме звязнага выказвання, якія пачуцці ахапілі вас, калі вы складалі гэтыя славесныя малюнкі. Што вы хацелі давесці да слухачоў?

IV пара. Скласці сінквейн. Ключавое слова *вайна*.

Узор выканання сінквейна:

Вайна
Лютая, страшная
Забівае, калечыць, адрывае ад сям'і
Яна стала гіганцкім паядынкам
Гора

• ***Прэзентацыя творчага задання.***

Настаўнік. Пакуль вы працавалі над творчым заданнем, у мяне таксама склаўся невялічкі верш (*настаўнік чытае ўласны верш*).

Героі вайны жывуць побач,
Мала, на жаль, засталося
Тых дзяўчат і хлапцоў, якім
У сорак першым было па 17.
Ім было па 15 – 17,
Калі ішлі на абарону Радзімы,
Не ведалі яны, не снілі,
Хто вернецца з іх, хто – загіне.
А дома чакалі весткі,
Матулі іх, сёстры, дзяўчаты…
Чакалі, любілі, пісалі,
Смела гледзячы ў вочы катам.
І не верыць бабуля дагэтуль,
Што не вернецца дзед мой дахаты.
Вось ізноў 9 мая…
Завязала прыгожую хустку.
Прыйдзе дзядуля – я веру,
Пацалуе бабуліны рукі.

Настаўнік. Растлумачце другі эпіграф – радкі верша А. Вярцінскага. Да каго звяртаецца паэт? (*Адказы вучняў.*) Нельга па-сапраўднаму любіць родную зямлю, родны край, не дакрануўшыся душою і сэрцам да подзвігу продкаў, не адчуўшы гонару і болю за свой народ.

• ***Наведванне школьнага музея.***

Сённяшні ўрок яшчэ раз зверне нас да гістарычнай памяці. У нашай школе створаны і дзейнічае музей, дзе сабраны багаты матэрыял і праводзіцца экскурсія "Пліса ў гады Вялікай Айчыннай вайны". Давайце моўчкі пастаім над змятай асколкамі, прабітай кулямі каскай салдата, прастрэленым камсамольскім білетам, аплаўленай у баях вінтоўкай…

Даўнія здымкі гартаю,
Што пацямнелі ад часу.
Я кожны твар тут пазнаю
Без подпісу, без падказкі.

А. Русак.

Настаўнік праводзіць экскурсію па школьным музеі, распавядае пра вёску Плісу ў гады Вялікай Айчыннай вайны, гісторыю змагання, зачытваюцца франтавыя лісты, згадваюцца імёны ветэранаў.

• ***Хвіліна маўчання.***

Настаўнік. Звернемся да трэцяга эпіграфа ўрока. Зачытайце, калі ласка, радкі Надзеі Салодкай. Многія нашы землякі не вярнуліся з вайны, аддалі сваё жыццё за наша светлае будучае. Многія прапалі без вестак. Запалім свечку і хвілінай маўчання ўшануем тых, хто не вярнуўся з той страшэннай вайны.

Гучыць "Рэквіем" В. А. Моцарта.

III. Абагульненне.

Заданне. Супастаўце лёс М. Сурначова і лёс яго лірычнага героя, а таксама лёсы нашых землякоў. Што ў іх агульнага? (*Адказы вучняў.*)

Настаўнік. Спадзяюся, што наш сённяшні ўрок пакінуў адбітак у вашых сэрцах і вы зразумелі, якой жудаснай з'явай была вайна. Сёння мы чулі галасы салдат, маці і нават дзяцей вайны. Усе яны гучалі больш як праз 65 гадоў, якія мінулі з Дня Перамогі. Мы, нашчадкі тых, хто змагаўся ў гэтай вайне, хто сваім жыццём заплаціў за Перамогу, ніколі не забудзем подзвіг нашых продкаў.

IV. Рэфлексія.

Чаму вайна для нас сёння не толькі памяць і боль перажытага нашым народам, дзядамі і бацькамі? Ці згодны вы, што перажытае народам, краінай, кожным асобным чалавекам – гэта наш духоўны набытак, скарб нашых сэрцаў? Чаму творы пра вайну неабходна вывучаць і сёння, у мірны час? Над чым прымусіў задумацца наш урок? (*Адказы вучняў.*) Наша зямля такая вялікая для таго, каб жыць у міры, і такая маленькая для войнаў. Няхай жа ніколі не паўтараюцца жахі вайны!

V. Дамашняе заданне. Вывучыць верш М. Сурначова на памяць, скласці партытуру чытання верша.

Аліна ЗУБКО,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Пліскага дзіцячага сада – сярэдняй школы
Глыбоцкага раёна.

КАЛІ ЗАКОНЧЫЎСЯ ЎРОК

Да Міжнароднага дня роднай мовы

ВЕЧАРЫНА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

IX – XI КЛАСЫ

Мэты і задачы: паглыбіць веды вучняў па беларускай літаратуры; пашыраць кругагляд; вучыць працаваць з навуковай літаратурай, рэалізоўваць свае веды на практыцы; прывіваць любоў да роднай мовы, спадчыны продкаў.

Месца правядзення: актавая зала школы.

Абсталяванне і афармленне: дошка, карткі з вершамі; партрэты Ф. Скарыны, Я. Коласа, Я. Купалы, М. Багдановіча; малюнкі вучняў, сачыненні (апавяданні) пра беларускую мову; выстава кніг беларускіх пісьменнікаў і паэтаў.

Падрыхтоўчая работа: за тыдзень да мерапрыемства прапанаваць вучням спіс неабходнай літаратуры для самастойнай падрыхтоўкі да віктарын; напісаць сачыненні на тэмы "Чаму беларусы не размаўляюць па-беларуску?", "Як выратаваць родную мову?", паведамленні пра сучасны стан беларускай мовы; падрыхтаваць малюнкі пра Беларусь.

Умовы і правілы гульні: удзельнічаюць 3 каманды па 5 – 6 чалавек з трох класаў (IX, X, XI класы), якія павінны да гульні падабраць назвы каманд, дэвіз, сімволіку. У кожнай камандзе прысутнічае адзін паэт. Паэты выбіраюць сабе псеўданімы; да конкурсу "Найлепшы верш" яны складаюць уласны вершаваны твор; да конкурсу "Як выратаваць родную мову?" кожная каманда абараняе праект-сачыненне.

ХОД МЕРАПРЫЕМСТВА

Настаўнік. Добры вечар, паважаныя сябры! У нашай школе праходзіць Тыдзень беларускай мовы і літаратуры. Таму сённяшні вечар прысвячаецца гэтай падзеі. Спадзяюся, сябры, што вы знойдзеце шмат цікавага і новага на гэтай вечарыне. Разам з тым вы можаце праверыць свае веды па літаратуры роднага краю.

1-ы чытальнік.

Дагарэў за брамай небакрай,
Месяц паміж воблачкаў плыве,
Выйду зноў, як у мінулы май,
Басанож прайдуся па траве…
А вакол травіцы роснай рай
І бярозак белая сям'я.
Мой чароўны беларускі край,
Бацькаўшчына светлая мая!

Уладзімір Караткевіч. Бацькаўшчына.

Выходзяць вядучыя ў нацыянальных строях.

1-ы вядучы. Беларусы не павінны забываць сваю мову, вытокі, Бацькаўшчыну. А цяпер сустракаем знаўцаў роднага слова, якія хочуць паказаць і даказаць, што яны не толькі ведаюць беларускую літаратуру, гісторыю, але і з'яўляюцца патрыётамі зямлі беларускай.

2-і вядучы. Прывітаем жа хлопцаў і дзяўчат каманды "Васількі"!

Каманда падымаецца пад апладысменты гледачоў.

1-ы вядучы. Прывітаем каманду "Беларусачкі"!

2-і вядучы. А трэцяя каманда падабрала вельмі арыгінальную назву. Папросім іх саміх расказаць пра свой выбар!

Капітан кожнай каманды абгрунтоўвае выбар назвы і сімволікі сваёй каманды.

1-ы вядучы. А цяпер надышоў самы час пазнаёміць вас з журы. Даведаўшыся пра нашу сустрэчу, да нас завіталі вашы настаўнікі літаратуры, гісторыі, матэматыкі… Дзякуем, што змаглі прыйсці, нягледзячы на вялікую занятасць.

2-і вядучы. Вось мы ўбачылі нашых удзельнікаў, а іх здольнасці праверым падчас конкурсаў.

Вядучыя запрашаюць удзельнікаў і журы заняць свае месцы.

1-ы вядучы. Кожная каманда атрымала дамашняе заданне – падрыхтаваць паведамленне пра сучасны стан беларускай мовы. Каманда, якая пераможа ў конкурсе, атрымае 20 балаў.

2-і вядучы. Права першым пачаць гульню даецца камандзе, якая адкажа на наступнае пытанне.

1-ы вядучы.

У добры час, на ўлонні вясковым,
Дзе вадзіца крынічная б'е,
Навучыўся я матчынай мове
І задуманых песняў яе.

2-і вядучы. Толькі што вы пачулі ўрывак з верша. Хто аўтар твора? (*Ларыса Геніюш.*)

Першымі выступаюць тыя, хто адказаў на пытанне, затым па прапанове журы адказвае наступная каманда.

• ***Конкурс "Як выратаваць родную мову?".***

1-ы вядучы. Мы даведаліся шмат цікавага пра тое, як выратаваць родную мову ад знікнення. А зараз, пакуль журы будзе падводзіць вынікі першага этапу, мы прапануем наступны конкурс.

• ***Конкурс з балельшчыкамі.***

Вы пачуеце радкі з вершаў і павінны будзеце адказаць, каму яны належаць.

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына.
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

Янка Купала.

Веру братцы: людзьмі станем,
Хутка скончым мы свой сон;
На свет божы шырай глянем,
Век напіша нам закон.

Цётка.

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не ачарсцвець
І не страціць святое штосьці.

Рыгор Барадулін.

О, край родны, край прыгожы,
Мілы кут маіх дзядоў.

Якуб Колас.

Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!..

Францішак Багушэвіч.

• ***Журы агучвае вынікі першага конкурсу.***

• ***Конкурс "Найлепшы верш".***

2-і вядучы. А зараз паэты з кожнай каманды прачытаюць на памяць уласныя вершы. У нашых аўтараў вельмі цікавыя псеўданімы, спадзяёмся, яны раскажуць нам, чаму і як выбралі іх. А за найлепшы верш каманда атрымае 20 балаў.

1-ы вядучы. Якія цудоўныя радкі прагучалі! Колькі ў іх прыгажосці, мілагучнасці, але разам з тым суму. Суму за нашу сучаснасць, за страчаную самасвядомасць, за бездухоўнасць. Будзем спадзявацца, што нашы душы не стануць халоднымі і жорсткімі. І прыкладам могуць служыць вершы, прачытаныя нашымі паэтамі.

• ***Конкурс "Сюрпрыз".***

2-і вядучы. А цяпер я запрашаю па адным прадстаўніку ад кожнай каманды, якія выцягнуць карткі з урыўкамі вядомых вершаў. За 5 хвілін каманды павінны падабраць мелодыю да верша і прызначыць выканаўцу песні на дадзены верш. За найлепшае выкананне – 10 балаў.

Пакуль каманды рыхтуюцца да конкурсу, праводзяцца конкурсы з балельшчыкамі.

• ***Конкурс "Антонімы" (з балельшчыкамі).***

[Да (прыназоўнік) – пасля; канец – пачатак; горкі – салодкі; мала – многа; усход – захад; зімою – летам; надзея – адчай; хлусня – праўда; наватар – руцінёр; роўны – крывы.]

• ***Конкурс "Хто з паэтаў сказаў?".***

1-ы вядучы. Мы даведаліся шмат цікавага з папярэдніх конкурсаў. А зараз вы пачуеце добра вядомыя радкі з вершаў і павінны будзеце адгадаць, каму яны належаць. За кожны правільны адказ каманда атрымлівае 5 балаў.

Вільготны месяц стуль на поле
Празрысты, светлы стоўп спусціў
І рызай срэбнаю раздолле
Снягоў сінеючых пакрыў.

Максім Багдановіч.

Дагарэў за брамай небакрай,
Месяц паміж воблачкаў плыве.
Выйду зноў, як у мінулы май,
Басанож прайдуся па траве.

Уладзімір Караткевіч.

Я чула пяшчотнае,
шчырасці поўнае,
маё, беларускае, роднае, кроўнае,
такое чароўнае.
Такое ласкавае, цёплае, чыстае,
як сонца, агністае,
як Нёман, празрыстае…
вясновае сонца ад шчырага сэрца.

Данута Бічэль.

Край мой беларускі, край!
Дай мне прыгарнуцца, дай!
Да твайго ляснога
Вераснога долу,
Дзе так шчасця многа
Выпала на долю, –
Дай жа прыгарнуцца, дай!

Ніл Гілевіч.

Між алешын, кустоў,
Дзе пяе салавей,
І шуміць, і грыміць
Срэбразвонны ручэй.
Як матулька, вярба
Хіліць голаў над ім.
І глядзяцца кусты
Пышным верхам сваім.

Якуб Колас.

• ***Конкурс "Назавіце герояў твораў".***

1-ы вядучы. А цяпер мы даведаемся, наколькі вы добра ведаеце творы школьнай праграмы.

1. Назавіце галоўнага героя паэмы "Кепска будзе!" Ф. Багушэвіча. Як растлумачыць яго імя? (*Аліндарка. Перайначанае слова "каляндар".*)

2. "І ён згарэў – адзін, хто мог бы ў той дзень не згарэць. І ён жыве". Хто гэта быў? Назавіце

твор і аўтара. (*Пячнік. Апавяданне "Memento mori" Янкі Брыля.*)

3. Ля вогнішч начлежных і ля невадоў
Чуў гэту легенду я часта
Ад гатаўскіх сосен і ад рыбакоў
Пра Нарач, Баторына, Мястра.
Назавіце герояў твора, яго назву і аўтара.
(*Галіна і Васілёк. "Нарач", "Ля вогнішч начлежных". Максім Танк.*)

4. Назавіце імя хлопчыка з апавядання "Васількі" Міхася Лынькова. (*Міколка.*)

5. "Назаўтра, як настаўнік гэта ўгледзеў, дык выдзер яго добра за нос, за вушы і за чупрыну, і ў дадатак паставіў голымі каленямі на жарству. Пасля такой строгай кары настаўнік выдаў яму новую кніжку і паперу, будучы пэўным, што хлопец болей гэткіх выкрутасаў рабіць не будзе. Праз пару дзён паўтарылася тое самае".

Назавіце імя хлопчыка, твор, аўтара. (*Сцяпанка Пяцкун. "Велікодныя яйкі". Змітрок Бядуля.*)

2-і вядучы. Сярод школьных прадметаў вялікай папулярнасцю ў нашай школе карыстаецца родная мова. А ці добра вы ведаеце яе законы і правілы? Запрашаю капітана кожнай каманды, каб пераканацца ў праўдзівасці сказанага.

• ***Конкурс капітанаў "Амонімы" (крыжаванка).***

За кожны правільны адказ залічваецца 5 балаў. Калі капітан не адказаў, даецца магчымасць адказаць на гэтае пытанне капітану іншай каманды.

1. Народнае паэтычнае паданне; тлумачальны тэкст, а таксама ўмоўныя знакі да карты, плана. (*Легенда.*)

2. Доўгім карыстаннем прывесці ў непрыгоднасць; занесці што-небудзь у якое-небудзь месца. (*Знасіць.*)

3. Знак узнагароды; манаскае таварыства каталіцкай царквы. (*Ордэн.*)

4. Адзінка вымярэння колькасці электрычнасці; жаночае ўпрыгожанне. (*Кулон.*)

5. Месца, дзе спяць; рад снапоў, пакладзеных для абмалоту. (*Пасцель.*)

1-ы вядучы. Не толькі літаратура і мова натхняюць нас на творчасць, але і беларускі фальклор жывіць нас непаўторнымі вобразамі і ідэямі. Інакш і быць не можа, бо беларуская народная творчасць – падмурак, з якога пачынаецца беларуская культура. Без ведання нацыянальных традыцый і звычаяў немагчыма быць сапраўдным патрыётам Бацькаўшчыны. Любіць і берагчы свае карані не толькі абавязак, але і гонар кожнага свядомага беларуса. Запрашаю каманды ўзяць удзел у наступным конкурсе.

• ***Конкурс "Беларускія прыказкі і прымаўкі: хто больш".***

Назваць прыказкі і прымаўкі; камандзе, якая ўзгадае больш, дадаецца 5 балаў.

1-ы вядучы. За кароткі час мы ўбачылі, наколькі таленавітыя нашы ўдзельнікі. Яны складаюць вершы і прыгожа спяваюць. А зараз апошні, восьмы, конкурс пакажа знаходлівасць хлопцаў і дзяўчат. Пакажа, наколькі яны ведаюць беларускія загадкі.

• ***Конкурс "Беларускія загадкі".***

1. Чоран, ды не воран, рагаты, ды не бык, шэсць ног без капыт, ляціць – вые, сядзе – зямлю рые. (*Жук.*)

2. Кругленькі, маленькі, а за хвост не паднімеш. (*Клубок.*)

3. Сядзіць Пархом на кані вярхом; сам непісьменны, а чытаць дапамагае. (*Акуляры.*)

4. Лажыцца вусаты, устае гарбаты. (*Кот.*)

5. Цяпло прыйдзе – апранаецца, холад настане – распранаецца. (*Дрэва.*)

6. Усе яго любяць, чакаюць, а глянуць, убачаць – адразу заплачуць. (*Сонца.*)

7. Сястра да брата ў госці ідзе, а брат ад яе хаваецца. (*Сонца і Месяц.*)

8. Ляціць без крыл, бяжыць без ног, плыве без ветразя. (*Воблака.*)

9. З высокай дарогі глядзіць бычок крутарогі. (*Месяц.*)

10. Пакаціўся клубок, рассыпаўся гарох, пачало світаць – не было чаго збіраць. (*Месяц і зоркі.*)

11. У вадзе нараджаецца, а вады баіцца. (*Соль.*)

12. Па моры імчыцца, пад ветрам гуляе, да берага дойдзе – адразу знікае. (*Хваля.*)

13. Стукае, грукае, а нідзе не відаць. (*Гром.*)

14. Ляціць, а не птушка, вые, а не звярушка. (*Вецер.*)

15. Ляцяць птушкі без крыл, садзяцца – без ног. (*Снег.*)

16. На дварэ гарою, а ў хаце – вадою. (*Снег.*)

17. Хоць побач ідзе, а рукамі не возьмеш. (*Цень.*)

• ***Падвядзенне вынікаў спаборніцтва.***

• ***Вучні чытаюць на памяць вершы беларускіх паэтаў пра беларускую мову.***

2-і чытальнік.

Гімн мове

О, мова родная мая!
Вяскова, проста, а святая –
Хацеў бы свету крыкнуць я,
Што сэрцам ўсёгды паўтараю:
Хвала табе! О, церпяліва,
За муку вечную тваю –
Дагэтуль ты ўсяму на дзіва
Схавала моц вялікую…

Не згінула… мерлі хаця
Прадзеды, дзеды і іх унукі –
Табой ж гаворыць іх дзіця,
І зноў ты, мова, церпіш мукі…
Хвала табе! Бо дні вякамі
Ішлі над гэтым светам ўсім,
А ты трывала ўсцяж і з намі…
Хвала табе – табе і ім,
Хто здрады ў жыццяйку не знаў,
Нягледзячы на хмары бед,
Хто ўсцяж табою стараваў,
Сцярпеўшы здзекаў пераслед.
Хвала табе! Прайшло ўжо тое…
Хоць не зусім, але мінецца:
Прачулі мы, што нам святое
І да чаго сардэнька б'ецца…
Хвала табе! О, дарагая!
О, беларуска проста мова!
Што сон магільны прарываеш,
Нясеш нам знак на жыцце нова!
Хвала табе! Вяліку справу
Спраўляеш ты між нас сярод,
Адвечнай кормячы нас стравай,
Даеш салодкі жыцця мёд…

Алесь Гарун.

3-і чытальнік.

Родная мова

З калыскі я люблю цябе,
Жыла ты з намі ў нашай хаце.
У весялосці і ў жальбе
Са мной заўжды, як песня маці.
Дзе наш зарэчны лес і дол,
Там песнямі вясну гукалі;
На нашай мове навакол
Зязюлі у лясах кувалі.
Чаго ў нас толькі ні было:
І Трасцянец, і Курапаты.
І нават мову заадно
Хацелі выжыць з роднай хаты.
Я сваёй мове прысягаў, –
І гэтага, лічу, замала, –
Любіць яе, як Колас зваў,
І шанаваць, як зваў Купала!

Аляксей Пыліла.

Юрый МЯНЬКОЎ,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
Баравабудскага сада – сярэдняй школы
Кармянскага раёна.

Аўтар ахвяруе ганарар на развіццё часопіса.

Кола народных святаў

ОЙ, ВЯСНА ВЯСЁЛАЯ!

ТЭАТРАЛІЗАВАНАЕ ПРАДСТАЎЛЕННЕ ГУКАННЯ ВЯСНЫ

Дзейныя асобы: Васіліна, Дзед, Аленка, Міхась, Зіма, Вясна, Пчолка, дзеці.

Двор вясковай хаты. Развешаны прыгожыя тканыя посцілкі, ручнікі, аздобленыя каляровай вышыўкай, настольнікі, сурвэткі.

Васіліна. Дзякуй богу, сонейка ўжо добра свеціць, але яшчэ не грэе. Няма яшчэ сапраўднай вясны, і, мабыць, рана я пачала ў хаце прыбіраць ды ўсё прасушваць. Вой, нават рукі змерзлі, хоць рукавіцы надзявай.

Дзед (*падыходзячы*). Добры дзень табе, Васіліна, бог у дапамогу!

Васіліна. Добры дзень, дзеду, дзякуй за добрыя словы!

Дзед (*звяртаючы ўвагу на вырабы*). Якая прыгажосць! Наткалі за зіму са старой Аленай. Яна заўсёды была найлепшай ткачыхай, відаць, і цябе гэтаму навучыла.

Ткала дзяўчына для красы,
Ткала для шлюбу ў жыццё,
Сцяжынкай слала ручнікі
На долю, шчасце і цяпло.

Васіліна. Во, як вы ўмееце хораша гаварыць, дзякуй. Але, што гэта вы так цёпла апрануты, зіму падтрымліваеце, вясну палохаеце?

Дзед. Ды калі гаварыць пра вясну, то па старым звычаі вясну трэба паклікаць. Раней заўсёды так рабілі. Моладзь збіралася ды ішла на сухі пагорачак спяваць, вясну-красну заклікаць:

Ой, Вясна, ты, Вёсенка,
Дзе падзелася?
Нам Зіма халодная
Ужо й прыелася!

Гукалі вясну не толькі на Беларусі, але і на рускіх ды ўкраінскіх землях. А вясна, нібы прыслухоўвалася і прыходзіла ў наш край. Вось так даўней было.

Васіліна. Цікава вы, дзед, расказалі. Пайду дзяцей клікну, паспрабуем і мы вясну пагукаць,

зімку халодную прагнаць. А птушак я з самага ранку напякла – дзяцей хацела парадаваць.

Дзед. Вось і добра. Пастараемся свята наладзіць.

Васіліна (*гукае*). Міхаська, Аленка, хадзіце хутчэй сюды, нешта цікавае вам скажу!

З'яўляюцца Міхась і Аленка.

Васіліна (*да дзяцей*). Бяжыце, клічце сваіх сяброў, будзем вясну гукаць.

У хуткім часе ў дварыз'яўляюцца дзеці рознага ўзросту, з імі і некаторыя дарослыя.

1-ы хлопчык. Дзякуй вам, цётка Васіліна, і вам, дзеду, за тое, што запрасілі нас вясну гукаць, а зімку праганяць.

2-і хлопчык. Нам і ў школе пра гэта расказвалі, а называецца гэты абрад "Гуканне вясны", або "Саракі", калі прылятае многа птушак.

Васіліна. Якія малайцы і вы, і вашы настаўнікі, што не забываюць народныя святы.

1-я дзяўчынка.

А мы, цётачка, і словы ведаем:
З дазволу вашага, шаноўныя людзі,
Вясну-красну гукаці будзем.

2-я дзяўчынка.

Вясну-красну гукаці,
Сцюдзёную зімку замыкаці.

3-і хлопчык.

Сцюдзёную зімачку, ды ў каморачку,
А цёплую вёсенку, ды ў падворачак.

Аленка (*кланяецца*).

Блаславіце, дзеду, вясну пазваці!
Блаславі, маці,
Вясну гукаці!

Міхась.

Блаславі, Божа, вясну заклікаці,
Зімку халодную забываці!

Дзед. А цяпер карагод вадзіць ды вяснянку спяваць!

Усе водзяць карагод і спяваюць.

Усе (*разам*).

Жавароначкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце,
Ясным сонейкам адарыце,
Зімку белую адзавіце.
Бо нам зімачка надаела,
Увесь хлебушак пераела.
Жавароначкі, прыляціце,
Зямлю-матухну абудзіце,
Яе дожджыкам напаіце,
Каб травачкі парасцілі,
Каб волікаў накармілі.
Жавароначкі прыляціце!

4-ы хлопчык (*гучна*).

Ці скора ты, жаданы час,
Вясны-красны ідзеш да нас?

5-ы хлопчык (*гучна*).

Сагрэй ты нас, цяплом абвей,
Ідзі, вясна, ідзі скарэй!

Аленка.

А ў лесе лісіца брэша,
Мядзведзь рыкае – вясну гукае.

Міхась.

Вол бушуе – вясну чуе,
Карова раве – вясну заве.

Васіліна. Дзякуй, дзеці, шмат чаго ведаеце пра гэтае свята.

Дзед. Ну, а цяпер давайце, дзеткі, пагукаем вясну вунь з таго пагорачка, бо, відаць, вясна нас яшчэ не пачула.

Усе ідуць за дзедам. Водзяць карагод, спяваюць.

Усе (*разам*).

Прыйдзі, прыйдзі, вясна,
Прыйдзі, прыйдзі, красна,
К нам у таночак!
Прынясі нам збожжа,
Дай нам красок,
Каб нам звіць вянок!

Дай нам жыта, дай пшаніцы,
Агарод дай, сенажаць,
Роўны грады,
Поўны грады,
Увосень многа коп нажаць!

Дзед. А цяпер усе разам дый пагукаем доўгачаканую вёсенку. Паўтарайце за мной гучна:

Вясна наша вясёлая – гу!
Развесялі зямлю, ваду – гу!
Зямлю, ваду, мяне маладу – гу!
Ой, вясна вясёлая – гу!
Пакрый пчалу мядком – гу!
Маці-зямлю коўдрай – гу!
Гаспадароў дабром – гу!
Маладую пару вянцом – гу!

Васіліна. Добра вясну пагукалі, ажно здаецца і пацяплела.

Дзед. Сапраўды пацяплела. Дзеці, а хто гэта да нас набліжаецца ў прыгожым ды яркім убранні?

Дзеці (*разам*). Дык гэта ж Вясна ідзе! Вясна! Вясна!

Танцуюць і пляскаюць у далоні. Заходзіць Вясна ў суправаджэнні музыкаў.

Вясна.

Еду, еду на плужочку,
Еду, еду на баронцы,
На залатым еду канёчку
Я па вашай па старонцы.

Дзеці падымаюць уверх абруч-кола, упрыгожаны кветкамі, каляровымі стужкамі. Гэта вароты, праз якія пройдзе Вясна.

Усе (*разам*).

Мы вароты адчыняем,
Цябе, Вёсенка, чакаем.

Вясна (*праходзячы праз "вароты"*).

Прывітанне, людзі добрыя!
Доўга я да вас ехала, спяшалася,
Па дарозе Зімку бачыла – прывіталася,
На шляхах-сцяжынах разміналася.

6-ы хлопчык.

Ой, Вясна-красна,
А што нам прынясла?

Вясна.

А дам я вам жменю ячменю,
Жыта карыта, мерку пшаніцы,
Ды вадзіцы з крыніцы.

Вясна сыпле зернем, пырскае вадой.

7-ы хлопчык. Вясна-красна, што яшчэ нам прынясла?

Вясна.

Маладзенькім – па плужочку,
А старэнькім – па кіёчку.
Маладзіцам, цёткам
Хаты прыбіраці
Ды кросны даткаці.
А добрым дзеткам давучыцца
І добра пагуляці.

Васіліна. Дзякуй, Вясна-красна, за тое, што не абмінула наш край.

Дзед. Дзякуй за пажаданні добрыя, за словы ласкавыя.

Дзеці (*разам*). За падарункі харошыя.

Нечакана для ўсіх з'яўляецца Зіма – дзяўчына ў белай, прыгожай вопратцы, з блішчастай каронай на белых валасах.

Зіма. Вы мяне, бачу, не чакалі, а я ўсё ж вярнулася. Хоць я і сама не ў кажуху, але ўсё ж рана, ой, рана прыйшла, ты, сястрыца. Я, Зіма, не збіраюся саступаць без пары трон малодшай сястры. І за што вы толькі любіце так Вясну? Яна ідзе – людзям працу нясе. А вы яе і на Грамніцы чакаеце, і на Масленіцу страчаеце. Па дарозе сюды я чула масленічную песню (*спявае, перадражнівае, крыўляецца*):

У нас сёння Масленка,
Прыляцела ластаўка,
Перайка кідала,
Вясну зазывала.

(*Злосна.*) Я не перайка буду кідаць, а чысты, крыштальны снег буду вам сеяць. (*Гукае.*)

Хай дачушка-мяцеліца
Над палямі сцелецца,
Добра пагуляе,
Белы покрыў засцілае.

Сыпле снег на тканыя вырабы Васіліны. Дзеці і Васіліна ўсё хуценька здымаюць. Зіма здзекліва смяецца, прытанцоўвае і кружыцца. Дзед, дзеці, Васіліна засланяюць Вясну.

Зіма. А птушак гаманлівых, ранніх веснікаў сястрыцы, разганю, есці не дам ды іхняга галоўнага, што ў чырвоных ботах, зусім не пушчу ў гэты край. (*Гукае.*) Чуеш, сястрыца, а месяц Сакавік будзе мой, бо мы заўсёды з-за яго спрачаліся. Ну, а зараз я падзьму мацней, падкіну снегу ды пайду пасплю. (*Кружыцца, кідае снег, пасля, пазяхаючы, кладзецца на лаву ў двары спаць.*)

Васіліна (*ціха*). Што ж нам цяпер рабіць, як пакінуць Вясну, а Зіму адправіць на адпачынак?

Аленка. Як гэта зрабіць, дзеду?

Дзед (*падумаўшы*). Здаецца ж, усё рабілі, як трэба, але вось што, мае вы дзеткі. Мы ж яшчэ не праспявалі вяснянку – зварот да пчолкі. Хуценька станавіцеся ўсе ў кола ды спявайце разам са мной:

Ты, пчолачка, ярая,
Ой, пчолачка, ярая!
Ты вылеці з-за мора,
Ты вынесі ключыкі,
Ключыкі залатыя,
Ты замкні зімачку,
Зімачку сцюдзёную,
Адамкні нам вёсенку,
Лецейка чырвонае.

Міхась. Гляньце, снег растаў, пацяплела.

Аленка. А вунь і Пчолка паявілася.

Пчолка весела гудзе, кружыць вакол дзяцей, убачыўшы Зіму, якая спіць на лаве, пачынае кружыць каля яе.

Зіма (*спалохана ўсхапіўшыся*). Вой, вой (*махае рукамі*), адчапіся, зімой не бывае пчол. Добра, я ўсё зразумела і таму пайду ў свой далёкі, паўночны край. (*Кланяецца людзям і Вясне.*)

Бывайце, дабром успамінайце,
А напачэ вас лецейка –
Зноў мяне чакайце.

Выходзіць.

Вясна. Дзякуй вам, людзі добрыя, за тое, што мяне чакалі, добра прымалі.

Каб вы ніколі не хварэлі,
Хай нясуць вас увысь Вясны арэлі.

Усе падняўшы рукі.

8-ы хлопчык. На жыта высокае.

3-я дзяўчынка. На ніву багатую.

4-я дзяўчынка. На ночы цёплыя.

5-я дзяўчынка. На дажджы ўраджайныя.

9-ы хлопчык. На лета добрае.

Міхась. Спакойнае, не грымотнае.

Аленка. На дружбу чыстую.

Васіліна. На жыццё заможнае.

Дзед. На долю шчаслівую.

Усе (*разам*). Узляціце вясны арэлі!

Вясна. Бывайце, а я далей пайду, іншым цяпло ды святло панясу.

Васіліна. Які слаўны быў дзень! Дзеці і вы, дзеду, пойдзем частавацца жаўранкамі з цеста, што я напякла для вас з самага ранку.

Алена МАСКЕВІЧ,
педагог.

Аўтар ахвяруе ганарар на развіццё часопіса.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ І СУСВЕТНАЯ КУЛЬТУРА

З архіваў часу

МАКСІМ ГАРЭЦКІ ВА ЎСПАМІНАХ СУЧАСНІКАЎ

ПА МАТЭРЫЯЛАХ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА-МУЗЕЯ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА

Першыя публікацыі ўспамінаў пра Максіма Гарэцкага з'явіліся ў друку ў пачатку 1963 г., калі адзначалася 70-годдзе з дня нараджэння пісьменніка. Найперш паклапаціўся пра гэта яго брат, вядомы вучоны Гаўрыла Гарэцкі, які апублікаваў у другім нумары часопіса "Полымя" "Успаміны пра брата". Гаўрыла Іванавіч і потым друкаваў успаміны пра брата ў розных выданнях, дапаўняючы іх новымі фактамі і дэталямі. Зробіць шчырыя згадкі пра М. Гарэцкага ў 1963 г. у "Голасе Радзімы" і беластоцкай "Ніве" Янка Шутовіч. Але на той час спіс аўтараў успамінаў, можна сказаць, на гэтым і вычэрпваўся. Тым не менш пачатак быў пакладзены. Рэабілітацыя М. Гарэцкага як пісьменніка, вяртанне яго творчасці да жыцця набірала хаду. З кожным чарговым юбілеем з'яўляліся тыя, хто ў друку ці афіцыйных выступленнях успамінаў пра пісьменніка, вучонага, педагога М. Гарэцкага. Самым вялікім поклічам да напісання ўспамінаў стала 90-годдзе з дня нараджэння творцы. У розных часопісах і газетах у 1983 г. змясцілі свае мемуары сябра М. Гарэцкага А. Сухі, малодшы брат Парфір Іванавіч, акцёр Рускага драмтэатра БССР і былы вучань К. Кулакоў (Рутштэйн), пісьменнікі А. Якімовіч і М. Лужанін, настаўніца В. Маслоўская і інш. У той жа перыяд пачалася падрыхтоўка зборніка "Максім Гарэцкі: Успаміны. Артыкулы. Дакументы", складальнікамі якога сталі вядомыя вучоныя, літаратуразнаўцы А. Ліс і І. Саламевіч. Гэты зборнік, што выйшаў у выдавецтве "Мастацкая літаратура" ў 1984 г., змяшчае ўспаміны шаснаццаці аўтараў, у тым ліку дачкі пісьменніка Г. Гарэцкай, настаўніка, калегі па працы ў Пясочні Я. Трагубава, этнографа М. Пецюкевіча, гісторыка М. Улашчыка, вучонага-фізіёлага М. Ганчарыка, вучонага-біяхіміка і паэта А. Вечара, якія пісаліся спецыяльна для зборніка ці друкаваліся ўпершыню. У зборніку былі змешчаны і ўрыўкі з чарнавых накідаў-успамінаў жонкі М. Гарэцкага, беларускай пісьменніцы Леаніды Усцінаўны Чарняўскай-Гарэцкай (1893 – 1976). Падрыхтавала да публікацыі гэтую частку ўспамінаў пад назвай "Як складалася кніжка народных песень" Галіна Гарэцкая. Быў час, калі нельга было друкаваць усё тое, што пакінула ў сваіх запісах Леаніла Усцінаўна, і Галіна Максімаўна выбрала для зборніка самае прымальнае. З пачаткам 1990-х гг. і ўсталяваннем традыцыі штогадовых Гарэцкіх чытанняў мемуарыстыка пра М. Гарэцкага папоўнілася ўспамінамі Р. Гарэцкага, А. Бабарэкі, Г. Гарэцкай.

Вялікую ролю ў зборы звестак пра пісьменніка адыграла яго дачка і выдатны даследчык Галіна Максімаўна Гарэцкая. Яна напісала дзясяткі лістоў да самых розных асоб, якія маглі ведаць і помніць бацьку, вывучыла шматлікія архіўныя дакументы і выданні, падрыхтавала да друку многія невядомыя творы літаратара. Пасля смерці Леанілы Усцінаўны Галіна Максімаўна вельмі ўважліва паставілася і да ўсіх запісаў, якія пакінула маці ў нататніках альбо на асобных лістках. У 1989 г. у газеце "Звязда" за 12 кастрычніка яна ўпершыню змясціла невялікі ўрывак з успамінаў маці пад назвай "Памятка". А ўжо ў першым нумары часопіса "Полымя" за 1990 г. "Памятка" была надрукавана цалкам. У пасляслоўі да публікацыі Г. Гарэцкая напісала: «Маці мая, беларуская пісьменніца Леаніла Чарняўская (1893 – 1976) марыла напісаць успаміны пра блізкіх і знаёмых ёй людзей, але многа хварэла, апошнія восем гадоў жыцця была прыкутай да ложка і змагла занатаваць нямногае: нататкі пра сустрэчы з Якубам Коласам, невялічкі ўспамін "Як складалася кніжка народных песень" (у кнізе "Максім Гарэцкі: Успаміны, артыкулы, дакументы", 1984, с. 61 – 62), "Успаміны пра сына" і "Памятку" пра апошнія гады жыцця бацькі майго Максіма Гарэцкага».

І тым не менш да ўсяго зробленага і апублікаванага на сёння ёсць што дадаць. Гэта стала магчымым пасля навуковай апрацоўкі сямейнага архіва Гарэцкіх, які захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Адна з адзінак захоўвання (фонд 426, воп. 2, адз. зах. 134) прыцягнула ўвагу сваёй назвай "Дзённікавыя запісы. Успаміны (1918 – 1920 гг.). Блакноты". Гады напісання гэтых матэрыялаў –

Максім Гарэцкі і Леаніла Чарняўская-Гарэцкая (2-і рад злева) **сярод выкладчыкаў і навучэнцаў Віленскай беларускай гімназіі.** 1920 г.

1968 – 1972. Тое, што ў двух нататніках знаходзяцца не толькі дзённікавыя запісы, а і ўспаміны, гэтаксама пазначаныя дакладнай датай, можна было ўстанавіць толькі пры пастаронкавым знаёмстве з тэкстам. Усе пазнакі ў блакнотах, за выключэннем 2 – 3 старонак, зроблены алоўкам, графіка тэкстаў у многіх месцах вельмі слабая, ледзьве бачная. Першы запіс датуецца 15 верасня 1968 г., над ім надпіс "Л. Чарняўская", апошні – 3 мая 1973 г.

Ужо з першай нататкі Леаніла Усцінаўна гаворыць пра свой цяжкі фізічны стан, пра частыя выклікі "хуткай дапамогі", шкадуе дачку, "якая самаддана даглядае мяне і ў дзень і ўначы". Калі ж станавілася лягчэй, Леаніла Усцінаўна, акрамя фіксацыі фактаў паўсядзённага жыцця, згадвала падзеі мінулага. Такіх запісаў няшмат, але і яны маюць для нас вялікае значэнне. Праз пятнаццаць старонак пасля першай даты, 5 лістапада 1968 г. Леаніла Усцінаўна пазначыла: "Успаміны, калі іх так можна назваць". Гэтыя старонкі, у адрозненне ад астатніх, аўтарка пранумаравала. Утрымліваюць успаміны і запісы ад 26 верасня 1969 г. (пра ўкладанне чытанкі), 21 снежня 1969 г. (пра арышт М. Гарэцкага; запіс пачынаецца словамі: "Апошні раз я бачылася і гаварыла з Максімам у гэты дзень у 1937 годзе"), 1, 2 і 18 сакавіка 1970 г. ("што адказаць на пісьмо камсамольцаў з Мінскай школы" – пра жыццё ў Мінску). Найбольш цэласнымі і завершанымі з іх здаюцца запісы ад 5 лістапада 1968 г., якія публікуюцца ніжэй.

«5/XI.68 г. Успаміны, калі іх так можна назваць

Слаба я стала вельмі, але ўспомню, што змагу.

Канец 1918 г. У канцы лістапада, цяжка хворая, трапіла я ў Вільню[1]. Была ў мяне гішпанка і сыпняк разам. Маці абірала вошы, паліла іх у печы і ніхто з яе вялікай сям'і не захварэў. Правалялася я без памяці тыдні са тры, потым, хістаючыся, стала на ногі, мой магутны арганізм вытрымаў і хваробу, і страшныя падзеі мінулага.

Трэба было жыць і зарабляць на жыццё.

Панавалі ў горадзе немцы. Рускіх школ не было. Я, радзіўшыся на Беларусі, чула вакол беларускую мову, ведала яе добра, але вучылася ў рускай школе, выкладала ў рускай пачатковай школе, да "тутэйшай мовы" адносілася не з пагардай, але не сур'ёзна. Мне падабаліся дзіцячыя гульні пра вераб'я, [яшчурка], пра лён, мак. Пры школе быў інтэрнат, начавалі дзеці з дальніх вёсак. Падручнікі былі на рускай мове, ім лёгка давалася мова, але між сабой яны гаварылі на роднай мове.

Кватэра наша была на вуліцы, назву якой я не памятаю, але адным канцом яна выходзіла на Віленскую, другім на Катэдру[2]. Ня памятаю, хто мяне навучыў звярнуцца на Віленскую, 22 да Івана Луцкевіча[3].

Сустрэў ён мяне прыхільна. Я – настаўніца са стажам, ведаю беларускую мову, і адразу запрог мяне ў работу. Абяцаў пасаду настаўніцы ў Беларускай гімназіі, якая мелася адчыніцца ў Базыльянскіх мурох 1 студзеня 1919 г., і даручыў укласці чытанку пад назвай "Родны край". Вось калі адчыніўся новы свет: Янка Купала, Якуб Колас (Тарас Гушча), З. Бядуля, Максім Гарэцкі, Багушэвіч, Ядвігін Ш., іншыя.

Гімназія адчынялася ў Базыльянскіх мурох. Раней да вайны там была духоўная семінарыя. Пры немцах – шпіталь. Немцы ўжо эвакуіраваліся.

Зіма была лютая, сцены будынку прамерзлі наскрозь. Аднак там ужо збіраўся будучы калектыў. На радасць сустрэлася я з Алёнай Кірылаўнай Сакаловай[4], з якой некалі вучылася разам, толькі у розных класах. Былі ў Вільні прытулак на Бакшце і пры Духовым манастыры. На Бакшту ў будынак былога Дух[оўнага] вуч[ылішча]. Пайшла. Дзеці жылі ў цяжкіх умовах. [Загадчыцай] Тэця Станішэўская[5], хворая на сухоты, цьмяная з твару. Сумна глядзела на мяне.

У горадзе было трывожна. На вуліцах усё больш было легіянераў у блакітных, чырвоных мундзірах. Трымаліся яны горда.

Максім і Леаніла Гарэцкія з Аленай Сакаловай-Лекант і яе дзецьмі. 1920 г.

Я зайшла ў гарадскі зал, поўны народу. Вёў даклад малады чалавек, ніякай трывогі не адчувалася. Слухалі ўважліва. А калі пазней я пайшла ў даведкі да сваёй цёткі, што жыла за Зялёным мастом, то, вяртаючыся дамоў, убачыла, што на масту стаялі кулямёты, але так прасілася пакарміць дзіця (якога у мяне не было), што мяне прапусцілі. Вуліцы былі пустыя.

Ці ў тую ноч, ці пазней адбыліся трагічныя падзеі на Вароньей вуліцы ў рабочым клубе. Неўзабаве ў горад прыйшла Чырвоная Армія. Загінуўшых камунараў хавалі вельмі ўрачыста ў скверы, дзе раней стаяў помнік Катарыне. Уся плошча была запруджана народам. Рабочыя, рабочыя, але шмат варожых твараў. З ухмылкамі і гамонкамі ў паўголаса.

Хутка жыццё маё пайшло іншым шляхам. Я "пякла" чытанку "Родны край", а мяне ўсе падганялі. У Вільню пераехала з Мінску "Звязда", у рэдакцыю якой уваходзіў Максім Гарэцкі. Упершыню мы сустрэліся ў нейкім пакоі на Віленскай, 22. Я ўжо ведала яго як пісьменніка па зборніку "Рунь", ён чуў пра мяне як беларускую настаўніцу, чуў, што ўкладаю чытанку "Родны край".

Гімназія наша і вучняў набрала, як у Ноеў каўчэг, "каждой твари по паре". Ну і настаўніцкі калектыў быў не дужа аб'яднаны. Дырэктарам быў М. С. Кахановіч[6], беларус, інспектар Дмахоўскі, паляк. Далей пайшлі беларусы Г. В. Багдановіч[7], І. Я. Катовіч, Сакалова, я, і прамільгнула на кароткі час постаць Т. Грыба[8], фігура арыгінальная. Што ён выкладаў, не ведаю, бачыла, што сядзеў ён верхам на парце, вучні абляплялі яго, а то сядзелі дзе збоку, займаліся хто чым хацеў. У канцэляры сядзеў смуглявы хлопец па прозвішчы Шабуня, але хутка знік некуды, Ганна Душэўская[9].

Чытанка мая "Родны край" была гатова, але трэба быў дазвол рэдактара Біржышкі[10]. Станкевіч[11] аднёс у рэдакцыю, але праз нейкі час сказаў, каб я пайшла з ім да рэдактара, бо таму не ўсё да спадобы, трэба перарабіць тое-сёе.

Пайшлі, селі, дзе нас пасадзілі. Рэдактар гартаў старонкі будучай чытанкі, рабіў розныя заўвагі, вось-вось верне назад, а я ўтаропілася ў яго такімі журботнымі вачамі, што ён глянуў на мяне раз, другі, мусіць падумаў, што слёзы паліюцца з мяне ракой, махнуў рукой, сказаў: "Наогул няма яшчэ добрых падручнікаў" і падпісаў дазвол на друкаванне.

Рады мы былі без меры, хоць гэта задалося. Ну, мне заказалі ўкладаць новыя чытанкі, хоць і працы ў гімназіі было шмат. Добра сябравала я з Алёнай Сакаловай, весялілі адна адну, хоць цешыцца не было чым.

З Максімам Гарэцкім сустракаліся не часта. Калі ў мяне не хапала часу на работу, то ў яго тым больш. Дапрацоўваў ён слоўнічак, пісаў аповесць "Дзве душы", апрацоўваў "Запіскі на імперыялістычнай вайне", а галоўнае, узяўся за складанне першай "Гісторыі беларускай літаратуры" па непраторанаму яшчэ шляху.

Час ішоў, надыходзіла вясна, і ў канцы красавіка, у каталіцкі Вялікдзень, горад раптоўна за пару сутак захапілі палякі. Тры дні ішла страляніна. Праз акно нашай мансарды бачыла я: на пярылах балкона вісеў забіты чалавек. Тонкія сценкі нашага дома прашывалі кулі. У дзень мы спускаліся ўніз, начою клаліся спаць на падлогу.

Праз дні тры палякі цалкам захапілі горад. Заставацца мне з маці ў прастрэлянай кватэры не хацелася. Пашанцавала мне спаткацца на вуліцы са знаёмым былым настаўнікам А. Л. Лекантам. Ён жыў у царкоўных будынках побач з Бел[арускай] Гімн[азіяй]. Як кажуць, "на мое счастье" ў адной кватэры нядаўна, гэтымі днямі, памёрла жанчына. Кватэра яшчэ не была занята, і А. Л. выстараўся яе для мяне. А што лепей: побач з гімназіяй. І Гарэцкі, які не паспеў выехаць з Вільні, асталяваўся у адным з пакояў у мурох, дзе ўжо змесцілася рэд. беларускай газеты.

Мы зараз ужо маглі часцей бачыцца, хаця абое былі заняты работай, асабліва Максім. Я пачала апрацоўваць "дзяціныя гульні". Часта заходзіў Тарашкевіч. Ён і Максім рабілі некаторыя заўвагі, а Тарашкевіч параіў запісаць на музыку карагодную песню "Сядзі, сядзі, яшчар", прызнаў яе старажытнай. Кімант[12] паклала яе на ноты, таксама "Як пайшоў верабей". Зрэдка забягаў

Станкевіч, ён усё падганяў, не даваў рабіць ніякіх зносак, паясненняў.

У газэце друкаваліся "Дзве душы"[13].

Максім расказаў мне пра свае любошчы з Аляй, сапраўднае прозвішча якой было [Крупенікава], дачкой багатага купца[14]. У доме іх было поўна элегантных афіцэраў, але балаванае дзяўчо аддала свае сымпатыі прапаршчыку Гарэцкаму. Але тэрмін [лячэння] Гар[эцкага] скончыўся, і яны разлучыліся. Аднак белы тварык з цёмнымі пасмачкамі валасоў застаўся назаўсёды ў яго памяці. Я чытала яе пісулькі абыякавыя, бяздумныя. Я была значна сталейшай за яе і зразумела, які чалавек спаткаўся на маім шляху, і пакахала яго навек. І я яму падабалася. Тарашкевіч, калі прыходзіў да нас, спяваў жартліва: "Максімку, сынку, вазьмі стрэльбінку, забі дзічынку".

Здаецца, у канцы мая Максім прыйшоў невясёлы з больніцы, дзе паміралa ад сухотаў Т. Станішэўская. Пры ёй сядзела маці. Яна сказала дачцэ проста: "Вось бульбачка прымёрзла, але адыдзе, а ты, дачушка, не аджывеш". Тэця толькі ўсміхнулася краем вуснаў, а на Максіма паглядзела сумна, сумна.

Неўзабаве яна памёрла. Пахавалі яе гарачым днём на могільніку, на Росе.

16 ліпеня 19 г. мы пажаніліся. Пераехалі ненадоўга на Антокаль, нанялі пакойчык. Але пры гімназіі адчыніліся настаўніцкія курсы. Максім пачаў чытаць лекцыі. З Антокаля далёка было хадзіць да гімназіі, і мы пераехалі ў кватэру, дзе жыла я з маці. Максім быў таксама зацверджаны наст[аўнікам] у гімназіі. Аб настаўніцкіх курсах у нас была вялікая фатаграфія, якая знікла ў адзін з сумных для нас часоў.

Акрамя педаг[агічнай] працы, у газэтах, розных "Думках", якія палякі зачынялі адну за адной, галоўнай работай стала для Максіма стварэнне першага падручніка "Гіст[орыі] бел[арускай] літаратуры".

У Вільні было вялікіх багатых бібл[іятэк]. Максім карыстаўся музеем бр. Луцкевічаў, бібл[іятэкай] духоўн[ай] семін[арыі], універс[ітэцкай] бібл[іятэкай]. Пазнаёміўся з адвакатам Врублеўскім[15], у якога была найбагацейшая бібліятэка. Максім прыносіў дамоў "Літоўскі статут", "Аль-Кітаб", іншыя рэдкія выданні.

У зімовыя канікулы ў пачатку 1920 года ў Вільню прыехаў Янка Купала. Колькі радасці было ў гімназіі. Спраўлялі вечар у гонар Купалы. Ставілі ўрыўкі з "Раскіданага гнязда", чыталі вершы. Адну ноч Купала начаваў у нас, Максім удакладняў яго біяграфію.

Здаецца, у гэтым годзе я пазнаёмілася з Гаруном. Вершы яго мне вельмі падабаліся. Ён былы сталяр. Быў сасланы ў Сібір. Вярнуўся пасля рэвалюцыі. У нешчаслівую для сябе хвіліну ён звязаўся з "беларускім" войскам пры польскай арміі. Захварэў на дызэнтырыю і памёр у Кракаве.

1920 г. Максім вельмі плённа працаваў, супрацоўнічаў у газэтах, пісаў апавяданні. Я ўкладала "Родны край", ужо 3 і 4 часткі. У канцы лета перайшоў граніцу Гурык і прыйшоў да нас. Радаваліся браты сустрэчы. Я была ўжо цяжарная, худая, збялелая і, відаць, не дужа спадабалася Гурыку, [пазней] я пачула выпадкова з размовы братоў, што і мая маці не спадабалася Гурыку. Было яму толькі 20 гадоў, але быў мужны, поўны запалу, кахання да роднага краю».

---

[1] Леаніла Чарняўская з 1911 г. да пераезду ў 1918 г. у Вільню працавала настаўніцай у вёсцы Залессе Дзісенскага павета (сучасны Міёрскі раён Віцебскай вобласці).

[2] Ад вуліцы Віленскай на Катэдральную плошчу выходзілі вуліца Маставая (цяпер Цілту) і Георгіеўскі праспект (пазней – Адама Міцкевіча, цяпер праспект Гедыміна).

[3] Насамрэч, кватэра І. і А. Луцкевічаў знаходзілася на Віленскай, 33, пра якую М. Гарэцкі ва ўспамінах пра І. Луцкевіча (1881 – 1919) напісаў: "Да яго выезду ў Закапанае залучаў я на знамянітую ў нашым руху кватэру на Віленскай 33, і заўсёды знаходзіў у хворага поўна гасцей. Сюды вялі дарогі з усіх беларускіх устаноў Вільні; сюды ішоў кожды беларус, быўшы праездам у Вільні; сюды ішоў кожды паступовы грамадзянін краю, каб пагаманіць аб справах краю" ("Памяці Івана Луцкевіча. У першыя ўгодкі смерці яго 20.VIII.1919 – 20.VIII.1920". Вільня, 1920. С. 43). Менавіта там, як вынікае з наступных радкоў, Леаніла Усцінаўна і Максім Іванавіч і пазнаёміліся. І. Луцкевіч у гэты час актыўна працаваў над арганізацыяй у Вільні беларускай гімназіі.

[4] Сакалова-Лекант Алена (1895 – 1960) – настаўніца, сяброўка Л. Гарэцкай. Захаваліся лісты іх перапіскі 1957 – 1959 гг.

[5] Станішэўская Тэкля (1898 – 1919) – настаўніца. Скончыла ў 1916 г. настаўніцкія курсы ў Гродне. Удзельніца беларускіх тэатральных пастановак у Вільні ў 1918 – 1919 гг., працавала ў прытулку "Золак" і "Беларускай кнігарні". Прататып настаўніцы Агаты Невядомскай у драматычным абразку "Жалобная камедыя" М. Гарэцкага.

[6] Какановіч Міхаіл Сілуянавіч (1882 – 1934) – беларускі палітычны дзеяч і педагог. З часу заснавання і да 1922 г. быў дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі.

[7] Багдановіч Генадзь Васілевіч (1885 – 1937 ?) – беларускі педагог і грамадскі дзеяч, выкладчык геаграфіі ў Віленскай беларускай гімназіі.

[8] Грыб Тамаш (1895 – 1938) – палітычны дзеяч. Звесткі пра настаўніцкую працу ў Віленскай беларускай гімназіі ў яго біяграфічных артыкулах адсутнічаюць.

[9] Дуж-Душэўская Ганна (1898 – 1990) – удзельніца беларускага нацыянальнага руху, жонка беларускага палітычнага дзеяча К. Дуж-Душэўскага (1891 – 1959).

[10] Біржышка Міколас (1884 – 1956) – юрыст, бібліёграф, гісторык культуры, грамадскі і палітычны дзеяч. Са студзеня да сакавіка 1919 г. быў камісарам асветы Літвы.

[11] Станкевіч Янка (1891 – 1976) – беларускі грамадска-палітычны дзеяч, які ў той час працаваў у літаратурна-выдавецкім аддзеле ЛітБелССР, загадваў выдавецтвам "Веды".

[12] Кімант-Ячыноўская Марыя (1858 ? – 1922) – беларуская піяністка, кампазітар і грамадскі дзеяч.

[13] Беларуская думка. 1919. 20, 22, 25 – 27, 29 чэрвеня, 3, 5, 6, 9, 11, 13, 17, 19, 20, 22 – 24 ліпеня.

[14] Тут, магчыма, Леаніла Усцінаўна ўказвае на прататып Алі Макасеевай з аповесці "Дзве душы" М. Гарэцкага.

[15] Врублеўскі Тадэуш (Урублеўскі) (1858 – 1925) – палітычны і культурны дзеяч, адвакат, бібліяфіл.

Ганна ЗАПАРТЫКА,
дырэктар Беларускага дзяржаўнага
архіва-музея літаратуры і мастацтва.

Анатоль СТАТКЕВІЧ-ЧАБАГАНАЎ

АРЦІШЭЎСКІЯ ГЕРБА "РОЛЯ"*

Герб "Роля" роду Арцішэўскіх.

Родапачынальнік адной з галін роду Арцішэўскіх герба "Роля" палкоўнік літоўскіх войск Станіслаў Арцішэўскі па прывілеі караля польскага Уладзіслава IV Вазы 5 чэрвеня 1638 г. атрымаў маёнтак Зорын з трыма вёскамі – Жорнаўка, Церамень, Таўпыжын – і сялянамі ў Мсціслаўскім ваяводстве над ракою Сож.

Прымаючы рашэнне пра ўзнагароджанне, кароль улічыў, што маскоўскія войскі разбурылі маёнтак Арцішэўскага Чыжоўка ў Смаленскім ваяводстве: *"…Станиславу Арцишевскому полковнику Нашему вечно и безвозвратно отдаём и дарим ему, жене и их наследникам, покуда род Арцишевских и царство Польское будут существовать, и предоставляем право помянутому полковнику пожалованною себе маетностию распоряжать, местечки деревни строить и всяких користей снискивать, отдать подарить или продать…"*

З прывілея вынікае, што аддадзеныя Арцішэўскаму тры вёскі маёнтка Зорын належалі на той момант каралеўскаму двару і знаходзіліся ва ўпраўленні Людвіка Цэханоўскага.

Памёр палкоўнік літоўскіх войск Станіслаў Арцішэўскі ў 1675 г., пакінуўшы тастамент ад 5 мая 1675 г., па якім маёнтак пераходзіў да ўнука Міхаіла праз бацьку яго Валерыяна: *"…душу мою грешную, коя скоро разлучится с телом, отдаю Всевышнему Господу Богу, равно всем святым ангелам, дабы помиловали меня грешного.*

Похоронить же тела моего должен будет потрудиться сын Валериан Арцишевский. Каковый обряд исполнит без всякой выставы, но с эфимерной молитвенностью и ассистенциею духовников должен совершиться, на каковой предмет означаю триста польских злотых.

Фундуш же мой, состоящий из имения Зорин с тремя деревнями Жарновкою, Теремень и Товпыжин с крестьянами, в Мстиславском воеводстве лежащее даю, дарую и записываю единому сыну своему Валериану Арцишевскому с тем, что по кончине этого сына моего означенное имение должно достаться во владение внуку моему Михаилу Арцишевскому.

А ныне прощаюсь с Вами, любезнейший сын мой Валериан и внук Михаил Арцишевские, друзья мои и крестьяне".

Сын Станіслава Арцішэўскага Валерыян таксама быў палкоўнікам войск літоўскіх. Пра яго вядома, што 18 чэрвеня 1674 г. у Аршанскім каптуровым судзе аднавіў граматы і прывілеі роду, якія згарэлі пры пажары. Разумеючы, што сын мог загінуць у адной з бітваў, Станіслаў Арцішэўскі паклапаціўся, каб у гэтым выпадку маёнтак перайшоў яго ўнуку Міхаілу.

Міхаіл, "таварыш панцырнай харугвы", сам займаўся справамі маёнтка. Адпраўляў на службу "почт" экіпіраваных падданых. Памёр Міхаіл Валерыянавіч у 1742 г. Па духоўным завяшчанні, актыкаваным 6 верасня 1788 г. у Мінскім гродскім судзе, пакінуў родавы маёнтак з вёскамі тром сынам у роўных частках, *"каб жылі міралюбна, з братняю любоўю і пра маю грэшную душу помнілі"*.

Выконваючы просьбу бацькі пра роўны падзел спадчыны, браты вырашылі прадаць маёнтак Зорын з вёскамі Жорнаўка, Церамень і Таўпыжын. Па акце ад 2 сакавіка 1787 г. яго купіў дваранін Эразм Касоўскі. Асобым пунктам дакумента адзначалася, што пасля выплаты ўсёй сумы ні браты, ні іх дзеці ніякага дачынення да маёнтка мець ужо не будуць. Як сведчаць паперы, цалкам купля маёнтка была завершана ў 1788 г. Аднак у будучым, пры зацвярджэнні ў патомным дваранстве чарговых нашчадкаў, Зорын па-ранейшаму фігураваў ва ўсіх дакументах як родавы маёнтак Арцішэўскіх герба "Роля".

Дамы і зямлю Арцішэўскія стараліся набываць у населеных пунктах, якія знаходзіліся недалёка адзін ад аднаго. Так, Іван Арцішэўскі, продак Генадзя Аляксандравіча Арцішэўскага, асеў у Сенненскім павеце Магілёўскай губерні. У яго было тры сыны: Ананій – ротмістр Рэчыцкага павета, Лявон і Раман – засядацель Мінскага земскага суда. Ад Лявона (1780 – 1830) прадоўжыўся род Генадзя Арцішэўскага.

* Матэрыял да публікацыі падрыхтаваны на аснове даследавання Генадзя Аляксандравіча Арцішэўскага.

Пастановай Мінскага губернскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 03.01.1803 г. род Арцішэўскіх унесены ў 1-ю частку дваранскай радаводнай кнігі і зацверджаны указам Герольдыі. У сувязі з падзеямі 1830 – 1833 гг. указам Герольдыі № 6811 ад 17.11.1832 г. увесь род быў выключаны з дваранскага саслоўя з загадам адабраць усе дакументы ў Арцішэўскіх, што было неадкладна выканана ў 1833 г. Праз пэўны час прадстаўнікам роду ўсё ж удалося даказаць сваё паходжанне. Пра гэта сведчыць пастанова Магілёўскага губернскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 28.11.1846 г. і указ Герольдыі ад 25.07.1847 г. з унясеннем 22 асоб роду ў 6-ю частку дваранскай радаводнай кнігі.

Лявон Арцішэўскі быў жанаты двойчы. Ад першага шлюбу з Вікторыяй (дзявочае прозвішча не вядома) у яго нарадзілася пяцёра дзяцей. Пасля смерці Вікторыі Лявон ажаніўся другі раз з Мар'янай Церахавай, у іх нарадзілася дачка Кацярына і сын Мацвей. Як відаць з метрычнай кнігі Лукомльскага рымска-каталіцкага касцёла францысканцаў Сенненскага павета Магілёўскай губерні, Мацвея ахрысціў святар Сямён Квасялевіч. Жонкай Мацвея стала Антаніна з Гардзіеўскіх, з якой яны мелі дачок Марыю і Канстанцыю, сыноў Івана і Міхаіла. Апошні ў 1895 г. вянчаўся з Паўлінай Іванаўнай Мярло ў Чарэйскім прыходскім касцёле. Міхаіл Мацвеевіч служыў ротным фельчарам у Рыжскім шпіталі ў Перавалачэнскім пяхотным палку. Пасля, у сувязі з тым, што ў той час у Магілёўскай губерні знаходзілася шмат вайскоўцаў, ён быў прыкамандзіраваны да Сенненскай павятовай бальніцы, каб сачыць за эпідэміялагічным становішчам. Потым працаваў у валасных фельчарскіх пунктах у вёсках Расна, Ульяновічы, у Горы-Горацкай павятовай бальніцы.

21 лютага 1902 г. у сям'і нарадзіўся першынец Аляксандр, якога ахрысціў у Абаленскім філіяльным касцёле ксёндз Андрэй Жаўрыд. Потым Міхаіл і Паўліна сталі яшчэ бацькамі Антаніны, Альфонса, Аліны, Апалоніі (Паліны), Марыі, Віктара.

Міхаіл Мацвеевіч Арцішэўскі марыў пра ваенную кар'еру для сваіх сыноў. Выхаванне хлопчыкаў было падпарадкавана гэтай мары. Старэйшы Аляксандр, вытрымаўшы ўступныя экзамены, стаў кадэтам Полацкага кадэцкага корпуса, куды прымалі тады з 12 гадоў.

У "Алфавітным спісе кадэтаў Полацкага кадэцкага корпуса да 1 верасня 1915 г." у графе "стыпендыяты" значыцца: *"Арцишевский Александр, II кл., пот. двор., вероисп. р.-к, кадет воспитывается на стипендию дворянства Могилёвской губ. Список подписан генерал-майором М. Г. Чигирь"*.

Старанны, працалюбівы і настойлівы хлопчык хутка асвоіўся ў калектыве. Вучоба давалася лёгка. Добрая памяць, кемлівасць, прыродная назіральнасць дапамаглі прызвычаіцца да новых абставін. Самымі складанымі былі ўрокі французскай мовы. Выкладчык, стары француз, патрабаваў ад кадэтаў не толькі слоўнага запасу, ведання граматыкі, але і вымаўлення з "французскім пранонсам", што было асабліва цяжка для выхаванцаў.

З пачаткам Першай сусветнай вайны і набліжэннем фронту Полацкі кадэцкі корпус эвакуіравалі спачатку ў Маскву, потым 1-ю роту – ва Уладзікаўказ, 2-ю – у Адэсу, 3-ю – у Сумы. Зімой 1919 г. прыйшла вестка пра цяжкую хваробу бацькі кадэта Арцішэўскага, Міхаіла Мацвеевіча. Аляксандру выдалі сухі паёк, пэўную грашовую суму і дазволілі ненадоўга з'ездзіць дадому. Грамадзянская вайна рабіла гэтае падарожжа складаным і небяспечным: чыгунка была паралізавана, на дарогах гаспадарылі марадзёры і рабаўнікі. За некалькі месяцаў шляху Аляксандр сутыкаўся з бандамі, хварэў на тыф. Летам 1919 г. ён нарэшце дабраўся да роднага дома. Бацькі да гэтага часу ўжо не стала. Сям'я, якая раней не ведала матэрыяльных цяжкасцей, цяпер ледзьве выжывала. Антаніна вучылася ў Аршанскай жаночай гімназіі, Альфонс у 1917 г. быў прыняты ў Полацкую гімназію Ваеннага ведамства стыпендыятам дваранства Магілёўскай губерні, але і яму неабходна была дапамога. Дома заставаліся хворая Аліна і Паліна, якая вучылася ў прыходскім вучылішчы. Дзяўчаты дапамагалі маці даглядаць малодшага Віктара.

Пра вяртанне Аляксандра ў кадэцкі корпус не было чаго і думаць. Тым больш што 25 студзеня 1920 г. яго рота разам з кадэтамі Кіеўскага і Адэскага карпусоў была эвакуіравана ў Грэцыю, а потым у Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў, дзе ўлілася ў склад зводнага кадэцкага корпуса, які быў створаны 10 сакавіка 1920 г. у горадзе Сіска. Абставіны вымусілі Аляксандра застацца з сям'ёй. Гэта наклала адбітак на ўсё яго астатняе жыццё: адчуванне нявыкананага доўгу, пачуццё віны перад таварышамі… Да канца сваіх дзён Аляксандр Міхайлавіч захоўваў маўчанне. Ніколі не расказваў пра вучобу ў кадэцкім корпусе, не спрачаўся, калі замянілі літару "ц" на "т" пры напісанні дваранскага прозвішча, гаварыў, што вучыўся ў гімназіі, а паходзіў з мяшчан. Толькі пасля яго смерці маці расказала дзецям і пра кадэцкі корпус, і як бацька прыйшоў пешшу з Адэсы дадому ў час грамадзянскай вайны.

…Старэйшы з дзяцей, Аляксандр узяў на сябе клопат пра забеспячэнне сям'і. Вось тут і спатрэбіліся веды, атрыманыя ў кадэцкім корпусе.

Падчас НЭПу яго прынялі на працу ў рэстаран у Горках. Заробкі дазволілі аплачваць вучобу малодшых, больш-менш нармальна жыць сям'і. Здавалася, жыццё паступова наладжвалася. Аднак праз пэўны час дзяржава адмовілася ад так званай новай эканамічнай палітыкі, для большасці людзей наступіў час экспрапрыяцыі. Паўсюль перасследаваліся "кулакі" і "міраеды", пацягнуліся першыя эшалоны рэпрэсаваных у Сібір, на Поўнач і на Усход. Трапіў у гэтае пекла і Аляксандр. Як узгадваў яго малодшы брат Альфонс Міхайлавіч, гаспадар рэстарана, дзе працаваў Аляксандр Арцішэўскі, ажаніў яго са сваёй дачкой, якая была значна старэйшая за Аляксандра. Дзяцей у іх не было, ды і асабістыя адносіны не складваліся. Каб запалохаць зяця, гаспадар арганізаваў растрату, абвінаваціўшы ва ўсім маладога дырэктара. Аляксандра пасадзілі ў турму. Яго выратавалі акуратнасць у вядзенні спраў, дакладныя запісы. Наяўнасць шматлікіх даведак дапамагла даказаць яго невінаватасць і пазбегнуць турмы. Вызваліўшыся з-пад следства, ён па рэкамендацыі старых знаёмых бацькі ўладкаваўся справаводам у Горацкі сельскагаспадарчы інстытут. Праз пэўны час адказнага і добрасумленнага супрацоўніка прызначылі загадчыкам канцылярыі інстытута.

Праца падабалася Аляксандру. Нягледзячы на цяжкасці, жыццё працягвалася. У гарадскім садзе гучаў духавы аркестр, па вечарах збіралася на танцы моладзь. Сур'ёзны, памужнелы хлопец, які да таго ж добра танцаваў, пазнаёміўся з мясцовай прыгажуняй, Марыяй Андрэеўнай Забэла. Праз тыдзень ён ужо прывёў у бацькоўскі дом маладую гаспадыню. Так у ліпені 1928 г. утварылася новая сям'я, якая аб'яднала два старажытныя дваранскія роды. Марыя пачала наводзіць парадак у доме, завяла невялікую гаспадарку. Усе дамашнія, акрамя малодшай Паліны, адразу прынялі нявестку.

У 1930 г. у Аляксандра і Марыі Арцішэўскіх нарадзілася дачка Алінара. Малодшыя браты і сястра раз'ехаліся на вучобу. Здавалася, усё было добра. Аднак пасада, якую займаў Аляксандр Міхайлавіч, выклікала цікавасць у органаў НКУС. Праз канцылярыю праходзілі ўсе асабовыя справы супрацоўнікаў і студэнтаў. Па начах, з інтэрвалам у трое сутак, яго сталі выклікаць у аддзел, патрабуючы справаздачы пра іх жыццё. Разумеючы, што нічым добрым гэта не скончыцца, Аляксандр Міхайлавіч пачаў задумвацца пра змену месца жыхарства і працы. Да таго ж у пачатку 1933 г. памерла ад рожыстага запалення дачка Алінара, а 30 сакавіка ў сям'і нарадзіўся хлопчык, якога назвалі ў гонар філосафа Аўгуста Бебеля, а таксама сябра бацькі Аўгуста Іванавіча Берзіна.

У 1935 г. сям'я пры дапамозе старога знаёмага Бушунова, які працаваў галоўным аграномам у саўгасе "Індустрыя", пераехала ў вёску Блонь Пухавіцкага раёна. Сям'я маці ўжо не мела патрэбы ў дапамозе. Аляксандр Міхайлавіч працаваў рахункаводам, а пасля заканчэння бухгалтарскіх курсаў у Харкаве – намеснікам галоўнага бухгалтара саўгаса. У 1937 г. у сям'і нарадзіўся другі сын Валерый, а ў 1939-м – дачка Людміла. У тым жа годзе бацьку прызвалі ў Чырвоную Армію. Ён удзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі. Пасля дэмабілізацыі ў 1940 г. быў зноў прызваны ў войска і накіраваны на Карэла-Фінскі фронт. Праўда, у баях часць Аляксандра Міхайлавіча не ўдзельнічала і ў хуткім часе была дэмабілізавана.

Вялікую Айчынную вайну сям'я Арцішэўскіх правяла ў Блоні. Двойчы за час акупацыі Аляксандр Міхайлавіч выратоўваўся ад смерці. У першы раз ён адмовіўся зняць з забітага чырвонаармейца боты і пераабуцца па загадзе нямецкага камандзіра. Выручыў аднавясковец, які замест яго выканаў гэтую каманду. У наступны раз адмовіўся ад прапановы ўпраўляючага маёнтка Вайса ўзначаліць бухгалтэрыю, за што яго загадалі адправіць у канцлагер у Азарычах. Аднак памочнік упраўляючага, які да вайны працаваў з Арцішэўскім у мабілізацыйнай камандзе, угаварыў Вайса адмяніць загад і паслаць Аляксандра работнікам на жывёльны двор.

Пасля вызвалення ў 1944 г. Савецкай Арміяй і праверкі адпаведнымі органамі Аляксандр Міхайлавіч трапіў на фронт. Дзень Перамогі ён сустрэў у Кёнігсбергу. Як чалавек, які валодае нямецкай мовай, быў накіраваны ў каманду, што займалася зборам ва Усходняй Прусіі і адпраўкай у Савецкі Саюз буйной рагатай жывёлы. Дэмабілізаваўся і вярнуўся ў верасні 1945 г. у Блонь, адкуль быў накіраваны на працу ў саўгас "Малое Мажэйкава" Гродзенскай вобласці. Тут у сям'і 29 жніўня 1946 г. нарадзіўся сын Генадзь.

З канца 1960-х гг. Аляксандр Міхайлавіч з жонкай жылі ў Мінску ў дзяцей, усе яны атрымалі вышэйшую адукацыю. Старэйшы сын, Аляксандр, стаў доктарам медыцынскіх навук, прафесарам. Валерый – кандыдат тэхнічных навук, доктар сацыялогіі, прафесар энергетыкі. Дачка Людміла – дацэнт, кандыдат медыцынскіх навук. Малодшы Генадзь – вядучы інжынер-электрык.

У 1983 г. Аляксандра Арцішэўскага не стала. За баявыя заслугі ён быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны, медалямі "За Адвагу", "За ўзяцце Кёнігсберга", "За Перамогу над Германіяй", юбілейнымі медалямі.

Пераклад з рускай мовы.

Аўтар ахвяруе ганарар на развіццё часопіса.

Водсветы

ПЯТРО ФРАНКО – ВЯРТАННЕ З ЗАБЫЦЦЯ

Беларуска-ўкраінскія літаратурныя сувязі абумоўлены тысячагадовай гісторыяй суседскага і супольнага жыцця двух народаў. Сацыяльна-гістарычны кантэкст выклікаў падабенства многіх мастацкіх з'яў у беларускай і ўкраінскай літаратурах [1, с. 69]. Нямала агульнага можна знайсці ў жыцці і творчасці пісьменнікаў братніх краін.

Літаратурныя творы Пятра Франко (28 чэрвеня 1890 – 1941) невядомыя беларускаму чытачу, хіба асобным літаратуразнаўцам. Ягоныя творы не перакладаліся на беларускую мову, у адрозненне ад твораў яго славутага бацькі – Івана Франко (1856 – 1916). Імя П. Франко ў шэрагу іншых імёнаў выдатных нацыянальных дзеячаў вярнулася з забыцця ў часы незалежнасці Украіны. Дачка Тараса, старэйшага брата Пятра, вядомая ўкраінская мовазнаўца і грамадская дзяячка Зяновія Франко (1925, Львоў – 1991, Кіеў) трапна заўважыла: «Пятро Франко, асоба далёка не аднамерная, сёння паступова выходзіць з таго, ніяк не людскога забыцця, бо ў памяці львавянаў ён быў не проста сынам вялікага пісьменніка, але і гістарычнай асобаю, з імем якой увязваліся перыпетыі падзей 20-х і 30-х гадоў, потым уз'яднанне 1939 г. і, нарэшце, таемная расправа, з таго забыцця вымушанага, на дзіва алагічнага пры афіцыйнай версіі яго пагібелі пад бамбёжкай. Ды і насамрэч досыць парадаксальна: чалавек загінуў ад фашысцкай бомбы, а яго імя нельга было згадваць нават у музеі яго бацькі, першым дырэктарам якога ён быў» [2, с. 55].

Пятро Франко – трэці, малодшы сын вялікага Каменяра і адзіны з яго дзяцей*, хто нарадзіўся там, дзе іх бацька, – у вёсцы Нагуевічы Драгобыцкага павета на Львоўшчыне. У 1910 г. у Львове скончыў украінскую Акадэмічную гімназію** і паспяхова здаў іспыт па фізічным выхаванні ў Львоўскім універсітэце, што давала права працаваць настаўнікам фізічнай культуры ў сярэдніх школах. У 1911 – 1914 гг. настаўнічаў у філіяле ўкраінскай Акадэмічнай гімназіі ў Львове і адначасова вучыўся на факультэце тэхнічнай хіміі Львоўскай палітэхнікі, закончыць які перашкодзіла вайна. У дыпломе, атрыманым толькі 7 лістапада 1923 г., адзначалася, што «п. Петро Франко закінчив належне академічне навчання на Відділі Технічної Хімії, виконав дипломну роботу на тему "Опис природи і кількість складу даної речовини" та склав кінцевий усний дипломний екзамен із загальним добрим результатом, і на омнові цього Рада Відділу Технічної Хімії надає йому ступінь інженера-хіміка» [3].

Актыўны прапагандыст фізічнага выхавання моладзі, Пятро Франко заслужана лічыцца адным з заснавальнікаў украінскага скаўцкага руху, пачатак якому паклалі пластунскія (*пластові*) гурткі. Восенню 1911 г., выкладаючы ў філіяле ўкраінскай Акадэмічнай гімназіі *цялавыхаванне* (фізкультуру), П. Франко арганізаваў там тайны ваенна-спартыўны гурток "Пласт"*** з мэтай ваеннай вывучкі моладзі. Назва гуртка абраная невыпадкова: такім чынам падкрэсліваўся ў першую чаргу нацыянальны, украінскі характар маладзёжна-спартыўнага таварыства. У старыя часы ў казацкім войску *пластунамі* звалiся казакі-разведчыкі. Як адзначае ўкраінскі гісторык Тарас Каляндрук, аўтар кнігі "Таємниці бойових мистецтв України", спосаб незаўважнага падпаўзання да цэлі ў шматлікіх арміях і сёння называецца *па-пластунску*, а самі пластуны ў казацкім войску называлі сваю тактыку "Вовча паща і лисячий хвіст" [4].

Таксама П. Франко займаўся рэдагаваннем часопіса "Пластовий табір" і напісаў папулярны падручнік "Пластові ігри та забави", выдадзены ў 1913 г. Варта адзначыць, што, па некаторых звестках, П. Франко колькі часу быў яшчэ гульцом папулярнага львоўскага футбольнага клуба "Україна", які з 1928 г. уваходзіў у Польскі футбольны саюз, гуляў у "окружної ліги Львів" і тройчы (1937, 1938 і 1939 гг.) здабываў там віцэчэмпіёнства.

Як і большасць "пластуноў", у Першую сусветную вайну П. Франко добраахвотна запісаў-

---

* Дзеці Івана Франко: Андрэй (16.07.1887, Львоў – 22.04.1913, Львоў), Тарас (09.03.1889, Львоў – 13.11.1971, Кіеў), Ганна (03.09.1892, Львоў – 24.04.1988, Таронта, Канада).

** Гімназія створана ў 1784 г. як складовая частка Львоўскага ўніверсітэта, адсюль і назва "акадэмічная". З 1874 г. усе прадметы выкладаліся на ўкраінскай мове. Сёння гэта Львоўская акадэмічная гімназія пры нацыянальным універсітэце Львоўская палітэхніка, найстарэйшай вышэйшай тэхнічнай навучальнай установе ва Украіне, заснаванай у 1844 г.

*** У 1911 г. ва Украіне падобныя гурткі незалежна адзін ад аднаго арганізавалі вядомыя грамадскія дзеячы Галіччыны: Пятро Франко, Іван Чмала (*Чмола*) (1892 – 1939) і Аляксандр Тысоўскі (*Тисовський*) (1886 – 1968). А. Тысоўскі заснаваў гурток пры Акадэмічнай гімназіі ў Львове, дзе выкладаў прыродазнаўства. Ён жа пераклаў на ўкраінскую мову кнігу "Скаўтынг для хлопцаў" заснавальніка скаўцкага руху англічаніна Роберта Бадэн-Паўэла (1857 – 1941). 12 красавіка 1912 г. праведзена першая прысяга сяброў гуртка "Пласт". Сёння "Пласт" – скаўцкая арганізацыя Украіны, датай заснавання лічыцца восень 1911 г.

ся ў шэрагі легіёна Украінскіх сечавых стральцоў* (УСС) і атрымаў вайсковае званне *четар* (падпаручнік). Удзельнічаў у шматлікіх баявых дзеяннях, асаблівую храбрасць выявіў пад Семікоўцамі на Цярнопальшчыне ў лістападзе 1915 г., дзе дзякуючы адвазе двух куранёў (*курэнь*, укр. *курінь*, адпавядаў батальёну) УСС і, зазначым, коштам іх вялікіх страт удалося затрымаць прасоўванне расійскіх войскаў на поўдзень. Гэты ваенны досвед пазней дапамог П. Франко ўвасобіць мастацкія вобразы ў прыгодніцкай аповесці "Від Стрипи до Дамаску. Пригоді четаря УСС". У прадмове да выдання гэтага твора ў 1937 г. "Сплелась із видумкою правда" адзначалася: «Ужо сам загаловак аповесці "Від Стрипи до Дамаску" нагадвае не адно якоесь падарожжа, а між тым аповесць Пятра Франко – гэта тыповая аповесць ваеннага неймавернага жыцця, багатага на розныя прыгоды, часам дужа незвычайнага, таму што ў ім заўжды рэчаіснасць цесна сплецена з выдумкай» [5, с. 575].

Пятро Франко з жонкай Вольгай і дачкой Верай. Львоў. 1924 г.

У 1916 г. камандаванне накіравала П. Франко ў лётную школу паблізу Сараева. Але пасля яе заканчэння ён не працягнуў службу ў лётнай часці, што па тым часе лічылася элітным падраздзяленнем – тады там пераважна служылі аўстрыйцы і немцы, а зноў трапіў у легіён УСС. У маі 1916 г. прыехаў на двухтыднёвы адпачынак у Львоў і апошні раз убачыўся з хворым бацькам. Бацька знаходзіўся ў вельмі цяжкім стане. Пра тое, што здарылася далей, П. Франко распавёў у мемуарнай аповесці "Іван Франко з близька (пять портретів)": *«Я пайшоў да каменданта станцыі УСС др. Валошына з просьбаю аб прадаўжэнні адпачынку. Але др. Валошын адмовіў: "Едзьце на фронт, пане таварышу, як бацька памрэ, то вам паведамім". Праз некалькі дзён на Стрыпе я атрымаў паведамленне. Атаман Варывода паказаў мне дэпешу, і я паехаў на пахаванне»* [5, с. 574].

"Ці можна дараваць сотніку Міхаілу Валошыну, – піша ў прадмове да першага тома Збору твораў П. Франко, упершыню выдадзенага ў 2010 г., яго ўкладальнік, старшыня львоўскага абласнога Таварыства палітычных вязняў і рэпрэсаваных П. М. Франко, – які сам амаль усю вайну (ад 1915 да 1918 г.) хаваўся ад фронту на тылавой пасадзе каменданта станцыі УСС у Львове, той ягоны ўчынак? Тым больш што на фронце тады было зацішша. …Праз некалькі дзён пасля таго, як М. Валошын адправіў Пятра Франко на фронт, яго бацька памёр у адзіноце. Было тое 28 мая 1916 года" [5, с. 9].

Пасля 1917 г. на палітычнай мапе Еўропы адбыліся кардынальныя змены. Яны прадвызначалі далейшыя драматычныя падзеі на тэрыторыі Украіны ў першай палове XX ст. Запаветная мара ўкраінцаў пра дзяржаўную самастойнасць рэалізавалася толькі на надта кароткі гістарычны перыяд, у 1918 – 1920 гг., калі на этнічнай украінскай тэрыторыі ўтварыліся Украінская Народная Рэспубліка (УНР) і Заходнеўкраінская Народная Рэспубліка (ЗУНР). У 1919 г. яны аб'ядналіся ў адзіную дзяржаву – Саборную Украіну. Вынікам далейшага развіцця палітычных падзей стала падпісанне ў 1921 г. Рыжскай мірнай дамовы, паводле якой усе этнічныя ўкраінскія землі, як, дарэчы, і беларускія, апынуліся падзеленымі паміж Савецкай Расіяй і яе сатэлітнымі рэспублікамі, з аднаго боку, і Польшчай – з другога.

У часы існавання УНР і ЗУНР П. Франко вызначыўся як першы арганізатар ваеннай авіяцыі Украінскай галіцкай арміі (так называлася рэгулярная армія ЗУНР). Згодна з загадам ад 1 снежня 1918 г., падпісаным намеснікам дзяржаўнага сакратара ваенных спраў ЗУНР, паручнік П. Франко быў прызначаны "камендантом Летунського Відділу і референтом Летунства при Державнім Секретаріаті Військових Справ" [5, с. 9].

Пятро Франко не ператварыўся ў "наземнага" лётчыка. Ён не толькі займаўся вялікай арганізатарскай працай па стварэнні авіяцыі ўзброеных сіл маладой украінскай рэспублікі, але і сам здзейсніў каля пяцідзесяці баявых вылетаў за лінію ўкраінска-польскага фронту [5, с. 10].

* Украінскія сечавыя стральцы (*Українські Січові Стрільці*) – украінскае нацыянальнае ваеннае фарміраванне ў складзе аўстра-венгерскай арміі. Створана ў 1914 г. па закліку Галоўнай Украінскай Рады – міжпартыйнай арганізацыі, якая аб'яднала ў сваіх шэрагах прадстаўнікоў украінскіх парламенцкіх партый Галіччыны, яе галоўнай палітычнай мэтай была дзяржаўная самастойнасць Украіны. Ва ўмовах Першай сусветнай вайны абараняла інтарэсы ўкраінцаў у Аўстра-Венгерскай імперыі, падтрымлівала палітыку гэтай дзяржавы.

У адзін з такіх вылетаў, які выконваўся ўзімку 1919 г. П. Франко сумесна з другім пілотам, іх самалёт быў збіты палякамі недалёка ад Уладзіміра-Валынскага і ўпаў у глыбокі снег, дзякуючы чаму адбылося шчаслівае выратаванне авіятараў. Яно, праўда, скончылася лагерам для ваеннапалонных у Кракаве, з якога П. Франко ўдалося ўцячы, пераапрануўшыся ў мундзір польскага жаўнера, які ён выменяў на залаты пярсцёнак, і праз Прагу, Вену, Будапешт і Карпаты вярнуцца на Бацькаўшчыну.

1919 год адзначаны ў жыцці П. Франко яшчэ адной падзеяй – шлюбам з каханай – Вольгай Білевіч, дачкой святара (1896, с. Выраў, укр. *Вирів*, Львоўшчына – 1987, Львоў).

Пасля акупацыі тэрыторыі Заходняй Украіны польскімі войскамі П. Франко з жонкай жыў у Вене, дзе арганізаваў выдавецкую фірму "Франко-син і спілка" і выдаў такія кніжкі, як "Огляд території України", "Теорія зглядности після А. Айнштейна", "Як закладати пластові дружини", "Відмолодження", "Що кождий повинен знати про знімок", а таксама твор свайго бацькі "Лис Микита" [5, с. 11].

Потым маладыя вярнуліся ў Галіччыну. На радзіме П. Франко настаўнічаў у Каламыйскай гімназіі і выкладаў хімію ў тайным украінскім універсітэце ў Львове. З Каламыяй (сёння раённы цэнтр у Івана-Франкоўскай вобласці), якая за польскім часам уяўляла з сябе буйны ўкраінскі культурны асяродак на Галіччыне, звязаны пэўны перыяд творчага і педагагічнага жыцця П. Франко.

«Тут, у Каламыі, 11 верасня 1922 г., – піша ўкладальнік збору яго твораў П. М. Франко, – Пятро Франко пачаў сваю працу як настаўнік-кантрактнік ва ўкраінскай кантрактнай гімназіі. …З "асабовай карткі настаўніка" Пятра Франко я даведаўся, што ў яго як настаўніка-кантрактніка асноўным прадметам лічылася выкладанне "руханкі" (гімнастыкі), а другасным – геаграфіі і англійскай мовы. Але практычна яму даводзілася выкладаць і іншыя прадметы, пра што ён дакладна паведамляе ў сваім "Перерізі життя".

Так, у 1925/26 і 1926/27 навучальных гадах ён выкладаў фізіку, хімію і прыроду. А яшчэ ў 1924/25, а потым у 1927/28 навучальных гадах – матэматыку. Відавочна, заробкі, якія ён меў у гімназіі, не маглі задавальняць патрэбы яго сям'і, таму ён яшчэ працаваў па сумяшчальніцтве ў Каламыйскай жаночай гімназіі "Рідної школи". …У 1923 – 1925 гг. Пятро Франко, як вучоны-патрыёт Украіны, знаходзіў мажлівасць перыядычна ездзіць з Каламыі ў Львоў і выкладаць хімію ва Украінскім (тайным) універсітэце. Універсітэт быў створаны ў кастрычніку 1921 г. украінскай навуковай грамадой і студэнцкай моладдзю без дазволу і супраць волі польскай акупацыйнай улады. Гэтая навучальная ўстанова, арганізаваная на ўзор найлепшых універсітэтаў Заходняй Еўропы, у сваім складзе мела тры факультэты: філасофскі, юрыдычны і медыцынскі» [5, с. 12, 13].

У Каламыі П. Франко напісаў першыя п'есы, камедыі "Заздрісні" і "Марко Спотикайло", там выйшаў яго першы зборнік апавяданняў "Дядько шкіпер".

Творы зборніка "Дядько шкіпер" прысвечаны марской тэматыцы, насычаны адпаведнай спецыфічнай лексікай і ў жанрава-тэматычным плане не з'яўляюцца тыповымі для заходнеўкраінскай літаратуры.

Восенню 1930 г. ва Усходняй Галіччыне польскімі ўладамі была здзейснена так званая акцыя пацыфікацыі (Pacyfikacja Małopolski Wschodniej), скіраваная на задушэнне супраціву акупацыйным уладам украінскага нацыянальнага руху. Яна суправаджалася масавымі арыштамі і зняволеннямі ўкраінскіх патрыётаў, экзекуцыямі сялян і руйнаваннем іх гаспадарак, закрыццём украінскіх устаноў. У гэтым кантэксце варта ўзгадаць і палітыку асіміляцыі на заходнебеларускіх землях, і сумнавядомую Бярозу-Картузскую.

Пацыфікацыя не абмінула і сям'і П. Франко. Яго родная сястра Ганна Франко-Ключко ўзгадвала: «У адну ноч паліцыя акружыла хату, у якой жыў П. Франко з сям'ёй, уварвалася ўсярэдзіну і цэлы дзень і цэлую ноч абшуквала памяшканне. Усё перавярнулі і ператрэслі, але ніхто з паліцаяў не здагадаўся зазірнуць у стары куфар, што стаяў на ганку і быў бітма набіты падпольнай літаратурай, "Сурмой" і інш. У гэтым куфры мама калісьці прывезла з Кіева свой пасаг, і, можа, сэрца мамы абараняла сваё самае любімае дзіця» [5, с. 14].

Пятру Франко ўдалося пазбегнуць арышту, але ён страціў пасаду настаўніка гімназіі. У далейшым зазнаў цяжкасці з працаўладкаваннем па спецыяльнасці. Відавочна, польская дзяржава не мела патрэбы ў паслугах украінскай інтэлігенцыі.

Гэтыя акалічнасці змусілі да пошуку новых месцаў. П. Франко зацікавіўся перспектывай працы ў Савецкай Украіне. Ён уладкаваўся ў групу польскіх інжынераў, якая накіроўвалася ў СССР з мэтай дапамогі кваліфікаванымі кадрамі. Яму паспрыяў колішні яго выкладчык з Львоўскай палітэхнікі, прафесар, а ў той час прэзідэнт Польшчы Ігнацій Масціцкі (Ignacy Mościcki), які, дарэчы, паходзіў з сям'і паўстанца 1863 г.

Такім чынам П. Франко з сям'ёй трапіў у Харкаў. «Чаму выбраў Харкаў, сталіцу Украіны, – пі-

Мемарыяльная шыльда ў гонар Пятра Франко на Львоўскай камерцыйнай акадэміі.
Фота Ю. Кур'яновіча, студзень 2010 г.

сала З. Франко, – а не Кіеў, дзе жылі родзічы па маці, прызнаўся неяк сам: "Гэта ж Тарас [родны брат] так расхваліў мне Харкаў (а ў ім ён пасля 1918 г. працаваў чатыры гады), што мяне цягнула туды з неймавернай сілаю"» [2, с. 57].

У Харкаве П. Франко працаваў у Навукова-даследчым інстытуце прыкладной хіміі, выкладаў курс хіміі ў Політэхнічным інстытуце, займаўся літаратурнай працай і пераробляў для пастаноўкі на сцэне некаторыя творы бацькі. Сярод яго навуковых прац і падручнікаў гэтага перыяду – "Одержання сульфатної кислоти та цементу з гіпсу в одній фазі", "Одержання казеїну з молока прі помочі електрики", "Дослідження газової фази термічного розкладу гіпсу", "Підручник неорганічної хімії", "Енциклопедичний словник хімічної термінології", "Технологія казеїну", нямецка-ўкраінскі, англійска-ўкраінскі, украінска-нямецкі слоўнікі, у дадатак 36 запатэнтаваных вынаходніцтваў у галіне хіміі, большасцю звязаных з перапрацоўкай малака пры дапамозе электрычнасці.

Іншы бок прыдбанага ім у першай "краіне рабочых і сялян" звязаны з досведам тагачаснага жыцця таталітарнай савецкай дзяржавы. Што такое галадамор, рэпрэсіі і НКВД, ён убачыў на ўласныя вочы.

«У Харкаве яму давялося бачыць голад 1932 – 1933 гг., – сведчыла З. Франко, – бачыць вымараных голадам нябожчыкаў, якіх ранкам з дапамогай металічных крукоў падбіралі і скідалі ў грузавыя машыны, і апухлых дзяцей, якім употай раздаваў атрыманы па спецкартках хлеб. Ён асабіста ўратаваў ад галоднай смерці сваю калегу інжынера, уладкаваўшы яе да сябе кухаркаю, уратаваў сям'ю Ларысы Гінзбург і інш.

…Распавядаючы за сямейным сталом пра ўсё тое ўбачанае і перажытае ў Харкаве, у тым ліку і пра тыя строгія рамкі, у якіх ён знаходзіўся, пра пастаянныя праверкі, якія здзяйсняліся ў дачыненні да іншаземцаў, на заканчэнне ён кідаў апошнюю рэпліку: "Лепш было б усяго таго не бачыць".

Увогуле пра перажытае за пяць гадоў знаходжання ў Харкаве Пятро Іванавіч распавядаў толькі нам, і тое – пры нагодзе, наплывамі. Не памятаю, каб ён пра гэта гаварыў пры гасцях і тым больш прылюдна, ці на рабоце ў школе. …Але справа была не ў ягоным характары. Прычына, якая стала мне вядома толькі пазней, была тая, што, калі ад'язджаў з Харкава, яго абавязалі маўчаць і нават папярэдзілі, што, калі парушыць умову, караючая рука дасягне яго і за кардонам» [2, с. 58, 59].

У 1936 г. П. Франко прымушалі прыняць савецкае грамадзянства, але, ужо добра разумеючы, чым яно пагражае яго сям'і, ён адмовіўся, аргументуючы тым, што ў Львове мае смяротна хворую маці. Вынікам адмовы стала распараджэнне ўлад за 24 гадзіны пакінуць межы СССР.

Вярнуўшыся на Галіччыну, П. Франко працаваў настаўнікам у школах Львова і Яварава (сёння раённы цэнтр у Львоўскай вобласці), абіраўся членам Навуковага таварыства імя Т. Шаўчэнкі, займаўся творчай працай. Дапісаў няскончаную аповесць бацькі "Борислав сміється", пераклаў на польскую мову яго паэмы "Мойсей" і "Іван Вишеньский". У 1937 г. выйшаў з друку згаданы вышэй біяграфічны нарыс П. Франко "Іван Франко з близька" – каштоўны мастацка-дакументальны партрэт сямейнага жыцця І. Франко. Дарэчы, у ім падаецца згадка, што І. Франко сярод шмат якіх моў валодаў і беларускай, а таксама што беларусы былі сярод шматлікіх гасцей вялікага Каменяра ў яго ўласным доме на вул. Панінскага ў Львове.

«…Яму, як сыну вялікага бацькі, – пісала З. Франко, – ужо наперад было адведзена месца мемуарыста і загадзя запраграмавана ягонае ўспрыманне эстэтычных традыцый бацькі, а не самабытная асобнасць у пісьменстве. …Між тым яго літаратурная франкіяна не была вызначальнаю ў яго творчай спадчыне, а з'яўлялася хутчэй данінай вялікаму бацьку і была прадыктавана сыноўскім абавязкам. Спадчыну бацькі ён ніколі не разглядаў як капітал, на працэнты з якога мерыўся жыць, не збіраўся стрыгчы з яе купоны і акцыі. Гэтую недатычнасць да "працэнтаў" ён рабіў сваім жыццёвым прынцыпам і намагаўся, дзе можна, яго дэманстраваць і пра гэта гаварыць» [2, с. 64].

Што тычыцца маральных якасцей асобы П. Франко, то варта адзначыць, што, нягледзячы на страх, ён не змог прамаўчаць пра галадамор

у Наддняпроўскай Украіне і распавёў пра тыя жахлівыя падзеі ў двух артыкулах у галіцкай прэсе.

Немажлівасць далейшай творчай рэалізацыі і плённай працы ва ўмовах палітыкі польскай улады прымусіла П. Франко ў 1939 г. зноў звярнуцца да прэзідэнта І. Масціцкага па дапамогу. У гэты раз ён атрымаў працу па кантракце ажно ў Японіі. Была ўжо запланавана дата ад'езду – 20 – 25 верасня 1939 г., але 1 верасня пачалася Другая сусветная вайна і паездка стала немагчымай.

Вайна па-новаму перакройвала мапу Еўропы. Паводле сакрэтнага дадатковага пратакола да пакта Молатава – Рыбентропа, заходнебеларускія і заходнеўкраінскія землі трапілі пад кантроль Савецкага Саюза. Пасля вядомага так званага вызваленчага паходу Чырвонай Арміі тэрыторыя Галіччыны ўвайшла ў склад Украінскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Як змянілася жыццё П. Франко ў гэты драматычны час? Звернемся да сведчанняў З. Франко: «Ён ведаў, што яго будзе чакаць "немінучая расплата" (о, савецкую рэчаіснасць перыяду "росквіту" сталіншчыны ён добра ведаў). Аднойчы ўвечары ён прыйшоў да брата і паведаміў, што "сядзіць на клунках" і жадае выехаць у Вену. Нават дамовіўся з чыгуначнікам аб нелегальным пераездзе праз не ўсталяваны яшчэ на рэчцы Сян кардон паміж Савецкім Саюзам і Нямеччынай. Матыў выезду брату быў вядомы, таму не стаў пераконваць яго, каб змяніў рашэнне. Толькі сказаў: "Табе лепей відаць". І браты на развітанне моцна расцалаваліся. Літаральна праз дзень ці два Пятро Іванавіч, які, як мы думалі, ужо дзесьці ў дарозе да Вены, з'яўляецца ў нас дома і, зззяючы, распавядае пра тое, як яго выклікалі ў абкам партыі, які якраз прыехаў у Львоў, і пра тое, якую з ім мелі размову. "Нам, Пётр Іванавіч, сказалі яму, добра вядомы вашы артыкулы (з гэтага павялі размову), але мы не маем да вас ніякіх прэтэнзій, бо разумеем, што іх напісаць прымусілі вас абставіны жыцця, бо жылі вы ўсё-такі пры панскай Польшчы. Цяпер вы нам патрэбны. Мы хочам, каб вы сталі дэпутатам Вярхоўнага Савета УССР і як дэпутат дапамаглі нам усталяваць савецкую ўладу на заходніх землях Украіны". Абодва браты вельмі гэтаму ўзрадаваліся, бо Пятру так не хацелася ўцякаць з Украіны, але разам з тым разумелі, што гэтая радасць можа стацца дарэмнаю» [2, с. 59, 60].

Пятра Франко савецкая ўлада напоўніцу выкарыстоўвала ў прапагандысцкіх мэтах на мерапрыемствах, прысвечаных "уз'яднанню". Яго "абіралі" дэпутатам Народнага сходу Заходняй Украіны, дзе прымалі дэкларацыю пра ўстанаўленне савецкай улады на заходнеўкраінскіх землях, а таксама дэпутатам Вярхоўнага Савета УССР, на пазачарговай сесіі якой даручылі абвясціць заяву Паўнамоцнай камісіі вышэйзгаданага сходу аб прыняцці Заходняй Украіны ў склад Украінскай ССР з «усім рытуальным славаслоўем на адрас "бацькі ўсіх народаў" і існых тады "правадыроў" украінскага народа, якіх трэба было пералічыць паводле ўсталяванай для іх іерархіі» [2, с. 60].

У савецкі час П. Франко працаваў у Львове дэканам таваразнаўчага факультэта Інстытута савецкага гандлю (сёння Львоўская камерцыйная акадэмія) і дырэктарам літаратурна-мемарыяльнага музея Івана Франко.

Зяновія Франко адзначала, што як дэпутат "ён выявіўся далёка не пасіўным выканаўцам волі прадстаўнікоў улады, бо быў чалавекам з уласнай думкаю і даволі незалежнымі ўчынкамі" [2, с. 61]: выкарыстоўваючы дэпутацкія паўнамоцтвы, нярэдка заступаўся за людзей і выратоўваў іх з-пад арышту НКВД. На такія яго заступніцтвы ў партыйных органах глядзелі коса, але "часцяком, пэўна, для таго, каб у людзей заставаліся нейкія ілюзіі наконт сілы дэпутата, прадстаўнікі ўлады вымушаны былі задавальняць яго хадайніцтвы" [2, с. 62]. У НКВД рэагавалі раздражнёна, але канчаткова вырашыць лёс вядомага навукоўца, прафесара, грамадскага дзеяча і пісьменніка П. Франко змаглі ў спрыяльных для гэтага ваенных абставінах 1941 г.

28 чэрвеня 1941 г. у дом П. Франко прыйшлі супрацоўнікі НКВД і загадалі тэрмінова збіраць рэчы для эвакуацыі. «Пятро Іванавіч папрасіў дазволу выкупацца ў ванне перад ад'ездам і пайсці развітацца са смяротна хворай маці* (яна памерла праз дзевятнаццаць дзён). На развітанне маці мовіла: «"Тікай, синку, тебе знищать; я добре знаю, хто такий Сталін". – "Пізно, мамо", – адказаў ён. Гэта былі апошнія [вядомыя нам] словы Пятра Франко» [2, с. 62].

Тое, што адбылося потым, застаецца дасюль невядомым. Паводле адной версіі, П. Франко быў застрэлены на станцыі Прашава (*Прошова́)* блізу Цярнопаля.

Сённяшні дырэктар Львоўскага літаратурна-мемарыяльнага музея Івана Франко Раман Горак у 1992 г. пісаў: «І ўсё-такі Пятро Франко як "актывіст савецкай улады" быў вывезены ў падполле. Бальшавіцкая прапаганда палічыла, што яшчэ не поўнасцю выкарыстала яго і пакінула жывым на будучыню. Забіваць яго, такім чынам,

* Франко Вольга (Харужынская; 1864 – 1941).

не было сэнсу. Можа, пазней, а не цяпер. Пасля прыезду ў Кіеў ён павінен быў звярнуцца па радыё да сваіх землякоў, каб тыя землякі грамілі ненавісных нямецкіх акупантаў… Зяновія Тарасаўна Франко, пляменніца Пятра Франко, пасля доўгіх пошукаў выявіла, што цягнік з Львова з "актывістамі" (П. Франко, К. Студынскі*) сапраўды прыехаў у Кіеў. …Тады, што ж здарылася? І дзе?» [6].

Надзея Франко**, унучка П. Франко, зазначае: "На вялікі жаль, мая маці так і не дазналася з архіваў КДБ пра месца пагібелі свайго бацькі Пятра Франко. І гэтае пытанне застаецца адкрытым да сёння. На маю думку, гэта была мэтанакіраваная акцыя па знішчэнні прагрэсіўнай часткі галіцкай інтэлігенцыі. А ідэальнае злачынства не пакідае пасля сябе ніякіх слядоў" [7].

Са словамі Н. Франко пераклікаюцца ўспаміны Я. Беразняка, у 1939 г. загадчыка Львоўскага гарадскога аддзела народнай адукацыі, які быў асабіста знаёмы з П. Франко: "Апошні раз яго [П. Франко] бачылі ў Харкаве, а далей сляды Пятра згубіліся, пэўна, назаўсёды. Магчыма, што ён патрапіў пад бамбёжку, але ёсць і іншая версія. Каб не аддаць дэпутата Вярхоўнага Савета гітлераўцам (а Франко быў дэпутатам), нашы і вырашылі яго лёс.

Гадоў пяць таму да мяне звярнулася Вера – дачка Пятра Іванавіча. Яна хацела даведацца, мажліва, ці мне што-небудзь вядома пра яе бацьку. Я, на жаль, нічым ёй не змог дапамагчы. Яна была ў мяне дома і са слязьмі распавядала, што ёй давялося перажыць.

Калі прыйшлі немцы, Веры не было яшчэ і васямнаццаці. Яна была накіравана ў Германію, у жаночы лагер смерці Равенсбрук, дзе знаходзілася да заканчэння вайны. Вера распавядала, што, калі саюзнікі вызвалілі гэты лагер, за сваімі суайчыннікамі прыбылі прадстаўнікі тых дзяржаў, вязні якіх знаходзіліся ў гэтым лагеры. Вязняў Савецкага Саюза ніхто не забіраў. У родны Львоў Вера дабіралася сама, як магла. Але праз два тыдні яна была арыштавана органамі дзяржбяспекі. У лагерах на сваёй радзіме Вера знаходзілася да самай смерці Сталіна. Яе ўжо няма з намі, яна пайшла з жыцця пяць гадоў таму яшчэ не вельмі старой жанчынай. Фашысты і органы дзяржбяспекі СССР звялі на той свет зусім нявіннага чалавека, унучку вялікага Франко" [8].

Вольга Франко да апошніх дзён жыцця чакала мужа, захоўваючы веру, што ў любую хвіліну адчыняцца дзверы і ён з'явіцца на парозе…

Незалежная Украіна аддала даніну памяці сваім слаўным сынам і дочкам, прадстаўнікам нацыянальна-вызвольнага руху. Была ўшанавана і памяць пра выдатнага прадстаўніка галіцкай інтэлігенцыі Пятра Франко. У гонар яго на фасадзе будынка Львоўскай камерцыйнай акадэміі, дзе ён працаваў, адкрыта мемарыяльная шыльда, а кафедры хіміі і фізікі гэтай вышэйшай навучальнай установы нададзена яго імя. У 2008 г. указам прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанкі імя Пятра Франко прысвоена 7-й брыгадзе тактычнай авіяцыі паветранага камандавання "Захад" Узброеных Сіл Украіны, а Львоўская абласная дзяржаўная тэлерадыёкампанія ў серыі "Українські державники" выпусціла фільм "Петро Франко".

У 2010 г. у львоўскім Палацы мастацтваў з нагоды 120-годдзя з дня нараджэння Пятра Франко адбылася прэзентацыя першага тома яго Збору твораў, які ўбачыў свет у выдавецтве "Ліга-Прес".

Імя Пятра Франко паступова выходзіць з забыцця, але… "ніяк не людскога забыцця"…

Спіс літаратуры

1. **Шаладонава, Ж. С.** Якуб Колас і Міхайла Кацюбінскі : тыпалогія творчасці / Ж. С. Шаладонава // Нарысы беларуска-ўкраінскіх сувязей : Культур.-гіст. і літ. аспекты праб. / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – С. 64 – 137.

2. **Зеновія Франко (1925 – 1991)** : Статті. Спогади. Матеріали / упоряд. і наук. ред. М. А. Вальо; передм. О. М. Романіва; відп. ред. Л. І. Крушельницька. – Львів, 2003.

3. **Центральний державний історичний архів (ЦДІА) України,** Львів. – Фонд 640. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 82.

4. **Бойове мистецтво пластунів** : корені та походження // Воєнна історія. – [Электронный ресурс]. – 2004. – Режим доступа : http://warhistory.ukrlife.org/1_3_04_7.htm. – Дата доступа : 27.06.2012.

5. **Франко, П. І.** Доробок / П. І. Франко; передм. П. М. Франко. – Львів : Ліга-Прес, 2010. – Том І : Літературни твори.

6. **Горак, Р.** Так де ж пропали Петро Франко та Кирило Студинський? / Р. Горак // Ратуша. – 1992. – 1, 10 верес.

7. **З асабістага ліста Н. Франко Ю. Кур'яновічу.** – 2011. – 8 ліст.

8. **Личности. Петро Франко** : Евгений Березняк рассказывает // [Электронный ресурс]. – Режим доступа : vrazvedka.com/download.php?get=ber06. – Дата доступа : 27.06.2012.

Юрась КУР'ЯНОВІЧ,
даследчык гісторыі, літаратуры.

За дапамогу пры падрыхтоўцы матэрыялу аўтар выказвае шчырыя словы падзякі спадарыні Надзеі Франко, праўнучцы вялікага Каменяра, унучцы выдатнага прадстаўніка галіцкай інтэлігенцыі і адданага сына ўкраінскага народа Пятра Франко.

Аўтар ахвяруе ганарар на развіццё часопіса.

* *Кирило Студинський* – акадэмік, у чэрвені 1941 г. таксама прымусова вывезены з Львова.

** У Пятра і Вольгі Франко былі дзве дачкі – Вера (1923 – 1996) і Івана (Ася; 1925 – 1978). Вера мела дзве дачкі: Івану (1952 г. н.) і Надзею (1950 г. н.). Словы апошняй і падаюцца ў тэксце.

АД ПРЫПЯЦІ ДА НЁМАНА

ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ НАРОДНАГА МАСТАКА БЕЛАРУСІ ВІТАЛЯ ЦВІРКІ

Беларускае выяўленчае мастацтва абапіраецца на вялікія жывапісныя традыцыі канца XIX – XX ст. У пейзажным жанры беларускі жывапіс мае сваіх прызнаных геніяў: Ф. Рушчыца, С. Жукоўскага, В. Бялыніцкага-Бірулю і В. Цвірку. Менавіта Віталю Цвірку (1913 – 1993) выпала ўзначаліць рух беларускага жывапісу другой паловы XX стагоддзя да наватарскіх далячынь. Ён быў сапраўдным майстрам пейзажных кампазіцый. Месца яго нараджэння – вёска Радзеева, што знаходзіцца ў Буда-Кашалёўскім раёне на Гомельшчыне, можа многае растлумачыць у фарміраванні першых эстэтычных памкненняў будучага мастака: неабсяжная прастора, крыху падкрэсленая на далягляцзе цёмна-сіняй стужкай лясоў, такія высокія нябёсы са светлымі хмаркамі, вясковыя вуліцы з маляўнічымі хаткамі, побач з якімі ўздымаюцца высачэзныя бярозы, ліпы, таполі, што перажылі не адно пакаленне гаспадароў утульных сядзіб. І ўсё гэта свеціцца чысцінёй, паветранай сінню, цеплынёй збажыны, усхваляванасцю нябачнага ветрыка. Мастак з самага дзяцінства так добра адчуваў настрой беларускай прыроды, што нават мог беспамылкова прадбачыць, сонечным ці пахмурным будзе надвор'е. Тым болей – магчымую навальніцу! І гэта вельмі важна для пейзажыста, які за творчымі ідэямі павінен рэгулярна выязджаць на эцюды і працаваць з натуры. З роднай Гомельшчыны жыццёвы і творчы шлях мастака вядзе ў Віцебскі мастацкі тэхнікум, дзе ён вучыўся ў 1929 – 1932 гг., а потым – у Маскоўскі мастацкі інстытут. Вялікая Айчынная вайна многае змяніла ў планах маладога таленавітага жывапісца, але не выбіла з творчай каляіны. Сваю прафесійную падрыхтоўку на вышэйшым мастацкім узроўні В. Цвірка завяршыў у Самаркандзе, куды быў эвакуіраваны інстытут з Масквы. Трэба аддаць належнае тагачасным дзяржаўным уладам, якія нават у самыя драматычныя часы ваеннага супрацьстаяння высока цанілі ролю мастацтва ў барацьбе за Перамогу. Здаралася, мастакоў адзывалі з франтоў для выставачнай дзейнасці. Студэнцкая моладзь мела магчымасць працягваць вучобу ў недасягальных для тэатра ваенных дзеянняў мясцінах. За выдатныя творчыя поспехі малады выпускнік мастацкага інстытута Віталь Цвірка ў 1944 г. быў прыняты ў Саюз мастакоў, пасля чаго адразу пераехаў у вызвалены Мінск. З таго часу яго творчасць непарыўна звязана з нашай адроджанай для культурнага жыцця сталіцай, з неабсяжнымі беларускімі прасторамі, з іх мінуўшчынай, сучаснасцю і смелым позіркам у будучыню.

Пра творчасць Віталя Канстанцінавіча Цвіркі напісана адначасова і многа, і мала. Гэта найперш чатыры выдатныя манаграфіі, якія даюць характарыстыкі, тлумачаць асаблівасці жывапісу мастака, распавядаюць пра перыяды ў яго творчасці, падсумоўваюць вынікі яго выключнай таленавітай дзейнасці: мастацтвазнаўчыя працы Вольгі Залескай, Барыса Крэпака, Валянціны Вайцэхоўскай, Наталлі Сяліцкай.

Тым не менш многія біяграфічныя факты з жыцця мастака, успаміны яго паплечнікаў, асэнсаванне творчага метаду чакаюць сваіх даследчыкаў. Гэтая публікацыя таксама не прэтэндуе на завершанасць раскрыцця пастаўленай праблемы, але мае на мэце пашырэнне і паглыбленне сучасных уяўленняў пра асобу творцы і яго мастацкую спадчыну.

Вялікую ролю ў творчым развіцці мастака 1940 – 1950-х гг. адыграла яго жывапісная і педагагічная дзейнасць. Серыя гарадскіх краявідаў В. Цвіркі, прысвечаных разбуранай фашыстамі сталіцы, не мае аналагаў у беларускім жывапісе. Мастак паказвае гэтыя трагічныя матывы ў промнях сонечнага святла, нібы жадаючы перадаць надзею, што жыццё на вуліцах і плошчах Мінска хутка адродзіцца і зноў заззяе сонейка ў вокнах новаадбудаваных дамоў, што, зрэш-

ты, і адбылося за няпоўнае дзесяцігоддзе. Праявіў сябе В. Цвірка і як майстар гістарычнай тэматыкі. Яго кампазіцыі "Няскораныя" (1947) і "Паўстанне рыбакоў на возеры Нарач" (1957) з'яўляюцца выдатным сведчаннем выключнага таленту мастака, развіцця найлепшых традыцый рэалістычнага сюжэтна-тэматычнага жывапісу свайго часу.

У час працы ў Тэатральна-мастацкім інстытуце ён запомніўся сваім студэнтам, цяпер ужо славутым беларускім мастакам – Барысу Аракчэеву, Леаніду Шчамялёву, Леаніду Дударэнку і іншым, вельмі дэмакратычным, па-рэфарматарску скіраваным педагогам, які адмаўляў розныя штампы, падштурхоўваў да эксперыментаў, жывапісных навацый. Разам са студэнтамі В. Цвірка выязджаў на эцюды падчас летняй практыкі, што праводзілася на Міншчыне, напрыклад у Валожынскім раёне. Менавіта з тых часоў канчаткова ўсталявалася скіраванасць мастака на неабмежаванае развіццё пейзажнага жывапісу. Яго "Ля млына. Поўдзень" (1954) – жывое сведчанне сапраўднага жывапіснага маніфеста, маляўнічае пацвярджэнне творчага выбару. Пейзаж насычаны такім сонечным настроем і праніклівым аптымізмам, якія цяжка знайсці ў жывапісных творах, прысвечаных жыццю беларускай вёскі. Перад вачыма гледача разгортваецца дарога, далягляд закрываецца выразным адлюстраваннем зялёнага атачэння побач з млыном і рэчкай. А цэнтрам кампазіцыі з'яўляецца выява белага каня, запрэжанага ў драбіны, які спакойна жуе сена. Ці ж гэта не сімвал творчага шляху, які завяршаецца сапраўднай перамогай, трыумфам пейзажнага жанру? Гэтую ідэю ў 1950 – 1960-я гг. мастак развівае ў вобразах узгорыстай Лагойшчыны, а таксама роднай Гомельшчыны, што прывольна шырыцца абапал хуткаплыннай Прыпяці. У творах таго часу ён надаў беларускаму краявіду манументальны характар, адлюстраваў веліч і значнасць беларускай зямлі, багацце і выключна згарманізаваны каларыт прыроды як сведчанне мужнасці і годнасці яе народа, цеплыні і гасціннасці яго душы. Жывапісны стыль В. Цвіркі ўпэўнена фарміраваўся як стыль свабоднага, шырокага абагульнення, выяўлення галоўнага, маляўнічага, эмацыйна шматзначнага, што звязана з зелянінай, небам, купінамі дрэў, шырынёй водных прастораў. Невыпадкова кампазіцыя "Мая Радзіма" (1961) выглядае як панарама палёў і лясоў, што ахоплівае неабсяжныя далягляды, а твор "Прыпяць" (1963) дазваляе ўбачыць беларускі краявід з вышыні птушынага палёту, які ўздымае значнасць нібы звычайнага пейзажа да ўзроўню эпічнага абагульнення. У 1964 г. за выключныя дасягненні ў беларускім жывапісе Віталь Канстанцінавіч атрымаў званне народнага мастака СССР, што, несумненна, паставіла яго на чале ўсіх творчых навацый беларускага мастацтва.

Па вызначэнні вядучых савецкіх крытыкаў, у тагачасным жывапісе вылучаліся чатыры прафесійныя школы: маскоўская, прыбалтыйская, закаўказская і беларуская. Вялікая заслуга ў гэтым творчым дасягненні належыць В. Цвірку. Мастака паўсюль успрымалі як прызнанага і аўтарытэтнага маэстра, хоць не заўсёды калегі ў роднай сталіцы ацэньвалі яго творчасць належным чынам. Існавалі і кансерватыўныя меркаванні, нібы жывапісец празмерна парушае непахісныя акадэмічныя традыцыі… Але творца быў вышэй за нядобразычлівасць і непаразуменні. Ён працягваў вандраваць па Беларусі, шукаў новыя матывы і падтрымку аднадумцаў. Выключным этапам яго творчасці стала сувязь з горадам Гродна ў другой палове 1960-х гг. Доўгі час ён працаваў там у сяброўскім атачэнні мясцовых мастакоў, меў сваю майстэрню, разам з паплечнікамі выязджаў на эцюды, жыў пад гасцінным дахам старшыні Гродзенскага аддзялення Саюза мастакоў Івана Пушкова. У занёманскіх майстэрнях, а таксама мастацкіх майстэрнях, якія размяшчаліся ў вялікім будынку былой сінагогі, пабудаванай у XVI – XVII стст., аднадумцы абмяркоўвалі творчыя здабыткі Міхаіла Плужніка, Валянціна Савіцкага, Мікалая Апіёка, Фелікса Шунейкі, Данііла Парахні, Аляксея Арнаутава і інш.

Мне асабіста давялося пазнаёміцца з В. Цвіркам менавіта ў той час, калі Гродна літаральна выбухнула жывапісным і графічным наватарствам. Першая наша сустрэча адбылася ў Барыса-Глебаўскай царкве на высокім беразе Нёмана. Нешта асаблівае адчулі тады пад скляпеннямі старажытнай святыні гродзенцы і іх шаноўны мінскі калега, які прыехаў з членамі мастацкага савета з нагоды 50-годдзя Кастрычніка. З тых часоў Віталь Канстанцінавіч пастаянна наведваў Гродна. У выніку шчырага супрацоўніцтва ён, на маю думку, дасягнуў вяршыні творчага абагульнення і манументальнай выразнасці ў пейзажных творах, напісаных у 1967 – 1970-я гг. і прысвечаных Панямонню: "Каложа. Царква XII ст. у Гродне" (1969), "На Нёмане" (1969), "Ганча – зямля партызанская" (1969), "На чырвонай гары" (1970), "Вясна. Гракі прыляцелі" (1975). У гэтым цыкле мастак стварыў асаблівы аўтарскі стыль, пра які можна казаць як пра самы наватарскі падыход да пейзажнага жывапісу апошняй чвэрці XX ст. Ён уключае ў сябе выдатную фармальную кампазіцыю, пабудаваную на колеравых кантрастах, надзвычай шы-

Віталь Цвірка ў майстэрні.
Пачатак 1950-х гг.

рокую манеру пісьма, што пазбягае ўсяго другаснага, дробнага і нязначнага. Творы загучалі як сапраўдныя эпічныя паэмы, перакладзеныя на мову сучаснага беларускага жывапісу. І па сённяшні дзень яны з'яўляюцца каштоўным здабыткам пейзажнага еўрапейскага наватарства.

У 1970 – 1980-я гг. мастак пашырае свае гродзенскія здабыткі ў пейзажных і нацюрмортных кампазіцыях, надзвычай шмат працуе ў акварэльнай тэхніцы. Яго творы знайшлі належнае месца ў зборах Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь: "Позняя восень" (1977), "Бярозы белыя" (1980), "Лагойшчына" (1980), "Царква ў Заслаўі" (1980), "Царква ў Лагойску" (1982), "Касцёл у Ракаве" (1980) і інш.

Нацюрморты мастака "Хлеб" (1982), "Восеньскі матыў" (1982), "Нацюрморт з люстэркам" (1982), "Палявыя кветкі" (1980), "Памяць" (1987), "Элегія" (1989) і іншыя – яшчэ адно новае і, на жаль, апошняе слова-запавет вялікага маэстра ў развіцці айчыннага мастацтва. Надзвычай упэўненай рукой, на адным дыханні створаны шматзначныя кампазіцыі, якія пераконваюць у тым, што найвышэйшыя здабыткі заўсёды будуць звязаны з родным і блізкім, нацыянальна акрэсленым. Нацюрмортны жанр, не менш за пейзажны, збірае ўсё блізкае і шматзначнае ў побытавым і творчым асяроддзі, дазваляе адчуць повязь з сапраўднымі і натуральнымі каштоўнасцямі роднага дома і перажыць еднасць з неабмежаваным вобразным светам праз свабодны падыход да кампазіцыі, колеравай гамы, разняволенай манеры жывапісу.

У позні перыяд творчасці В. Цвірка дасягнуў выключнага жывапіснага майстэрства ў адлюстраванні зімовых краявідаў, у матывах, звязаных з першымі праявамі надыходу вясны. Гэтаму спрыялі частыя вандроўкі на радзіму Якуба Коласа – Стаўбцоўшчыну. Не забываўся мастак і на ўзгорыстую Лагойшчыну, якая не пераставала адорваць яго сваімі велічнымі далягляда мі. Калі стан здароўя ўжо не дазваляў выязджаць на эцюды, ён не пераставаў пісаць па памяці, на падставе назапашаных уражанняў. Іх можна назваць пэўным падсумаваннем творчага шляху, дзе гродзенскі перыяд меў краевугольнае значэнне для стылістычна-эксперыментальных пошукаў. Гэта змушае даследчыкаў сур'ёзна паставіцца да "жывапіснага Панямоння" В. Цвіркі, больш глыбока звярнуцца да названай тэматыкі.

У Гродне Віталь Канстанцінавіч сустрэўся з Аляксеем Арнаутавым, з якім вучыўся некалі ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме. Зацікавіўся творчымі задумамі Фелікса Шунейкі, які спрабаваў узняць народнае ткацтва Гродзеншчыны на ўзровень прафесійнага габеленнага мастацтва. Дарэчы, дзякуючы ў тым ліку і яго станоўчай характарыстыцы склаўся прафесійны лёс дзяцей Фелікса – Алены і Яўгена, якія, паказаўшы мастаку свае студыйныя працы па малюнку і жывапісе, пачулі ўпэўненую параду паступаць у Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. Сёння Алена – вядомы майстар габелена, а Яўген не толькі выдатна праявіў сябе як мастак, але і стаў вядомым мастацкім крытыкам. Добра памятае В. Цвірку і Мікалай Апіёк, які на той час працаваў мастаком-пастаноўшчыкам Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра, куды Віталь Канстанцінавіч прыходзіў на спектаклі. Разам з сябрамі ён агледзеў усе навакольныя цэрквы і касцёлы аж да Друскенікаў на літоўскім памежжы. У адным з праваслаўных храмаў адрэстаўраваў алтарнае палатно з выявай Хрыста, што было прабіта кулямі падчас вайны. Удзячны святар прапанаваў майстру ў дар абразкі з царкоўнага збору [9]. Разам з Валянцінам Савіцкім наведаў Віталь Канстанцінавіч своеасаблівы нефармальны "мастацкі цэнтр" Гродна – невялікую драўляную хатку на беразе

Нёмана пад Каложай, пазнаёміўся з ксяндзом гродзенскага касцёла Маці Божай на Занямонні Аркадзем Вальтасам, таксама мастаком. У касцёле тады яшчэ захоўваліся роспісы не толькі самога ксяндза, але і Пётры Сергіевіча [8]. Дарэчы, Віталь Канстанцінавіч выканаў сваё абяцанне перадаць Аркадзю Вальтасу добрую паперу для акварэляў, што я сама і зрабіла.

Магчыма, гэтыя звесткі дадаюць толькі асобныя рысы да характарыстыкі шматграннай дзейнасці В. Цвіркі, але трэба ўлічваць, што для гродзенцаў усё гэта мела вялікае значэнне: мастакі і сёння прыгадваюць падзеі тых часоў. Для самога ж В. Цвіркі гродзенскі перыяд стаў вызначальным. З'явіліся палотны падкрэслена вялікіх памераў, якія ён прывозіў з Мінска на машыне і захоўваў у майстэрнях былой сінагогі. На эцюды жывапісец ніколі не выбіраўся ў адзіноце, яго суправаджалі Іван Пушкоў, Міхаіл Плужнік, Мікалай Апіёк і інш. Трэба прызнацца, што Віталь Канстанцінавіч заўсёды запрашаў і мяне на эцюды, дзякуючы чаму я стала сведкай яго арыгінальных творчых паводзін. На высокім беразе Нёмана, усталяваўшы вялікае палатно на мальберце, ён пачынаў голасна спяваць для эмацыйнага разагрэву на радасць мясцовым рыбакам. Быў у яго і своеасаблівы рытуал: памачыць у неба пэндзлі. Віталь Канстанцінавіч падкідаў угару некалькі пэндзляў, нешта прыгаворваючы, а потым пачыналася сапраўдная жывапісная "віхура", калі пырскі ляцелі ва ўсе бакі, цюбікі з фарбамі імгненна спустошваліся і за лічаныя гадзіны перад намі паўставалі выразныя, панарамныя, абагульненыя прынёманскія шэдэўры. Апроч шырокай "нёманскай плыні" яго захаплялі берагі шматлікіх рэк-прытокаў – Гараднічанкі, Котры, Ганчы і інш. Пасля В. Цвіркі ўжо немагчыма не бачыць невычэрпнай маштабнасці і вобразнай прыцягальнасці гэтага манументальнага пейзажнага рэгіёна.

Дзякуючы хадайніцтву выдатнага жывапісца атрымалі рэкамендацыі для паступлення ў Саюз мастакоў многія яго аднадумцы, што значна ўмацавала аўтарытэт абласной творчай арганізацыі на доўгія гады. Я асабіста вельмі ўдзячная В. Цвірку за супрацоўніцтва, бо менавіта ён ацаніў у свой час мой эксперыментальны стыль, прагу да шырокіх абагульненняў. Не без яго рэкамендацыі мае працы сярод іншых трапілі ў 1967 г. на Усесаюзную выставу ў Маскву. Дарэчы, і народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў, у той час таксама гродзенец, не абыходзіў увагай творчыя поспехі мясцовых графікаў, вызначаў іх дзейнасць як наватарскую і запатрабаваную ў мастацтве з'яву [1].

Калі Віталь Канстанцінавіч пакінуў гэты свет, неўзабаве пасля сваёй вялікай персанальнай выставы, яго творчая спадчына крыху нібы адышла ў цень на фоне розных постмадэрнісцкіх "гульняў" у мастацкім жыцці 1990 – пачатку 2000-х гг. Усе больш ці менш вядомыя мастакі розных пакаленняў мелі выдатную адукацыю, марылі пра сусветны поспех. Яны маглі настроіцца на любую модную плынь (нарэшце ўсё стала дазволеным і даступным), але вялікага цуду не адбылося. І многія мары разбіліся, нібы тонкае шкло, аб падмуркі мастацкага рынку заходняга свету, дзе пануюць зусім іншыя культурныя арыенціры і, адпаведна, стаўленне да мастацкай прадукцыі, скіраванай на халодны офісны стыль альбо задавальненне вычварных густаў розных нуварышаў. Паступова прыходзіць разуменне, што мастак павінен найперш упэўнена стаяць на роднай глебе, не перастаючы захапляцца яе невычэрпнай вобразнасцю. І развіваць тыя найвыдатнейшыя адкрыцці, якія засталіся нам у спадчыну ад незабыўнага і натхнёнага маэстра, чыё стагоддзе мы адзначаем сёлета. Нездарма галоўная выставачная пляцоўка беларускай сталіцы, больш вядомая як Мінскі палац мастацтва, будзе насіць імя Віталя Канстанцінавіча Цвіркі. Ён неаднойчы выстаўляўся тут разам са сваімі аднадумцамі-паплечнікамі. Магчыма, у гэтай выставачнай зале мы яшчэ неаднойчы з хваляваннем убачым яго этапныя творы з музейных калекцый, а таксама мастацкія пошукі сучасных беларускіх майстроў, якія ў пейзажы, нацюрморце і іншых жанрах жывапісу будуць пашыраць далягляды творчай прасторы XXI стагоддзя, што пачынаюцца ад родных і блізкіх сэрцу мясцін, якія ўжо сталі для нас сакраментальнымі дзякуючы геніяльнай творчасці Віталя Цвіркі.

Спіс літаратуры

1. **Быков, В.** Четверо из одного города / В. Быков // Дружба народов. – 1972. – № 1. – С. 129 – 131.

2. **Віталій Канстанцінавіч Цвірка** / аўтар тэксту і складальнік В. У. Вайцэхоўская. – Мінск, 2003.

3. **Віталь Цвірка** / аўтар тэксту і складальнік Н. Л. Сяліцкая. – Мінск, 2012.

4. **Віталь Цвірка. Выстаўка твораў народнага мастака БССР** / склад. І. В. Назімава. – Мінск, 1988.

5. **Виталий Цвирко. Каталог выставки** / автор вступит. статьи О. А. Сурский. – М., 1983.

6. **Заславская, О.** Виталий Константинович Цвирко / О. Заславская. – М., 1960.

7. **Крепак, Б. А.** Виталий Цвирко / Б. А. Крепак. – Минск, 1985.

8. **Маліноўская, Т.** Наталля Маліноўская. Паралельны свет : Мастакі і мастацкае жыццё Гродна ў 50-я гг. XX ст. / Т. Маліноўская, Н. Маліноўская // ARCHE. – 2011. – № 10. – С. 262.

9. **Шаранговіч, Н.** "Чараўнік дый годзе…" / Н. Шаранговіч // Мастацтва. – 2006. – № 5. – С. 22 – 23.

Людміла НАЛІВАЙКА,
кандыдат мастацтвазнаўства.

РЭЧЫ Ў КУЛЬТУРЫ І Ў ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНЫМ ПОЛІ

НЕКАТОРЫЯ МЕРКАВАННІ ПРА ІХ ПРЫРОДУ І ПРЫЗНАЧЭННЕ

Заканчэнне. Пачатак у № 1.

Рэчы-сімулякры адначасова і амбіцыйныя, і нікчэмныя. Яны адлюстроўваюць такую характэрную сёння з'яву, як працэс распаду прадметнай цэласнасці рэчы, калі з паўнавартаснага вырабу яна ў адзін момант ператвараецца ў нейкі дэматэрыялізаваны, амаль умоўны знак. Гэта і сінонім сацыяльнага прэстыжу, і ўяўны вобраз іншага свету, і абезасобленая самасць, у якой нібы матэрыялізавалася пачуццё экзістэнцыяльнай тугі ад бессэнсоўнасці існавання. Яны ўвасабляюць у сабе вяршыню ўяўнасці замест страчанай сутнасці, ілюзію замест рэальнасці, намёк замест зразумелага выказвання. Рэч-сімулякр – гэта своеасаблівая адсутная дадзенасць, якая выказвае ў пэўных акалічнасцях немагчымасць прадмета быць адэкватным самому сабе. Такія рэчы закліканы прадэманстраваць уяўнасць поспеху і эканамічнага росквіту ў сітуацыі, калі яны цалкам адсутнічаюць. Сусветная індустрыя кантрафактнай прадукцыі сваім росквітам абавязана такому дэфіцыту. Бракаванне прадметнай цэласнасці і каштоўнасці ў такой "рэчы" можна паспрабаваць замаскіраваць гульнёй: жартам, правакацыяй ці адкрытым эпатажам спажыўца. Узгадаем, да прыкладу, пра даволі вядомыя пісталеты-запальніцы, куфэркі-пужалкі, бялізну, якая імітуе адпаведную частку аголенага цела мармуровай статуі – шэдэўра сусветнай скульптуры, і іншыя прадметныя "кур'ёзы" турыстычнага шопінгу.

Наглядна адлюстроўваючы ў сабе распад асобы сучаснага чалавека, які абірае "мець" і "здавацца" замест "быць", рэч-сімулякр імітуе згубленую цэласнасць, кампенсуе сабой гэты недахоп. Такая рэч – усяго толькі ўяўнасць, што хоць і адчайна імкнецца, але ніколі не зможа стаць той сутнасцю, якую пераймае. Бездань, што падзяляе іх, відавочная. І безнадзейнасць сітуацыі выразна адчуваецца ў самой рэчы-сімулякры. Яна літаральна нясе на сабе пячатку распаду. У такой "рэчы" сканцэнтравана занадта шмат напружання. Знарочыста-выродлівая, грубая ці амаль пазбаўленая "цела", яна разрываецца паміж вульгарнасцю і падкрэсленым рацыяналізмам, выступае то згусткам эмоцый, то ўвасабленнем абыякавасці. Пры гэтым такая ўмоўная "рэч" амаль што пазбаўлена магчымасці прамога ўжытку, які забяспечвае паўнавартаснасць яе жыцця. Рэччу-сімулякрам вельмі цяжка карыстацца, бо гэтая імітацыя "арыгінала" не вытрымлівае напружання сэнсарнага кантакту з чалавечай рукой, маніпуляцыі, якая прадугледжвае магчымасць і нават неабходнасць супраціўлення матэрыялу. Ёю нельга актыўна карыстацца з-за рызыкі хуткага разбурэння, таму рабіць гэта можна аднакратна ці вельмі рэдка, нядоўга, у выключных выпадках і толькі ўмоўна-дэманстратыўна (меней чапаць, каб не сапсаваць!). Яе сфера – чыстая прэзентнасць [4, с. 493 – 495], прысутнасць у кантэксце і не больш за тое. Таму такая рэч фактычна ўхіляецца ад кантакту, дакладней, паўнавартасны кантакт знішчае яе, як світанак з'ядае ранішні туман. Ён выдае з галавой яе неадэкватнасць самой сабе, недасканаласць, разыходжанне ў ёй сутнага і ўяўнага робіць відавочным, а яе саму – бессэнсоўнай. Калі гэта прадмет інтэр'ера, то ён часта знаходзіцца ў аддаленні, на вялікай дыстанцыі, нібы ў ізаляцыі для таго, каб не пашкодзіць і без таго далікатную падробку, і для таго, каб не быць "выкрытым". Яго функцыянаванне хутчэй намінальнае, чым рэальнае; яно вычэрпваецца адной толькі наяўнасцю ў памяшканні. Як маляваны дыван на сцяне: вось ён вісіць на бачным месцы, аднак не варта падыходзіць занадта блізка, каб не сапсаваць першага ўражання. Няхай яно застанецца адзіным і пойдзе на карысць гаспадарам, бо нават адзін уважлівы, а не павярхоўны погляд, не кажучы ўжо пра мінімальнае пашкоджанне "глянцу", страту знешняга лоску, бязлітасна агаляе заганную сутнасць. А "выкрыццё" суправаджаецца выгнаннем, далёкай высылкай і забыццём, па сутнасці, смерцю цалкам прыдатнага да выкарыстання, але ўжо непрэзентабельнага вырабу, які вычарпаў сваё прызначэнне. Такая рэч народжана для таго, каб *здавацца* чымсьці, а не *быць* сабой.

У адрозненне ад рэчаў-сімулякраў, "разумныя машыны" – гэта рэчы-мары, валоданне якімі не толькі прэстыжнае, але і робіць чалавека "дасканалай прыладай". І тэхналагічна, і сацыяльна дзякуючы ім ён становіцца вельмі эфектыўным, у ідэале – звышэфектыўным, супергероем, практычна богам. Валоданне такімі рэчамі значна вызваляе яго час і аблягчае намаганні ў дасягненні яго звышмэт і рашэнні звышзадач. Ідэя звышвелічы і звышмоцы, а насамрэч дасягнення абсалютнай улады над светам і іншымі людзьмі – вось тая мара, што рухае і распрацоўшчыкамі, і карыстальнікамі такіх дасканалых прылад, ці, дакладней, "дасканалай зброі" для заваявання свету. Гэтыя суперпрацэсары, якія працуюць ад электрычнасці, тэхналагічна складаныя, надзвычай эфектыўныя, замя-

няюць сабой чалавека і ўвасабляюць вяршыню функцыяналізму. У тым ліку і тым, што практычна не патрабуюць ні яго ўдзелу ў працы, ні нават яго прысутнасці падчас рабочага цыкла. Хопіць толькі лёгкага дотыку пальцам, націску кнопкі для таго, каб запусціць складаны тэхналагічны працэс і сам механізм у дзеянне. А часам нават і гэтага не патрабуецца: дастаткова паднесці руку да ўбудаванага фотаэлемента ці сканера, каб прыбор пачаў функцыянаваць. Такім чынам, знікае сама магчымасць тактыльнага ўзаемадзеяння, кантакт з рэччу робіцца эфемерным.

Многія з "разумных машын" нават свой канчатковы выгляд прымаюць толькі на час працоўнага цыкла, каб потым быць разабранымі па частках і складзенымі ў сховішчы максімальна кампактным чынам. Яны нібы знікаюць на час, растваряюцца, сыходзяць у нябыт да наступнага разу, калі іх ізноў збяруць, згодна з вызначаным парадкам (рытуалам) і ў дакладнай адпаведнасці з інструкцыяй па выкарыстанні, і запусцяць у справу. І тады яны "адродзяцца" ва ўсёй сваёй моцы. Такой рэчы нібы няма ў прыродзе, яна не з'яўляецца велічынёй пастаяннай, а ўзнікае толькі па неабходнасці ў сувязі з відавочным і тэрміновым запатрабаваннем, пасля чаго тут жа знікае з віду. Яна "дзейнічае" аператыўна, ненавязліва і максімальна карэктна, як дасведчаны афіцыянт у рэстаране высокага класа.

Шматразовае прайгравание зборна-разборнага механічнага аб'екта нічога агульнага не мае ні з існаваннем традыцыйнай рэчы, ні з цыклам жыцця біялагічнай істоты, па аналогіі з якой тая і была створана. Ды і кантакт з ім пры ўсёй безумоўнай важнасці, патрэбнасці і карыснасці цуда-агрэгата можа быць толькі самым павярхоўным, дакладней, амаль неадчувальным, фрагментарным і даволі аднастайным па характары, манатонным. Гаворка ідзе пра шматразовы, а часам і аднакратны пальцавы націск, які цалкам забяспечвае запуск працоўнага працэсу і функцыянаванне ў вызначаным, загадзя зададзеным рэжыме нашай цуда-машыны. Разнастайнасць тактыльных маніпуляцый тут ад пачатку не прадугледжана, нават у выпадку зборкі ці ачысткі. А ці можна чакаць паўнавартаснага кантакту ад "зносін" з напоўненым гарачай вадкасцю пластыкавым посудам? Дастаткова і лёгкага дотыку, у адваротным выпадку занадта вялікая рызыка страціць змесціва або саму машыну.

Мабыць, самай галоўнай якасцю сучасных рэчаў з дзвюх вышэйназваных тыпалагічных груп можна лічыць адсутнасць аўтэнтычнасці, унікальнасці, той самай "аўры сапраўднасці", пра якую пісаў В. Беньямін [3]. Толькі ў выпадку з сімулякрамі гаворка ідзе пра страту Самасці, дакладней, прадметнай ідэнтычнасці рэчы, а ў выпадку са шматлікімі "цуда-машынамі" – пра страту паўнавартаснага кантакту з рэальнасцю. Сучасная рэч уніфікаваная, стандартызаваная, абязлічаная, што непазбежна і натуральна для серыйнай прадукцыі, індустрыяльнага працэсу вытворчасці. Таму больш за ўсё запатрабаваны на сучасным рынку рэчаў такія спажывецкія якасці, як адзінкавасць (дакладней, выпуск малой серыяй / тыражом) і "арыгінальны дызайн" (што само па сабе нонсэнс).

Змяніўся сёння і характар узаемаадносін рэчы з уладальнікам. Замест ранейшага ўпэўненага і строгага *гаспадар* з'явілася абязлічанае *карыстальнік*, што ўжо само па сабе гаворыць пра нейкую нестабільнасць, абмежаванасць у правах і пасіўнасць. У той жа час мы кажам і пра страту ўнікальнасці, узаемнасці і саміх ранейшых адносін, якія цяпер можна звесці толькі да так званага стрыманага "паліткарэктнага" дыскурсу, а дакладней, да абмежаванага, тэхналагічна вывераного і пры гэтым аднабаковага абслугоўвання ў рамках зададзенай функцыі, бо сучаснай рэччу ў поўнай меры валодаць нельга. Ёю толькі перыядычна карыстаюцца, больш ці менш інтэнсіўна, каб па заканчэнні загадзя вызначанага тэрміну прыдатнасці (які нязменна скарачаецца) замяніць "маральна састарэлую (ці маральна зношаную)" мадэль на новую, больш дасканалую. З іншага боку, рэч нібы пастаянная, яна як быццам захоўвае, хоць і вельмі ўмоўна, свой прыярытэт над карыстальнікамі, якія могуць змяняцца. Бо ўся асноўная (яна ж – тэхналагічная) каштоўнасць – у ёй; карыстальнік з'яўляецца толькі яе дадаткам.

У сучасным свеце рэч, як і чалавек, яе стваральнік-праекціроўшчык і спажывец, перажывае глыбокі крызіс існавання. Яе статус не вызначаны і вельмі нестабільны. Сучасная рэч або зусім не мае цэннасці, гэта амаль нікчэмны прадмет, які можна прынесці са сметніцы, або гэта суперрэч, і тады яна надзвычай каштоўная з пункту гледжання яе канструкцыі, тэхналагічных пошукаў і ўкладзенай працы. Аднак уся творчасць сышла на само стварэнне такой машыны, яна сканцэнтравана галоўным чынам на этапе тэхналагічнага канструявання, і гэта робіць сучасную рэч вельмі ўразлівай. Каштоўная навізной і разнастайнасцю інтэлектуальных рэсурсаў у выглядзе патэнцыйных спажывецкіх магчымасцей, яна не разлічана на абуджэнне тактыльнай цікаўнасці, той самай сітуацыі "асабістага знаёмства" з рэччу на ўзроўні пачуццёвага ўзаемадзеяння, таго адзінага, што стварае адчуванне паўнаты кантакту і выклікае глыбокае ўнутранае здавальненне.

Наадварот, такая супертэхналагічная рэч патрабуе максімальна стрыманага тактыльнага ўзаемадзеяння: асцярожнага, беражлівага, легкаважнага, рэгламентаванага і вельмі дыстанцаванага кантакту. Яна заклікае да выканання прадпісанняў інструкцыі па эксплуатацыі, а не да жывой і непасрэднай сэнсарнай гульні, не дапускае творчых стасункаў з

чалавекам на ўзроўні пачуццяў, а толькі на ўзроўні інтэлектуальнага ўзаемадзеяння. Замест багатага на адчуванні, цеснага, частага, разнастайнага тактыльнага судакранання, што абуджае вострае перажыванне-задавальненне, сучасная рэч прапануе нам нешта іншае: даволі вялы, абыякавы, амаль бязважкі кантакт, які ў той жа час інтэлектуальна надзвычай актыўны, рацыянальна нагружаны, лагічна напружаны, што патрабуе не менш магутных рэсурсаў, але дзейнічае зусім інакш, на ўзроўні абстрактнага ўзаемадзеяння. Ён апелюе пераважна да інтэлектуальна-рацыянальнага апарату, падахвочваючы індывіда да сыходу ў свет абстрактных канструкцый, фантазій, аслабляе яго сувязі з рэальнасцю, дыстанцуе, калі не сказаць, адводзіць убок, чалавека ад навакольнай рэчаіснасці, парываючы сапраўдныя сувязі з іншымі людзьмі. Затое сучасная рэч спрыяе фіксацыі індывіда, яе спажыўца ці карыстальніка, на ўласнай суб'ектыўнай рэальнасці як выключнай і ўніверсальнай для ўсіх астатніх. У сваёй кіберрэальнасці, недасяжнай для іншага, а значыць, і для праверкі ці параўнання, ён пачуваецца ў бяспецы. Ніхто ніколі не зможа не толькі сустрэцца з такім індывідам, але нават і наблізіцца да яго, не зробіць яму балюча, але і не прынясе радасці. Мы гаворым пра свет, дзе няма колераў, кветак і пахаў, бо там не існуюць адчуванні, што робяць чалавека жывой істотай і надаюць пачуццям вастрыню, а самому жыццю – усю паўнату задавальненняў.

У выпадку "зносін" чалавека з традыцыйнай рэччу мэтай іх інтэнсіўнага гульнёвага ўзаемадзеяння былі даследаванне свету і арыентацыя чалавека ў навакольным асяроддзі, пошукі спосабаў творчага прыстасавання да яго, выпрацоўка ў працэсе гульні (сэнсарнага ўзаемадзеяння) новых ведаў, навыкаў для задавальнення ўласных запатрабаванняў і пераўтварэння рэчаіснасці. Рэч выступала ў якасці гульнёвай мадэлі падчас жыцця і спазнання чалавекам свету.

Сучасная сітуацыя кароткага, фрагментарнага, павярхоўна-спрошчанага сэнсарнага кантакту чалавека з рэччу, які набывае ўсё больш адцягнена-інтэлектуальны характар, але захоўвае ў цэлым гульнёвыя рысы, першаснай па значнасці падзеяй робіцца індывідуальнае даследаванне ўнутранага псіхічнага жыцця асобы, дакладней, яе пазбаўленага ў рэальнасці апоры і неверагодна раздзьмутага Эга. Рэч выступае ў якасці нагоды, стымулу і своеасаблівай кропкі адліку для даследавання індывідам павярхоўных структур яго ўнутранага Я, якое ўяўляецца пабудаваным па аналогіі з механічным аб'ектам, "разумнай машынай". Менавіта механічны характар узаемадзеяння чалавека з сённяшняй рэччу, заснаваны на шматразовым манатонным кропкавым націску (раздражненні адных і тых жа рэцэптараў), прыводзіць нашага сучасніка да вельмі вузкага і павярхоўнага ўспрымання сябе, свету і іншых людзей па аналогіі з такой жа "разумнай машынай". Пачуцці проста адкінуты як непатрэбныя.

Традыцыйная рэч аб'ядноўвала людзей падчас гульні (зносін), выступаючы пасрэднікам; сучасная рэч такой магчымасці не выключае, прынамсі, інтэлектуальнае ўзаемадзеянне карыстальнікаў у кіберпрасторах усяляк заахвочваецца і дэкларуецца. Але ў рэальным працэсе інтэлектуальнай гульні такое ўзаемадзеянне носіць даволі ўмоўны, эмацыйна адцягнены характар. Не закранаючы глыбінь чалавечай душы, не задавальняючы яе эмацыйных запатрабаванняў, не насычаючы ўдзельнікаў працэсу сапраўдным паўнавартасным перажываннем сэнсарнага ўзаемадзеяння з рэччу, яно застаецца павярхоўным і фармальным. А ўзмоцненая частата такіх кантактаў ніяк не здольная кампенсаваць адсутнай якасці. Таму вызначэнне "вечна галодны абжора" лепш за ўсё, на наш погляд, характарызуе сутнасць спажыўца (ці карыстальніка) сучасных рэчаў.

Пераклад з рускай мовы.

Спіс літаратуры

1. **Байбурин, А. К.** Семиотические аспекты функционирования вещей / А. К. Байбурин // Этнографическое изучение знаковых средств культуры : сб. ст. / Академия Наук СССР. Институт этнографии имени Н. Н. Миклухо-Маклая. Ленинградская часть [отв. ред. А. С. Мыльников]. – Л. : Наука, 1989. – С. 63 – 88.

2. **Байбурин, А. К.** Семиотический статус вещей и мифология / А. К. Байбурин // Материальная культура и мифология : сб. ст. музея антропологии и этнографии / АН СССР, Институт этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая [отв. ред. Б. Н. Путилов]. – Л. : Наука, 1981. – С. 215 – 226.

3. **Беньямин, В.** Произведение искусства в эпоху его технической воспроизводимости : избранные эссе / В. Беньямин; пер. с нем. – М. : Немецкий культурный центр им. Гете; Медиум, 1996. – 240 с.

4. **Бычков, В. В.** Эстетика : учебник для вузов / В. Бычков. – М. : Гардарики, 2006.

5. **Габричевский, А.** Одежда и здание / А. Габричевский // Вопросы искусствознания. – 1994. – № 2-3. – С. 381 – 404.

6. **Лотман, Ю. М.** Натюрморт в перспективе семиотики / Ю. М. Лотман // Вещь в искусстве : материалы научной конференции / Государственный музей изобразительных искусств имени А. С. Пушкина. – М., 1986. – С. 6 – 14.

7. **Фрейденберг, О. М.** Семантика архитектуры вертепного театра / О. М. Фрейденберг // Декоративное искусство СССР. – 1978. – № 2. – С. 41 – 44.

8. **Фрейденберг, О. М.** Семантика первой вещи / О. М. Фрейденберг // Декоративное искусство СССР. – 1976. – № 12. – С. 16 – 22.

9. **Фромм, Э.** Иметь или быть. Бегство от свободы / Э. Фромм; пер. с англ. – М., 2000.

10. **Цивья, Т. В.** Музыкальные инструменты как источник мифологической реконструкции / Т. В. Цивья // Образ – смысл в античной культуре : материалы научной конференции / Государственный музей изобразительных искусств имени А. С. Пушкина. – М., 1990. – С. 182 – 195.

11. **Цивья, Т. В.** Оппозиция *мужской / женский* и ее классифицирующая роль в модели мира / Т. В. Цивья // Этнические стереотипы мужского и женского поведения : сб. ст. / отв. ред. А. К. Байбурин, И. С. Кон // АН СССР. Институт этнографии имени Н. Н. Миклухо-Маклая. – СПб. : Наука, 1991. – С. 77 – 91.

Аксана КОЎРЫК,
кандыдат мастацтвазнаўства.

Постаці

ГРАНІ ВОБРАЗА ПЕЙЗАЖНАГА ЖЫВАПІСУ ІВАНА КОЗЕЛА

Іван Козел – сфарміраваны мастак, за плячыма якога жывапіснае аддзяленне Беларускай акадэміі мастацтваў (1996), стажыроўка ў творчых акадэмічных майстэрнях Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (1997 – 2000). Ён мае досвед шматгадовай пленэрнай і мастацкай практыкі, амаль дваццацігадовай выставачнай дзейнасці, а таксама дзесяцігадовы стаж педагагічнай працы ў гімназіі-каледжы мастацтваў імя І. Ахрэмчыка. І. Козел прысвяціў сваю творчасць пераважна жанру пейзажа. Пяцідзесяцігадовы рубеж творцы, вядома ж, яшчэ не падстава для выніковых сцвярджэнняў і ацэнак, аднак ён дае багаты матэрыял для крытычнага асэнсавання.

Разуменне творчай індывідуальнасці пейзажыста немагчыма па-за разуменнем спецыфікі жанру ў цэлым. Пейзаж, на першы погляд такая простая і натуральная форма мастацкага выражэння, хавае ў сваіх унутраных магчымасцях пэўную калізію: шырыню і нявызначанасць дыстанцыі паміж творчым суб'ектам і аб'ектам прыроды. Спазнанне гэтай дыстанцыі ўводзіць аналітыка культуры ў кола перманентнай кан'юнкцыі суб'екта і аб'екта, у праблему іх узаемнага праламлення і перастварэння ў кожным факце мастацтва. Найбольш відавочным прыкладам персаніфікацыі прыродных сіл чалавечай свядомасцю з'яўляецца атаясамліванне стыхійных станаў прыроды з тымі ці іншымі пачуццямі чалавека. Гэтым мастацкім прыёмам найчасцей карысталіся прадстаўнікі рамантызму.

У беларускім рэалістычным пейзажы – менавіта ў межах гэтай мастацкай з'явы І. Козела можна па праве назваць традыцыяналістам – выпрацавана свая сістэма выяўленча-выразных сродкаў, якія дазваляюць квінтэсіраваць "філасофію" пейзажа, асэнсоўваць праз яго светасузіральныя праблемы, перадаваць аўтарскія разважанні і пачуцці. Школа айчыннага пейзажнага жывапісу пачынала канстытуявацца на аснове рускага рэалістычнага пейзажа, але ўжо ў пачатку XX ст. беларускія пейзажысты Ф. Рушчыц і В. Бялыніцкі-Біруля пазначылі прыкметы нацыянальнай ментальнасці. З 1960-х гг. закладваліся сапраўдныя асновы нацыянальнай школы жывапісу. У гэты ж час у пейзажным жывапісе Беларусі ўзмацняліся сюжэтна-тэматычныя прыярытэты, пераважна звязаныя з гістарычнай і сацыяльна-духоўнай праблематыкай. Драматызм рэальнага жыцця, перанесены на пейзажныя палотны, спарадзіў выразную, прамую і адчувальную да фальшу мастацкую мову. Пошукі арыгінальнай стылістыкі прывялі да лаканічнасці пластычных рашэнняў і абмежавання колеравых філіяцый, што робіць жывапіс такім успрымальным да сімвалічных эфектаў. Жыва і вобразна гэты падыход крышталізуецца ў творчасці В. Цвіркі, знакамітага беларускага пейзажыста, які стаў прыкладам для шматлікіх паслядоўнікаў.

У гэтым плане І. Козел не стаў выключэннем – стрыманасць палітры і праца з вялікімі колеравымі адносінамі складаюць аснову яго творчай манеры. Напэўна, дзякуючы гэтай індывідуальнай рысе надзвычай плённым было творчае судакрананне маладога жывапісца з асобай і метадалагічным прынцыпам М. Савіцкага – "пісаць не побыт, а быццё", адбіраць і супастаўляць элементы мастацкай формы, ніколі слепа не пераймаць прыроду і не капіраваць натуру. Паводле гэтай жывапіснай прэамбулы, мінімізацыя сродкаў твора не даніна экспрэсіянізму, а метад дасягнення адпаведнасці формы зместу. Невыпадкова працы І. Козела, выкананыя падчас стажыроўкі ў акадэмічных майстэрнях ["Мірскі замак" (1998), "Дыханне восені" (1999) і інш.], адрозніваюцца найбольшай абагульненасцю і танальнай цэласнасцю.

Сюжэтна-тэматычныя прыярытэты жывапісу І. Козела вызначаны паэтыкай натуральнага шматаблічнага жыцця прыроды, вечнай ідэяй гарманічнага суіснавання чалавека і яго асяроддзя. Мастака натхняюць шырокія панарамныя ландшафты, пакладзеныя ім у аснову твораў эпічнага характару [напрыклад, палатно "Зямля продкаў" (1998)]. Хоць, на наш погляд, у большай ступені ў І. Козела атрымоўваюцца сціплыя, пазбаўленыя знешняй эфектнасці архітэктурна-ландшафтныя віды ["Дзятлаўская старонка" (2011), "Сядзіба ў Лошыцы" (1998) і інш.], прасякнутыя элегічнымі нотамі. Тут прыметы нацыянальнага прыроднага і архітэктурнага асяроддзя, а таксама пазнавальны, прыглушаны і стрыманы каларыт беларускага ландшафту далучаюць гледача да павольнага і шчырага аўтарскага маналогу.

Асобным матывам творчасці І. Козела служыць асабістае перажыванне прасторы, у якім з'явы прыроды, архітэктурныя збудаванні, чалавечыя постаці, аб'ёмы і дэталі кожны раз складва-

юцца ў непаўторную мізансцэну, што адчуваецца суб'ектыўна. Творчая індывідуальнасць мастака фарміравалася ў працэсе дзіцячых уражанняў і здзіўлення ад разнапланавага, зменлівага, дробнаўзгорыстага ландшафту Навагрудчыны. Таму падчас стварэння карціны аўтара цягне змяняць кропку ўспрымання, перасоўваць кампазіцыйны фокус, вар'іраваць вышыню погляду на натуру. Такім чынам, прастора робіцца для жывапісца сродкам выразнасці, які вядзе да злучэння прадметаў і вобразаў аб'ектыўнай рэальнасці ва ўласную мастацкую канструкцыю.

Як і шматлікія пейзажысты, І. Козел піша карціны на аснове папярэдніх эцюдаў. Стварэнню пейзажа папярэднічае пільны адбор і абагульненне назапашанага матэрыялу, у выніку якіх фарміруецца своеасаблівы экстракт мастацкага ўражання. Апора на пленэрную практыку дазваляе жывапісцу дакладна перадаваць танальныя адносіны натуры; шматлікія штудыі спрыяюць пераканаўчай характарыстыцы стану прыроды.

У працах І. Козела адчувальны прыярытэт прасторавай усталёўкі зроку, што, па сутнасці, таксама ўваходзіць у метадалагічныя асновы шматлікіх жывапісцаў Беларусі. Выявы прыроды ў мастака паўстаюць як цэласнае ўяўленне колера-фармальнага асяроддзя на плоскасці, без акцэнтавання на аб'ёмных, канструктыўных і матэрыяльных уласцівасцях. Пры гэтым абавязковым правілам І. Козела застаецца максімальна дакладная перадача танальных суадносін. Прывядзенне адлюстраваных прадметаў і выяўленчай плоскасці да агульнага назоўніка стварае жывы, шматпланавы вобраз, акцэнтуе ўвагу гледача на якасцях жывапіснай паверхні. Гэтым дасягаецца характэрны эфект успрымання, калі выява, пераведзеная са сферы прасторавай ілюзіі ў разрад плоскасцевых плям, выклікае цікавасць чыста фармальнымі ўласцівасцямі.

Нацыянальная мастацкая традыцыя настолькі адчувальная ў пейзажах І. Козела, што цяжка пераадолець спакусу разглядаць яго творчасць "як люстэрка" пейзажнага жывапісу Беларусі. Вядома, у гэтым люстэрку не толькі адлюстраваны дасягненні школы, але і чытаюцца вострыя праблемы анталогіі жанру. Яны выкліканы рэзкай трансфармацыяй адносін у сістэме *чалавек – прырода*. Неабыякавыя развагі пра крызіс гэтых узаемаадносін, пра шляхі збліжэння цывілізацыі і навакольнага асяроддзя павінны выразіцца ў новых канатацыях вобраза маці-зямлі, якія яшчэ не прагучалі ў мастацтве. Зразумець і выказаць новы канцэпт прыроды вобразнымі сродкамі жывапісу, знайсці гэтыя новыя сродкі – задача, падуладная чуйнай душы мастака.

У працах апошніх гадоў І. Козел звяртаецца да аблічча старога Мінска; у іх адчуваецца настальгія па страчаным [напрыклад, "Мінскі дворык узімку" (2011), "Восень каля Белай дачы" (2011)]. Магчыма, такое асэнсаванне мінуўшчыны – неабходны этап перад крокам наперад, да новага творчага вітка? У любым выпадку, у І. Козела ёсць істотны прафесійны досвед і мастацкія напрацоўкі для новых творчых дасягненняў і адкрыццяў.

Пераклад з рускай мовы.

Галіна ГОРАВА,
кандыдат мастацтвазнаўства.

КАЛЯНДАР ПАМЯТНЫХ ДАТАЎ І ЮБІЛЕЙНЫХ ДЗЁН на 2013 год

КРАСАВІК

Заканчэнне. Пачатак на с. 52.

12 красавіка – 80 гадоў з дня нараджэння Валянціны Міхеевай, скульптара

75 гадоў з дня нараджэння Алеся Масарэнкі, празаіка, перакладчыка

13 красавіка – 90 гадоў з дня нараджэння Барыса Скабло (1923 – 1999), беларускага і расійскага віяланчэліста, педагога, заслужанага артыста Беларусі

18 красавіка – 115 гадоў з дня нараджэння Антука Крыніцы (сапр. Ждановіч; 1898 – 1937), акцёра

110 гадоў з дня нараджэння Платона Галавача (1903 – 1937), празаіка, грамадскага і дзяржаўнага дзеяча

70 гадоў з дня нараджэння Любові Румянцавай, актрысы, заслужанай артысткі Беларусі

55 гадоў з часу стварэння Беларускага саюза кінематаграфістаў

19 красавіка – 120 гадоў з дня нараджэння Васіля Гарбацэвіча (1893 – 1985), драматурга, педагога, заслужанага настаўніка Беларусі

21 красавіка – 110 гадоў з дня нараджэння Міколы Аляхновіча (1903 – 1959), крытыка

23 красавіка – 100 гадоў з дня нараджэння Рыгора Рэлеса (1913 – 2004), ідыш- і рускамоўнага паэта, празаіка

75 гадоў з дня нараджэння Георгія Качаноўскага, жывапісца

24 красавіка – 160 гадоў з дня нараджэння Станіслава Пташыцкага (1853 – 1933), гісторыка, архівіста, даследчыка помнікаў старажытнай пісьменнасці Беларусі, Літвы і Польшчы

25 красавіка – 85 гадоў з дня нараджэння Святланы Курылёвай (1928 – 2011), рускамоўнага празаіка

80 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Навіцкага (1933 – 1979), жывапісца

26 красавіка – 150 гадоў з дня нараджэння Яўстафія Арлоўскага (1863 – 1913), гісторыка, краязнаўцы, педагога

28 красавіка – 60 гадоў з дня нараджэння Валянціны Аксак (па мужу Арлова), паэткі

* * *

60 гадоў таму выйшаў у свет літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны ілюстраваны часопіс "Маладосць"

Паводле картатэкі БДАМЛМ.

Музычная гасцёўня

НЕЗАБЫЎНАЯ МЕЛОДЫЯ СЭРЦА

ІНТЭРВ'Ю З КАМПАЗІТАРАМ ДЗМІТРЫЕМ ДАЎГАЛЁВЫМ

29 студзеня 2013 г. у культурным жыцці краіны адбылася значная падзея – у зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі зладзілі свой аўтарскі канцэрт кампазітар Дзмітрый Даўгалёў і паэт Уладзімір Пецюкевіч. Абодва – юбіляры. У снежні мінулага года кампазітару споўнілася 50 гадоў, а ў сакавіку 2013 г. паэт Уладзімір Пецюкевіч рыхтуецца адзначыць сваё сямідзесяцігоддзе.

У мастацкім багажы юбіляраў шмат разнажанравых твораў, такіх як араторыя "Зорка палын", кантата "Дарога-сцяжына матулі і сына", сімфа-рок-опера "Агонь Праметэя". Але найбольш вядомыя творы славутага тандэма – песні "Гаю мой, не кліч", "А ты кажаш: вясна", "Зараніцы", "Белая лілея", "Балада", "Пажадай мне, мама", "Застольная", "Азярцо", "Рэха жураўлінае", "Голуб галубку цалуе", "Мілая спадарыня", "Нарач". А калі ўзгадаць песні Дзмітрыя Даўгалёва на вершы іншых паэтаў, то трэба адзначыць "Обманите меня", "Погоди", "Телеграммы", "Две звезды", "Не судьба", "Через все границы", "Разводные мосты", "Пани Гражина", "Птицы".

Творчае супрацоўніцтва кампазітара Дзмітрыя Даўгалёва і паэта Уладзіміра Пецюкевіча пачалося ў далёкім 1985 годзе з балады "Поле горкіх палыноў", якую ўпершыню выканалі народны артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка і ансамбль "Сябры". Другая песня "Гаю мой, не кліч", напісаная ў 1986-м, стала для творцаў своеасаблівай візітоўкай, слухачам яна запомнілася ў непараўнальным выкананні нашага славутага Песняра – заслужанага артыста Беларусі Валерыя Дайнэкі.

Песні і балады Дзмітрыя Даўгалёва і Уладзіміра Пецюкевіча – частыя госці на міжнародных конкурсах. Толькі на адным "Славянскім базары" яны маюць тры перамогі. У 1999 г. Ірына Дарафеева з "Баладай" атрымала першую прэмію, у 2005-м Паліна Смолава з баладай "Рэха жураўлінае" ўзяла Гран-пры, у 2006-м Наталля Гардзіенка (Малдова) з песняй "Азярцо" – першую прэмію. Балада "На гнядым звінела срэбраная збруя" хутка стала рэпертуарным творам конкурсаў і выйшла за межы Беларусі. Так, у 2008 г. на міжнародным конкурсе "Пуцёўка да зор" (Масква) Вераніка Чарняўская з "Баладай" атрымала Гран-пры, а ў 2009-м на міжнародным конкурсе "ТеремОК!" (Санкт-Пецярбург) маладая расійская спявачка Анастасія Цітова з гэтай жа "Баладай" была таксама ўганаравана Гран-пры.

Сёння госць нашага часопіса – кампазітар Дзмітрый Даўгалёў.

– Дзмітрый, віншую Вас з юбілеем і аўтарскім канцэртам.

– Дзякуй.

– Хто дапамагаў Вам зладзіць такі запамінальны вечар?

– Першы, каму хочацца падзякаваць, гэта Гасподзь Бог. Ён даў крылы, надзею, жаданне і цярпенне. Велізарны дзякуй Міністэрству культуры за фінансавую падтрымку. Без яе наша вечарына не адбылася б. Таксама хачу сказаць словы падзякі кіраўніцтву і супрацоўнікам Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Асобны дзякуй артыстам і рэжысёру канцэрта Ніне Осіпавай. А яшчэ нам дапамагла цудоўная, шчырая публіка, якая знайшла магчымасць, час і адкрыла сваё сэрца нашым мелодыям.

– Ці была ў Вас упэўненасць перад канцэртам, што будуць раскуплены амаль усе білеты? Тым больш што тэатральнае жыццё Мінска ў гэтым сезоне даволі насычанае.

– Упэўненасці не было. Была надзея, што на канцэрт прыйдуць нашы з Уладзімірам Пецю-

Дзмітрый Даўгалёў і Уладзімір Пецюкевіч за раялем.

кевічам сапраўдныя паклоннікі. Так і адбылося, толькі я не думаў, што іх будзе столькі.

– На канцэрце прагучалі не толькі Вашы творы, напісаныя раней, але і новыя балады і песні. Калі ласка, раскажыце пра прэм'еры.

– Прэм'еры складалі амаль палову праграмы канцэрта. Гэта "Ой, зіма-зіма", "Не кувай, зязюленька", "Незабыўная мая", "Не спяшайся, восень" у выкананні Валерыя Дайнэкі, "Шчабятуня-ластаўка" і арыоза Праметэя ў выкананні Пятра Елфімава, "Туба" ў выкананні Аляксандра Ціхановіча і Ядвігі Паплаўскай, "Ты пачуй мяне" ў выкананні Вячаслава Ісачанкі.

Маладыя спевакі таксама парадавалі: Анастасія Арцем'ева выканала "Клён з таполяю" і "Акеаніды" з оперы "Агонь Праметэя", Вольга Клімовіч – баладу "Ой, ляці, казачанька", Валянціна Альшанская – баладу "Гусі-лебедзі", Наталля Кірыенка – песню "Льецца кахання рака". Яшчэ была прэм'ера інструментальнай кампазіцыі "Круіз", якую выканалі Ігар Ляўчук на блок-флейце і я – на раялі.

– Дзмітрый, а яшчэ была прэм'ера песні "Летуценніца" ў выкананні Уладзіміра Стамаці, Пятра Елфімава і Вашым (за раялем). Гэтая песня нагадала слухачам лепшыя песняроўскія традыцыі. На Ваш погляд, песняроўскія традыцыі – што гэта такое?

– На гэтае пытанне лепш адказаў бы Уладзімір Мулявін. Ён прапусціў беларускую народную песню праз геніяльную прызму свайго музычнага інтэлекту, сабраў лепшыя галасы, музыкантаў і явіў свету непадобнае ні на што, новае гучанне. За песняроўскія традыцыі, якія часткова прысутнічаюць у маёй творчасці, мне не сорамна. Яны нашы, родныя. У іх чыстых, крыштальных крыніцах чэрпалі сваё натхненне цэлыя пакаленні слухачоў і музыкантаў. Я таксама выхоўваўся на "Песнярах".

– На Вашым канцэрце выступалі салісты "Песняроў" розных гадоў.

– Так. Валерый Дайнэка, Уладзімір Стамаці, Пётр Елфімаў і Вячаслаў Ісачанка ці маюць, ці мелі дачыненне да знакамітага калектыву.

– Ці задаволены Вы супрацоўніцтвам з маладымі выканаўцамі, якія ўдзельнічалі ў Вашым аўтарскім канцэрце?

– Пасля канцэрта мой тэлефон быццам "расчырванеўся". Усе мае сябры, знаёмыя, якія прысутнічалі на канцэрце, быццам "спяліся" і задавалі адно і тое ж пытанне: "Дзе ты знайшоў такіх прыгожых і галасістых маладых спевакоў?" Я вельмі задаволены маладымі выканаўцамі, веру ў іх і буду далей з імі працаваць.

– А як усё ж Вы іх знаходзілі?

– Я знайшоў Анастасію Арцем'еву і Пятра Елфімава, калі шукаў выканаўцаў на ролі Акеанід і Праметэя ў рок-оперу "Агонь Праметэя". Мяне знайшлі Валянціна Альшанская, Вольга Клімовіч, а таксама Наталля Кірыенка. Асобна хачу сказаць пра Вераніку Чарняўскую. Спачатку таленавітая спявачка знайшла маю "Баладу", потым "Балада" знайшла яе. Пазней "Балада" нас і пазнаёміла.

– Дзмітрый, як Вы адчуваеце, ці прымае сучасная моладзь тую музыку, якую Вы ствараеце? Ці не дарэмныя намаганні захаваць традыцыі?

– Цікавае і цяжкае пытанне. На яго можа адказаць SMS, якую мне даслала Валянціна Бандарэнка ў перапынку нашага з Уладзімірам Пецюкевічам аўтарскага канцэрта. «Чула, як малады чалавек сказаў у антракце дзяўчыне: "Дзеля такога варта жыць!"»

– Чым Вам блізкі Ваш суаўтар Уладзімір Пецюкевіч?

– Я люблю ягоныя меладычныя вершы, вобразы, метафары. Люблю ягоную беларускую мову. Яна мілагучная, сапраўдная, лагодная і шчырая.

– Вашы балады – сапраўдныя жамчужыны і Вашага з Уладзімірам Пецюкевічам аўтарскага канцэрта, і ўвогуле сумеснай творчасці. У іх заўсёды цікавая, незвычайная форма, драматургія. Што на гэта ўплывае?

– На гэта ўплывае, перш за ўсё, дух, вобраз, рытміка і рыфміка верша. А музыка павінна дапоўніць усё пералічанае і ўзмацніць эмоцыі, якіх у баладах Уладзіміра Пецюкевіча больш чым дастаткова. Падняць гэтыя паэтычныя глыбіні дапамагае прафесія кампазітара, якой я вучыўся

На сцэне Беларускай дзяржаўнай філармоніі. 29 студзеня 2013 г.

ў народнага артыста СССР, прафесара Яўгена Аляксандравіча Глебава.

– Хто аўтар аранжыровак Вашых песень і балад, якія прагучалі ў канцэрце?

– "Гаю мой, не кліч" аранжыраваў Ігар Карнялевіч, "Палачаначку-князёўну" – Раман Козыраў. Усе астатнія зрабіў я.

– Музычная крытыка не раз адзначала і давала высокую ацэнку "аркестраваму мысленню" Вашых балад і песень. Гэта вынік вучобы ў кансерваторыі?

– Па-першае, я з дзяцінства люблю сімфанічны аркестр, юнаком граў на кантрабасе. Памятаю прыгожыя адчуванні, калі ў школьным аркестры мы гралі творы славутых класікаў: Моцарта, Вівальдзі, Чайкоўскага. Гэта са мной назаўсёды. Па-другое, адчуваю і лічу, што выразных сродкаў музыкі, больш дасканалых, чым сімфанічны аркестр, чалавецтва пакуль яшчэ не прыдумала. Дарэчы, лепшая класічная музыка напісана для аркестраў. Па-трэцяе, Вы правільна заўважылі – вучоба ў Майстра аркестроўкі Яўгена Глебава таксама спрыяла развіццю гэтага мыслення.

– На Вашым канцэрце акампанементам для салістаў гучалі ў тым ліку і аркестравыя фанаграмы. А чаму на сцэне не было жывога аркестра?

– На гэтае пытанне лепшы адказ атрымаўся б у дырыжораў тых аркестраў, якія сапраўды маглі б сваёй прысутнасцю і прафесійным выкананнем упрыгожыць сцэну філармоніі. Чаго не адбылося. Але дзякуй Богу, што працавала апаратура, на сцэне стаяў раяль "Steinway", а да мікрафона выходзілі сапраўдныя зоркі беларускай эстрады.

– Ці імкнецеся Вы да папулярнасці?

– Шчыра кажучы, не зусім уяўляю, навошта і якімі сродкамі можна да яе імкнуцца. Папулярнасць, слава… Кампазітар Васіль Салаў'ёў-Сядой з гэтай нагоды неяк добра сказаў: "Слава приходит между делом, если дело того стоит". Папулярнасць і значнасць – розныя субстанцыі. Дык вось першая хутка прыходзіць, хутка адыходзіць. А значнасць, як тое золата, намываецца па крупінцы гадамі, дзесяцігоддзямі. Гэта зароблены аўтарытэт, які застаецца на ўсё астатняе жыццё.

– Дзмітрый, у Вас прыгожая шматдзетная сям'я: дзве дачкі, сын, жонка. Што для Вас сям'я? Ці не перашкаджае яна творчасці?

– Сям'я для мяне – гэта сэнс жыцця. Ні ў якім разе не клопат і цяжар, наадварот, моцная падтрымка. Сям'я не можа перашкаджаць творчасці. Мае дочкі сваімі ясназорымі вочкамі грэюць сэрца, сваімі звонкімі галасамі запісваюць усе мае дзіцячыя песні, сваімі ручкамі граюць п'есы для фартэпіяна, якія час ад часу пішу спецыяльна для іх. Старэйшы сын мяне таксама радуе сваёй вучобай і мэтанакіраванасцю. А яшчэ ў сям'і галоўнае – каб каханая жанчына добра разумела, што такое быць паловай творчага чалавека, тым больш кампазітара. Мне ў гэтым сэнсе пашанцавала.

– А ёсць у Вашым жыцці нешта такое, што стрымлівае працэс напісання новых твораў?

– Ёсць. І не ў мяне аднаго. Гэта недахоп матэрыяльных сродкаў. Але ў гэтым я не бачу трагедыі – нават тады, калі мне не хапае грошай, я ўсё роўна займаюся музыкай, толькі не сваёй. Дзякуй за ўсё Богу!

Гутарыла
Зоя ПАДЛІПСКАЯ.

У матэрыяле выкарыстаны фотаздымкі Аляксандры Шпартавай.

НЕ КУВАЙ, ЗЯЗЮЛЕНЬКА

Верш Уладзіміра Пецюкевіча

Музыка Дзмітрыя Даўгалёва



У суседняй хаце дзеўчына жыла,
І яе не стала – рэчанькай сплыла,
Недзе ў свеце белым, за гарой крутой,
Можа, ў сне гаворыць любая са мной.

Не кувай, зязюленька, не кувай, харошая,
Не лічы так жаласна мне гады трывожныя!

Рэчанькі не будзе ўжо ніколі той,
Што паіла сэрца мне вадой жывой.
Любая не гляне ў вочы болей мне,
Не заззяе сонцам у маім акне.

Не кувай, зязюленька, не кувай, харошая,
Не лічы так жаласна мне гады трывожныя!

Установа «Рэдакцыя часопіса "Роднае слова"». Заснавальнікі: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне "Саюз пісьменнікаў Беларусі". Рэгістрацыйны нумар часопіса 561.
220035, г. Мінск, пр. Пераможцаў, 47, кор. 1, пад'езд 2 (уваход з вул. Гвардзейскай, код на ўваходзе: 43 + званок).
Р/р № 3015702170012 у аддзяленні № 527 ААТ "Белінвестбанк" г. Мінска, код 739, УНН 190241571, ОКПО 37551965.

Тэлефоны: галоўнага рэдактара **(017) 203-35-17**, намесніка галоўнага рэдактара **(017) 203-24-69**, рэдактараў і галоўнага бухгалтара **(017) 203-34-79**, адказнага сакратара **(017) 203-07-40**, факс **(017) 203-07-40**.
E-mail: **rodnaje_slova@tut.by**
www.rs.unibel.by

Падп. да друку 08.02.2013. Фармат 60x84 1/8. Папера газетная. Гарнітура "Minion Pro". Афсетны друк. Ум.-друк. арк. 9,1. Ум.-фарб. адбіт. 11,07. Ул.-выд. арк. 11,5. Тыраж 2514 экз. Зак. 445.
Надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва "Беларускі Дом друку"».
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. ЛП 02330/0494179 ад 03.04.2009.

®Роднае слова, 2013